Министерство связи и информатизации Республики Беларусь
Научно-инженерное республиканское унитарное предприятие
"Институт прикладных программных систем"
(НИРУП "ИППС")

**ГОСУДАРСТВЕННЫЙ РЕГИСТР ИНФОРМАЦИОННЫХ РЕСУРСОВ**

# РЕГИСТРАЦИОННОЕ СВИДЕТЕЛЬСТВО

## № 1141920555 от 28.11.2019 г.

о включении в Государственный регистр информационного ресурса

**Учебно-методический комплекс по учебной дисциплине «Методика преподавания истории» для специальностей: 1-02 01 01 История и обществоведческие дисциплины; 1-02 01 02 История и мировая художественная культура; 1-02 01 03 История и экскурсионно-краеведческая работа**

Владелец информационного ресурса

**Учреждение образования "Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка"**

Автор информационного ресурса

**Богданович Иван Иванович**

Директор — И.А. Михайловский

М.П.

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

Гістарычны факультэт
Кафедра ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі
Рэг.№ УМК 26-2-22/2018

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
__________ А.А. Корзюк
30. 05. 2018 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
__________ А.В. Касовіч
30. 05. 2018 г.

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ**

**"Методыка выкладання гісторыі"**

для спецыяльнасцей
1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны
1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура
1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

Складальнік кандыдат педагагічных навук, дацэнт Багдановіч І.І.

Разгледжана і зацверджана на паседжанні Савета БДПУ
" 22 " чэрвеня 2018 г., пратакол № 11

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск 2018

## ЗМЕСТ


1. Тлумачальная запіска
2. Тэарэтычны раздзел
2.1. Канспекты лекцый па дысцыпліне “Методыка выкладання гісторыі”
3. Практычны раздзел
3.1. Планы семінарскіх заняткаў па дысцыпліне
3.2. Тэматыка курсавых работ.
3.4.Тэмы дыпломных работ.
4. Радзел кантролю ведаў
4.1. Пытанні да заліку па дысцыпліне
5. Дапаможны раздзел
5.1. Тыпавая праграма па дысцыпліне
5.1. Вучэбная праграма па дысцыпліне (з вучэбна-метадычнай картай дысцыпліны)
6. Інфармацыйна-метадычная частка
6.1. Гласарый
6.2 Літаратура


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Паспяховае вырашэнне задач навучання гісторыі ў асноўным залежыць ад настаўніка, яго прафесійнага майстэрства, эрудыцыі і культуры.Курс “Методыка выкладання гісторыі ў школе” займае вядучае месца ў прафесійнай падрыхтоўцы настаўніка гісторыі. Ён закліканы даць будучым настаўнікам гісторыі веданне тэарэтычных асноў сучаснай методыкі выкладання, выпрацаваць першапачатковыя ўменні і навыкі, неабходныя для арганізацыі эфектыўнага навучання гісторыі, падрыхтаваць студэнтаў да рэалізацыі ў школьным выкладанні выхаваўчых і развіваючых магчымасцей гісторыі.

**Вучэбна-метадычны комплекс** распрацаваны ў адпаведнасці з Дзяржаўным стандартам і тыпавой вучэбнай праграмай, для спецыяльнасці 1-02 01 01 “Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны” з улікам Канцэпцыі школьнай гістарычнай адукацыі і абапіраецца на дасягненні сучаснай тэорыі і методыкі выкладання гісторыі.

**Мэта ВМК**: кіраванне і самакіраванне вучэбнай дзейнасцю па развіцці прафесійных кампетэнтнасці навучэнцаў у працэсе засваення методыкі выкладання гісторыі.

**ВМК** па методыцы выкладання гісторыі: раскрывае патрабаванні да зместу вывучаемай дысцпліны, да адукацыйных вынікаў і сродкам іх дасягнення і ацэнкі: забяспечвае эфектыўнае засваенне навучэнцамі вучэбнага матэрыялу, вызначанага Дзяржаўным стандартам, тыпавымі і вучэбнымі праграмамі па методыцы выкладання гісторыі; аб’ядноўвае ў адзінае цэлае розныя дыдактычныя сродкі (вучэбныя і вучэбна-метадычныя дапаможнікі, канспекты лекцый, планы семінарскіх заняткаў і г.д.); забяспечвае пераемнасць у выкладанні методыкі выкладання гісторыі з педагогікай, псіхалогіяй, і спецыяльнымі гістарычнымі дысцыплікамі: з’яўляецца сродкам кіравання самастойнай работы студэнтаў.

ВМК па методыцы выкладання гісторыі складаецца з: **тэарэтычнага раздзела**, які уключае ў сябе канспекты лекцый, і пералік вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў; практычны раздзел, у якім змешчаны планы семінарскіх заняткаў, тэматыку курсавых і дыпломных работ; **раздзел кантролю ведаў,** які ўтрымлівае матэрыялы для бягучага, прамежкавага (у тым ліку тэставыя заданні) і выніковага контролю вучэбных дасягненняў (пытанні да заліку і экзамену); **дапаможны раздзел,** у якім змяшчаюцца тыпавая і рабочая праграмы вучэбнай дысцыпліны, якія адпавядаюць усім патрабаванням да нарматыўных дакументаў такого тыпу; і інфармацыйна-метадычная частка, дзе змешчаны гласарый і пералік асноўнай і дадатковай літаратуры для студэнтаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ БЛОК

## 2.1. КАНСПЕКТЫ ЛЕКЦЫЙ ПА МЕТОДЫЦЫ ВЫКЛАДАННЯ ГІСТОРЫІ

### Лекцыя 1. Прадмет і задачы методыкі выкладання гісторыі

1. Прадмет методыкі выкладання гісторыі. 2. Сувязь методыкі выкладання гісторыі з іншымі навукамі. 3. Задачы методыкі выкладання гісторыі. 4. Метады даследавання працэса научання гісторыі.

1. Слова “методыка” паходзіць ад старажытнагрэчаскага “метадас”, што азначае “шлях даследавання”, “спосаб пазнання”. ***Методыка выкладання гісторыі*** – гэта самастойная галіна педагагічнай навукі, якая даследуе працэс навучання гісторыі з мэтай выяўлення і выкарыстання яго заканамернасцей для далейшага павышэння эфектыўнасці навучання, выхавання і развіцця вучняў. Яна канкрэтызуе агульныя вызначаныя дзяржавай мэты навучання, распрацоўвае змест школьнай гістарычнай адукацыі, аптымальныя прыёмы, сродкі і формы навучання, якія адпавядаюць узроставым і псіхалагічным асаблівасцям вучняў.

Працэс навучання гісторыі складаны і шматгранны працэс. Ён складаецца з шэрагу ўзаемазвязаных і ўзаемаабумоўленых ***кампанентаў (фактараў)***: мэт навучання, зместу гістарычнай адукацыі, выкладчыцкай дзейнасці настаўніка, вучэбнай дзейнасці вучняў і вынікаў навучання.

Адным з важнейшых фактараў працэсу навучання гісторыі з’яўляюцца дакладна вызначаныя ***мэты навучання***. Агульныя мэты навучання гісторыі, як правіла, вызначаюцца дзяржавай у адукацыйным стандарце і школьных праграмах. У іх фармуліруюцца агульныя патрабаванні, якія прад’яўляе грамадства да гістарычнай адукацыі ў цэлым. Канкрэтызацыя гэтых задач у дачыненні да асобных курсаў гісторыі, у адпаведнасці з узроставымі асаблівасцямі школьнікаў, распрацоўка методыкі праекціравання настаўнікам мэт вывучэння асобных раздзелаў, тэм і канкрэтных урокаў – гэта задача метадычнай навукі.

Працэс навучання гісторыі складаны і шматгранны працэс. Ён складаецца з шэрагу ўзаемазвязаных і ўзаемаабумоўленых ***кампанентаў (фактараў)***: мэт навучання, зместу гістарычнай адукацыі, выкладчыцкай дзейнасці настаўніка, вучэбнай дзейнасці вучняў і вынікаў навучання.

Адным з важнейшых фактараў працэсу навучання гісторыі з’яўляюцца дакладна вызначаныя ***мэты навучання***. Агульныя мэты навучання гісторыі, як правіла, вызначаюцца дзяржавай у адукацыйным стандарце і школьных праграмах. У іх фармуліруюцца агульныя патрабаванні, якія прад’яўляе грамадства да гістарычнай адукацыі ў цэлым. Канкрэтызацыя гэтых задач у дачыненні да асобных курсаў гісторыі, у адпаведнасці з узроставымі асаблівасцямі школьнікаў, распрацоўка методыкі праекціравання настаўнікам мэт вывучэння асобных раздзелаў, тэм і канкрэтных урокаў – гэта задача метадычнай навукі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Змест адукацыі*** – абавязковы кампанент працэса навучання, без яго не можа быць і самой вучэбнай дзейнасці школьнікаў. Змест школьнай гістарычнай адукацыі надзвычай разнастайны. Ен уключае фактычны і тэарэтычны матэрыял, які адлюстроўвае ўсе бакі гісторыі развіцця чалавечага грамадства: эканоміку, розныя аспекты ўнутранай і знешняй палітыкі дзяржаў у розныя перыяды гісторыі, сацыялныя, этнічныя, рэлігійныя і культурныя з’явы і працэсы, дынаміку іх развіцця ад старажытных часоў да нашых дзён.

Непарыўна звязанымі паміж сабой фактарамі працэса навучання з’яўляюццаа ***выкладчыцкая дзейнасць настаўніка і вучэбная дзейнасць вучняў***. Асновай выкладчыцкай дзейнасці настаўніка з’яўляецца не толькі адаптацыя і трансляцыя навуковых гістарычных ведаў, але і больш складаная работа па арганізацыі вучэння школьнікаў.

2. Методыка выкладання гісторыі мае самастойны ***прадмет даследавання – працэс навучання гісторыі.*** Абапіраючыся на метады навуковага даследавання і агульныя заканамернасці працэса навучання, выяўленыя педагогікай і псіхалогіяй, а таксама на метадалогію гістарычнай навукі, яна раскрывае аб’ектыўна дзеючыя заканамернасці навучання гісторыі і прымяняе іх для ўдасканалення практыкі вывучання гісторыі. Менавіта таму мы можам разглядаць яе як самастойную галіну педагагічнай навукі.

Шматбаковасць працэсу, які даследуецца методыкай, набліжае яе да іншых навук. Яна арганічна звязана ***з гістарычнай навукай***, як методыкі іншых прадметаў з адпаведнымі навукамі.

Найбольш цеснымі з’яўляюцца сувязі методыкі выкладаня гісторыі з ***педагогікай***. Абапіраючыся на ***тэорыю выхавання***, методыка дае сваю інтэрпрэтацыю вырашэння задач маральнага, грамадзянска-патрыятычнага, прававога, працоўнага, эканамічнага, экалагічнага і эстэтычнага выхавання. Самыя непасрэдныя сувязі яна мае з ***тэорыей навучання – дыдактыкай***.

Вывучэнне ў методыцы вучэбнай дзейнасці школьнікаў цесна звязвае яе з ***псіхалогіяй***. Развіццё псіхалогіі, асабліва ўзроставай і педагагічнай, стварае спрыяльныя ўмовы для навуковага даследавання працэсу навучання гісторыі і асабліва заканамернасцей працэсу вучэння. Праз гісторыю, педагогіку і псіхалогію методыка выкладання гісторыі мае апасрэдаваныя сувязі з многімі іншымі навукамі: філасофіей, метадалогіей гісторыі, спецыяльнымі гістарычнымі дысцыплінамі, узроставай фізіялогіей, школьнай гігіенай і г.д.

Падрабязны разгляд прадмета методыкі выкладання гісторыі і яе сувязей з іншымі навукамі дазваляе коратка вызначыць яе ***асноўную задачу***: выяўленне аб’ектыўна існуючых сувязей паміж асноўнымі кампанентамі працэса навучання гісторыі, тэарэтычнае іх тлумачэнне і вызначэнне шляхоў практычнага іх выкарыстання для ўдасканалення вывучэння гісторыі ў школе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Распрацоўваючы тэарэтычныя основы навучання гісторыі, методыка заклікана даць навукова-абгрунтаваныя адказы на шэраг практычных пытанняў прынцыпова важных для практыкі навучання:

- Якія мэты можна ставіць перад навучаннем гісторыі? (Для чаго вучыць?)
- Якімі павінны быць адбор гістарычнага матэрыялу і структура курса? (Чаму вучыць?)
- Якая выкладчыцкая дзейнасць забяспечвае аптымальныя вынікі ўнавучанні, выхаванні і развіцці вучняў? (Як вучыць?)
- Якія віды навучальных дапаможнікаў і якая іх метадычная пабудова забяспечвае дасягненне аптымальных вынікаў навучання? (Якія сродкі навучання гісторыі выкарыстоўвавць?)
- Якая вучэбная дзейнасць школьнікаў забяспечвае лепшыя вынікі навучання? (Як вывучаць гісторыю?)
- Як улічваць вынікі навучання і выкарыстоўваць іх для яго ўдасканалення? (Як удасканаліць навучанне гісторыі?)

Нягледзячы на тое, што асноўныя пытанні, на якія методыка выкладання  гісторыі павінна даць адказы фармулiруюцца проста і даўно вядомыя, даць дакладныя і вычарпальныя адказы на іх і, такім чынам, забяспечыць абсалютныя вынікі навучання аб’ектыўна немагчыма, як немагчыма даць гатовыя рэкамендацыі на ўсе выпадкі жыцця.

4. У аснове  ***навуковага даследавання па методыцы выкладаня гісторыі*** ляжыць супастаўленне вынікаў навучання з іншымі кампанентамі працэса навучання гісторыі і супастаўленне двух, або некалькіх працэсаў навучання, у якіх адны кампаненты з’яўляюцца падобнымі, другія рознымі. Калі ў адных выпадках дасягаюцца лепшыя вынікі, а ў другіх горшыя, то прычыны гэтага трэба шукаць у дзеянні адпаведнага кампанента.

Існуюць два асноўныя шляхі (метады) даследавання працэсу навучання. Першы – вывучэнне працэсу навучання без уздзеяння на яго даследчыка. Яго называюць ***метадам назірання.*** Ён ўключае ў сябе: вывучэнне друкаванай і пісьмовай дакументацыі, непасрэднае назіранне самаго працэсу навучання, вывучэнне вопыту, які знайшоў адлюстраванне ў педагагічнай, метадычнай і вучэбнай літаратуры, у неапублікаваных справаздачах, дакладах, рэфератах, дзённіках настаўнікаў і т. п. Такім чынам даследчык знаёміцца з апасрэдаваным вопытам выкладання.

Другі шлях вывучэння працэсу навучання гісторыі – эксперыментальныя даследаванні, або ***педагагічны эксперымент***. Адрозніваюць ***канстацiруючы і фарміруючы эксперымент***. На стадыі канстатацыі даследчык вызначае мэту і задачы даследавання, яго рабочую гіпотэзу, а таксама праграму і крытэрыі эксперыментальнага вывучэння для выяўлення аб’ектыўна існуючага ў рэальным вучэбным працэсе стану даследуемай праблемы.

Вынікі канстацiруючага эксперымента дазваляюць даследчыку распрацаваць навукова абгрунтаваную мадэль ***фарміруючага эксперымента*** і методыку яе рэалізацыі ў рэальным вучэбным працэсе. У адрозненні ад назіральніка, эксперыменатар арганізуе працэс навучання, або ўносіць у яго

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

змены ў адпаведнасці з задачай даследавання, а затым правярае дасягнутыя вынікі. Атрыманыя вынікі служаць крытэрыямі для ацэнкі правяраемых кампанентаў працэсу навучання: зместу, прыёмаў і сродкаў навучання і г.д.

## Лекцыя 2. Станаўленне і развіццё школьнай гістарычнай адукацыі і методыкі выкладання гісторыі ў дасавецкі час

*1. Станаўленне і развіццё гістарычнай адукацыі ва ўсходнеславянскіх землях да канца 18 ст. 2. Гістарычная адукацыя і методыка выкладання гісторыі ў X1X ст. 3. Развіццё методыкі выкладання гісторыі ў пачатку XX ст.*

1. Пачатак пісанай гісторыі ўсходніх славян паклалі старажытнарускія летапісы і, найперш, "Аповесць мінулых гадоў". Аднак летапісы былі даступнымі абмежаванаму колу чытачоў, а асноўнай крыніцай пазнання народам сваёй гісторыі, як і ў дапісьмовыя часы, заставалася вусная народная творчасць.

Некаторыя звесткі па айчыннай і сусветнай гісторыі ў 15-17 стст. можна было атрымаць з шырока распаўсюджаных у той час рукапісных кніг "Азбукоўнікаў". У іх змяшчаліся апавяданні навучальнага характару, прысвечаныя важнейшым падзеям свяшчэннай і часткова грамадзянскай гісторыі. Першым вучэбным дапаможнікам па гісторыі ўсходніх славян стаў "Сінопсіс"(у перакладзе з грэчаскага – агляд), створаны і выдадзены ў Кіеве ў 1674 годзе. Аб тым, што гэта быў вучэбны дапаможнік сведчыць наяўнасць у ім "роспісаў" з датамі праўлення кіеўскіх і маскоўскіх мітрапалітаў і князеў, што дазваляла вучням лягчэй засвоіць храналогію падзей.

Упершыню выкладанне грамадзянскай гісторыі ў Расіі пачалося Ў 1705 годзе, калі Петр I прапанаваў з мэтай маральнага выхавання навучэнцаў увесці выкладанне сусветнай гісторыі ў гімназіі, заснаванай пастарам Глюкам для дзяцей баяр, служывага і купецкага люду. З 1721 года гісторыя пачала вывучацца ў школе Феафана Пракаповіча, створанай для дзяцей "усякага звання".

Дзяржаўнае навучанне гісторыі пачалося толькі з 1726 годзе, калі ў першай ўрадавай акадэмічнай гімназіі заснаванай пры Пецярбургскім універсітэце, ў 3-м, 2-гім і 1-м класах пачала вывучацца гісторыя. Першы пераклад падручніка гисторыі на рускую мову быў зроблены толькі ў 1747 годзе. Гэта было «Введение в генеральную историю Гильома Кураса».

Буйнейшым гісторыкам XVIII ст., быў сучаснік Пятра I В. Тацішчаў. Менавіта па яго настаянню гісторыя як вучэбны прадмет упершыню была ўключана ў школьныя праграмы. Вялікі ўклад ва ўкараненне рускай гісторыі ў школу ўнёс М.В. Ламаносаў. Яго "Краткий Российский летописец с родословием" (1760г.) стаў фактычна першым школьным падручнікам па рускай гісторыі.

У 1783 годзе ў Пецярбургу была заснавана першая ў Расіі настаўніцкая семінарыя для падрыхтоўкі выкладчыкаў для народных вучылішчаў. У лік абавязковых для вывучэння навучэнцамі прадметаў уключаецца методыка гісторыі. Першыя метадычныя рэкамендацыі па выкладанню гісторыі ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

школе зрабіў Ф.І. Янковіч у падрыхтаваным ім у 1783 г. дапаможніку “Руководство учителям народных училищ”.

У 1786 годзе па ініцыятыве імператрыцы Кацярыны II праводзіцца школьная рэформа. У адпаведнасці з падпісаным ёй статутам народных вучылішчаў у школах уводзіцца класна-урочная сістэма навучання, пачынаецца выкарыстанне крэйды, дошкі і іншай нагляднасці, ствараецца камісія па перакладу замежных і падрыхтоўцы айчынных падручнікаў.

Руская гісторыя ў народных вучылішчах вывучалася па “Летапісцу” М.В. Ламаносава, а з 1799 года яго замяніла “Кароткая Расійская гісторыя, складзеная для ўжывання ў народных вучылішчах”, аўтарства, якой застаецца спрэчным. Такім чынам, у XVIII ст. грамадзянская гісторыя зацвердзілася ў школах Расійскай імперыі як самастойны вучэбны прадмет, гістарычная адукацыя замацавалася ў вучэбных планах народных вучылішчаў, яна пачыналася з вывучэнння сусветнай гісторыі і завяршалася вывучэннем расійскай гісторыі ў выпускных класах. У гімназіях яна працягвала вывучацца ў якасці дадатку да філалагічнага курса. Спробы укараніць новую прагрэсіўную методыку выкладання гісторыі аказаліся марнымі – па-ранейшаму ў школах пераважала зацверджванне дат, імен, падзей мінулага напамяць, панавала механічнае завучванне урока па падручніку у класе ад “а” да “я”. Расказ настаўніка на ўроку быў з’явай рэдкай, у лепшым выпадку перадавыя настаўнікі выкарыстоўвалі тлумачальнае чытанне, што не віталася ні калегамі, ні адміністрацыяй.

2. У пачатку XIXст. царскі ўрад праводзіць школьную рэформу, ствараецца Міністэрства народнай асветы, якое павіннаа было ажыццяўляць адзіную палітыку ў галіне народнай адукацыі ў маштабах усёй імперыі. Гэта палітыка заклікана была забяспечваць выхаванне насельніцтва краіны ў духу фарміраваўшайся ў той час “тэорыі афіцыйнай народнасці”.

У расійскай гістарыяграфіі пачатку XIX ст. ў якасці дамінуючага зацвярджаецца дваранскі напрамак, заснавальнікам і ідыёлагам якога ў Расіі стаў М.М. Карамзін.

Што датычыцца спосабу выкладання гісторыі ў першай палове XIXст., то ён мала чым адрозніваўся ад методыкі канца XVIII ст.. У сярэдзіне XIX ст. паяўляецца шэраг метадычных работ, у якіх прапануюцца розныя метады выкладання гісторыі. Так доктар філасофіі А. Язвінскі прапанаваў арыгінальны спосаб завучвання храналагічных дат. Ён рэкамендаваў запісваць важнейшыя факты стагоддзя на лісты рознага колеру, разлінаваўшы іх на 100 клетак. Кожная клетка забяспечвалася клапанам, які дазваляў адкрыць ці закрыць лічбу. Спачатку гэта методыка была прынята з вялікім энтузіязмам, аднак паступова цікавасць да яе была страчана. Методыку рыфмовачна - абагульняючага запамінання прапанаваў дырэктар Пецярбургскага нямецкага вучылішча Готліб фон Шуберт. Сутнасць яе ў тым, што гістарычныя факты рыфмавалі і распяваючы завучвалі. Вялікая ўвага надавалася апытанню, праводзіць якое дапамагалі памочнікі настаўніка – аудытары.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

Найбольш распаўсюджаным прыёмам навучання  на ўроках было кароткае каменціраванне настаўнікам тэкста падручніка, які потым задаваўся на дом для завучвання напамяць. Настаўнікі не раскрывалі ўнутраных сувязей паміж гістарычнымі фактамі, не выкарыстоўвалі дакументальныя матэрыялы. Апытанне, якое займала большую частку ўрока, выконвала функцыю кантролю за якасцю засваення тэкста падручніка, падручнікі былі пазбаўлены ілюстрацый.

Тым не менш, ужо ў 50-60-я гады пачынае складвацца больш прагрэсіўная метадычная сістэма навучання гісторыі. Пэўны ўклад у яе станаўленне ўнеслі прадстаўнікі рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні грамадскай думкі Расііі В.Р. Бялінскі, М.А. Дабралюбаў, М.Г. Чарнышэўскі. У сваіх публікацыях, яны падверглі рэзкай крытыцы існуючую сістэму школьнай гістарычнай адукацыі і методыку яе выкладання, скіраваную на бяздумнае завучванне “множества фактов, имён и тьмы чисел», якія засмечваюць памяць вучняў і вядуць да безсэнсоўнай  неапраўданай перагрузкі школьнікаў. Яны прапанавалі шэраг прадуктыўных ідэй. Паяўляюцца падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, напісаныя з розных метадалагічных пазіцый.

Цікавыя, так званыя “прафесарскія падручнікі” для сярэдніх навучальных устаноў, былі створаны ў 60-–80-я гады вядомымі расійскімі гісторыкамі Г.Р. Вінаградавым, М.І. Карэевым, С.Ф. Платонавым і С.М. Салаўёвым. Так С.М. Салаўёў у сваім даволі аб’ёмным (565с.) дапаможніку па рускай гісторыі паслядоўна праводзіў ідэю гістарычнай заканамернасці і ўсталявання сувязі айчыннай гісторыі з сусветнай.

Адначасова з названымі вышэй, пачалі выходзіць новыя падручнікі прыхільнікаў манархічнай плыні ў гістарычнай навуцы. Сярод іх вызначаліся падручнікі таленавітага гісторыка і папулярызатара гісторыі Д.І. Ілавайскага, напісаныя жывой вобразнай мовай.

Аўтарам першай па грунтоўнасці методыкі выкладання гісторыі ў Расіі можна лічыць Я.Р. Гурэвіча, якая выйшла ў “Педагагічным зборніку” 1877 года пад назвай “Вопыт методыкі гісторыі”.

У 1881г. у перакладзе на рускую мову была выдасдзена “Методыка гісторыі” знакамітага нямецкага педагога Г. Дыстырвега, які заклікаў пры навучанні гісторыі імкнуцца ні да чаго іншага, акрамя ісціны нават калі яна непрыемная і не супадае зпоглядамі рэлігійных ці палітычных партый. Ен выступаў супраць штучнага насаджэння патрыятызму і лічыў, што няма патрэбы “спяваць аб любові да Радзімы”, бо гатоўнасць спрыяць шчасцю і свабодзе роднай зямлі павінна вынікаць “з унутрана неперадольнага пачуцця”

У канцы 90-х гадоў выразна абазначыўся *радыкальны* напрамак ў развіцці гісторыка-метадычнай думкі. Найбольш яркімі яго прадстаўнікамі былі гісторыкі - марксісты Н.М. Каваленскі, М.А. Ражкоў і М.М. Пакроўскі. Яны зрабілі спробу ўкараніць у школьную практыку  марксісцкае разуменне гісторыі, выкарастаўшы для гэтага выкладанне ў нядзельных і вячэрніх школах для рабочых. Яны поўнасцю адмаўляліся ад існаваўшай сістэмы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вывучэння гісторыі па падручніках і лічылі адзіна правільным *рэальны метад* вывучэння гісторыі па першакрыніцах і гістарычных дакументах, аналіз і разбор якіх на уроках гісторыі, самастойнае вывучэнне і падрыхтоўка рэфератаў дазволяць развіваць у навучэнцаў самастойнае мысленне і трывалыя веды аб рашаючай ролі развіцця спосаба вытворчасці і класавай барацьбы ў прагрэсіўным руху грамадства да сацыялізму і камунізму.

У 1890г. у Пецярбурзе выйшла першая абагудьняючая тагачасны вопыт выкладання элементарнага курса гісторыі праца А Кралюніцкага, у якой знайшла адлюстраванне методыка выкарыстання розных прыёмаў вуснага выкладання, нагляднасці і арганізацыі ўрокаў гісторыі.

Цікавыя ідэі аб выкладанні гісторыі ў школе былі выкладзены ў кнізе С. Ламавіцкага. На яго думку, гістарычны змест вывучаецца не дзеля яго самаго: а з’яўляецца сродкам, з дапамогай якога ажыццяўляецца выхаваўчае і развіваючае ўздзеянне на вучняў). Значны ўклад у методыку выкладання гісторыіі ўнёс М.І. Карэеў, аўтар падручніка па ўсеагульнай гісторыі і адзін з першых расійскіх вучоных-метадыстаў.

Такім чынам да канца XIX стагоддзя ў Расіі былі закладзены навуковыя асновы методыкі выкладання гісторыі ў школе, склалася сістэма школьнай гістарычнай адукацыі, сфарміраваліся розныя плыні ў развіцці гісторыка-метадычнай думкі, якія аказвалі істотны ўплыў на стан і практыку выкладання гісторыі у пачатковай і сярэдняй школе.

3. У пачатку XX ст. завяршаецца працэс афармлення методыкі выкладання гісторыі як навукі, чаму паспрыялі вынікі першай расійскай рэвалюцыі, абвясціўшай свабоду слова і друку. Хутка расце колькасць метадычных публікацый, узбагачаюцца сродкі, метады і формы арганізацыі працэса навучання гісторыі, настойліва выказваюцца думкі аб неабходнасці рэфармавання гістарычнай адукацыі. Асаблівую ўвагу педагогі-гісторыкі пачалі надаваць арганізацыі самастойнай пазнавальнай дзейнасці вучняў, фарміраванню ў іх пазнавальнага інтарэсу. У тэорыі і практыцы навучання знайшлі адлюстраванне пытанні фарміравання ў вучняў канкрэтных гістарычных уяўленняў на аснове шырокага выкарыстання спецыяльна створаных вучэбных карцін, ілюстрацый падручніка і гістарычных карт. Распрацоўваюцца пытанні арганізацыі экскурсійнай і краязнаўчай работы.

Пошук актыўных метадаў навучання гісторыі прывёў да ўдасканалення метада рэферыравання, распрацаванага настаўнікамі гісторыі кіеўскай гімназіі Б.А. Влахапулавым і гродзенскай, а затым пецярбургскай гімназій М.П. Пакацілам. У складанні рэфератаў яны бачылі асноўны спосаб фарміравання ў вучняў навыкаў самастойнай работы.

Такім чынам, ў расійскай школе у пачатку XX стагоддзя сфарміравалася развітая сістэма гістарычнай адукацыі, якая ўключала ў сябе вывучэнне ўсеагульнай (старажытная і сярэдневяковая гісторыя, а з пачатку стагоддзя і новая гісторыя) і гісторыі Расіі, якія вывучаліся як самастойныя прадметы. Далейшае развіццё атрымала гісторыка-метадычная думка, што праявілася ў тэарэтычным абгрунтаванні і практычным выкарыстанні актыўных метадаў навучання, скіраваных на арганізацыю самастойнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пазнавальнай дзейнасці вучняў і стварэнні разнастайных наглядных і друкаваных сродкаў навучання гісторыі. Разам з тым, пануючымі ў школе, нягледзечы на распрацоўку і выкарыстанне асобнымі настаўнікамі навацый, заставалася сістэма навучання заснаваная на традыцыйных для папярэдняга перыяда метадах завучвання і ўзнаўлення матэрыяла афіцыйных падручнікаў манархічнага толку.

## Лекцыя 3. Развіцце школьнай гістарычнай адукацыі і методыкі выкладання гісторыі ў СССР

1. Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў 20-я гады. 2. Аднаўленне ў школе вывучэння гісторыі як самастойнага курса і мтодыка яго выкладанне ў 30-х – сяр. 60-х гадах. 3. Развіццё гістарычнай адукацыі і методыкі выкладання гісторыі ў сяр. 60-х - 80-х гадах. 4. Крызіс у развіцці школьнай гістарычнай адукацыі ў квнцы 80-х-пачатку 90-х гадоў XX ст.

1. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі пачалася карэнная ломка ўсёй сістэмы школьнай адукацыі. Старая школа і асабліва сістэма школьнай гістарычнай адуацыі не адпавядалі ідэалагічным і палітычным запатрабаванням бальшавікоў.
Настаўнікі гісторыі ў большасці сваёй сталі ў апазіцыю да новай улады. У ліпені 1918 года на пасяджэнні Наркамасветы загадчык аддзела рэформы школы П.М. Лепяшынскі, так намалёўваў карціну новай працоўнай школы: вучоба ў школе працягваецца круглы год, перапынкі ў занятках ставяцца ў залежнасць ад кліматычных умоў; школьнікі займаюцца ўсе сем дзён тыдня, але два з іх павінны быць аддадзены экскурсіям; класнае выкладанне адмяняецца і замяняецца працоўным; праграмы павінны мець рэкамендацыйны характар; прадметнае выкладанне супярэчыць прынцыпам працоўнай школы; настаўнікі павінны пазбягаць выкарыстання падручнікаў; неабходна карыстацца даведнікамі і весці з вучнямі гутаркі.

У 1920 годзе па даручэнню Наркамасветы камісія пад кіраўніцтвам намесніка наркама М.М. Пакроўскага распрацавала прыкладныя праграмы па гісторыі. Аднак яны не атрымалі шырокага выкарыстання ў школе, бо ўжо ў наступным 1921 годзе гістарычны матэрыял разам з палітычнай эканоміяй і правам быў аб’яднаны ў курс грамадазнаўства, а пачынаючы з 1923 года былі ўведзены комплексныя праграмы, якія зусім ліквідавалі прадметнае выкладанне ў школе.

У новай школе адмяняліся прадметнае навучанне, класна-урочная сістэма арганізацыі навучання, пакаранні, бальная ацэнка ведаў, экзамены і дамашнія заданні. Замест класаў прапаноўвалася стварыць дробныя групы – брыгады, а замест урокаў лабарторна-студыйныя заняткі. Шырокае выкарыстанне атрымала арганізацыя заняткаў па амерыканскаму Дальтон-плану.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Да новага зместу курса грамадазнаўства і новых метадаў яго вывучэння ("працоўны", "лабараторна-брыгадны", "даследчы") ствараліся новыя тыпы вучэбных дапаможнікаў і кніг. Найбольш характэрным з іх быў вучэбны дапаможнік па гісторыі А.А. Увядзенскага і А.В. Прадцечанскага.

Шырока выкарыстоўваўся працоўны метад, які прадугледжваў уключэнне ў заданні-падрады рэканструкцыі розных з'яў мінулага, выраб касцюмаў, мадэліраванне зброі, прылад працы, падрыхтоўка тэатрэалізаваных пастановак.

Такая методыка відавочна пераацэньвала сілы навучэнцаў і недаацэньвала ролю настаўніка, але разам з тым фарміравала ў лепшых вучняў уменні і навыкі ажыццяўлення самастойнага творчага пошуку і самастойнага мышлення. Менавіта сістэма адукацыі 20-х гадоў спрыяла станаўленню савецкай навукі і яе дасягненням у 30-я-50-я гады XX ст.

Сур'ёзным недахопам у гістарычнай адукацыі ў 20-я гады была адсутнасць сістэмы гістарычных ведаў і, як вынік гэтага, неразуменне вучнямі сутнасці развіцця гістарычнага працэса. Аднак, пошук новых ідэй у галіне адукацыі і шляхоў іх ажыццяўлення, спрыялі развіццю метадычнай навукі.

2. У пачатку 30-х гадоў, калі у СССР вырашаліся грандыёзныя праграмы індустрыялізацыі, калектывізацыі і культурнай рэвалюцыі, кіраўніцтву стала ясна, што стан гістарычнай адукацыі не адпавядае ідэалагічныу забяспечанню сацыялістычнага будаўніцтва. Абстрактныя сацыялагічныя схемы, вывучаемыя ў курсе грамадазнаўства, былі незразумелымі вучням і дрэнна засвойваліся. Трэба было напоўніць гэтыя схемы канкрэтным гістарычным матэрыялам, што дазваліла б сфарміраваць у вучняў трывалае разуменне асноўных дагматаў гістарычнага матэрыялізму ў жывой, канкрэтна-вобразнай форме.

Менавіта таму 15 мая 1934 г. выдадзена спецыяльная пастанова ЦК УКП(б) і СНК СССР «Аб выкладанні грамадзянскай гісторыі ў школах СССР». Яна паклала пачатак новаму этапу ў развіцці школьнай гістарычнай адукацыі і методыкі выкладання гісторыі ў СССР.

У пастанове была вызначана стройная метадычная сістэма выкладання гісторыі, якая праіснавала ў савецкай школе да канца 80-х гадоў. Асноўныя палажэнні гэтай сістэмы наступныя:

- галоўная мэта вывучэння гісторыі – фарміраванне ў вучняў марксісцка-ленінскага разумення гісторыі, як заканамернага працэсу змены ў выніку класавай барацьбы грамадска-эканамічных фармацый;
- структура вывучэння школьных курсаў гісторыі павінна адпавядаць марксісцкай перыядызацыі гісторыі, заснаванай на паступовай змене грамадска-эканамічных фармацый са старажытнейшых часоў да нашых дзён;
- паведамленне вучням канкрэтных гістарычных фактаў, з'яў і падзей павінна ажыццяўляцца ў жывой, нагляднай і даступнай форме, з характарыстыкай асноўных гістарычных дзеячоў;
- у памяці вучняў павінны фарміравацца вобразы канкрэтных гістарычных фактаў, аналіз і абагульненне якіх падводзіў бы іх да

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

марксісцка-ленінскага  разумення гісторыі і пераканання ў непазбежнасці гібелі капіталізму і ўсталявання ва ўсім свеце сацыялізму і камунізму. У адпаведнасці з гэтымі метадычнымі палажэннямі прапаноўвалася скласці новыя праграмы і падручнікі па ўсіх гістарычных курсах.

Такім чынам, пастанова ЦК УКП(б) і СНК СССР ад 15 мая 1934 г. мела для станаўлення і развіцця школьнай гістарычнай адукацыі *гістарычнае значэнне*. У 1937 годзе у структуру гістарычнай адукацыі быў уключаны курс Канстытуцыі СССР, які вывучаўся ў 7-м класе.

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў змест школьнай гісторычнай адукацыі былі ўключаны ваенна-гістарычны матэрыял, звязаны з жыццём і дзейнасцю знакамітых рускіх палкаводцаў і флотаводцаў А. Неўскага, Дз. Данскога, К. Мініна, Дз. Пажарскага, А. Суворава, М. Кутузава, Ф. Ушакова, А. Нахімава, а таксама матэрыял аб усенароднай барацьбе супраць іншаземных захопнікаў. Усё гэта паспрыяла ўзмацненню ваенна-патрыятычнага выхавання школьнікаў.

У 40-50-я гады значныя змены адбываюцца ў метадычнай навуцы. Актыўна працуюць такія вучоныя-метадысты як Н.В. Андрыеўская, В.М. Бернадскі, І.В. Гіцціс, М.А. Зіноўеў, В.Р. Карцоў, А.І. Стражаў і інш. Імі створаны шэраг абагульняючых прац па праблемах камуністычнага выхавання ў працэсе навучання гісторыі, фарміравання ў вучняў гістарычных уяўленняў, паняццяў і заканамернасцей грамадскага развіцця, робяцца спробы распрацаваць сістэмы метадаў навучання гісторыі, сувязі гісторыі з сучаснасцю, пачынаецца даследаванне характару пазнавальнай дзейнасці вучняў пры вывучэнні гісторыі.

У сувязі з увядзеннем у 1958 г. новага Закона аб школе і пераходам да ўсеагульнай васьмігадовай адукацыі ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР 8 кастрычніка 1959г. прыняў пастанову “Аб некаторых зменах у выкладанні гісторыі ў школах”. У пастанове прапаноўвалася ўзмацніць выхаванне моладзі ў духу камуністычнай ідэйнасці і маралі, сацыялістычнага патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму, глыбокай павагі да працы, да актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці.

Пастанова ўводзіла наступны парадак вывучэння гісторыі ў 11-гадовай школе: 4 клас – эпізадычныя расказы па гісторыі СССР, 5-8 класы – элементарныя курсы гісторыі: гісторыі старажытнага свету (5 кл.), гісторыі сярэдніх вякоў (6 кл.), гісторыі СССР з важнейшымі звесткамі па новай і навейшай гісторыі замежных краін і звесткамі аб грамадскім і дзяржаўным ладзе СССР (7-8 кл.), у 9-11 класах – сістэматычныя курсы: гісторыя СССР са старажытных часоў да канца 50-х гадоў ХХст. і новая і навейшая гісторыі. Пабудова школьных курсаў гісторыі набыла яскрава азначаны канцэнтрычны выгляд. У сувязі з гэтым значна быў павялічаны аб’ём часу на вывучэння гісторыі (да 25 гадзін у тыдзень).

3. У сярэдзіне 60-х гадоў стала ясна, што змены, унесеныя ў структуру школьнай адукацыі ў цэлым і гістарычнай адукацыі, ў прыватнасці, былі паспешнымі, а ўсеагульная васьмігадовая адукацыя, якая была ўведзена ў 1958 годзе, ўжо незадавальняла патрэбам сучаснага ўзроўню эканамічнага,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

грамадскага і культурнага развіцця. Канцэнтрычнае вывучэнне гісторыі не апраўдала сябе: нягледзячы на істотнае павелічэнне часу на вывучэнне гісторыі, не ўдалося дасягнуць больш глыбокага засваення гістарычных ведаў. Таму ў канцы 1964 года было вырашана вярнуцца да дзесяцігадовага тэрміну навучання ў сярэдняй школе і лінейнага прынцыпу пабудовы школьнай гістарвычнай адукацыі.

Менавіта пагэтаму 14 мая 1965 года была выдадзена новая пастанова ЦК КПСС “Аб змяненні парадку выкладання гісторыі ў школах”. Парадак вывучэння гісторыі ў 4, 5, 6 класах застаўся той жа, але курсы гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў перасталі называць элементарнымі. Замест элементарнага і сістэматычнага курсаў айчыннай гісторыі ў 7-10 класах уводзіўся адзіны сістэматычны курс гісторыі СССР, а новую і навейшую гісторыю прадугледжвалася вывучаць ў 8-10 класах паралельна з курсам гісторыі СССР. Да 20 гадзін у тыдзень быў скарочаны час на вывучэнне гісторыі ў школе.

У сувязі з вяртаннем да ранейшай структуры школьнай гістарычнай адукацыі, пачалося стварэнне новага пакалення падручнікаў па гісторыі. Яно завяршылася да сярэдзіны 70-х гадоў.

Пераход у пачатку 70-х гадоў да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі патрабаваў далейшага ўдасканалення ў краіне яе сістэмы і зместу. У сувязі з гэтым ў канцы 70-х- пач.80-х гадоў былі ўдасканалены школьныя праграмы па гісторыі. Больш выразна быў акрэслены яе асноўны змест: па кожнаму курсу гісторыі былі вылучаны асноўныя паняцці і дадзены пералік агульнавучэбных і спецыяльных уменняў, якімі вучні павінны авалодаць пры вывучэнні гісторыі, вылучаны і абазначаны міжпрадметныя, міжкурсавыя сувязі па кожнай тэме і раздзелу школьных курсаў гісторыі.

4. У другой палове 80-х гадоў у краіне пачалася перабудова, у аснове якой ляжала дэмакратызацыя і галоснасць. Яна суправаджалася шырокім распаўсюджаннем і прапагандай праз сродкі масавай інфармацыі перадавых , для таго часу ідэй настаўнікаў - наватараў: Т.І. Ганчаровай, В.Ф. Шаталава, С.Д. Шаўчэнкі, С.Б. Каплана, якія прапанавалі, заснаваныя на дасягненнях сучаснай тэорыі і методыкі навучання і правераныя шм эфектыўнага вывучэння гісторыі, заснаваныя на выкарыстанні праблемнага навучання, апорных канспектаў, як асновы забеспячэння поўнага засваення ведаў, камунікатыўнага дыялогу і дыдактычнай гульні, канцэнтрыраванага блочнага навучання.

Аднак выкарыстанне гэтых тэхналогій стрымлівалася ва ўмовах, яскрава праявіўшагася ў перыяд галоснасці, крызісу школьнай гістарычнай адукацыі. Ён быў выкліканы дэфіцытам праўды, разыходжанне слова і справы, меўшымі месца ў нашай рэчаіснасці не толькі ў гады “застою”, але і у час перабудовы. Гэта аказала згубны ўплыў на выкладанне гісторыі, асабліва ў старэйшых класах, вучні якіх добра разумелі, што тое аб чым гаворыцца на ўроках гісторыі далёка не адпавядае таму, што асвятляецца ў сродках масавай інфармацыі, якія ў гэты час актыўна абмяркоўвалі гістарычную праўду аб падзеях, якія складалі змест савецкай і навейшай гісторыі.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Крызісныя з’явы ў навучанні гісторыі працягвалі нарастаць. У сувязі з гэтым пачынаецца работа па распрацоўцы новай канцэпцыі школьнай гістарычнай адукацыі ў СССР. У 1990 годзе на абмеркаванне педагагічнай грамадкасці былі прапанаваны некалькі варыянтаў канцэпцыі перабудовы школьнай гістарычнай адукацыі, якія былі распрацаваныя ў Маскве. Аднак ніводзін з іх не мог быць прыняты, бо аўтары-складальнікі не змаглі адысці ад марксісцкай парадыгмы гісторыі. Яна па-ранейшаму знаходзілася пад кантролем КПСС. Менавіта таму спробы стварыць новую сістэму школьнай гістарычнай адукацыі ў СССР аказаліся безвыніковымі да часу яго распаду.Такім чынам за час існавання савецкай дзяржавы школьная гістарычная адукацыя і методыка выкладання гісторыі прайшлі некалькі этапаў у сваім развіцці ад станаўлення ў 20-я гады і інтэнсіўнага развіцця ў 60-80-я гады да крызісу і краху ў канцы 80-х – 90-я гады XX стагоддзя.

## Лекцыя 4 Станаўленне нацыянальнай сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі ў Беларусі

1. Вытокі станаўлення гістарычнай адуацыі ў Беларусі. 2. Развіццё гістарычнай адукацыі ў 20-60-я гады XX ст. 3. Вывучэнне гісторыі БССР развіццё методыкі яе выкладання ў 60-х-80-х гадах XXст. 4 Стварэнне нацыянальнай сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі. 5. Развіццё методыкі выкладання гісторыі ў Рэспубліцы Беларусь

1. Час зараджэння нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі, на нашу думку, можна аднесці да другой паловы X1X – пачатку XX стагоддзя, калі пачалося сістэматычнае навуковае вывучэнне гісторыі Беларусі. Ля яго вытокаў стаялі вядомыя беларускія этнографы, краязнаўцы і гісторыкі П.В. Шэйн, П. Шпілеўскі, М. Любаўскі, М. Доўнар-Запольскі і інш. Менавіта іх даследаванні і шырокае знаёмства з іх вынікамі новага пакалення беларускай інтэлігенцыі стварылі перадумовы для фарміравання нацыянальнай самасвядомасці і ажыццяўлення спробы стварэння нацыянальнай гістарычнай адукацыі.

Пачынальнікам нацыянальнай гістарычнай адукацыі па праву можна лічыць выдатнага вучонага В. Ластоўскага. Менавіта ён стварыў і выдаў спачатку ў газеце “Наша ніва”, а затым асобным выданнем “Кароткую гісторыю Беларусі”. Гэта быў першы сістэматычны нарыс гісторыі Беларусі створаны, па словах А. Грыцкевіча “беларусам і для беларусаў”.

Прадаўжальнікам справы В. Ластоўскага ў галіне стварэння сістэмы нацыянальнай гістарычнай адукацыі стаў вядомы беларускі гісторык і патрыёт Бацькаўшчыны Усевалад Макаравіч Ігнатоўскі. У пачатку 1915 года ён пераехаў з Вільні, дзе працаваў настаўнікам гісторыі ў гімназіі, у Мінск і ўладкаваўся на працу прафесарам Мінскага настаўніцкага інстытута. З восені 1915 года ён пачаў выкладаць спецкурс па гісторыі Беларусі. Змест гэтага спецкурса стаў асновай шырока вядомай яго працы “Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. У гэтай працы зроблена спроба даць марксісцкую інтэрпрэтацыю гісторыі беларускага народа, аднак гэта спроба аказалася не вельмі ўдалай, занадта спрошчанай, а, часам, прымітыўна-нелагічнай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Каштоўным у дапаможніку У.М. Ігнатоўскага з’яўляецца тое, што ён упершыню вызначыў перыядызацыю гісторыі Беларусі, якая і да гэтага часу шырока ўжываецца ў беларускай гістарыяграфіі. Такім чынам, вытокі станаўленне нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі адносяцца да другой паловы XIX - пачатку XX ст, калі пачаліся грунтоўныя навуковыя даследаванні айчыннай гісторыі, якія стварылі перадумовы для паяўлення першых вучэбных дапаможнікаў па айчыннай гісторыі, зроблены першыя практычныя крокі па арганізацыі навучанні гісторыі. Пачынальнікамі нацыянальна гістарычнай адукацыі па праву можна лічыць вядомых гісторыкаў і патрыётаў Бацькаўшчыны Вацлава Ластоўскага і Усевалада Ігнатоўскага,

2. Наступны этап станаўлення гістарычнай адукацыі ў Беларусі пачынаецца з 20-х гадоў XXст., калі пачалася ўсебаковая беларусізацыя грамадства і стварэнне беларускай нацыянальнай школы. Гісторыя, а тым больш гісторыя Беларусі, як самастойны прадмет у 20-я гады ў школе не вывучалася, бо савецкая школа адмовілася ад прадметнага навучання і класна-урочнай сістэмы.

У адпаведнасці з комплекснымі праграмамі навучанне ў школе вялося шляхам вывучэння прыродна-жыццёвых комплексаў. У межах комплексаў вучні знаёміліся з гісторыяй вывучаемай з’явы. Менавіта таму 20-я гады сталі часам росквіту гістарычнага краязнаўства, у аснове якога ляжала даследаванне гісторыі роднага краю. У сярэдзіне 20-х гадоў ў Беларусі ўзнікла і дзейнічала больш за 600 краязнаўчых таварыстваў, выдаваўся краязнаўчы часопіс “Наш край”, які не толькі друкаваў вынікі даследаванняў краязнацаў, але і змяшчаў метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі краязнаўчай работы ў школе. У пачатку 30-х гадоў у сувязі з пачаўшыміся рэпрэсіямі і барацьбой з нацдэмаўшчынай дзейнасць большасці таварыстваў была згорнута, перастаў выходзіць і часопіс “Наш край”, што значна абмежавала магчымасці знаёмства школьнікаў з айчыннай гісторыяй.

Істотны ўклад у развіццё нацыянальнай гістарычнай навукі і гістарычнай адукацыі ў 20-я гады ўнёс выдатны беларускі гісторык М. Доўнар-Запольскі, які ў 1923 годзе вярнуўся на радзіму і пачаў працаваць прафесарам БДУ. Ён падрыхтаваў да выдання вялікую абагульняючую працу “Гісторыя Беларусі”, якая ўяўляла сабой сістэматычнае ізлажэнне гісторыі беларускага народа са старажытнейшых часоў да 20-х гадоў XX стагоддзя, аднак ў сувязі з пачаўшайся барацьбой з нацдэмаўшчынай, яна так і не пабачыла свет, бо рукапіс быў арыштаваны і трапіў у спецсховішча.

У пачатку 30-х гадоў, работа па стварэнню нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі, якая ішла з пачатку XX ст. фактычна была згорнута. Прычынай гэтаму стаў сталінскі курс на паскарэнне сацыялістычнага будаўніцтва праз звышіндустрыялізацыю, калектывізацыю і іх ідэалагічнае забеспячэнне праз культурную рэвалюцыю. Яно суправаджалася звышцэнтралізацыей дзяржаўнай улады, якая была немагчымай ва ўмовах адноснай самастойнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Толькі пасля Вялікай Айчыннавй вайны ў школьных праграмах па гісторыі паяўляюцца спецыяльныя краязнаўчыя ўрокі, што стварыла настаўнікам магчымасць для паведамлення вучням звестак з гісторыі роднага краю і гісторыі Беларусі ў цэлым.

Пераломным момантам у развіцці нацыянальнай гістарычнай адукацыі ў школе стаў XX з'езд КПСС і наступленне перыяду хрушчоўскай "адлігі". Па рашэнню Міністэрства асветы ў школах СССР з 1958 года было ўведзена вывучэнне гісторыі саюзнай рэспублікі. Увядзенне ў школах Беларусі айчыннай гісторыі абумовіла неабходнасць вызначэння парадку яе вывучэння і стварэння першага нацыянальнага падручніка па айчыннай гісторыі. Першая праблема была вырашана Міністэрствам асветы БССР шляхам уключэння ўрокаў і асобных пытанняў па гісторыі Беларусі ў адпаведныя раздзелы і тэмы праграмы па гісторыі СССР са старажытных часоў і да нашых дзён, хаця ў шэрагу прыбалтыйскіх і закаўказскіх рэспублік айчынная гісторыя была вылучана ў самастойны курс, які вывучаўся ў 8 класе. Праблема стварэння нацыянальнага падручніка гісторыі таксама была вырашана проста – конкурс, па яго стварэнню не аб'яўляўся. Міністэрства асветы БССР даручыла гэту справу загадчыку кафедры гісторыі Беларусі БДУ прафесару Л.С. Абэцэдарскаму і дацэнтам М.П. Баранавай і Н.Г. Паўлавай.

У 1959 годзе выйшаў падрыхтаваны гэтымі аўтарамі першы пробны варыянт падручніка, а ў 1960 – другі, перапрацаваны і выпраўлены. Ён быў напісаны ў адпаведнасці з панаваўшымі ў тагачаснай савецкай гістарыяграфіі марксісцкіх пазіцый і склаўшыхся ў расійскіх дарэвалюцыйных і савецкіх гісторыкаў поглядаў на Беларусь, як Паўночна-Заходні край Расійскай імперыі. Уключэнне курса айчыннай гісторыі ў праграмы сярэдняй школы хаця і было фармальным, аднак ўсё ж стварала патэнцыяльныя магчымасці азнаямлення школьнікаў з галоўнымі фактамі па гісторыі беларускага народа, асноўнымі этапамі яго станаўлення і гістарычнага развіцця. Увядзенне вывучэння айчыннай гісторыі паспрыяла назапашванню вопыту стварэння школьных падручнікаў і распрацоўкі пытанняў методыкі яе выкладання, што ў многім дапамагло ў будучым вырашыць праблему навукова-метадычнага забеспячэння выкладання гісторыі пасля абвяшчэння незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

3. Нягледзячы на ўсе недахопы, якія існавалі ў выкладанні гісторыі Беларусі ў 60-х-80-х гадах XX ст. сам факт прызнання неабходнасці яе вывучэння станоўча адбіўся на развіцці нацыянальнай гістарычнай адукацыі і станаўленні методыкі выкладання гісторыі ў Беларусі. Станаўленне айчыннай методыкі выкладання гісторыі правамоцна аднесці да ўвядзення ў школах СССР ў канцы 50-х гадоў гісторыі саюзнаых рэспублік. Менавіта тады паявіўся першы сістэматычны курс гісторыі Беларусі ў школе, першы, афіцыйна прызнаны, падручнік і пачаў ствараццa першы вучэбна-метадычны комплекс яе вывучэння.

Ля вытокаў беларускай методыкі выкладання гісторыі стаялі М.П. Баранава, Н.Г.Паўлава, М.Р. Гнеўка, Р.А. Марачова  М.С. Рыўкін якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

першымі пачалі друкаваць у часопісе “Народная асвета”, метадычныя парады і рэкамендацыі па розных аспектах вывучэння гісторыі Беларусі і тэматычнае планіраванне.

У 1971 годзе паяўляецца першая падрыхаваная ў Беларусі дысертацыя па методыцы выкладання гісторыі, абароненая М.С. Рыўкіным ў Маскве, яна была прысвечана даследаванню аптымальных шляхоў вывучэння гісторыі Беларусі ў курсе гісторыі СССР

Значную ролю ў станаўленні айчыннай методыкі выкладання гісторыі ў 60-я – 80-я гады ў Беларусі выконваў старэйшы навукова-метадычны часопіс “Народная асвета”, які рэгулярна друкаваў на сваіх старонках навукова-метадычныя артыкулы па разнастайных пытаннях выкладання гісторыі Беларусі.

Нягледзячы на рэкамендацыі Міністэрства асветы, намаганні навукоўцаў і часткі настаўнікаў гісторыі, якія рабілі многае для павышэнню эфектыўнасці выкладання гісторыі Беларус, рэальная практыка яе вывучэння была нездавальняючай. Толькі ў 1/3 школ рэспублікі гісторыя Беларусі выкладаецца ў адпаведнасці з праграмамі і рэкамендацыямі Міністэрства асветы, яшчэ ў 1/3 школ – урокі па гісторыі Беларусі не праводзяцца, а толькі запісваюцца ў класным журнале, ў астатніх – нават запісы ў класных журналах аб правядзенні ўрокаў па айчыннай гісторыі не робяцца.

4. Пачаўшаяся ў другой палове 80-х гадоў перабудова і выкліканы ёй крызіс гістарычнай адукацыі абумовіў пошук шляхоў яго пераадолення. Спачатку ў Маскве, а затым і ў саюзных рэспубліках, пачалося стварэнне новай канцэпцыі гістарычнай адукацыі. Восенню 1990 года пры НДІ педагогікі па ініцыятыве Міністэрсва асветы БССР быў створаны часовы творчы навуковы калектыў у складзе: М.В. Біч (кіраўнік), І.І. Багдановіч, Г.А. Космач, А.М. Люты і У.К. Пляшэвіч.

Аналізуючы стан гістарычнай адукацыі ў краіне, аўтары падкрэслілі, што існаваўшая сістэма адукацыі практычна ігнаравала вывучэнне гісторыі Беларусі і вяла да вынішчэння нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Для пераважнай большасці насельніцтва рэспублікі гісторыя сваёй Бацькаўшчыны заставалася невядомай. У аснову вызначэння зместу школьнай гістарычнай адукацыі было прапанавана пакласці прынцыпы дэпартызацыі і дэідэалагізацыі, якія павінны рэалізавацца праз адмову ад ідэалагічных штампаў і догмаў марксісцка-ленінскай метадалогіі, адмову ад выкарыстання гісторыі як інструмента насаджэння ідэалогіі якой-небудзь партыі. Вызначальным прынцыпам адбору зместу гістарычнай адукацыі абвяшчалася гуманізацыя ўсіх школьных курсаў, плюралістычная тэорыя і метадалогія, заснаваная на творчым асэнсаванні і засваенні розных канцэпцый сусветна-гістарычнага працэсу, апрабіраваных часам і вопытам чалавецтва.

Пры вызначэнні структуры школьнага выкладання гісторыі прапаноўвалася кіравацца прынцыпамі адзінства айчыннай і сусветнай гісторыі, канцэнтрызма, шматварыянтнасці праграм навучання і падручнікаў. Новая структура прадугледжвала вывучэнне гісторыі ў двух канцэнтрах:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

першы – 5-9 класы – эмпірычны ўзровень, заснаваны на вывучэнні і засваенні канкрэтных фактаў і першапачатковым іх абагульненні;

другі – 10-11 класы – праблемна-тэарэтычны ўзровень на якім павінны былі закладвацца асновы тэарэтычнага асэнсавання вучнямі заканамернасцей і асаблівасцей сусветна-гістарычнага працэсу.

Напярэдадні распада СССР канцэпцыя была прынята калегіей Міністэрства асветы БССР і 30 лістапада 1991 года апублікавана ў “Настаўніцкай газеце”. З новага 1992/93 навучальнага года пачалося яе ажыццяўленне. У сціслыя тэрміны былі падрыхтаваны першыя варыянты школьных праграм, змест курсаў друкаваўся ў перыядычным друку напярэдадні правядзення адпаведных ўрокаў, бо новых падручнікаў не было, а старыя поўнасцю не адпавядалі новаму зместу гістарычнай адукацыі і не маглі быць выкарыстанымі.

У 1993-1995гг. ў аўтарскай рэдакцыі выдадзены першыя, пазбаўленыя метадычнага апарата засваення і арганізацыі самастойнай працы, вучэбныя дапаможнікі, якія былі вельмі недасканалымі і складанымі для разумення школьнікамі і, ў значнай ступені, ўяўлялі сабой канспект лекцый аўтараў, якія яны чыталі для студэнтаў вну.

Выданне другога пакалення вучэбных дапаможнікаў ажыццяўлялася ў 1997-2000 гг. Гэтыя дапаможнікі былі ў большай ступені адапціраваны да ўзроставых асаблівасцей і пазнавальных здольнасцей школьнікаў і мелі значна больш дасканалы метадычны апарат, які дазваляў настаўнікам паспяхова выкарыстоўваць іх для арганізацыі самастойнай пазнавальнай дзейнасці вучняў на ўроках гісторыі і дома. Паралельна з выданнем гэтага пакалення вучэбных дапаможнікаў працягвалася работа па стварэнню і апрабацыі трэцяга пакалення дапаможнікаў, якія пачалі выдавацца ў сувязі з пераходам на 12-ці гадовы тэрмін навучання у сярэдняй школе з 2002 года. Гэтыя дапаможнікі якасна адрозніваліся ад папярэдніх навукова-метадычным узроўнем іх распрацоўкі, ступенню апрабацыі, што наблізіла іх да набыцця статуса падручнікаў.

5. Абвяшчэнне суверэнітэту Рэспублікі Беларусь дало штуршок развіццю гісторыка-метадычнай думкі ў Беларусі. Пытанні метадалогіі, тэорыі і методыкі выкладання гісторыі актыўна распрацоўваюцца беларускімі вучонымі-гісторыкамі, метадыстамі і творча працуючымі настаўнікамі. Усяго за дзесяціГоддзе былі створаны дзесяткі вучэбных дапаможнікаў, хрэстаматый, рабочых сшыткаў, карт, атласаў для вучняў, метадычных дапаможнікаў для настаўнікаў.

У пачатку 90-х гадоў у МДПІ імя М. Горкага была створвна першая ў рэспубліцы кафедра дапаможных гістарычных і методыкі выкладання гісторыі, якая занялася даследаваннем праблемы рэалізацыі дзейнаснага падыходу ў навучанні гісторыі. Пры кафедры пачала працаваць аспірантура), што паспрыяла станаўленню айчыннай метадычнай школы. У канцы ХХ – пачатку ХХ1ст. у спецыялізаваным савеце па абароне дысертацый створаным пры БДПУ ім. М. Танка абаранілі першыя ў суверэннай Беларусі кандыдацкія

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

дысертацыі па тэорыі і методыцы выкладання гісторыі С.В. Паноў, В.В. Гінчук, М.А. Краснова, А.А. Карзюк, А.В. Лізунова.

Нягледзячы на гістарычна кароткі шлях, які прайшла гістарычная адукацыі і методыка выкладання гісторыі ў Беларусі, можна канстатаваць, што ў нашай краіне склалася арыгінальная нацыянальная сістэма школьнай гістарычнай адукацыі, створана ўласная метадычная школа падрыхтоўкі і выдання падручнікаў, якая не ўступае па свайму ўзроўню і якасці лепшым еўрапейскім узорам, фарміруецца нацыянальная навуковая школа даследаванняў у галіне тэорыі і методыкі навучання гісторыі.

### Лекцыя 5 Стан сучаснай гістарычнай адукацыі за мяжой

1. Мэты і задачы вывучэння гісторыі ў школе. 2. Асаблівасці паслядоўнасці вывучэння гісторыі і метадалагічных прынцыпаў адбору зместу гістарычнай адукацыі ў розных краінах свету. 3. Сучасны стан развіцця дыдактыкі гісторыі ў розных еўрапейскіх краінах і ЗША. 4. Інавацыйныя тэхналогіі выкладання гісторыі ў школе і іх выкарыстанне ў розных краінах свету.

1. Абумоўленасць мэт і задач навучання гісторыі ў розных краінах свету: амерыкацэнтрызм ў ЗША; прыярытэт задач вывучэння нацыянальнай гісторыі ў шэрагу краін Еўропы, Кітаі, некаторых краінах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Асаблівасці вывучэння гісторыі ў постсавецкіх краінах, суадносіны нацыянальнай і сусветнай гісторыі ў змесце гістарычнай адукацыі ў постсавецкіх краінах. 2. Асаблівасці паслядоўнасці вывучэння гісторыі і метадалагічных прынцыпаў адбору зместу гістарычнай адукацыі ў розных краінах свету: канцэнтрызм як аснова пабудовы школьных курсаў гісторыі ў большасці краін свету, яго перавагі перад лінейнасцю і недахопы. 3. Сучасны стан развіцця дыдактыкі гісторыі ў розных еўрапейскіх краінах і ЗША: пераход да асобасна-арыентаванага падыходу да вывучэння гісторыі; ключавыя кампетэнцыі і іх роля ў сацыялізацыі асобы школьніка. 4. Інавацыйныя тэхналогіі выкладання гісторыі ў школе і іх выкарыстанне ў розных краінах свету (модульныя тэхналогіі, праграміраванае навучанне, праектныя тэхналогіі, як сродак фарміравання інфармацыйна-камунікатыўных кампетэнцый асобы шшкольніка).

### Лекцыя 6. Мэты, задачы і структура гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь

1.Задачы навучання гісторыі. 2. Структура школьнай гістарычнай адукацыі. 3. Навукова-метадычныя прынцыпы адбору зместу гістарычнай адукацыі і стварэння школьных праграм па гісторыі.

1. Асноўныя задачы школьнай адукацыі, у тым ліку, навучання гісторыі вызначаюцца запатрабаваннямі грамадства, якія сфармуліраваны ў адпаведных дзяржаўных дакументах: адукацыйных стандартах і вучэбных праграмах. У школах нашай краіны вывучэнне гісторыі накіравана на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

станаўленне асобы школьніка, якая ўсведамляе прыярытэт фундаментальных агульначалавечых каштоўнасцей, садзейнічае захаванню і развіццю культурна-гістарычнай спадчыны і свядома арыентуецца ў сучасным грамадскім жыцці.

*Мэтамі* гістарычнай адукацыі з’яўляюцца: - авалоданне вучнямі сістэматызаванымі ведамі аб сусветным гістарычным працэсе і фарміраванне ўяўленняў аб месце ў ім гісторыі Беларусі, далучэнне вучняў да дасягненняў айчыннай і сусветнай культуры; вывучэнне айчыннай гісторыі ў кантэкаце ўсходнеславянскай, агульнаеўрапейскай і сусветнай гісторыі і на гэтай аснове засваенне сацыяльнага, духоўнага, маральнага вопыту чалавецтва, асноўных тэндэнцый і заканамернасцей развіцця грамадства, асаблівасцей развіцця асобных краін, цывілізацый і рэгіёнаў; развіццё гістарычнага мышлення і выхаванне ў вучняў грамадзянскасці, патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці.

Зыходзячы з вызначаных мэт задачамі гістарычнай адукацыі з’яўляюцца: засваенне вучнямі асноўных факталагічных і тэарэтычных ведаў аб важнейшых падзеях, з’явах, працэсах, тэндэнцыях і заканамернасцях развіцця грамадства, аб асаблівасцях развіцця асобных краін, цывілізацый і рэгіёнаў азнаямленне з жыццём і дзейнасцю, духоўнай спадчынай знакамітых дзеячоў гісторыі, навукі і культуры; асэнсаванне своеасаблівасці культур народаў свету і самабытнасці культуры беларускага народа; усведамленне вучнямі своеасаблівасці гістарычнага шляху беларускага народа, выхаванне пачуцця адказнасці за будучыню сваёй краіны; фарміраванне інтэлектуальных якасцей асобы, неабходных для пераўтваральнай і творчай пазнавальнай дзейнасці.

Шматграннасць вызначаных дзяржавай задач гістарычнай адукацыі патрабуе комплекснага іх вырашэння ў працэсе навучання гісторыі. Багацце і насычанасць зместу гісторыі як прадмета школьнага навучання, адлюстраванне ў ёй усіх бакоў грамадскага жыцця: эканомікі, палітыкі, сацыяльных адносін, стану развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры, а таксама шырокімі магчымасцямі для навучання, выхавання і развіцця асобы школьніка стварае патэнцыяльныя магчымасці для іх паспяховага вырашэння ў навучанні гісторыі.

Такім чынам можна вызначыць таксанамію (іерархію) рэалізацыі задач навучання гісторыі: 1) агульныя мэты і задачы, вызначаемые грамадствам ў асобе дзяржавы, 2) мэта і задачы навучання канкрэтнаму курсу гісторыі, якія вызначаюцца аўтарамі праграм і падручнікаў гісторыі, 3) мэты і задачы вывучэння асобных раздзелаў і тэм, якія фармуліруюцца настаўнікам ў працэсе складання тэматычнага планавання; 4) мэта і задачы канкрэтнага ўрока, якія вызначаюцца у працэсе падрыхтоўкі настаўніка да канкрэтнага ўрока.

3. Пабудову і змест гістарычнай адукацыі вызначае вучэбная праграма. Вучэбная праграма гэта дзяржаўны дакумент, абавязковы для выканання

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўсімі настаўнікамі ва ўсіх тыпах школ. Ён забяспечвае рэалізацыю вызначанага дзяржавай стандарту гістарычнай адукацыі, яе задачы, змест і паслядоўнасць вывучэння гісторыі ў школе. Пры адборы зместу гістарычнай адукацыі і складанні школьных праграм па гісторыі іх аўтары кіруюцца шэрагам навукова-метадычных прынцыпаў, распрацаваных педагогікай, метадалогіяй гістарычнай навукі і методыкай выкладання гісторыі.

Перш за ўсё гэта агульнадыдактычныя прынцыпы – навуковасць, сістэматычнасць і паслядоўнасць, адзінства адукацыйных, выхаваўчых і развіваючых функцый навучання, даступнасць, ўлік узроставых асаблівасцей вучняўі і іншыя. Не менш важным для складальнікаў праграм з’яўляецца ўлік метадалагічных *прынцыпаў* гістарычнага пазнання: 1) аб’ектыўнасці, якая дасягаецца выкарыстаннем шырокага кола крыніц і рэалізацыяй унутрыпрадметных і міжпрадметных сувязей; 2) гістарызму – разгляду гістарычнай падзеі ў развіцці, з выясненнем яе вытокаў, прычын, асноўных этапаў развіцця, наступстваў і ўплыву на ход гістарычнага працэсу; 3) сістэмнасці – выяўленне структурных элементаў вывучаемага факта як сістэмы з яе унутранымі і знешнімі сувязямі; 4) каштоўнаснага падыходу – выяўлення ролі і значэння вывучаемых фактаў для грамадскага развіцця і выбар для вывучэння з гістарычнага вопыту фактаў і з’яў, якія будуць карыснымі для вырашэння многіх праблем сучаснага грамадскага развіцця.

Адной з найважнейшых праблем для складальнікаў праграм і аўтараў школьных падручнікаў з’яўляецца выбар метадалагічнай парадыгмы, або вызначэння метадалагічных падыходаў да раскрыцця сэнсу гісторыі. Кожны з іх вызначае тое, што бярэцца за аснову развіцця гістарычнага працэсу і фарміравання светапогляду навучэнцаў. Такіх падыходаў у метадалогіі гісторыі шмат: 1) *фармацыйны,* які ў якасці асновы развіцця гістарычнага працэса бачыць змену грамадска-эканамічных фармацый; 2) цывілізацыйны, які прадстаўляе гістарычны працэс, як развіццё ўзаемазвязаных лакальных, рэгіянальных і сусветнай цывілізацый; 3) *культуралагічны* – разглядае гісторыю, як працэс дасягнення прагрэсіўнага развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры; 4) *антрапалагічны* – аснову грамадскага развіцця як вынік волі і жыццядзейнасці людзей, 5) *каштоўнасны (аксіялагічны)*, які дазваляе разглядаць вызначаную сувязь фактаў у эвалюцыйным працэсе іх значымасці для чалавецтва, зразумець грамадскае развіццё, як мяняючуюся сістэму каштоўнасцей і г.д.

Аўтарам вучэбных дапаможнікаў і складальнікам школьных праграм прыходзіцца ўлічваць таксама *метадычныя прынцыпы*, якія адлюстроўваюць асаблівасці зместу гісторыі, як школьнага прадмета, і парадак яе вывучэння, які вызначаецца з улікам узроставых асаблівасцей на розных ступенях агульнай сярэдняй адуацыі. Да ліку іх адносяцца:

1) прынцып *лінейнасці*, які прадугледжвае аднаразавае вывучэнне ў школе зместу гістарычнай адукацыі ў храналагічнай паслядоўнасці са старажытнейшых часоў да нашых дзён. Такое вывучэнне больш эканомнае па затратах вучэбнага часу, але пры яго ажыццяўленні засваенне гістарычных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ведаў па старажытнай гісторыі і гісторыі сярэднявякоўя застаецца пераважна на эмпірычным узроўні пазнання;

2) прынцып *канцэнтрызму* прадугледжвае шматкратнае вывучэнне аднаго і таго перыяду гісторыі на розных ступенях агульнай сярэдняй адукацыі і розных узроўнях яго абагульнення: элементарным, эмпірычным і тэарэтычным. якія адпавядаюць ступеням структуры школьнай адукацыі (пачатковая, базавая і сярэдняя школа).

3) прынцып *сінхроннасці* прадугледжвае паралельнае, а часам і аб’яднанае вывучэння аднароднага вучэбнага матэрыялу, ці адпаведнага перыяду гісторыі ў курсах айчыннай і сусветнай гісторыі; 4) прынцып *узаемасувязі айчыннай і сусветнай гісторыі* рэалізацыя якога дазваляе эфектыўна ажыцяўляць міжкурсавыя і унутрыпрадметныя сувязі і шырока абапірацца на веды атрыманыя пры вывучэнні айчыннай гісторыі ў курсе сусветнай і наадварот.

Такім чынам, распрацоўка і складанне вучэбных праграм гэта складаны працэс звязаны з неабходнасцю ўлічваць, распрацаваныя навукай дыдактычныч, метадалагічныя і метадычныя прынцыпы. Улік пералічаных навуковых прынцыпаў дазваляе не толькі навукова абгрунтавана вызначыць задачы навучання гісторыі, але і ажыццявіць аптымальны адбор яе зместу, вызначыць яго аб’ём і парадак вывучэння ў школе.

## Лекцыя 7. Агульная характарыстыка зместу і асаблівасцей выкладання асобных курсаў гісторыі ў школе

1. Характарыстыка дзеючых праграм па гісторыі. 2. Характарыстыка зместу і асаблівасці вывучэння асобных курсаў гісторыі ў школе.

Дзеючыя праграмы “Усеагульная гісторыя. Гісторыя Беларусі. V – XI класы” уведзены ў навучання гісторыі з 2008/2009 вучэбнага года. Яны адпавядаюць Дзяржаўнаму адукацыйнаму стандарту, але носяць часовы характар. Гэта абумоўлена вяртаннем да адзінаццацігадовай сярэдняй адукацыі і лінейнага прынцыпу вывучэння гісторыі ў школе. Дзеючая праграма па гісторыі складзена з улікам разгледжаных на папярэдняй лекцыі метадалагічных і дыдактыка-метадычных прынцыпаў.

У яе структуру ўваходзяць: тлумачальная запіска і змест гістарычнай адукацыі па сусветнай і айчыннай гісторыі па гадах навучання, з разбіўкай яго на раздзелы і тэмы. Па кожнаму раздзелу гісторыі прыводзяцца асноўныя паняцці, абавязковыя для засваення школьнікамі. У праграмах дастаткова падрабязна вызначаны дзейнасны кампанент школьнай гістарычнай адукацыі па кожнаму году навучання і даецца пералік спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці і ўменняў, якімі павінны авалодаць вучні ў канцы кожнага навучальнага года.

2. Задачы, структура і асаблівасці выкладання гісторыі старажытнага свету. Курс гісторыі старажытнага свету вывучаецца ў 5 класе. Веды аб гісторыі першабытнага грамадства грунтуюцца пераважна на археалагічных артэфактах і гістарычнай этнаграфіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У першым раздзеле “Жыццё першабытных людзей” у вучняў фарміруюцца першапачатковыя ўяўленні і паняцці аб першабытных збіральніках і паляўнічых.

Другі раздзел прысвечаны вывучэнню цывілізацый Старажытнага Усходу і Амерыкі: Міжрэчча, Егіпта, Індыі, Кітая, а таксама персідскай, хетскай, фінікійскай і старажытнаяўрэйскай дзяржаў.

Трэці раздзел прысвечаны гісторыі старажытнай Грэцыі. Яго вывучэнне пачынаецца са знаёмства вучняў з прыродай, заняткамі, рэлігіей, паўсядзённага жыцця і быту старажытных грэкаў.

У чацвертым раздзеле разглядаецца гісторыя Рыма. Пры яго вывучэнні ў поўным аб’еме рэалізуецца храналагічны прынцып вывучэння гісторыі: разглядаюцца і выразна акрэсліваюцца асноўныя перыяды гісторыі Рыма: царскі, усталяванне рэспублікі і яе росквіт, імператарскі Рым, яго магутнасць, заняпад і падзенне. Вывучэнне гісторыі старажытнага свету завяршаецца разглядам невялікага пятага раздзела, прысвечанага старажытным кельтам, германцам і славянам, іх паходжанню і рассяленню, узаемаадносінам з Рымам, грамадскаму ладу, рэлігійным вераванням і культурным дасягненням.

Аналіз зместу гісторыі старажытнага свету дазваляе сфармуліраваць задачы яго вывучэнні:

- фарміраванне першапачатковых уяўленняў і паняццяў аб гісторыі першабытнага грамадства, складванні перадумоў узнікнення першых цывілізацый, іх дасягненнях у галіне матэрыяльнай і духоўнай культуры, прычынах заняпаду і іх гібелі;

- развіццё ўменняў элементарна аналізаваць прычынна-выніковыя сувязі, вызначаць працягласць і паслядоўнасць гістарычных падзей, месцазнаходжанне аб’ектаў на гістарычнай карце, рыхтаваць вусныя паведамленні аб гістарычных падзеях і асобах, тлумачыць значэнне гістарычных паняццяў;

- на аснове вобразнага вывучэння канкрэтных гістарычных фактаў і асоб фарміраваць ў вучняў эмацыянальныя адносіны да іх, патрыятычныя, інтэрнацыянальныя, маральныя і эстэтычныя пачуцці і погляды. Задачы, пабудова і асаблівасці вывучэння гісторыі сярэдніх вякоў. Курс гісторыі сярэдніх вякоў вывучаецца ў 6-7 класах. У 6-м класе вывучаецца перыяд ранняга і высокага , а ў 7-м – позняга сярэдневякоўя. Пры вывучэнні гісторыі сярэдніх вякоў настаўнік павінен сканцэнтраваць увагу на вырашэнні наступных задач:

- фарміраванне сістэмы паняццяў, ствараючых цэласную карціну аб развіцці цывілізацый сярэдявякоўя, агульным і адметным у іх сацыяльным, эканамічным і духоўным развіцці;

- падвядзенне вучняў да разумення ролі працы, спосабаў яе арганізацыі і ўдасканалення тэхнікі ў пастулальным развіцці грамадства ў сярэднія вякі; асаблівасцей сацыяльнай структуры феадальнага грамадства, ўзаемаадносін паміж living рознымі сацыяльнымі групамі, дзяржаўнага ладу на разных ступенях гісторыі сярэднявякоўя; ролі рэлігіі і царквы ў сацыяльным і духоўным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

жыцці, яе уплыву на культуру, побыт, звычаі, традыцыі і сістэму каштоўнасцей розных народаў;

- вызначаць храналогію падзей, складаць храналагічныя табліцы, лакалізаваць гістарычныя падзеі на карце; параўноваць падзеі па зададзеных настаўнікам крытэрыях; тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі; аналізаваць гістарычныя падзеі і рабіць абагульненні; тлумачыць сутнасць гістарычных паняццяў;

- на аснове эмацыяльнага і вобразнага вывучэння канкрэтных фактаў садзейнічаць выхаванню асобы школьнікаў, яе грамадзянскіх, маральных і эстэтычных якасцей, а таксама фарміраванню павагі да культурнай і гістарычнай спадчыны розных народаў і цывілізацый.

Задачы, пабудова і асаблівасці вывучэння сусветнай гісторыі новага часу. Сусветная гісторыя новага часу вывучаецца ў 8-9 класах.

У восьмым класе вывучаецца першы перыяд новай гісторыі. Храналыгічна ён ахоплівае асноўныя падзеі сусветнай гісторыі ад пачатку Вялікіх геаграфічных адкрыццяў і Рэфармацыі ў Еўропе да Вялікай Французскай рэвалюцыі ўключна.

Кароткі агляд зместу новай гісторыі дазваляе вызначыць асноўныя задачы яе вывучэння:

- засваенне сутнасці важнейшых падзей гісторыі еўрапейскай цывілізацыі, яе ўплыву на развіццё іншых цывілізацый і народаў свету, вытокаў і развіцця паўночна- і лацінаамерыканскай цывілізацый, асаблівасцей гістарычнага шляху Расіі.

- фарміраванне ў вучняў разумення шматварыянтнасці і разнастайнасці шляхоў гістарычнага развіцця розных народаў і цывілізацый, асаблівага і агульнага ў іх культурах, сістэмах каштоўнасцей.

Асаблівасці вывучэння. змест, пабудова і задачы курса сусветнай гісторыі навейшага часу. Вывучэнне сусветнай гісторыі навейшага часу адбываецца на трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі ў X – XI класах і завяршае сістэматычнае вывучэнне гісторыі ў школе.

У структуры курса вылучаюцца два перыяды: першы, ад заканчэння першай сусветнай да канца другой сусветнай вайны (1918 – 1945 гг.), вывучаецца ў дзясятым класе, другі – ахоплівае час ад заканчэння другой сусветнай вайны да нашых дзён і вывучаецца ў адзінадцатым класе.

Аналіз зместу сусветнай гісторыі навейшага часу дазваляе сфармуліраваць асноўныя задачы яе вывучэння:

- засвоіць змены, якія адбыліся на палітычнай карце свету ў XX – пачатку XXI стагоддзя і падзеі абумовіўшыя іх;

- на аснове засваення асноўных фактаў навейшай гісторыі, жыцця і дзейнасці знакамітых гістарычных асоб садзейнічаць фарміраванню ў вучняў уласных поглядаў і перакананняў, асабістых адносін і ацэнак да вывучаемага на ўроку гістарычнага матэрыялу.

- авалодаць спосабамі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, неабходнымі для самастойнага пошуку і выкарыстання гістарычнай інфармацыі для вырашэння практычных задач:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Задачы, структура і змест школьнага курса гісторыі Беларусі. Гісторыя Беларусі вывучаецца на працягу шасці гадоў з VI па XI клвсы. На яе вывучэнне адводзіцца амаль палова вучэбнага часу вызначанага на вывучэнне гісторыі ў школе.

Асноўнымі задачамі вывучэння айчыннай гісторыі з'яўляюцца:

- засваенне вучнямі важнейшых дат, гістарычных дзеячаў, падзей, з'яў, працэсаў і заканамернасцей, якія складаюць змест айчыннай гісторыі і ўсведамленне на гэтай аснове непаўторнасці гістарычнага шляху беларускага народа на розных этапах яго гісторыі ад першабытнага грамадства да нашых дзён, укладу беларускага народу ў скарбонку сусветнай навукі, адукацыі і мастацкай культуры;

- развіццё гістарычнага мышлення вучняў праз фарміраванне ўменняў параўноўваць і сінхранізаваць падзеі вывучаемыя ў курсах айчыннай і сусветнай гісторыі, вызначаць агульнае і адметнае, асаблівае, што характэрызуе гісторыю беларускага народа;

- садзейнічаць нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, адраджэнню нацыянальнай самасвядомасці, нацыянальнай годнасці і гонару, выхаванню чалавека-грамадзяніна, сапраўднага гаспадара на сваёй зямлі, адказнага за вынікі сваёй дзейнасці перад сучаснікамі і нашчадкамі.

Асаблівасцю вывучэння гісторыі Беларусі з'ўляецца тое, што больш раннія яе перыяды разглядюцца ў 6-7 класах, дзе пераважае канкрэтна-вобразнае, эмпірычнае навучанне, якое не дазваляе глыбока асэнсаваць і засвоіць гісторыю старажытнай і сярэдневяковай Беларусі.

**Лекцыя 8. Структура гістарычных ведаў школьнікаў.**

1. Структура гістарычных ведаў школьнікаў. 2. Функцыі гістарычных ведаў у фарміраванні асобы школьніка. 3. Структурныя кампаненты гістарычных ведаў і іх характарыстыка.

1. Фарміраванне светапогляду школьнікаў адбываецца ў працэсе вывучэння розных прадметаў. Веды, атрыманыя пры вывучэнні прыродазнаўчых дысцыплін, дазваляюць сфарміраваць у вучняў навуковую карціну развіцця прыроды, пазнаць асноўныя законы яе развіцця, убачыць іх выкарыстання ў практычнай дзейнасці людзей. Вывучэнне гуманітарных прадметаў стварае магчымасць атрымаць навуковыя звесткі аб развіцці грамадства, аб формах узаемаадносін людзей на розных этапах развіцця чалавечай супольнасці, яе дасягненнях у развіцці матэрыяльнай і духоўнай культуры. Важнейшае месца сярод гуманітарных навук займае гісторыя. Галоўны элемент зместу гістарычнай адукацыі – веды. Гістарычныя веды ўвасабляюць сацыяльны вопыт чалавецтва.

2. Атрыманыя ў працэсе навучання гісторыі веды выконваюць шэраг важных для фарміравання падрастаючага пакалення функцый. Яны дазваляюць: а) стварыць у вучняў выразныя ўяўленні аб гістарычнай рэчаіснасці; б) сфарміраваць навуковую карціну развіцця чалавечага грамадства; в) авалодаць арыентыровачнай асновай пазнання эканамічных,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сацыяльных і культурных працэсаў, якія характэрныя для грамадскага развіцця мінулага і сучаснасці; г) выклікаць асабістыя пачуцці і эмацыянальныя адносіны да гістарычных фактаў, з'яў і ўдзельнікаў гістарычных падзей; д) авалодаць неабходнымі для самастойнага пазнання гісторыі спосабамі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, элементарнымі ўменнямі і навыкамі гістарычнага пазнання, неабходнымі для практычнага выкарыстання гістарычнай інфармацыі.

У аснове навучання гісторыі ляжыць пазнанне, засваенне і ўсведамленне сутнасці гістарычнага факта. рэчаіснасці.

У метадычнай літаратуры існуюць розныя падыходы да групіроўкі гістарычных фактаў. Найбольш прадуктыўнай, на наш погляд, з'яўляецца групіроўка фактаў, прапанаваная Г.М. Данскім. Ён вылучыў тры групы фактаў: 1) падзеі – адзінкавыя, непаўтараючыяся факты, 2) з'явы – шматкратна паўтараючыяся, аналагічныя факты, 3) працэсы – ланцужкі ўзаемазвязаных у часе, прычынамі і вынікамі фактаў.

3. Усе гістарычныя падзеі адбываюцца ў прасторы і часе. Лакалізацыя фактаў ў часе патрабуе ад вучняў ведання храналогіі, а лакалізацыя ў прасторы – ведання гістарычнацй геаграфіі. Падзеі, храналогія, гістарычная геаграфія пазнаюцца праз канкрэтныя, эмацыянальныя вобразы і складаюць першы кампанент структуры гістарычных ведаў – гістарычныя ўяўленні. Ад стварэння вобразаў аб гістарычных фактаў вучні пераходзяць да пазнання іх унутранай сутнасці і ўсталявання ўзаемасувязі паміж імі. Сутнасць гістарычных фактаў адлюстроўваюць паняцці, якія ўключаюць унутраныя, абагульненыя, істотныя прыкметы і ўзаемасувязі паміж фактамі і вызначаюць іх родавыя і відавыя адрозненні. Тлумачэнне сутнасці гістарычных фактаў і гістарычных працэсаў ажыццяўляецца праз сістэму паняццяў і фарміраванне разумення заканамернасцей гістарычнага развіцця, якія і складаюць трэці кампанент гістарычных ведаў.

Фарміраванне гістарычных паняццяў і заканамернасцей ажыццяўляецца на аснове выкарыстання метадалогіі гістарычнага пазнання. Метадалогія гісторыі выконвае вызначальную ролю ў фарміраванні ў школьнікаў спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці. Такім чынам, авалоданне, спосабамі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці з гістарычным матэрыялам складаюць чацвёрты кампанент структуры гістарычных ведаў.

**Лекцыя 9 -10. Методыка фарміравання гістарычных уяўленняў (4г.)**

1. Месца і роля гістарычных уяўленняў у фарміраванні гістарычных ведаў.2. Метадычныя прыемы, сродкі і шляхі фарміравання гістарычных уяўленняў. 3. Лакалізацыя гістарычных фактаў часе. Методыка работы з храналогіей. 4. Лакалізацыя гістарычных падзей у прасторы. Методыка работы з гістарычнай картай.

1. Гістарычныя ўяўленні гэта адлюстраванне ў свядомасці чалавека знешніх прыкмет, карцін і вобразаў гістарычных фактаў, месце і часе, ў якім яны адбываліся. Змест гістарычнага факта пазнаецца праз стварэнне вобраза

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

аб ім, які узнаўляецца пачуццямі вучня (з дапамогай зроку – праз успрыймання яго нагляднага вобраза і з дапамогай слыху – праз апісанне факта вусным словам настаўніка). рассялення народаў.

Менавіта са стварэння гістарычных уяўленняў пачынаецца пазнанне гісторыі. Без іх фарміравання не магчыма раскрыць сутнасць гістарычных паняццяў, якія з’яўляюцца вынікам аналізу і абагульнення вобразаў гістарычных фактаў і ўсведамлення істотных сувязей паміж імі. Гістарычныя ўяўленні заўсёды суб’ектыўныя, бо залежаць ад асаблівасцей развіцця органаў пачуццяў чалавека, ступені вобразнасці яго мышлення. Вобразы гістарычных падзей, узнікшыя ў свядомасці школьнікаў, з’яўляюцца важнейшым сродкам захавання ў памяці гістарычнай інфармацыі. У пэўным сэнсе гістарычныя ўяўленні з’яўляюцца кодам захавання гістарычных ведаў ў памяці. Больш за тое, большасць гістарычных ведаў захоўваецца ў памяці чалавека ў выглядзе ўяўленняў, а пры іх ўзнаўленні спачатку ўзнікаюць гістарычныя ўяўленні, а затым аднаўляюцца паняцці і гістарычныя заканамернасці, сфарміраваныя на іх аснове. Таму ад якасці фарміравання гістарычных уяўленняў у многім залежыць якасць засваення гістарычных ведаў у цэлым.

2. Найбольш эканомным спосабам рэканструкцыі вобразаў гістарычных фактаў з’яўляецца выкарыстанне розных відаў нагляднасці: прадметнай (сапраўдныя прадметы гістарычнай рэчаіснасці, музейныя экспанаты, помнікі архітэктуры і мастацтва), выяўленчай (вучэбныя карціны, малюнкі, ілюстрацыі падручніка, кіна і фотадакументы, дыяпазітывы, слайды і г.д.), ўмоўна-графічнай (карты, схемы, аплікацыі, крэйдавыя малюнкі і г.д.). Менавіта нагляднасць у спалучэнні з вусным словам дазваляе настаўніку з найбольшай ступенню аб’ектыўнасці рэканструіраваць гістарычнае мінулае і з найменьшымі затратамі часу сфарміраваць у вучняў аб’ектыўныя і выразныя гістарычныя ўяўленні.

3. Ф. Энгельс пісаў “... быціе па за часам такая ж найвялікшая бязглуздзіца, як быціе па за прасторай”. Лакалізацыя гістарычных фактаў у часе і прасторы – абавязковая, хаця і не адзіная ўмова ўсведамлення школьнікамі асобных фактаў, як звенняў гістарычных працэсаў, адбываўшыхся у пэўны час на пэўнай тэрыторыі ў адпаведным гісторыка-геаграфічным асяроддзі.

Асноўная задача вывучэння храналогіі – усталяванне часавых адносін паміж вывучаемымі гістарычнымі фактамі, стварэнне апоры свядомага засваення школьнікамі сістэмы гістарычных ведаў у цэлым. Храналогію не выпадкова лічаць касцяком гістарычных ведаў. Яна з’яўляецца асновай усведамлення паслядоўнасці, працягласці і сінхроннасці гістарычных падзей і працэсаў, якія адбываліся ў адной або некалькіх краінах.

Значэнне вывучэння храналогіі ў тым, што яна дапамагае вызначыць і ўсвядоміць: а) месца вывучаемага факта, падзеі ці працэса ў гістарычным часе; б) часавыя сувязі і прычыннасць гістарычных з’яў; в) перыядызацыю гісторыі і адметныя рысы кожнага гістарычнага перыяду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Фарміраванне храналагічных ведаў пачынаецца са стварэння ў вучняў ўяўленняў аб гістарычным часе.

Знаёмства з каляндарамі і лікам гадоў у гісторыі адбываецца на спецыяльна адведзеным для гэтага ў пачатку вывучэння гісторыі старажытнага свету ўроку. На ім адбываецца знаёмства з календарамі і лікам гадоў у гісторыі. Наглядна і вобразна ўявіць такую складаную з'яву, як лік гадоў у гісторыі дапамагае выкарыстанне стужкі часу, змешчанай у падручніку ці намаляванай настаўнікам на класнай дошцы. Выкарыстанне стужкі часу для рашэння храналагічных задач на паследуючых уроках замацоўвае ў вучняў уменне карыстацца лікам гадоў у гісторыі, вызначаць працягласць гістарычных падзей да нашай эры і на рубяжы эр.

Метадычныя прыёмы і сродкі вывучэння храналогіі самыя разнастайныя. Іх можна падзяліць на тры вялікія групы. Да першай адносяцца прыёмы свядомага засваення храналагічных дат. Акрамя выкарыстання стужкі часу да гэтай групы прыёмаў адносяцца: а) фіксацыя ўвагі школьнікаў на датах з дапамогай інтанацыі, запісу даты на дошцы і ў сшытках, яе падкрэсліваннем, заключэннем у рамку, фіксацыяй ўвагі вучняў на неабходнасці і важнасці яе засваення; б) усталяваннем лагічнай сувязі даты з векам, дзесяцігоддзем, чвэрцю ці паловай стагоддзя, з жыццём і дзейнасцю гістарычнай асобы; в) складанне каляндара гістарычных падзей, які ўключае ў сябе пералік дат і асноўных падзей вывучаемых у курсе гісторыі, размешчаных у храналагічнай паслядоўнасці.

Другую групу складаюць прыёмы лагічнага засваення дат у сувязі з асноўнымі этапамі развіцця гістарычных працэсаў і з'яў: а) рашэнне храналагічных задач на ўсталяванне працягласці і паслядоўнасці гістарычных падзей; б) вылучэнне этапаў ў развіцці гістарычных працэсаў і з'яў з вылучэннем характэрных прыкмет кожнага этапа; в) складанне храналагічных комплексаў, якія ўключаюць усе даты звязаныя з развіццём гістарычнага працэса і г.д.

Трэцюю групу складаюць прыёмы, якія дазваляюць сфарміраваць уяўленні аб перыядызацыі гісторыі: а) складанне абагульняючых сінхранічных табліц, якія адлюстроўваюць адначасовасць падзей з гісторыі розных краін, або гістарычныя з'явы, якія адносяцца да розных бакоў грамадскага жыцця; б) устанаўленне храналагічных рамак асноўных перыядаў у развіцці грамадства, вызначэнне падперыядаў ў межах кожнага перыяду(перыяд сярэднявечча і падперыяды: ранняе, высокае і позняе сярэднявечча) і г.д.

4. Гістарычныя падзеі адбываюцца не толькі ў часе, але і ў прасторы. Стварэнне ўяўленняў аб прасторы, дзе адбывалася гістарычная падзея важнае, бо "... не змешчаныя ў часе і прасторы яны ўяўляюцца нам пустой абстракцыей, пазбаўленай рэальнага зместу і не адлюстроўваючай гістарычную рэчаіснасць"

Лакалізацыя гістарычных падзей у асноўным вывучаецца з дапамогай карты. Таму, каб стварыць у школьнікаў лакальныя ўяўленні, трэба навучыць іх карыстацца гістарычнай картай. А.А. Вагін вылучыў тры асноўныя віды

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гістарычных карт: 1) агульныя, 2) аглядныя, 3) тэматычны., Мэтазгодным, на наш погляд, з'яўляецца вылучэнне чацвертага віда карт: карт-планаў і катрасхем, якія адлюстроўваюць месца, дзе адбывалася канкрэтная гістарычная падзея і яе ход ("Грунвальдская бітва", "Узброенае паўстанне ў Петраградзе 25-26 кастрычніка 1917г.", "Курская бітва"). Гістарычыя карты могуць быць насценнымі, настольнымі (атласы, карты ў падручніку і ) і контурнымі.

Прасцейшы прыём работы з картай – гэта паказ настаўнікам па ходу выкладання новага матэрыялу вывучаемых на ўроку аб'ектаў. Пры арганізацыі паказу па карце неабходна выконваць шэраг метадычных правіл: 1) паказ лакалізуемых на карце фактаў павінен арганічна спалучацца са славвесным апісаннем месца, дзе ён адбываўся (даліна Ніла, джунглі Індыі, Буйніцкае поле і г.д.), пры гэтым трэба імкнуцца каб у вучняў складвалася ўяўленне, што настаўнік нібы счытвае паведамляемую інфармацыю з карты; 2) паказ аб'екта на карце суправаджаецца ўказаннем дакладнымх геаграфічных арыентыраў, старон гарызонта, славесным апісаннем геаграфічных прыкмет( мацярык, шырата, клімат і г.д.), пры паказе новых аб'ектаў неабходна абапірацца на добра вядомыя вучням аб'екты(сталіца дзяржавы, рака, горы і г.д.); 3) гарады, населеныя пункты, месцы бітваў паказваюцца кропкай,, рака – па цячэнню, межы дзяржавы – непарыўнай лініей з паслядоўным указаннем дзяржаў з якімі мяжуе лакалізуемая дзяржава; 4) пры магчымасці у сярэдніх класах паказ на карце суправаджаецца з выкарыстаннем аплікацый (фігурак і стрэлах, вобразна паказваючых напрамкі і удзельнікаў гістарычных падзе; 5) работа з насценнай картай павінна спалучацца з работай вучняў з настольнымі картамі, атласамі і контурнымі картамі, што дазваляе трывала засвоіць месцазнаходжанне і асаблівасці лакалізуемага гістарычнага факта.

Правільна арганізаваная работа з контурнымі картамі, якія выдадзены амаль па ўсіх курсах гісторыі, спрыяе лепшпму асэнсаванню і замацаванню ў памяці зместу гістарычнай карты. Такая работа пачынаецца непасрэдна на ўроку пад кіраўніцтвам настаўніка і толькі пасля авалодання вучнямі ўменнямі працаваць з контурнымі картамі выкарыстоўваецца ў якасці дамашняга задання. Заданні да контурных карт складзены такім чынам, што яны могуць выкарыстоўвацца амаль на кожным уроку гісторыі.

**Лекцыя 11. Метадычныя прыемы і сродкі фарміравання гістарычных паняццяў.**

1. Роля паняццяў у фарміраванні гістарычных ведаў школьнікаў. 2. Класіфікацыя гістарычных паняццяў. 3. Асноўныя шляхі фарміравання гістарычных паняццяў. 4.Метадычныя умовы павышэння эфектыўнасці фарміравання гістарычных паняццяў.

1. Гістарычныя паняцці з'яўляюцца адлюстраваннем у свядомасці найбольш істотных прыкмет, унутранай сутнасці гістарычных фактаў, іх відавай іродавай прыналежнасці. Яны складаюць стрыжань сістэмы навуковых ведаў школьнікаў і з'яўляюцца неабходнай умовай абагульнення і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўсведамлення ўсяго таго багацця канкрэтных фактаў і ўяўленняў, якія складаюць змест школьных курсаў гісторыі. Засваенне сістэмы гістарычных паняццяў складае аснову фарміравання светапогляду вучняў. Прыведзеныя ў сістэму яны ўяўляюць сабой веды аб заканамернасцях развіцця гістарычнага працэсу. Гістарычныя паняцці і заканамернасці ляжаць ў аснове светапогляду школьнікаў і выконваюць важную метадалагічную функцыю – з'яўляюцца інструментам пазнання сутнасці фактаў гісторыі і разумення многіх складаных працэсаў, якія адбываюцца ў сучасным грамадскім жыцці.

У школьных праграмах па гісторыі асноўныя паняцці і ідэі вылучаны ў спецыяльны раздел па кожнаму курсу гісторыі, што стварае настаўніку добрыя магчымасці сістэматычна і мэтанакіравана весці работу па іх фарміраванню ў школьнікаў у працэсе навучання гісторыі. Каб паспяхова весці гэту работу настаўнік павінен добра ведаць класіфікацыю гістарычных паняццяў, якая склалася ў методыцы выкладання гісторыі.

2. У методыцы выкладання гісторыі традыцыйна склалася дзве асноўныя класіфікацыі гістарычных паняццяў. У аснове першай ляжаць асаблівасці зместу гістарычнага матэрыялу (розныя бакі грамадскага жыцця, якія вывучаюцца ў курсе гісторыі). Па гэтаму крытэрыю усе паняцці можна аб'яднаць у 3 асноўныя групы: 1) гісторыка-эканамічныя; 2) сацыяльна-палітычныя; 3) гісторыка-культурныя.

У аснове другой класіфікацыі ляжыць ступень абагульнення ў паняццях вывучаемага ў школе гістарычнага матэрыялу. Па гэтай прыкмеце вылучаюць наступныя групы паняццяў: 1) прыватна-гістарычныя (адзінкавыя); 2) агульнагістарычныя (агульныя) паняцці; 3) усеагульныя ці сацыялагічныя паняцці.

3. Метадычныя шляхі фарміравання гістарычных паняццяў вызначаюцца шляхамі, якія праходзіць пазнанне вучняў пры іх фарміраванні.Можна вылучыць тры ступені, якія праходзіць пазнанне школьніка ў працэсе засваенн гістарычнага паняцця:

Першая ступень уключае ў сябе стварэнне ў свядомасці гістарычнага вобраза, або ўяўлення аб вывучаемым гістарычным факце, гэту ступень можна назваць падрыхтоўчай, або ступенню пачуццевага ўспрыймання, уявлення гістарычнага факта. Стварэнне гістарычнага вобраза ажыццяўляецца праз:

- выкарыствнне настаўнікам усіх відаў наглядных сродкаў – прадметных, выяўленчых і ўмоўна-графічных;

- выкарыстанне прыёмаў карціннага і аналітычнага апісання, вобразнай характарыстыкі, сюжэтнага расказа ў спалучэнні з нагляднасцю;

- выкарыстаннем мастацкай і навукова-папулярнай літаратуры, якая ўзнаўляе гістарычную рэчаіснасці ў мастацкай форме.

На гэтай ступені настаўнік раскрывае пераважна знешнія рысы і асаблівасці гістарычных падзей. Але, якімі б выразнымі не былі гістарычныя ўяўленні, яны не забяспечваюць паўнацэннага фарміравання гістарычных ведаў, а толькі ствараюць перадумовы паспяховага аналіза і разбора гістарычнага факта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На другой ступені пазнання гістарычнага факта ажыццяўляецца яго аналіз і абагульненне. У ходзе якога раскрываецца яго унутраная сутнасць, якая часта не супадае са знешнім праяўленнем гістарычнага факта, формай, у якой ён праяўляецца. Аналіз (разбор) і абагульненне гістарычнага факта адбываецца наступным чынам:

- вылучаюцца істотныя прыкметы, яго відавыя і родавыя адрозненні, пры гэтым вучні абстрагіруюцц ад неістотных, другасных прыкмет;
- устанаўліваецца паслядоўнасць і ўзаемадзеянне вылучаных прыкмет па ступені важнасці і узаемападпарадкаванасці;
- у працэсе абагульнення вызначаных прыкмет фармуліруецца азначэнне паняцця.

Аднак зрабіўшы гэта і нават дабіўшыся ад вучняў засваення азначэння паняцця, работа па яго фарміраванню не спыняецца. Трэба каб вучні навучыліся аперыраваць ім. Таму неабходна перайсці на трэцюю ступень яго фарміравання – ступень практыкавання ў яго прымяненні. На гэтай ступені настаўнік арганізуе прымяненне гістарычнага паняцця вучнямі праз арганізацыю актыўнай пазнавальнай дзейнасці на аснове спецыяльна падрыхтаваных праблемна-пазнавальных заданняў.

У дыдактыцы і псіхалогіі вызначаюцца лагічныя шляхі пазнання ці набыцця ведаў: індукцыя і дэдукцыя. Індуктыўны шлях фарміравання паняццяў абумоўлівае напрамак разважанняў ад прыватнага да агульнага, дэдуктыўны – ад агульнага да прыватнага.Абодвы шляхі пазнання выкарыстоўваюцца і пры фарміраванні гістарычных паняццяў

4. Тэорыя і методыка выкладання гісторыі выявіла метадычныя ўмовы, улік якіх дапамагае настаўніку істотна павысіць якасць фарміравання гістарычных паняццяў і тэарэтычных высноў у навучанні гісторыі. Разгледзім іх у наступнай паслядоўнасці:

1. Засваенне тэарэтычных паняццяў і высноў магчымае толькі на базе засваення вучнямі канкрэтных фактаў, прычым узаемазвязаных і узаемазалежных.

2. Сістэматызацыя і абагульненне фактаў у логіцы структуры вывучаемых паняццяў і тэарэтычных абагульненняў.

3. Вызначэнне найбольш мэтазгодных вузлоў (ступеней) у фарміраванні агульнагістарычных і сацыялагічных або “скразных” паняццяў.

4. Фарміраванне найбольш складаных агульнагістарычных паняццяў патрабуе правядзення спецыльных абагульняючых урокаў.

5.Пастаянны ўлік важнай ролі стварэння ў вучняў выразных уяўленняў і тыпічных вобразаў – важнейшая перадумова паспяховага фарміравання паняццяў.

6. Раскрыццё пры вывучэнні гісторыі не ізаляваных, а ўзаемазвязаных паняццяў.

7.Улік спецыфікі розных груп гістарычных паняццяў і ў сувязі з гэтым розны характар работы над імі.

8. Пастаяннае аперыраванне гістарычнымі паняццямі на аснове арганізацыі актыўнай пазнавальнай дзейнасці – важнейшая перадумова

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

паспяховага засваення вучнямі паняццяў і заканамернасцей гістарычнага развіцця.

9.Авалоданне вучнямі асноўнымі мысліцельнымі ўменнямі з'яўляецца важнейшай перадўмовай паспяховасці засваення гістарычных паняццяў.

10. Улік аптымальных суадносін эмацыянальнага і рацыянальнага на ўроках гісторыі пры фарміраванні гістарычных паняццяў.

**Лекцыя 13-14. Методыка раскрыцця гістарычных заканамернасцей і рэалізацыі міжпрадметных сувязей**

1. Методыка фарміравання гістарычных заканамернасцей ў навучанні гісторыі. 2. Сутнасць праблемы міжпрадметных сувязей. 3. Змест міжпрадметных сувязей у навучанні гісторыі. 4. Метадычныя шляхі і прыёмы ўсталявання міжпрадметных сувязей.

1. Засваенне сістэмы гістарычных паняццяў найбольш высокай ступені абагульнення падводзіць вучняў да ўсведамлення асноўных заканамернасцей гістарычнага развіцця. Раскрыць гістарычную заканамернасць гэта значыць устанавіць аб'ектыўныя, унутраныя, істотныя і паўтараючыяся сувязі паміж гістарычнымі фактамі і з'явамі. Першая група сувязей – прычынна-выніковыя. Іх свядомае засваенне патрабуе стварэння ў вучняў выразнвых і канкрэтных уяўленняў аб кожным звяне лагічнага ланцужка, усведамлення сувязей паміж гэтымі звеннямі, уменне абагульніць усе звенні ў адну прычынна-выніковую сувязь. Другая група сувязей – лакальныя сувязі. Іх выяўленне таксама дазваляе выявіць некаторыя істотныя лакальныя сувязі гістарычнага працэса: абумоўленнасць гаспадарчага развіцця і заняткаў людзей прыроднымі ўмовамі, узнікненне першых цывілізацый у далінах вялікіх рэк і г.д. Трэцяя група сувязей – часавыя. Яны вызначаюць усталяванне паслядоўнасці ці адначасовасці падзей і працэсаў у пэўны гістарычны перыяд. Напрыклад заканамернасць наступлення перыяду феадальнай раздробленасці, ці ўтварэння цэнтралізаваных дзяржаў на пэўным этапе развіцця феадальнага грамадства.

У метадыцы можна вылучыць тры узроўні фарміравання гістарычных заканамернасцей. Пераход да кожнага з іх азначае якасны скачок да новага узроўню асэнсавання гісторыі.

Першы ўзровень - падвядзенне вучняў да разумення гістарычнчга працэса і яго заканамернасцей без увядзення паняцця заканамернасць. Гэта работа вядзецца ў сярэдніх (5-6) класах. На другім узроўні (7-9) класы раскрыццё гістарычных заканамернасцей на аснове групіроўкі фактаў суправаджаецца фармуліроўкай абагульняючых высноў. Трэці ўзровень фарміравання разумення гістарычных заканамернасцей гэта 10-11 кл. На гэтым ўзроўні вучні выкарыстоўваюць веданне заканамернасцей для тлумачэння гістарычнага працэса і працэсаў, якія адбываюцца ў сучасным грамадскім жыцці.

У аснове фарміравання заканамернасцей ляжыць развіццё гістарычнага мыслення вучняў, што дасягаецца выкарыстаннем шэрагу метадычных прыёмаў і сродкаў.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

2. У агульнай тэорыі міжпрадметных.сувязей падкрэсліваецца іх універсальнасць і ўсеагульны характар. Таму сутнасць міжпрадметных і ўнутрыпрадметных сувязей у тым каб інтэгрыраваць веды і уменні школьнікаў, садзейнічаць фарміраванню сістэмы навуковых ведаў і светапогляду вучняў, навучыць самастойна пераносіць і прыменяць веды атрыманыя пры вывучэнні адных школьных прадметаў на вывучэнне другіх.

Спецыфіка зместу гістарычнай адукацыі ў тым, што яна ахоплівае ўсе аспекты жыцця  чалавека і грамадства: геаграфічнае асяроддзе, эканоміку, сацыяльныя і нацыянальныя адносіны, палітыку, міжнародныя адносіны, развіццё матэрыяльнай і духоўнай культуры. Таму змест гісторыі, як школьнага прадмета ў той ці іншай ступені закранае змест практычна ўсіх прадметаў, вывучаемых у школе і выконвае інтэгрыруючую светапогледную функцыю ў сістэме школьнай адукацыі.

2. Змест міжпрадметных сувязей быў выразна вызначаны ў школьных праграмах 80-х гадоў XXст. У іх указваліся факты, падзеі, паняцці, уменні і навыкі, якія фарміраваліся пры вывучэнні школьных прадметаў прыродазнаўчага і гуманітарнага цыклаў, з якімі маглі быць усталяваны міжпрадметныя і унутрыкурсавыя сувязі гісторыі. У дзеючых праграмах змест міжпрадметных сувязей не вызначаецца, аднак іх ажыццяўленне неабходнае для інтаграцыі ведаў, атрымліваемых у школе і фарміравання у вучняў светапоглядных ідэй. Работа па вызначэнню зместу міжпрадметных сувязей і іх рэалізацыі ў вучэбным працэсе ажыццяўляецца настаўнікам гісторыі самастойна.

Міжпрадметныя сувязі ўсталёўваюцца па агульных для дадзеных прадметаў фактах, паняццях, ідэях, па фарміраванню ўменняў і навыкаў вучэбнай работы. Пры гэтым у кожным вучэбным прадмеце неабходна ўлічваць  напрамак зместу па супадаючаму фактычнаму або тэарэтычнаму матэрыялу або этапу фарміравання вучэбнага умення да іншых прадметаў, часе, і час які аддзяляе яго вывучэнне ў прадметах з якімі ўстанаўліваецца сувязь.

Агульная тэорыя міжпрадметных сувязей мае асабліва  важнае значэнне для курсаў гісторыі і грамадазнаўства, бо гэтыя прадметы не толькі цесна звязаныя паміж сабой агульнасцю фаталагічнага і тэарэтычнага зместу, але і з многімі іншымі школьнымі прадметамі: літаратурай, айчыннай і сусветнай мастацкай культурай, выяўленчым мастацтвам, геаграфіей, фізікай, хіміяй, матэматыкай, біялогіяй і г.д. Напрыклад, пры ввывучэнні сусветнай культуры канца XIX – пачатку XX ст. у курсе сусветнай гісторыі новага часу ў IX класе, разглядаюцца пытанні, звязаныя з рэвалюцыяй ў прыродазнаўстве: адкрыццё перыядычнага закона Дз. Мендзялеева, адкрыццё будова клеткі і атама, з’явы радыёактыўнасці і рэнгенаўскага выпраменьвання, вынаходніцтва радыё, кіно, аўтамабіля і самалёта, і г.д., а таксама новыя ідэйныя напрамкі ў філасофіі, літаратуры, выяўленчым мастацтве, музыцы, архітэктуры, якія падрабязна разглядаюцца ў адпаведных школьных прадметах. Вывучэнне дадзенай тэмы наогул нельга ажыццявіць без шырокай апоры на веды, атрыманыя пры вывучэнні іншых прадметаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Самыя цесныя сувязі гісторыі на ўзроўні паняццяў з грамадазнаўствам, у якім адбываецца абагульненне і тэарэтычнае асэнсаванне асноўных сацыялагічных паняццяў фарміруемых пры яе вывучэнні. Вельмі цеснымі сувязі гісторыі на ўзроўні фактаў і гістарчных асоб з сусветнай і беларускай літаратурай, якая ў мастацкай форме адлюстроўвае грамадскія працэсы, разглядаемыя ў розныя перыяды гісторыі. Цяжка ўявіць работу з картай і вывучэнне геаграфічнага асяроддзя на ўроках гісторыі без апоры на адпаведныя веды і ўменні, якія фарміруюцца ў курсе геаграфіі.

Такім чынам, змест межпрадметных сувязей ў навучанні гісторыі ўключае ў сябе сувязі па наступных напрамках: па агульных фактах і падзеях, паняццях і светапоглядных ідэях, па агульнавучэбных ўменнях і навыках, па способах і прыёмах вучэбнай работы школьнікаў.

3. Міжпрадметныя сувязі па месцы і часе іх ажыццяўлення могуць быць: а) супадаючымі, калі факты, паняцці, уменні і навыкі фарміруюцца адначасова ў курсе гісторыі і іншых школьных прадметах; б) рэтраспектыўнымі, калі пры вывучэнні вучэбнага матэрыялу ў курсе гісторыі мы абапіраемся на вывучанае раней ў курсе гісторыі або на матэрыял ужо разгледжаны ў іншым школьным прадмеце; в) *перспектыўнымі*, калі вывучаемы ў курсе гісторыі вучэбны матэрыял будзе разглядацца пры вывучэнні іншых школьных дысцыплін пазней.

У метадычнай літаратуры знайшлі адлюстравання асноўныя прыёмы рэалізацыі міжпрадметных сувязей. Гэта: 1)напамінанне настаўнікам раней засвоеных фактаў, паняццяў і ідэй; 2) пастаноўка вучням пытанняў і заданняў, якія патрабуюць аперыравання раней засвоенымі ведамі; 3) складанне абагульняючых табліц, 4) падрыхтоўка вучнямі паведамленняў і дакладаў на аснове крыніц, якія адносяцца да іншых прадметаў; 5) выкарыстанне на ўроку гісторыі сшыткаў па іншых школьных прадметах; 6) джэманстрацыя наглядных дапаможнікаў, падручнікаў і вучэбных табліц па іншых школьных прадметах. Безумоўна, найбольш прадуктыўны прыём усталявання міжпрадметных і ўнутрыкурсавых сувязей з'яўляецца выяўленне іх самімі вучнямі па заданню настаўніка. Ён аказвае найбольшае развіваючае і выхаваўчае ўздзеянне, адначасова служыць паказчыкам развіцця памяці і ўзроўню ўмення абагульняць веды, лагічна мысліць, выстройваць сістэму ведаў. Таму пастаноўка рэпрадуктыўных і праблемных пытанняў і заданняў, якія патрабуюць прыпамінання і сінтэзіравання ведаў, прымянення ўменняў з розных школьных прадметаў у новай сітуацыі на ўроках гісторыі з'яўляецца важнейшым метадычным прыёмам рэалізацыі галоўных задач міжпрадметных сувязей.

Такім чынам ажыццяўленне міжпрадметных і ўнутрыпрадметных сувязей дазваляе не толькі паспяхова рашаць асноўныя задачы навучання гісторыі, але і спрыяе фарміраванню ў вучняў светапоглядных ідэй, здольнасці інтэгрыраваць веды і ўменні атрыманыя пры вывучэнні розных школьных прадметаў, прыменяць іх у новых вучэбных сітуацыях.

**Лекцыя 15 Выхаванне вучняў у навучанні гісторыі.**

1. Выхаваўчыя магчымасці школьных курсаў гісторыі. 2. Метадычныя шляхі рэалізацыі выхаваўчых магчымасцей у навучанні гісторыі. 3. Метадычныя ўмоыі павышэння эфектыўнасці выхавання вучняў у навучанні гісторыі.

1. Актуальнасць праблемы выхавання вучняў у навучанні гісторыі ў сучасных умовах істотна ўзрастае. Школьныя праграмы па гісторыі арыентуюць на забеспячэнне фарміравання высокамаральнай, духоўна прасветленай і грамадзянска сталай асобы, якая ўсведамляе прыярытэт агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей перад класавымі, партыйнымі, групавымі і асабістымі інтарэсамі, імкнецца да засваення нацыянальных традыцый і звычаяў, адчувае асабістую адказнасць за лёс Бацькаўшчыны. Вырашаць гэтыя задачы немагчыма без выразнага ўяўлення аб тых магчымасцях, якія змяшчае школьны курс гісторыі, і вызначэння метадычных шляхоў іх ажыццяўлення.

Гісторыя – гэта сацыяльны вопыт чалавецтва, які перадаецца з пакалення ў пакаленне, прызначэння якога ў тым каб нашчадкі ўлічвалі ўрокі гісторыі, пазбягалі памылак зробленых іх папярэднікамі і бралі на ўзбраенне станоўчае, што не страчвае сваей актуальнасці праз стагоддзі.

Усё лепшае, што назапашана вопытам чалавецтва, павінна быць перададзена падрастаючаму пакаленню, а ўсё горшае – стаць урокам для яго. З агульначалавечых пазіцый павінна разглядацца не толькі дзейнасць людзей, але і партый, урадавых органаў і устаноў. Пры гэтым трэба памятаць пра гістарычную абумоўленасць маральных каштоўнасцей грамадства, якія належаць ад этапу развіцця цывілізацыі.

Вывучэнне гісторыі стварае цудоўныя магчымасці прасачыць, як узнікаюць і развіваюцца маральныя каштоўнасці, як яны замацоўваюцца ў чалавечай свядомасці з дапамогай рэлігіі.

Шырокія магчымасці мае курс гісторыі для патрыятычнага выхавання моладзі. Любоў да Радзімы, імкненне самааддана служыць свайму народу, захоўваць яго мову, культурную і гістарычную спадчыну, яго звычаі і традыцыі немагчымы без глыбокага асэнсавання гісторыі.

Вырашаючае значэнне ў фарміраванні патрыятычных пачуццяў і свядомасці вучняў належыць вобразнаму і эмацыянальнаму выкладанню шматвякавой гісторыі беларускага народа. Уважліва прааналізаваўшы змест школьнай гістарычнай адукацыі, мы ўбачым, што факты, якія яго складаюць утрымліваюць шырокія магчымасці для эстэтычнага, эканамічнага, прававога і экалагічнага выхавання. У школе няма больш спрыяльнага, акрамя літаратуры, прадмета, які б валодаў такімі шырокімі магчымасцямі для выхавання школьнікаў і ажыццяўлення на уроках розных аспектаў выхаваўчай дзейнасці.

2. У педагогіцы вылучаюцца наступныя метады выхавання: пераканання, практыкавання, стымуліравання і самавыхавання. Іх рэалізацыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ў навучанні гісторыі мае сваю спецыфіку, якая абумоўлена асаблівасцямі зместу гісторыі і методыкі яе выкладання.

Асноўнымі метадычнымі шляхамі рэалізацыі выхаваўчых магчымасцей школьных курсаў гісторыі з'яўляюцца педагагічнае ўздзеянне на эмоцыі школьнікаў і фарміраванне светапоглядных ідэй, якія аказваюць уплыў на перакананні і сацыяльныя паводзіны асобы. Эмацыянальнае ўздзеянне на пачуцці школьнікаў дасягаецца праз выкарыстанне разнастайных прыёмаў вобразнага ізлажэння гістарычных фактаў: сюжэтнпага і вобразнага апавядання, карціннага апісання і вобразнай характарыстыкі ў спалучэнні з шырокім выкарыстаннем выяўленчай нагляднасці, мастацкай і навукова-папулярнай літаратуры, прыёмаў персаніфікацыі і драматызацыі гістарычных падзей.

Выхаваўчае ўздзеянне на свядомасць школьнікаў павышаецца праз арганізацыю такой пазнавальнай дзейнасці вучняў, якая вядзе іх да самастайных разважанняў і ацэнак гістарычных падзей і асоб, фарміравання гістарычнай эмпатыі.

У гэтым сэнсе эфектыўнымі з’яўляюцца разнастайныя заданні, якія ставяць вучняў у сітуацыю, калі неабходна умоўна перанесціся ў вывучаемую на ўроку эпоху, адчуць яе, стаць на пазіцыі ўдзельнікаў гістарычных падзей. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што выкананне такіх заданняў магчымае, калі вучні выразна ўяўляюць гістарычную эпоху і абставіны, у якіх жылі і дзейнічалі гістарычныя персанажы. У практыку работы настаўнікаў гісторыі трывала ўвайшлі наступныя віды вобразных заданняў: уяўнае падарожжа; прыём незакончанага сказа; уяўнае інтэрв’ю; ажыўшая карціна або ілюстрацыя; сачыненне ад першай асобы; стварэнне сітуацыі выбару. У ходзе выканання такіх заданняў вучні маюць магчымасць не толькі перанесціся ў вывучаемую эпоху, суперажываць гістарычныя падзеі, сфарміраваць асабістыя адносіны да вывучаемага на ўроках гісторыі, але і выразна адчуць недахоп у веданні гістарычных фактаў і дэталей канкрэтнай гістарычнай рэчаіснасці. Такім чынам, асноўнымі метадычнымі шляхамі рэалізацыі выхаваўчых магчымасцей закладзеных у змесце школьнай гістарычнай адукацыі, з’яўляюцца: выкарыстанне прыёмаў і сродкаў эмацыянальнага ўздзеяння на пачуцці школьнікаў, арганізацыя самастойнай пазнавальнай дзейнасці вучняў, скіраванай на фарміраванне гістарычнай эмпатыі, светапоглядных ідэй і перакананняў, якія ўплываюць на сацыяльную пазіцыю і паводзіны школьнікаў.

3. Выхаваўчы патэнцыял, закладзены ў змесце школьных курсаў гісторыі не рэалізуецца сам па сабе. Яго ажыццяўленне патрабуе выканання шэрагу метадычных умоў, якія забяспечваюць павышэнне эфектыўнасці выхавання вучняў сродкамі гісторыі. Важнейшай метадычнай умовай рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу гісторыі з’уляецца карпатлівая і мэтанакіраваная работа настаўніка па ацэнцы выхаваўчых магчымасцей вывучаемых фактаў, іх адборы ў адпаведнасці з патрабаваннямі школьнай праграмы і выразнае ўсведамленне выхаваўчых задач, якія могуць быць рэалізаваны на ўроку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“Вучаць, выхоўваюць чалавека факты – заўсёды – факты, ідэі спадарожнічаюць, а не пяпярэднічаюць фактам”, – пісаў А.М. Горкі. Таму адбор фактаў, іх метадычная апрацоўка і падача вучням з’яўляюцца асновай рэалізацыі выхаваўчых магчымасцей школьных курсаў гісторыі. Значнасць гэтай работы абумоўлена тым, што ў сучасных падручніках і вучэбных дапаможніках, перагружаных фактычным матэрыялам, факты, нават галоўныя і важныя ў выхаваўчых адносінах, падаюцца сцісла і канспектыўна. У іх амаль адсутнічаюць яркія і вобразныя характарыстыкі гістарычных асоб, дзейнасць іх асвятляецца схематычна. Гэта вымушае настаўніка да самастойнага структурна-функцыянальнага аналізу параграфа, вылучэння найбольш спрыяльных для выхавання асобы фактаў, пошуку дадатковай інфармацыі, неабходнай для грунтоўнага іх раскрыцця, вызначэння прыёмаў і сродкаў, з дапамогай якіх можна паспяхова ўздзейнічаць на пачуцці і свядомасць вучняў. Разуменне гэтага настаўнікам садзейнічае не толькі лепшаму засваенню школьнікамі гістарычных ведаў, але і назапашванню гістарычнага вопыту, выпрацоўцы ў іх крытэрыяў ацэнкі ўчынкаў сваіх сучаснікаў і саміх сябе. “Звяртаючыся да мінулага, – пісаў вядомы савецкі гісторык А.В. Гулыга – мы не толькі вывучаем падзею ў яе ўзаемасувязях і наступствах, але выносім пэўны маральны прысуд, зыходзячы з маральных крытэрыяў сучаснасці. З другога боку, і гэта галоўнае, вопыт гісторыі – дапамагае выпрацаваць маральную ацэнку акружаючай нас рэчаіснасці і пэўным чынам вызначыць свае паводзіны... Вопыт гісторыі – дакладны арыенцір, якім часам карыстаюцца людзі нават не ўсведамляючы гэтага. Часам, несвядома, чалавек карэктуе свае паводзіны, кіруючыся прыкладам перажытага, убачанага, пачутага.” Такім чынам, выхаваўчыя магчымасці, закладзеныя ў змесце курсаў гісторыі, могуць быць рэалізаваны, калі настаўнік: вядзе карпатлівую і мэтанакіраваную работу па ацэнцы выхаваўчых магчымасцей вывучаемых фактаў, іх адборы ў адпаведнасці з патрабаваннямі школьнай праграмы і выразна ўсведамляе выхаваўчыя задачы, якія могуць быць рэалізаваны на ўроку і будзе мэтанакіравана імкнуцца да іх ажыццяўлення; будзе ўлічваць узроставыя і псіхалагічныя асаблівасці вучняў рознага ўзросту і ў адпаведнасці з імі выбіраць адпаведную методыку, якая б спрыяла эмацыянальнаму ўздзеянню на пачуцці школьнікаў; прадумае такую арганізацыю пазнавальнай дзейнасці, якая будзе стымуляваць уласныя разважанні, маральна-этычныя і эстэтычныя ацэнкі вучняў, ствараць на ўроку атмасферу ўзаемапаразумення і адпаведны эмацыянальны настрой, выпрацоўваць у вучняў глыбокі пазнавальны інтарэс да гісторыі, абуджаць у іх цікавасць да яе вывучэння; будзе імкнуцца да прафесійнага самаўдасканалення, зможа выклікаць у вучняў павагу да сябе – як педагога і асобы.

**Лекцыя 16. Дзейнасны падыход ў навучанні гісторыі. Паняцце і структура дзейнасці**

1. Паняцце дзейнаснага падыходу ў навучанні гісторыі. 2. Паняцце і структура дзейнасці. 3. Ідэі асобасна-дзейнаснага падыходу ў працах

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

псіхолагаў ы дыдактаў 4. Укараненне дасягненняў псіхалогіі ў навучанне гісторыі.

1. Дзейнасны падыход як найважнейшая передумава паспяховай рэалізацыі адукацыйных, выхаваўчых і развіццевых задач навучання. Паняцце дзейнасці ў філасофіі, псіхалогіі, тэорыі і методыцы навучання гісторыі Праблема ўкаранення ў школьную практыку асмобасндзейнаснага падыходу ў працах Выгоцкага, Смірнова, Гальперына, Талызінай, Менчынскай і інш. Ідэя развіваючага навучання, як передумовы дзейнаснага падыходу да навучання гісторыі становіцца актуальнай у нашай школе з сярэдзіны 60-х гадоў. Гэта абумоўлена ўступленнем чалавецтва ў эпоху навукова-тэхнічнай рэвалюцыі і хуткім нарастаннем патоку навуковай, грамадска-палітычнай і культурнай інфармацыі, якая з сярэдзіны 60-х гадоў XX стагоддзя кожныя пяць гадоў павялічваецца ўдвая. У такіх умовах школа аказалася няздольнай даць свайму выпускніку аб'ёму ведаў, уменняў і навыкаў, якія неабходныя яму для авалодання прафесіяй выканання сваіх грамадзянскіх абавязкаў, свабоднай арыентацыі ў нарастаючым патоку інфармацыі і яе выкарыстання ў практычных мэтах. Менавіта таму ў сістэме адукацыі пачынаецца пераход ад традыцыйнага да развіваючага навучання.

**Лекцыя 17. Фарміраванне пазнаваўчага інтарэсу – аснова рэалізацыі дзейнаснага кампанента гістарычнай адукацыі**

Сутнасць пазнаваўчага інтарэсу і яго характэрныя рысы. Характарыстыка інтарэса ў філасофіі, псіхалогіі і педагогіцы. Класіфікацыя інтарэсаў. Пазнаваўчы інтарэс як аснова матывацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў, яго адметныя рысы. Дынаміка развіцця пазнаваўчага інтарэсу да вывучэння гісторыі. Устойлівы пазнаваўчы інтарэс. Змест гістарычнай адукацыі як крыніца фарміравання ўстойлівага пазнаваўчага інтарэсу. Паказчыкі наяўнасці пазнаваўчага інтарэсу і яго сфарміраванасці ў вучняў. Магчымасці прадмета "Сусветная гісторыя .Гісторыя Беларусі" ў 5-11класах для фарміравання ўстойлівага пазнаваўчага інтарэсу ў школьнікаў.

Актыўная вучэбна-пазнавальная дзейнасць і ўзаемадзеянне суб'ектаў адукацыйнага працэсу як крыніцы фарміравання ўстойлівага пазнаваўчага інтарэсу. Метадычныя прыемы і ўмовы фарміравання ўстойлівага пазнаваўчага інтарэсу вучняў 5-11 класаў да вывучэння гісторыі.

**Лекцыя 18. Характарыстыка зместу дзейнаснага кампанента гістарычнай адукацыі**

1. Дзейнасны кампанент гістарычнай адуацыі і шляхі яго рэалізацыі ў навучанні гісторыі. 3. Класіфікацыя ўменняў і методыка іх фарміравання. 4. Роля лагічных схем-памятак ў авалоданні спосабамі набыцця і выкарыстання гістарычных ведаў.

1. Праблема ўкаранення ў школьную практыку развіццева га навучання становіцца актуальнай у нашай школе з сярэдзіны 60-х гадоў. Гэта абумоўлена ўступленнем чалавецтва ў эпоху навукова-тэхнічнай рэвалюцыі і хуткім нарастаннем патоку навуковай, грамадска-палітычнай і культурнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

інфармацыі, якая з сярэдзіны 60-х гадоў XX стагоддзя кожныя пяць гадоў павялічваецца ўдвая. У такіх умовах школа аказалася няздольнай даць свайму выпускніку аб'ёму ведаў, уменняў і навыкаў, якія неабходныя яму для авалодання прафесіяй, выканання сваіх грамадзянскіх абавязкаў, свабоднай арыентацыі ў нарастаючым патоку інфармацыі і яе выкарыстання ў практычных мэтах. Менавіта таму ў сістэме адукацыі пачынаецца пераход ад традыцыйнага да развіваючага навучання.

Развіваючае навучанне – гэта навучанне ў працэсе якога ажыццяўляецца мэтанакіраваная і сістэматычная работа па развіццю і ўдасканаленню пазнавальных здольнасцей і ўласцівасцей асобы школьніка, росту яе магчымасцей самастойна вучыцца, авалодваць ведамі, арыентавацца ў патоку навуковай інфармацыі, ажыццяўляць яе аналіз, адбор і выкарыстанне ў практычных мэтах.

Эфектыўнасць і выніковасць развіваючага навучання павышаецца пры выкананні наступных метадычных умоў:

а) Навучанне павінна быць даступным, але засваеным на дастаткова высокім узроўні цяжкасці; б) фіксацыя ўвагі вучняў на тэарэтычных высновах і абагульненнях, а не толькі на вывучэнні фактычнага матэрыяла;

в)выбар аптымальнага тэмпу навучання для кожнага канкрэтнага класа, бо эфектыўнасць навучання мае пэўную сувязь з тэмпам навучання. г) не будзе свядомага засваення вучэбнага матэрыялу, калі вучань не ўсвядоміў яго матываў. Гатоўнасць вучняў да самастойнай пазнавальнай дзейнасці рэалізуецца праз развіццё і авалоданне імі пэўнымі спосабамі дзейнасці з гістарычным матэрыялам, спецыяльнымі ўменнямі і навыкамі. Уменне вучыцца мае вялікае выхаваўчае значэнне. Яно дапамагае выпрацаваць любоў да працы і дабрасумленныя адносіны да вучобы, дысцыплінаванасць, адказнасць, настойлівасць, самастойнасць – якасці, неабходныя ў жыцці кожнага чалавека. Адсутнасць уменняў рацыянальнай арганізацыі вучэбнай працы вядзе да перагрузкі вучняў і істотна зніжае эфектыўнасць навучання ў цэлым.

У якасці асноўных рыс развіваючага навучання гісторыі можна вылучыць наступныя: а) улік пры арганізацыі вучэбнага працэсу па гісторыі ўзроўню навучаемасці, пазнавальных магчымасцей, здольнасцей і інтарэсаў школьнікаў; б) свядомую, сістэматычную і мэтанакіраваную работу па развіццю пазнавальных магчымасцей і здольнасцей вучняў; в) мэтанакіраванае фарміраванне ў школьнікаў спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці з гістарычным матэрыялам, інтэлектуальных і практычных уменняў і навыкаў, неабходных для самастойнага пазнання гісторыі.

2. Дзейнасны кампанент зместу школьнай гістарычнай адукацыі прадстаўлены ў дзеючых праграмах асноўнымі спосабамі дзейнасці з гістарычным матэрыялам (да 2003 года уменняў). Паняцце *спосаб дзейнасці* ўключае ў сябе ўсведамленне вучэбнай сітуацыі (задачы), вызначэнне і прыняцце рашэння аб шляхах выкарыстання інтэлектуальных і практычных дзеянняў, або ўменняў і рашэнне з іх дапамогай вучэбнай або практычнай задачы. Рэалізацыя дзейнаснага кампанента гістарычнай адукацыі перш

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

за ўсе дасягаецца праз такую арганізацыю працэса навучання гісторыі, пры якой вучні не толькі авалодваюць рознымі па характару гістарычным ведамі (лакалізованымі ў прасторы і часе гістарычнымі фактамі, паняццямі, прычынна-выніковымі сувязямі, заканамернасцямі, тэарэтычнымі высновамі, абагульненнямі і ацэнкамі гістарычных падзей), але і ўсведамляюць магчымасці і спосабы іх прымянення ў пазнанні гісторыі і выкарыстання ў практычнай дзейнасці пры аналізе сучаснага сацыяльна-эканамічнага, грамдска-палітычнага і культурнага жыцця.

3. У дыдактыцы ўменні вызначаюць, як свядомае валоданне якім-небудзь прыёмам дзейнасці (інтэлектуальнай ці практычнай), а навык – згорнутае або даведзенае да аўтаматызму уменне. Уменне пастулова перарастае ў навык. Таму ў рэальным вучэбным працэсе адначасова фарміруецца ўменне і адпаведны навык (напрыклад, уменне чытаць і навык беглага чытання).

З пачатку 80-х гадоў уменні і навыкі былі ўключаны ў школьныя праграмы ў якасці самастойнага кампанента гістарычнай адукацыі, які разам з фактычным і тэарэтычнымі ведамі па гісторыі падлягае абавязковаму засваенню вучнямі.

**Лекцыя 19. Фарміраванне спосабаў вучэбна-пазнаваўчай дзейнасці**

У методыцы і практыцы навучання гісторыі педагогі-гісторыкі і настаўнікі падзяляюць спосабы вучэбна-пазнаваўчай дзейнасці на *агульнавучэбныя*, якія фарміруюцца пры вывучэнні розных школьных дысцыплін, і *спецыяльныя*, валоданне якімі неабходна для засваення прадметнага зместу гісторыі. Таму ў навучанні гісторыі настаўніку неабходна працаваць над тымі і другімі, але большую ўвагу ўсе ж надаваць фарміраванню спецыяльных уменняў.

Найбольш абгрунтаваны пералік спецыяльныхспосабаў вучэбна-пазнаваўчай дзейнасці, на наш погляд, прапанаваў І.Я. Лернер. У якасці крытэрыя для вылучэння асноўных груп спецыяльных гістарычных уменняў ён выкарыстаў тыпы аспектных праблем, якія прыходзіцца вырашаць у навучанні гісторыі: 1. Лакалізацыя гістарычных падзей, з'яў і працэсаў у часе. 2. Лакалізацыя гістарычных падзей, з'яў і працэсаў ў прасторы. 3. Вызначэнне сутнасці і характарыстыка гістарычных падзей, з'яў і працэсаў. 4. Усталяванне прычынна - выніковых сувязей. 5. Ацэнка гістарычных падзей, з'яў і асаблівасцей у развіцці гістарычных падзей, з'яў і працэсаў. 6. Выяўленне агульных рыс і асаблівасцей ў развіцці гістарычных падзей, з'яў і працэсаў. 7. Вызначэнне тэндэнцый і заканамернасцей гістарычнага развіцця. 8. Канструіраванне альтэрнатыўных шляхоў гістарычнага развіцця. 9. Выкарыстанне гістарычных ведаў пры аналізе сучаснага развіцця грамадства.

Асноўная работа па фарміраванню спросабаў вучэбна-пазнаваўчай дзейнасці ажыццяўляецца ў базавай школе. Тут шырокае распаўсюджанне атрымала методыка, заснаваная на тэорыі паэтапнага фарміравання спосабаў дзейнасці. У адпаведнасці з ёй пры фарміраванні спосабаў дзейнасці вылучаюцца наступныя этапы: 1) фарміраванне ў вучняў *арыентыровачнай*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*асновы* спосаба дзейнасці, якая ўтрымлівае пералік дзеянняў, што ўваходзяць у склад умення; 2) выкананне вучнямі *дзеянняў па ўзору* пад кіраўніцтвам настаўніка і самастойна ў новых вучэбных сітуацыях; 3) свядомы выбар найбольш рацыянальных спосабаў дзейнасці і *самастойны перанос* іх у новыя вучэбныя сітуацыі.

Спецыфікай работы па фарміраванню уменняў ў выпускных класах заключаецца ў тым, што вучні пры адпаведна арганізаванай рабоце здольныя хутка ліквідаваць прабелы. У гэтым ім дапамагаюць прапанаваныя настаўнікам лагічныя схемы і планы-памяткі, якія ўтрымліваюць пералік вучэбных дзеянняў, якія ўваходзяць у склад уменняў.

У методыцы і практыцы навучання гісторыі распрацавана мноства лагічных схем і памятак, якія дапамагаюць вучням авалодаць спосабамі набыцця і авалодання ведамі. Многія з іх увайшлі ў метадычны апарат падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, а многія складаюцца настаўнікам у працэсе падрыхтоўкі да ўрокаў. Усе памяткі прымяняемыя ў навучанні гісторыі па сваёй накіраванасці на фарміраванне пэўных уменняў можна падзяліць на тры вялікія групы: уменняў 1) уменні арганізоўваць і планаваць сваю пазнавальную дзейнасць; 2) уменні авалодваць гістарычнай інфармацыяй; 3) уменні гістарычнага мыслення.

Да першай групы адносяцца памяткі па кіраванню пазнавальнай дзейнасцю вучняў на ўроку і пры самастойнай падрыхтоўцы да яго, а таксама пры падрыхтоўцы да заліку, экзамену, напісання самастойных творчых работ (ад кароткага паведамлення, расказа на гістарычную тэму да гадавых рэфератаў і праектаў). Другая група памятак скіраваная на авалодання вучнямі ўменнямі авалодваць гістарычнай інфармацыяй. Гэта памяткі тыпу: як працаваць з пісьмовымі, рэчавымі першакрыніцамі, як вывучаць помнікі архітэктуры, як даваць гістарычны аналіз твораў жывапісу, як вывучаць навуковую, навукова-папулярную і мастацкую гістарычую літаратуру, як даваць бібліяграфічнае апісанне крыніцы і г.д. Самай вялікай і значнай у навучанні гісторыі з'яўляецца трэцяя група лагічных схем і памятак скіраваных на фарміравання уменняў, неабходных для развіцця гістарычнага мыслення. Яны ляжаць у аснове развіцця пазнавальных здольнасцей школьнікаў. Гэта памяткі на засваенне алгарытму гістарычнага аналізу, выяўлення прычын, сутнасці, параўнання, ацэнкі і наступстваў гістарычных падзей.

Паступовае ўвядзенне і выкарыстанне пералічаных вышэй тыпаў лагічных схем і памятак ў вучэбны працэс не толькі дазваляе паспяхова рэалізоўваць у навучанні гісторыі дзейнасны кампанент гістарычнай адукацыі, аднак і істотна павысіць эфектыўнасць засваення і выкарыстання прадметных ведаў, як на ўроках гісторыі так і ў практычнай дзейнасці пры аналізе фактаў сучаснага сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага жыцця грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Лекцыя 20. Асаблівасці методыкі рэалізацыі дзейнаснага кампанента ў традыцыйнай і тэхналагічнай мадэлях навучання.**

Дыягностыка ўзроўню сфарміраванасці спосабаў дзейнасці, інтэлектуальных і практычных уменняў і навыкаў, неабходных для пазнання гісторыі. Методыка фарміравання спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці ў працэсе навучання гісторыі ў школе. Метадычныя ўмовы павышэння эфектыўнасці іх фарміравання. Узаемасувязь авалодання спецыяльнымі гістарычнымі ўменнямі і развіццём пазнавальнай самастойнасці і актыўнасці вучняў. Асноўныя этапы работы па фарміраванні ўменняў і спосабаў вучэбнай дзейнасці. Метадычныя ўмовы рэалізацыі дзейнаснага кампанента гістарычнай адукацыі.

Асноўныя мадэлі арганізацыі навучання гісторыі ў сучаснай школе і крытэрыі іх вылучэння. Асноўны дыдактычныя прынцыпы традыцыйнай, тэхналагічнай і асобасна арыентаванай мадэляў навучання. Асаблівасці рэалізацыі дзейнаснага кампанента зместу гістарычнай адукацыі ў традыцыйнай і тэхналагічнай мадэлях. Рэалізацыя дзейнаснага падыходу да навучання гісторыі ў мадэлі асобасна арыентаванага навучання. Кампетэнтнасны падыход да пабудоввы зместу адукацыі. Выкладчыцкая дзейнасць настаўніка і вучэбная дзейнасць вучняў ў розных мадэлях навучання.

**Лекцыя 21. Агульная характарыстыка сродкаў навучання гісторыі**

1. Класіфікацыя сродкаў навучання гісторыі. 2. Агульная характарыстыка сродкаў навучання гісторыі. 3. Комплекснае выкарыстанне сродкаў навучання гісторыі.

1. Гістарычныя веды школьнікаў фарміруюцца на аснове разнастайных крыніц, з якімі яны знаёмяцца ў сваёй вучэбнай дзейгнасці і ў паўсядзённым жыцці. Крыніцы ведаў вызначаюць сродкі, метады навучання гісторыі і спосабы вучэбнай дзейнасці, праз якія вучні авалодваюць гістарычнымі ведамі. У сувязі з гэтым узнікае неабходнасць сістэматызацыі і класіфікацыі асноўных крыніц і сродкаў навучання гісторыі.

У аснове пазнання чалавекам свету ляжаць органы пачуцця: зрокавыя, слыхавыя, смакавыя і такцільныя аналізатары. Таму асноўнымі крыніцамі і сродкамі аваладоння ведамі, уменнямі і навыкамі з’яўляюцца нагляднаы вобраз, вуснае і друкаванае слова, практычныя дзеянні з прадметамі рэчаіснасці. Іншых крыніц ведаў не існуе, а ўсе сродкі навучання ў агульнадыдактычным плане дзеляцца на тры вялікія групы: наглядныя, славесныя (вуснае і друкаванае слова) і практычныя.

У методыцы выкладання гісторыі сродкі навучання таксама прынята дзяліць на тры вялікія групы, паклаўшы ў аснову класіфікацыі асаблівасці ўзнаўлення ў крыніцах ведаў гістарычнай рэчаіснасці. Па гэтай прыкмеце сродкі навучання гісторыі дзеляцца на: 1) сродкі, якія з’яўляюцца першакрыніцамі гістарычных ведаў; 2) сродкі, якія ўзнаўляюць гістарычныя веды ў навукова апрацаваным выглядзе; і 3) сродкі рэканструіруючыя гістарычную рэчаіснасць з дапамогай мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Першакрыніцы гістарычных ведаў* ў сваю чаргу дзеляцца на тры групы. Першую – складаюць гістарычныя дакументы, якія могуць быць прадстаўлены ў славеснай друкаванай форме: а) дзяржаўныя юрыдычныя дакументы: канстытуцыі, дэкларацыі, маніфесты, законы, судзебнікі, улажэнні, статуты, пастановы, дагаворы і г.д.; б) дакументы палітычных партый і рухаў: праграмы, статуты, дэкларацыі, адозвы, рашэнні партыйных органаў і з’едаў і г.д.; в) пісьмовыя помнікі вывучаемай эпохі: хронікі, летапісы, успаміны, міфы, легенды, крылатыя словы і выразы, паданні і г.д.; г) сачыненні, створаныя сучаснікамі гістарычных падзей: навуковыя і філасофскія працы, творы мастацкай літаратуры; д) гаспадарчыя дакументы: вопісы, інвентары і апісанні маёнткаў, гаспадарчыя справаздачы, статыстычныя звесткі і зборнікі і г.д.

Другую групу складаюць творы мастацтва вывучаемай эпохі (карціны, партрэты, скульптуры, малюнкі, карыкатуры, гравюры, кніжныя мініяцюры) і дакументы, зафіксаваныя аб’ектывам: фатаграфіі, кадры дакументальных і хранікальных кіна- і тэлефільмаў і г.д.

Да трэцяй групы гістарычных дакументаў адносяцца рэчавыя помнікі вывучаемай эпохі: археалагічныя артэфакты, помнікі архітэктуры, прылады працы, зброя, прадметы дамашняга ўжытку і г.д.

2. Выкарыстанне ў навучанні гісторыі *першакрыніц* гістарычных ведаў – эфектыўны сродак павышэння фарміравання трывалых ведаў, пераканаўчасці навучання, выпрацоўкі ў вучняў элементарных уменняў і навыкаў гістарычнага даследавання. Першакрыніцы гістарычных ведаў выкарыстоўваюцца ў навучанні гісторыі эпізадычна і пераважна шляхам арганізацыі вучэбных і пазаўрочных экскурсій да гістарычных помнікаў, у гістарычныя і гісторыка-краязнаўчыя музеі, індывідуальнай навукова-даследчай працы школьнікаў.

Самую вялікую групу складвюць сродкі навучання, якія ўзнаўляюць гістарычныя веды у навукова апрацаваным выглядзе. Сродкі навучання гэтай групы складаюць аснову арганізацыі навучання гісторыі ў школе. Яны навукова і дыдактычна апрацаваныя для навучання школьнікаў рознага ўзросту.

Да сродкаў навучання, якія рэканструіруюць гістарычную рэчаіснасць *ў* мастацкай форме адносяцца: творы выяўленчага мастацтва, (жывапіс, скульптура, графіка), вусная народная творчасць, мастацкая літаратура, драматургія, мастацкія кіна- і тэлефільмы, створаныя на гістарычныя сюжэты. Іх выкарыстанне ў вучэбным працэсе дазваляе стварыць у вучняў жывыя вобразы гістарычнага мінулага, сфарміраваць выразныя гістарычныя ўяўленні, закласці трывалы фундамент для тэарэтычнага асэнсавання гісторыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Лекцыя 22. Праблема метадаў навучання гісторыі.**

1. Азначэнне метада навучання. 2. Праблема класіфікацыі метадаў і прыёмаў навучання гісторыі. 3. Дыдактычны і метадычны падыходы да праблемы класіфікацыі метадаў і прыемаў навучання гісторыі.

1. Павышэнне навуковага ўзроўню выкладання гісторыі, актыўнасці і самастойнасці вучняў у навучальным працэсе ўжо даўно прыцягнула ўвагу метадыстаў да распрацоўкі навукова абгрунтаванай сістэмы метадаў, прыёмаў і сродкаў навучання, якая адпавядала б мэтам вывучання, зместу гістарычных курсаў і ўзроўню навучаемасці школьнікаў.

Большасць дыдактаў паняцце “метад” тлумачыць як спосаб работы настаўніка і вучняў, пры дапамозе якога дасягаецца авалоданне ведамі, уменнямі і навыкамі, фарміруецца светапогляд вучняў, развіваюцца іх пазнавальныя магчымасці. Найбольш распаўсюджана і больш шырока выкарыстоўваецца класіфікацыя метадаў, якая склалася з часоў Я.А. Каменскага. Яна заснавана на асноўных крыніцах, праз выкарыстанне якіх настаўнік перадае, а вучні засвойваюць інфармацыю, авалодваюць уменнямі і навыкамі. Яна ўключае ў сябе славесныя, наглядныя і практычныя метады навучання. надаваць характару і ўзроўням пазнавальнай дзейнасці. І.Я. Лернер прапанаваў класіфікацыю метадаў, заснаваную на трох узаемазвязаных падставах:а) спецыфіка мэт навучання ці відаў зместу навучання; б) асаблівасць спосабу іх засваення; в) спецыфіка дзейнасці па арганізацыі і ажыццяўленню спосабаў засваення].

Зыходзячы з гэтага, ён разам з М.Н. Скаткіным вызначыў наступныя пяць метадаў навучання гісторыі: 1) тлумачальна-ілюстратыўны або інфармацыйна-рэцэптыўны, які рэалізуецца ў форме расказа, лекцыі, экскурсіі; праз выкарыстанне падручніка, натуральнага або друкаванага гістарычнага дакумента, адлюстравання ці копіі гістарычнага аб’екта; 2) рэпрадуктыўны метад, заснаваны на ўзнаўленні ведаў і іх канструіраванні самімі вучнямі ў вуснай ці пісьмовай форме ў адпаведнасці з заданнем настаўніка; 3) праблемнае ізлажэнне, якое рэалізуецца праз тыя ж прыёмы і сродкі, што і інфарматыўна-рэцэптыўны, але з іншым спосабам падачы інфармацыі; 4) эўрыстычны або часткова-пошуковы, заснаваны на паэтапным навучанні рашэнню даследчых задач, найбольш выразна ён рэалізуецца ў эўрыстычнай гутарцы; 5) даследчы, заснаваны на самастойным выкананні вучнямі сканструіраваных настаўнікамі вучэбных праблем.

Яшчэ ў 50-я гады старэйшы савецкі метадыст В.Р. Карцоў прапанаваў выкарыстаць метадычны падыход да класіфікацыі метадаў і прапанаваў даць яе на аснове ўліку асаблівасцей структуры гістарычных ведаў. Ён вылучыў наступныя групы метадаў:

1. Метады стварэння гістарычных уяўленняў і адзінкавых паняццяў.
2. Метады фарміравання агульных абстрактных гістарычных паняццяў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Метады раскрыцця дыялектыкі гістарычнага развіцця (у тым ліку метады ўстанаўлення ўнутрыкурсавых і міжпрадметных сувязей).
4. Метады ўстанаўлення сувязі паміж гісторыяй і сучаснасцю, прымянення гістарычных ведаў у сучасным грамадска-палітычным жыцці.

Аб прыёмах, праз якія ажыццяўляюцца гэтыя метады, В.Р. Карцоў гаворыць мімаходзь, не раскрываючы іх істотных прыкмет і выкарыстоўваючы выраз “формы навучання”, блізкі да паняцця “прыём”: расказ, гутарка, апісанне, тлумачэнне, разважанне і г.д.

Сістэмы метадаў вывучэння гісторыі, прапанаваная В.Р. Карцовым і А.І. Стражавым, носяць метадычны характар і адлюстроўваюць асаблівасці вучэбнага гістарычнага матэрыялу.

Ідэя распрацоўкі сістэмы метадаў навучання гісторыі знайшла сваё далейшае развіццё ў даследаваннях П.В. Гары. Ён прапанаваў спалучыць дыдактычны і метадычны падыходы для распрацоўкі сістэмы спосабаў вывучэння гісторыі, адэкватнай мэтам навучання, асаблівасцям зместу гістарычнага матэрыялу і ўзроўню навучаемасці школьнікаў. Праблему класіфікацыі метадаў ён прапанаваў вырашаць у дыдактычным плане, бо паўсядзённая практыка работы выкладчыка грунтуецца на трох шляхах пазнання – пазнанне гістарычных з’яў шляхам успрымання слова настаўніка, пазнанне шляхам успрымання нагляднага вобраза і шляхам чытання. Таму мы лічым мэтазгодным прапанаваную крышачку мадэрнізіраваны П.В. Гарой традыцыйна дыдактычны падыход да падзелу метадаў навучання на: 1) метады нагляднага навучання асновам навук; 2) метады вуснага навучання асновам навук; 3) метады навучання друкаваных тэкстаў па асновах навук; 4) метады практычнага навучання асновам навук.

Далей дыдактычны падыход спалучаецца з метадычным, у аснову якога пакладзена спецыфіка гісторыі як навукі. У выніку *структурнага аналізу* П.В. Гара вылучыў у змесце школьнага курса гісторыі два галоўных кампаненты: 1) фактычны і 2) тэарэтычны матэрыял.

Вылучаныя структурныя элементы з’яўляюцца аб’ектыўнай асновай адбору адэкватных прыёмаў вучэбнай работы, якія забяспечваюць эмпірычнае вывучанне фактычнага матэрыялу. Ад эмпірычнага вывучэння фактычнага матэрыялу вучні шляхам індукцыі пераходзяць да асэнсавання сутнасці фактычнага матэрыялу, да тэарэтычнага вучэбнага пазнання гісторыі. У мэтах знаходжання аб’ектыўнай асновы адбора адэкватных метадычных прыёмаў і сродкаў вывучэння тэарэтычнага матэрыялу яго можна падзяліць на чатыры структурныя элементы: 1) гістарычныя паняцці рознай ступені абагульнення; 2) істотныя прычынна-выніковыя сувязі; 3) гістарычныя заканамернасці; 4) тэарэтычныя вывады, якія змяшчаюць ацэнкі гістарычных фактаў, характарыстыку іх істотных прыкмет, прычыны, абагульненні. На аснове гэтых элементаў адбіраюцца прыёмы эфектыўнага засваення тэарэтычнага матэрыялу На аснове гэтых элементаў у фактычным і

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

тэарэтычным змесце школьнага курсу гісторыі ўсё мноства прыёмаў і сродкаў вывучэння гістарычнага матэрыялу П.В. Гара падзяліў на 12 груп.

Аднак, метадычная сістэма, прапанаваная П.В. Гарой, нягледзячы на яе навуковую абгрунтаванасць і дасканаласць, аказалася занадта груваcткай для шырокага ўкаранення ў практыку навучання. Тым не менш яе распрацоўка і апрабацыя на практыцы звярнула ўвагу настаўнікаў на неабходнасць структурна-функцыянальнага аналізу гістарычнага матэрыялу, адбору адэкватных яго вынікам метадычных сродкаў і прыёмаў навучання. Такім чынам, П.В.Гара звярнуў увагу настаўнікаў гісторыі на неабходнасць у бобшай ступені ўлічваць у рабоце спецыфіку гісторыі. Пошукі адказу на гэтыя пытанні працягваюцца і з'яўляюцца адной з актуальных праблем методыкі выкладння гісторыі як навукі.

**Лекцыя 23. Метадыка нагляднага навучання гісторыі.**

1. Функцыі і прызначэнне нагляднасці ў навучанні гісторыі, класіфікацыя наглядных дапаможнікаў. 2. Прыёмы работы з выяўленчай нагляднасцю. 3. Умоўна-графічная нагляднасць ў навучанні гісторыі. 4. Тэхнічныя сродкі і іх прымяненне ў навучанні гісторыі. 5. Кабінет гісторыі.

1. Слова займае вядучае месца ў навучанні гісторыі. Аднак, якім бы яскравым і вобразным не было, яно не можа ва ўзнаўленні гістарычнай рэчаіснасці замяніць сабой наглядных сродкаў. Нагляднасць дапамагае хутка і эканомна па часе ўзнавіць гістарычныя вобразы і сфарміраваць у вучняў гістарычныя ўяўленні. Асаблівасцю навучання гісторыі з'яўляецца тое, што вучні практычна пазбаўлены магчымасці непасрэдна ўспрыймаць падзеі і з'явы далекага мінулага і вымушаны рэканструіраваць іх на аснове розных відаў нагляднасці і славесных апісанняў. Выключна вялікая роля нагляднасці ў пятых і шостых класах, дзе вывучаюцца раннія перыяды гісторыі, аб якіх у вучняў няма выразных вобразаў памяці і уяўленняў.

Нагляднасць ў навучанні гісторыі выконвае шэраг важных функцый: 1) з'яўляецца незамянімым сродкам стварэння ў школьнікаў выразных і гістарычна праўдзівых уяўленняў; 2) служыць асновай для ўсведамлення сутнасці гістарычных падзей і з'яў і эфектыўным спосабам фарміравання гістарычных паняццяў; 3) важным сродкам запамінання і захавання ў памяці гістарычнай інфармацыі; 4) садзейнічае развіццю ў вучняў назіральнасці, увагі, творчага ўяўлення і фантазіі, мышлення і мовы; 5) спрыяе фарміраванню ў вучняў цікавасці і пазнавальнага інтарэсу да вывучэння гісторыі; 6) садзейнічае выхаванню школьнікаў, фарміруе эстэтычныя погляды і пачуцці(асабліва пры выкарыстанні ў якасці нагляднасці мастацкіх твораў вывучаемай эпохі).

Асноўныя віды нагляднасці: прадметная, выяўленчая і ўмоўна-графічная.

Прадметная нагляднасць мае асаблівую пазнавальную каштоўнасць, бо заснавана на непасрэдным успрыйманні сапраўдных рэчавых помнікаў мінулага, або яго матэрыяльных слядоў. Да рэчавых помнікаў мінулага больш блізкага для вучняў часу адносяцца прылады працы, прадметы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дамашняга ўжытку, адзенне, упрыгожанні, транспартня сродкі, зброя, манеты і г.д. Яны экспаніруюцца ў цэнтральных, мясцовых і школьных музеях і могуць быць выкарыстаны праз правядзенне ўрокаў-экскурсій.

Выяўленчая нагляднасць складае самую вялікую групу і займае цэнтральнае месца ў нaглядным навучанні гісторыі. Яна заснаваная на навукова абгрунтаванай вобразнай рэканструкцыі мінулага ў макетах, мадэлях, копіях арыгіналльных рэчаў, вучэбных карцінах, ілюстрацыях, малюнках, фатаграфіях, кадрах кінахронікі, дакументальных і мастацкіх кіна- і тэлефільмах.

Умоўна-графічная нагляднасць адлюстроўвае мовай умоўных знакаў і сімвалаў сутнасць гістарычных з’яў, іх узаемасувязь і дынаміку развіцця. Гэта гістарычныя карты, схемы, графікі, дыяграмы, крэйдавы малюнак, апорныя сігналы і канспекты,.

2. У якасці выяўленчай нагляднасці ў навучанні гісторыі шырока выкарыстоўваюцца творы выяўленчага мастацтва, вучэбныя карціны, партрэты, малюнкі, карыкатуры, фатаграфіі і г.д. Калі яны з’яўляюцца творамі эпохі, створанымі сучаснікамі падзей, або спецыяльна створанымі вучэбнымі карцінамі (напрыклад карціны В. Сурыкава “Пераход Суворава праз Альпы”, “Раніца стралецкай кары”, І. Рэпіна “Іван Грозны забівае свайго сына Івана”, Э. Леснера “Пачатак бою сялянскай арміі Балотнікава пад Масквой” і г.д.), то яны могуць выкарыстоўвацца ў навучанні гісторыі як крыніцы гістарычных ведаў. Малюнкі, партрэты, фатаграфіі, карыкатуры часцей выступаюць у якасці вобразнай ілюстрацыі тзксту падручніка, сродку стварэння гістарычных уяўленняў. Яны могуць выкарыстоўвацца і ў якасці сродку замацавання вывучанага на ўроку.

На ўроку вучэбныя карціны і ілюстрацыі могуць выкарыстоўвацца ў якасці крыніцы ведаў, урокавай апоры, ілюстрацыі і канкрэтызацыі расказа настаўніка пры вывучэнні новага матэрыялу, для замацавання вывучанага на ўроку і ў ходзе праверкі ведаў.

Эпізадычныя карціны, якія адлюстроўваюць адзін з важнейшых момантаў вывучаемай на ўроку гістарычнайпадзеі, як правіла, арганічна ўключаюцца ў расказ настаўніка ў выглядзе карціннага ці аналітычнага апісання.

Тыпалагічная карціна часцей выкарыстоўваецца як крыніца ведаў, а работа з ёй можа заняць цэнтральнае месца на ўроку. У ходзе апісання зместу такой карціны або аналітыка-сінтэтычнай гутаркі настаўнік не толькі фарміруе ўяўленне аб гістарычным факце, але вылучае істотныя прыкметы вывучаемай падзеі, абагульненне якіх дазваляе паспяхова сфарміраваць паняцце, ці зрабіць тэарэтычныя высновы.

Карціны-партрэты дапамагаюць узнавіць вобразы гістарычных асоб. Іх выкарыстанне спалучаецца з кароткай ці разгорнутай характарыстыкай гістарычнай асобы. Пры гэтым вельмі важна каб характарыстыка, якая даецца на ўроку супадала з выбраным для дэманстрацыі партрэтам, або фатаграфіяй. Адным са сродкаў выяўленчай нагляднасці з’яўляецa карыкатура. Умоўнасць карыкатуры, яе “прывязанасць” да канкрэтнай падзеі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

паказ у ёй адной або некалькіх рыс вывучаемай з'явы патрабуе ўменне чытаць карыкатуру, бачыць думку аўтара, яго адносіны да гістарычнага факта ці асобы. 3. Найбольш распаўсюджаным у навучанні гісторыі сродкам умоўна-графічнай нагляднасці з'яўляецца гістарычная карта, прыёмы работы з якой разгледжаны намі раней. Спынімся на методыцы выкарыстання табліц, дыяграм, графікаў, лагічных схем і схематычных малюнкаў.

Вучэбныя табліцы, якія выкарыстоўваюцца ў навучанні гісторыі могуць быць тэкставымі, графічнымі і ілюстраванымі, але, як правіла, гэта дыдактычна падрыхтаваныя дапаможнікі, якія наглядна адлюстроўваюць асноўныя звенні, сутнасць вывучаемых працэсаў, структуру паняццяў, параўнанне і дынаміку развіцця гістарычных падзей, храналогію, будову і структуру вывучаемых фактаў

Дыяграмы гэта наглядныя дапаможнікі якія ўтрымліваюць аднародны статыстычны матэрыял прадстаўлены ў графічнай форме. Па знешніх прыкметах яны могуць быць сегментнымі, круглымі, слупковымі і фігурнымі, а па асаблівасцях зместу – статычнымі і дынамічнымі. *Графікі* ствараюць магчымасць наглядна ўявіць і колькасныя і якасныя характарыстыкі і змены вывучаемых у курсе гісторыі працэсаў і з'яў, дынаміку іх развіцця на працягу пэўнага адрэзку гістарычнага часу.

Схема ўяўляе сабой чарцёж, які адлюстроўвае істотныя прыкметы, сувязі і адносіны гістарычных з'яў. Схематычны малюнак асабліва каштоўны, бо паяўляецца на класнай дошцы па ходу ізлажэння, ўзнікае па меры тлумачэння вучэбнага матэрыяла настаўнікам і тым самым арганізуе слуханне, забяспечвае адначасовае ўспрыйманне вучнямі слова і вобраза, дазваляе паказваць падзеі або з'яву ў дынаміцы.

4. Тэхнічныя сродкі навучання (ТСН) як бы акумуліруюць у сабе ўсе разгледжаныя вышэй сродкі навучання гісторыі. Яны ўзмацняюць яскравасць, эмацыянальнасць, выразнасць і дынамічнасць навучання, стымулююць творчае ўяўленне і мышленне школьнікаў, абуджаюць пазнавальны інтарэс і дапамагаюць паспяхова рэалізаваць выхаваўчыя магчымасці школьных курсаў гісторыі.

Да ТСН адносяцца статычныя экранныя дапаможнікі (дыяпазітывы або слайды, дыяфільмы, транспаранты да графапраектара), дынамічныя або аўдыавізуальныя (кіно і тэлефільмы) і гукавыя (гуказапісы і фонахрэстаматыі) сродкі.

Вучэбныя кіна- і тэлефільмы дынамічныя, найбольш эканомныя па затратах часу сродкі перадачы ведаў, якія спалучаюць зрокавы і гукавы рад. У іх выкарыстоўваюцца дакументальныя кадры хронікі, фрагменты мастацкіх фільмаў, натурныя здымкі мясцовасці і гістарычных помнікаў, вучэбныя інсцэніроўкі. Яны могуць выступаць у якасці тэлевізійных лекцый і экскурсій і драматызацый гістарычных падзей.

Методыка работы з гуказапісамі мае шмат агульнага з методдыкай выкарыстання дынамічных сродкаў навучання. Перад праслухоўваннем настаўнік павядамляе гісторыю гуказапісу і ставіць паўзнавальныя заданні.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Пасля праслухоўвання ў гутарцы вучні дзеляцца ўражаннямі аб праслуханым, а затым настаўнік падводзіць вынікі выканання пастаўленага перад праслухоўваннем задання.

5. Першыя кабінеты гісторыі ў школах паявіліся ў 50-х гадоў ХХст., а з другой паловы 60-х гадоў пачаўся масавы пераход да кабінетнай сістэмы арганізацыі вучэбнага працэса ў савецкай школе. Гэта было абумоўлена ростам вучэбных плошчаў у школах, забяспечанасці вучэбнага працэса вучэбна-наглянымі дапаможнікамі і ТСН.

Пераход да *кабінетнай сістэмы* было заклікана забяспечыць спрыяльныя ўмовы арганізацыі працэса навучання гісторыі для дасягнення аптымальных вынікаў навучання пры найменшых затратах часу і сіл настаўніка і вучняў. Кабінет гэта не толькі база для арганізацыі вучэбных заняткаў, але і база арганізацыі метадычнай работы настаўніка гісторыі.

Матэрыяльная база кабінета складаецца з чатырох асноўных элементаў: 1) абсталявання ў выглядзе спецыяльнай мэблі і прыстасаванняў; 2) неабходных ТСН і апаратуры; 3) фонда наглядных дапаможнікаў; 4) бібліятэкі вучэбнай, метадычнай, навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры па гісторыі. Аптымальна для захавання асноўных фондаў кабінета (наглядных дапаможнікаў, літаратуры) мець пры ім спецыяльнае падсобнае памяшканне. У любым выпадку аажна правільна вырашыць пытанне планіроўкі кабінета так, каб яго абсталяванне было максімальна прыстасавана для работы настаўніка і вучняў і быў забяспечаны зручны доступ да асноўных фондаў кабінета. Афармленне інтэр’ера кабінета павінна быць мінімальным. Яно не павінна адцягваць увагу школьнікаў ад вучэбнага працэса. Трэба пазбягаць размяшчэння статычных стэндаў, якія не нясуць дыдактычнай нагрузкі.

Фонды кабінета павінны быць добра ўпарадкаваны, каб імі было лёгка карыстацца. Для гэтага неабходна стварыць метадычную картатэку кабінета, якая ўключае ў сябе тэхналагічную карту на кожны ўрок гісторыі. У ёй указваецца тэма ўрока, даецца пералік сродкаў навучання, якія ёсць у кабінеце і могуць быць выкарыстаны пры вывучэнні дадзенай тэмы (хрэстаматыі, навукова-папулярная літаратура, карты, схемы, вучэбныя карціны, слайды, дыяфільмы, кінафрагменты, відэафільмы, камп’ютэрныя прэзентацыі і г.д.), з указаннем фонда і адзінкі іх захавання ў фондзе. Пры гэтым вельмі важна, каб кожны вучэбна-нагляднны дапаможнік знаходзіўся ў фондзе захавання кабінета на строга вызначаным яму месцы.

Арганізацыя кабінетаў гісторыі стварыла шырокія магчымасці для выкарыстання ТСН і камп’ютэра на ўроках гісторыі. Аднак масавая практыка паказвае, што ўрок можа быць насычаны самымі сучаснымі сродкамі навучання, але не даць жадаемых вынікаў. Больш за тое вынікі могуць аказацца нават горшымі, чым у паралельных класах, дзе яны не ўжываліся. Прычынай гэтаму з’яўляецца тое, што настаўнік памылкова вызначыў дыдактычную ролю ТСН на ўроку, перагрузіў урок дэманстрацыямі, не акцэнтаваў увагу на галоўных кадрах і фрагментах відэаматэрыялаў, перадаў свае функцыі тэхнічным сродкам навучання.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

Пры выбары найбольш рацыянальных прыёмаў вывучэння новага матэрыялу з выкарыстаннем ТСН і камп’ютэра неабходна улічваць змест, дыдактычную значнасць выкарыстоўваемых дапаможнікаў, асаблівасць і паўнату раскрыцця ў іх вучэбнага матэрыялу, пазнавальныя магчымасці школьнікаў і самае галоўнае ўласную метадычную задумку настаўніка.

Наяўнасць добра абсталяванага кабінета гісторыі дазваляе эфектыўна арганізаваць пазакласную работу па гісторыі ў розных формах: гістарычнага гуртка, навуковага таварыства, клуба, музея, арганізацыі гістарычнага або краязнпаўчага вугалка, дыспутаў, выстаў, пазакласнага чытання і г.д.

Такім чынам, сродкі нвучання, якія сканцэтраваны ў кабінеце, сістэма работы з імі садзейнічаюць развіццю самастойнай дзейнасці школьнікаў, павышаюць іх інтарэс да вывучэння гісторыі, з’яўляюцца базай ажыццяўлення настаўнікам комплекснага падыходу да адукацыі, выхавання і развіццю школьнікаў.

**Лекцыя 24. Метады вуснага навучання гісторыі**

1. Месца і роля вуснага слова ў навучанні гісторыі. 2. Характарыстыка асноўных прыёмаў вуснага выкладання. 3. Патрабаванні да вуснага ізлажэння настаўніка.

1. У сучаснай масавай школе вуснае слова на ўроках гісторыі ўсё болей саступае сваё месца друкаванаму слову і электронным сродкам навучання. Праціўнікі вуснага слова ў навучанні сцвярджаюць, што слухаючы настаўніка вучні застаюцца пасіўнымі, а франтальнае навучанне вядзе да навязвання вучням пункту гледжання настаўніка і выпрацоўвае ў іх, у адрозненні ад работы з першакрыніцамі і друкаваным тэкстам, калектыўныя формы мышлення. Не з’яўляючыся праціўнікам вывучэння гістарычных дакументаў, выкарыстання друкаваных і электронных сродкаў навучання, мы не можам пагадзіцца з довадамі прыхільнікамі выцяснення вуснага слова з вучэбнага працэсу.

Па-першае, кожны гісторык ведае, што гістарычны дакумент можа многае расказаць вучонаму толькі пры пэўных умовах. Толькі ведаючы гэтыя ўмовы, валодаючы спецыяльнымі ўменнямі знешняй і ўнутранай крытыкі гістарычнай крыніцы можна зразумець сэнс, месца і значэнне гэтага дакумента. Такімі ведамі і ўменнямі валодае толькі настаўнік і толькі ён можа даваць адэкватную інтэрпрэтацыю першакрыніцы. Па-другое, гістарычная крыніца ў навучанні гісторыі выбіраецца настаўнікам ці аўтарам падручніка, якія дакладна ведаюць, што яны хочуць даказаць ці праілюстраваць выкарыстаннем гэтага дакумента. Такім чынам настаўнік зноў застаецца ў цэнтры навучання, а пытанні, якія вучні павінны засвоіць пры аналізе дакумента загадзя вызначаны ім, гэта ж робяць і аўтары падручніка. Такім чынам уяўная актыўнасць школьніка аказваецца псеўдаактыўнасцю. Па-трэцяе, выкладанне пабудаванае на вывучэнні першакрыніц патрабуе значных затрат часу. У такіх умовах значна лягчэй і эканомней самаму настаўніку раскрыць сэнс дакумента. Па-чацвертае, калі ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

навучанні гісторыі сканцэнтравацца толькі на рабоце з першакрыніцамі, то вучань атрымае веды, якія падобныя на незлічоныя каменьчыкі дзіцячай мазаікі, цэласная карціна гістарычнага працэса адыходзіць на другі план, а шматлікія асобныя часцінкі ведаў забываюцца, бо памяць утрымлівае адзінкавае, толькі пры апоры на цэлае, яго агульны сэнс. Па-пятае, калі навучанне весці выключна на выкарыстанні друкаваных і іншых першакрыніц, то неабходна паказаць дзецям, што гістарычныя дакументы заўсёды суб'ектыўныя і нясуць у сабе ідэалагічны і партыйны адбітак. Каб паказаць гэта неабходна будзе прыцягнуць дадатковыя першакрыніцы, патраціць яшчэ больш часу. Навучанне ператворыцца ў навуковы семінар і далёка выйдзе за межы школьнага навучання і яго задач. Гісторыя з'яўляецца вусным прадметам менавіта таму ў яе навучанні вуснае слова займае цэнтральнае месца. Вядучае роля вуснага слова вызначаецца тымі важнымі функцыямі, якія яно выконвае ў навучанні гісторыі.

Перш за ўсе гэта вобразная, або апавядальна – апісальная функцыя. Але роля вуснага слова гэтым не вычэрпваецца, яно выконвае яшчэ адну важную для навучання развіваючую, або лагічную функцыю. У спалучэнні вобразнай і лагічнай функцый жывога слова рэалізуецца яго выхаваўчая функцыя. Праз вобразнасць выкладання ажыццяўляецца эмацыянальнае ўздзеяне на пачуцці школьнікаў, дасягаецца суперыжыванне гістарычнай падзеі, вучні падводзяцца да маральных ацэнак мінулага, а логіка ўсведамлення сутнасці гістарычных падзей ўздзейнічае на фарміраванне свядомасці і перакананняў школьнікаў, а праз іх уплывае на паводзіны. Вуснае слова выконвае ў выкладанні гісторыі таксама важную арганізацыйную функцыю. З дапамогай яго настаўнік арганізуе і накіроўвае вучэбны працэс, самастойную пазнавальную дзейнасць, фармуліруе заданні, указвае на шляхі і спосабы іх выканання, правярае і ацэньвае дзейнасць вучняў.

2. Для таго, каб паспяхова рэалізаваць закладзеныя ў вусным слове адукацыйна-выхаваўчыя магчымасці неабходна авалодаць асноўнымі прыёмамі вуснага ізлажэння, распрацаванымі ў методыцы выкладання гісторыі. Асноўнымі відамі маналагічнай формы вуснага ізлажэння з'яўляюцца павестванне, апісанне, характарыстыка, тлумачэнне і разважэнне.

Кароткае паведамленне, або канспектыўнае павестванне выкарыстоўваецца тады, калі неабходна за кароткі адрэзак часу перадаць вучням значны аб'ём інфармацыі.

Апісанне – паслядоўнае ізлажэнне прыкмет і асаблівасцей гістарычнай з'явы, яе істотных рыс, будовы, стану, або знешняга выгляду. У адрозненне ад расказа ў апісання няма сюжэту, але заўсёды ёсць канкрэтны аб'ект, уяўленне аб якім неабходна стварыць у вучняў. У навучанні гісторыі выкарыстоўваюць два віды апісання: карціннае, якое стварае цэласную карціну або вобраз гістарычнай з'явы(Куліковa поле, карціна даліны Ніла, выгляд горада пасля захопу яго мангола-татарамі) і аналітычнае, якое ўтрымлівае аналіз стану, будовы і прызначэння асобных элементаў вывучаемага аб'екта(славянскі пасёлак, сярэдневяковы замак, саха, цяжкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

калёсны плуг, мушкет і г.д.) Аналітычнае апісанне набліжаецца да тлумачэння, але ў адрознеене ад яго скіраванае толькі на выяўленне знешніх прыкмет і прызначэнне дэталей, вывучаемага аб'екта ці прадмета.

Характарыстыка гістарычнай з'явы – разнавіднасць апісання, якая ўключае ў сябе дакладна сфармуліраваны пералік яе істотных рыс і асаблівасцей у іх унутранай узаемасувязі. Характарыстыка можа быць кароткай і разгорнутай. Тлумачэнне – гэта паслядоўнае раскрыццё ўнутранай сутнасці гістарычных фактаў, з'яў, паняццяў і тэрмінаў, заснаванае на аналізе і абагульненні істотных прыкмет і прычынна-выніковых сувязей.

Там, дзе стаіць задача раскрыцця і абгрунтавання тэарэтычных высноў і абагульненняў, ізлажэнне настаўніка набывае характар разважання і доказу. Так, напрыклад, настаўнік даказвае вучням неабходнасць пятроўскіх пераўтварэнняў ў Расіі ў XVII ст., заканамернасць прамысловай рэвалюцыі і пераходу да індустрыяльнага грамадства і г.д.

Разважанне – прыём вуснага ізлажэння, заснаваны на аналізе і абагульненні гістарычных фактаў, паслядоўным раскрыцці прычын, і ўзаемасувязей, якое падводзіць вучняў да усведамлення тэарэтычных абагульненняў і высноў, сутнасці развіцця гістарычнага працэса.

Лекцыя – разгорнутае тэарэтычнае разважанне, навуковы аналіз і абагульненне праведзенае ў пэўнай лагічнай паслядоўнасці, якое падводзіць вучняў да тэарэтычнага абагульнення і асэнсавання канкрэтнага гістарычнага матэрыялу. Лекцыя, як і расказ настаўніка, сінтэтычны прыём вуснага выкладання гісторыі.

Гутарка – дыялагічная форма вуснага выкладання, заснаваная на актыўным і цесным ўзаемадзеянні суб'ектаў працэса навучання, якая скіравана на дасягнення пэўнай дыдактычнай мэты.

3. Вуснае ізлажэнне гістарычнага матэрыялу настаўнікам павінна быць даступным, наглядным і канкрэтным. рэзаніраваць з узростам, інтарэсамі, мышленнем і пачуццямі школьнікаў. Каб дасягнуць гэтага настаўнік павінен звярнуць увагу на тры моманты. Па-першае ён павінен развіць у сябе і ў дзецях памяць і творчае ўяўленне (фантазію), без якіх нельга стварыць змястоўныя вобразы гістарычнага мінулага. Канкрэтнасць і яснасць апісанняў надае гістарычнай карціне дзейснасць, якая здольная выклікаць суперажыванне. Па-другое, яму неабходна заўсёды памятаць, што ў вучняў, асабліва малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту, няма выразных уяўленняў аб мінулым, іх трэба стварыць. Каб выканаць гэту задачу неабходна ўдасканальваць свае майстэрства расказчыка. Вуснае слова *прымусовае* па тэмпе ўспрыймання. Пагэтаму тэмп ізлажэння павінен быць ні занадта высокім (думка вучня не зможа паспяваць за тэмпам ізлажэння настаўніка), ні занадта марудным. Пры марудным тэмпе ізлажэння цяжка паспець выкласці матэрыял у аб'ёме, прадугледжаным праграмай і выразна і вобразна растлумачыць гістарычныя факты. Марудны тэмп ізлажэння прытупляе ўспрыйманне і істотна зніжае інтарэс вучняў да расказа настаўніка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Не дастатковяя расчлененасць вуснага слова яшчэ адзін недахоп вуснага слова, які настаўніку неабходна пераадольваць – у працэсе слухання вучням не заўсёды проста вычленіць галоўнае і істотнае ў расказе. Вуснае ізлажэнне настаўнікам павінна служыць вучням узорам аналіза і асвятлення гістарычнага матэрыялу. Вучням мала скзаць, што яны павінны рабіць ( “Думайце!”, “Прааналізіруйце!”, “Параўнайце!” і г.д.), але трэба паказаць, як гэта рабіць. У той ці іншай ступені любое метадычна правільнае ізлажэнне настаўніка знаёміць вучняў з правіламі асвятлення і аналіза гістарычных падзей, але ў большай ступені гэтаму спрыяе выкарыстанне разважаючага ізлажэння пры Немалаважным з’яўляецца патрабаванне да вуснай мовы настаўніка. Яна павінна быць яркай, вобразнай, простай і дакладнай, свабоднай ад слоў паразітаў(“так”, “вот”, “значыць” і г.д.). Часам, каб прыдаць сваёй мове яркасць і вобразнасць, настаўнікі прыбягаюць да празмернага выкарыстання эпітэтаў, вобразных параўнанняў, а ў выніку робяць свой расказ цяжкім для ўспрымання, топяць у шалупінні слоў галоўную думку, пазбаўляюць ізлажэнне навуковай дакладнасці.

**Лекцыя 25. Методыка выкарыстання друкаваных крыніц у навучанні гісторыі.**

1. Характарыстыка друкаваных сродкаў навучання гісторыі. 2. Роля падручніка ў навучанні гісторыі і методыка работы з ім. 3. Выкарыстанне гістарычных дакументаў у навучанні гісторыі. 4. Методыка выкарыстання навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры ў навучанні гісторыі.

1. У рашэнні адукацыйна-выхаваўчых задач навучання гісторыі, развіцці пазнавальных здольнасцей вучняў значнае месца належыць друкаваным сродкам навучання. Друкаванае слова можа выконваць усе тыя ж функцыі, што і вуснае (апавядальна-апісальную, лагічную, выхаваўчую і арганіцыйную), але яно менш разнастайнае па эмацыянальнай афарбоўцы. Друкаваныя крыніцы даюць магчымасць у любы час звярнуцца да іх, перачытаць і паразважаць над прачытаным.

Друкаванае слова ў выкладанні гісторыі прадстаўлена разнастайнымі сродкамі навучання. Гэта падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, хрэстаматыі, кнігі для чытання, навукова-папулярная і мастацкая літаратура, перыядычны друк. 2. Падручнік гэта найважнейшы сярод друкаваных крыніц ведаў сродак навучання. У адрозненні ад іншых друкаваных крыніц ён змяшчае сістэму ведаў па пэўнаму курсу гісторыі. Для раскрыцця гэтай сістэмы ў падручніку выкарыстоўваюцца слова, вобраз і ўмоўны знак у іх арганічным спалучэнні. Для школьнікаў падручнік – першая і асноўная, а часам і адзіная навукова-папулярная кніга па гісторыі (бо многія вучні, акрамя падручніка гісторыі, нічога ў гэтай галіне ведаў не чытаюць).

Падручнік гісторыі складаецца з шэрагу кампанентаў: тэксту(асноўны, дадатковы, паясняльны) і пазатэкставых кампанентаў: апарату арганізацыі засваення (сістэма пытанняў і заданняў, памяткі) і апарату арыентыроўкі (навукова-пазнавальныя ілюстрацыі, карты, схемы, табліцы, слоўнікі тэрмінаў і ўказальнікі). У практыцы работы школы вызначылася вялікае

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

мноства прыёмаў работы з падручнікам. Найбольш распаўсюджанымі сярод іх з’яўляюцца:тлумачальнае, каменціраванае і выбарачнае чытанне; выкарыстанне элементаў тэксту падручніка ў тлумачэнні новага матэрыялу на ўроку або спасылка на яго ў час тлумачэння; самастойнае чытанне падручніка па заданню настаўніка; састаўлення простага, ці разгорнутага плана параграфа; работа над загалоўкамі глаў, параграфаў і пунктаў (прачытаць і такім чынам пазнаёміць з планам урока);знаходжанне вучнямі адказу на пастаўленае настаўнікам пытанне ў тэксце падручніка;падцверджанне высновы, зробленай на ўроку фактамі з тэксту падручніка; параўнанне двух або некалькіх з’яў, апісаных у падручніку; выкананне на аснове работы з падручнікам заданняў на доказ; работа над выніковымі высновамі, фармулеўкамі і азначэннямі паняццяў, новымі тэрмінамі і г.д.

Гэты далёка не поўны пералік метадычных прыёмаў выкарыстання падручніка адлюстроўвае яго месца і ролю ў навучанні гісторыі і арганізацыі самастойнай пазнавальнай дзейнасці школьнікаў.

3. Аб тым, якія гістарычныя дакументы выкарыстоўваюцца ў навучанні гісторыі гаварылася, калі давалася характарыстыка сродкаў навучання гісторыі.

Выкарыстанне гістарычных дакументаў пры навучанні гісторыі праводзіцца з мэтай: азнаямлення вучняў з першакрыніцамі як гістарычнымі помнікамі і як крыніцамі гістарычных ведаў;прыцягнення ўвагі вучняў да гістарычнага факта, павышэня эмацыянальнасці яго засваення; выпрацоўкі ў вучняў самастойнага навуковага падыходу к крыніцам гістарычных ведаў, фарміравання прыёмаў работы з імі, такімі як аналіз, сінтэз, супастаўленне, параўнанне гістарычных падзей і з’яў і г.д. Магчымыя два спосабы выкарыстання гістарычных дакументаў у навучанні гісторыі: уключэнне гістарычнага дакумента ў ізлажэнне настаўніка і арганізацыя самастойнай работы вучняў над тэкстам дакумента, або яго аналіз і абагульненне.

Пры якіх жа ўмовах мэтазгодна ўключэнне фрагмента дакумента у расказ настаўніка? Перш за ўсё тады, калі ён: а) невялікі па аб’ёму і лёгка ўспрымаецца на слух; б) просты і зразумелы вучням без дадатковых камянтарыяў, в) узмацняе эмацыянальнасць, або канкрэтнасць ізлажэння; г) абуджае пазнавальны інтарэс вучняў; д) змяшчае выказванне гістарычных дзеячоў і, такім чынам, з дапамогай простай мовы, трапнай характарыстыкі, дапамагае ажывіць ізлажэнне.

Гістарычны дакумент выкарыстоўваецца таксама з мэтай узмацнення доказнасці і пераканаўчасці ізлажэння настаўніка на ўроку, падцвярджэння даваемых ім характарыстак і высноў. У такім выпадку неабходна спасылка на цытуемы дакумент і кароткая яго характарыстыка.

Кароткі аналіз прыведзенага гістарычнага дакумента надае выкладанню настаўніка аргументаваны характар. У залежнасці ад зместу гістарычнага дакумента, ад падрыхтаванасці класа кароткі разбор дакумента можа спалучацца з аналітыка-сінтэтычнай гутаркай. У такім выпадку пытанні

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пастаўленыя да дакумента перад яго разборам набываюць характар пастаноўкі праблемы.

Іншая справа – разгорнутая работа над дакументам з класам. Такую работу настаўнік вядзе над дакументамі, змешчанымі ў падручніку гісторыі ці ў хрэстаматыі і знаходзяцца перад вачыма кожнага вучня. Перад пачаткам работы над дакументам на ўроку, трэба падрыхтаваць вучняў да яго ўспрымання. Работа над тэкстам дакумента можа быць арганізавана па-рознаму: разбор дакумента настаўнікам; разбор дакумента вучнямі пад непасрэдным кіраўніцтвам настаўніка; самастойная работа вучняў над дакументам на ўроку па заданню настаўніка; самастойная дамашняя работа вучняў над дакументам.

У практыцы работы настаўнікаў склалася мноства прыёмаў работы з дакументаў. Найбольш распаўсюджанымі з іх з'яўляюцца наступныя: цыціраванне для падцвярджэння думкі і цыціраванне з паследуючым тлумачэннем зместу цытаты, каменціраванае чытанне дакумент, выбарачнае яго чытанне па заданню настаўніка, аналіз дакумента па пытаннях настаўніка, аналіз дакумента і складанне простага або разгорнутага плана, складанне тэзісаў, або канспекта гістарычнай крыніцы, напісанне рэфератаў, дакладаў, паведамленняў на аснове самастойнага вывучэння гістарычных крыніц, рашэнне праблемных задач на аснове вывучэння гістарычных крыніц.

4. Навукова-папулярная, мастацкай літаратуры і перыядычны друк даволі шырока выкарыстоўваюцца ў навучанні гісторыі. Шляхі іх выкарыстання тыя ж, што пры выкарыстанні падручнікаў і гістарычных дакументаў. Яны могуць уключацца ў ізлажэнне настаўніка, могуць выступаць у якасці матэрыялу для самастойнай работы на ўроку, а таксама сродкам арганізацыі самастойнай работы вучняў дома пры падрыхтоўцы паведамленняў, дакладаў і рэфератаў.

Задачы навучання гісторыі патрабуюць ад настаўніка, каб гістарычны матэрыял быў даведзены да вучняў канкрэтна, вобразна, эмацыянальна і наглядна. Вялікую дапамогу ў гэтым можа аказаць яму мастацкая літаратура, спецыфіка якой складаецца ў тым, што яна адлюстроўвае гістарычную рэчаіснасць ў канкрэтных мастацкіх вобразах.

Матэрыял, які мы называем мастацкай літаратурай у прымяненні да выкладання гісторыі вельмі разнастайны. Ён можа быць раздзелены на тры групы: 1) фальклор, народныя прымаўкі, песні, казанні, легеенды; 2) літаратурныя помнікі эпохі; 3) гістарычная белетрыстыка.

Кожная з групп мае свае навукова-гістарычнае значэнне, саваё асобнае прымяненне. Спынімся на кожнай з іх.

Характарызуючы культуру таго ці іншага народа, асабліва ранніх перыядаў ягогісторыі, натуральна звярнуцца да народнай творчасці. Фальклор дапаможа ажывіць ізлажэнне настаўніка, зрабіць яго блізкім да мовы вывучаемай эпохі. Выкарыстоўваючы на ўроку паданні, настаўнік не будзе ў іх шукаць матэрыял для характарыстыкі гістарычных падзей (барацьба з татарамі, крыжакамі), бо ў навуковых адносінах фальклорны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

матэрыял вельмі ненадзейны, але ён дакладна перадае думкі і пачуцці народа, ацэнкі ім гістарычных падзей, дазваляе ўзнавіць вывучаемую эпоху і адносіны да яе сучаснікаў.

Выкарыстоўваючы літаратурныя творы эпохі трэба ўлічваць, што з многімі з іх вучні ўжо знаёміліся на ўроках літаратуры. Да такіх твораў настаўнік гісторыі падыходзіць па-асобаму. Ён разглядае іх як своеасаблівыя першакрыніцы гістарычных ведаў, якія адлюстроўваюць вывучаемую эпоху. Пры гэтым яго цікавяць тыя бакі літаратурных твораў, якія адлюстроўваюць грамадскія адносіны, гістарычныя абставіны, сацыяльна-палітычнае крэда аўтара.

Трэці від мастацкай літаратуры, выкарыстоўваемай у выкладанні гісторыі – гэта гістарычная белетрыстыка. Да яе адносяць гістарычныя аповесці, раманы, п’есы, паэмы, вершы, напісаныя аўтарамі больш позняга часу на аснове вывучэння гістарычных крыніц. Чытанне мастацкай літаратуры абагачае ўяўленні настаўніка аб мінулым канкрэтнымі гістарычнымі вобразамі, якія ён можа выкарыстаць пры падрыхтоўцы яркага займальнага расказа на ўроку. Такім чынам, выкарыстанне друкаванага слова ў навучанні гісторыі выконвае ролю адной з крыніц ведаў і валодае шырокімі магчымасцямі для арганізацыі пазнавальнай дзейнасці школьнікаў, фарміравання у іх прыёмаў (спосабаў) вучэбнай работы з гістарычным матэрыялам.

**Лекцыя 26-27. Урок гісторыі і падрыхтоўка да яго правядзення 4г.**

1.Урок асноўная форма арганізацыі вучэбнага працэсу па гісторыі. 2.Тыпы ўрока гісторыі. 3. Структура ўрока. 4. Сучасныя патрабаванні да ўрока гісторыі. 5. Асноўныя этапы падрыхтоўкі да ўрока:планіраванне працэсу вывучэння гісторыі ў школе;вызначэнне мэты і задач ўрока (мадэліраванне вынікаў навучання); канструіраванне тэхналогіі правядзення ўрока; афармленне плана канспекта ўрока;рэфлексія вынікаў правядзення ўрока.

1. У нашай краіне, як і ў большасці краін свету, выкарыстоўваецца класна-урочная сістэма школьнага навучання, у аснову якой пакладзены два асноўныя элементы клас і ўрок. Клас – гэта гэта група вучняў пастаяннага саставу, якія маюць прыкладна аднолькавы ўзрост і навучаюцца па аднолькавых праграмах. Урок – гэта вучэбныя заняткі, якія маюць аднолькавую працягласць па часе, праводзяцца настаўнікам па раскладу і забяспечваюць засваенне пэўнай часткі вучэбнай праграмы. Урок гэта асноўная, прынятая ў школе адзінка арганізацыі вучэбнага працэса, у тым ліку і па гісторыі. Аднак урок нельга лічыць адзінай формай арганізацыі вучэбнага працэса. Веды вучні могуць атрымліваць і пры выкарыстанні іншых форм навучання: самастойнага чытання вучэбнай і навукова-папулярнай літаратуры, пазаўрочных экскурсіях, на кансультацыях, індывідуальных і дапаможных занятках з настаўнікам, у пазакласнай рабоце – гістарычных гуртках і таварыствах, краязнаўчых экспедыцыях, алімпіядах і г.д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Урок – гэта маленькая, арганічна завершаная частка вучэбнага працэса, якая вырашае канкрэтную адукацыйна-выхаваўчую задачу арганічна звязана з усёй сістэмай навучання канкрэтнай навуцы Ён уключае ў сябе ўсе асноўныя кампаненты працэса навучання:мэты навучання, паўнацэнны змест навучання, паведамленне настаўнікам пра зрозныя крыніцы навуковых ведаў, пазнавальную дзейнасць вучняў па іх засваенню і рэфлексію вынікаў навучання.

2. У методыцы выкладання гісторыі, як і ў дыдактыцы ў цэлым, многа размоў і спрэчак вядзецца аб класіфікацыі, або аб тыпалогіі ўрокаў гісторыі. З праблемай выбару тыпу ўрока настаўнік сутыкаецца штодзённа пры падрыхтоўцы да заняткаў. Гэта тлумачыцца рознымі падыходамі і крытэрыямі да вызначэння тыпа урокаў. Самымі распаўсюджанымі і традыцыйнымі з'яўляюцца тыпалогіі па двух наступных крытэрыях: 1)асноўных дыдактычных мэтах, якія вырашаюцца на ўроку і 2)спосабу правядзення ўрока, або вядучаму метаду, які дамінуе на ўроку.

Першая тыпалогія ўключае ў сябе такія тыпы ўрокаў: 1) вывучэння новага матэрыялу; 2) паўтарэння і абагульнення, 3) выпрацоўкі ўменняў і навыкаў; 4) уліку і праверкі ведаў, уменняў і навыкаў; 5) камбінiраваны, або састаўны урок, які ўключае усе асноўныя звенні процэсу навучання і вырашае некалькі дыдактычных мэт: засваенне ведаў, уменняў і навыкаў, паўтарэнне і абагульненне, праверку вынікаў навучання. Гэты тып ўрока найбольш распаўсюджаны ў практыцы навучання, бо якмы ўжо гаварылі, уяўляе сабой завершаны працэс навучання.

Другая традыцыйная класіфікацыя ўключае ў сябе такія тыпы ўрокаў, як урок расказ, урок гутарка, урок экскурсія, кінаўрок, тэлкўрок, урок работы з гістарычным дакументам, урок самастойнай работы, урок лекцыя, урок семінарскія заняткі, урок практычных заняткаў, урок лабараторных заняткаў і г.д.

3. Пад структурай урока трэба разумець спалучэнне тых ці іншых звенняў працэса навучання, якія рэалізуюцца праз адпаведныя формы работы. У 50-60-х гадах 20 ст. структура ўрока прыцягвала да сябе вялікую ўвагу як з боку настаўнікаў так і вучоных- метадыстаў. Гэта было выклікана тым, што, насуперак рэкамендацыям дыдактыкі і методыкі выкладання, ўрокі ў школе набылі шаблонную і закаснелую структуру камбінiраванага ўрока. Кожны ўрок пачынаўся з праверкі дамашняга задання, затым ішло паведамленне новага матэруялу, замацаванне і затым давалася дамашняе заданне. Такая паслядоўнасць стала ўсеагульнай заканамернасцю і не толькі для ўрокаў гісторыі, але і для ўсіх іншых прадметаў. Іншыя тыпы ўрокаў практычна не выкарыстоўваліся, што адмоўна адбівалася на выніках навучання, зніжала цікавасць школьнікаў да выкарыстоўваемых ў школе арганізацыйных форм работы.

У структуры любога тыпу ўрока заканамерна прысутнічаюць асноўныя звенні працэса навучання: 1) арганізацыя класса, якая ўключае ў сябе падрыхтоўку ўсяго неабходнага да ўрока і настрой на прадуктыўную работу, 2) актуалізацыю ведаў засваеных на папярэдніх уроках, або праверку

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дамашняга задання, 3)падрыхтоўку да ўспрыймання новага матэрыялу. 4)вывучэнне новага вучэбнага матэрыялу, авалоданне новымі ведамі, уменнямі і навыкамі, 5)пярвічнае паўтарэнне, або замацаванне засвоенага на дадзеным уроку, або рэфлексію, 6) дамашняе заданне, заарыентаванае на арганізацыю самастойнай работы вучняў па авалоданню атрыманымі на ўроку ведамі, уменнямі і навыкамі. Іншая справа, што на ўроках розных тыпаў гэтыя асноўныя элементы структуры ўрока спалучаюцца ў розных суадносінах.

Такім чынам урок любога тыпу ўтрымлівае адны і тыя ж структурныя элементы, аднак спалучэнне іх па часе рознае. Выбіраючы структуру ўрока мы перш за ўсё павінны імкнуцца да таго, каб яна не была шаблоннай і стэаратыпнай. Так на камбініраваным ўроку праверку ведаў можна правесці не толькі ў пачатку ўрока, але і паходу вывучэння новага матэрыялу, або разам з замацаваннем ў канцы ўрока. Пры выбары структуры трэба ўлічваць асаблівасці ўспрыймання і засваення ведаў на ўроку, выяўленыя псіхолагамі. Так яны сцвярджаюць, што самым спрыяльным для засваення інфармацыі на ўроку з'яўляецца час з 4 па 26 хвіліну, калі магчымае 100% засваенне ведаў; з 26 па 34 – толькі 50%, з 34 па 42 хвіліну каля 20%. У канцы ўрока з 43 па 45 хвіліну магчымасці да засваення ведаў набліжаюцца к нулю.

4. Сучасныя патрабаванні да ўрока гісторыі. У практыцы навучання гісторыі, склалася вялікае мноства разнастайных пералікаў дыдактычных патрабаванняў да ўрокаў. Спынімся на тых патрабаваннях, якія методыка прад'яляе да сучаснага ўрока: 1) Паўнацэннасць гістарычнага зместу ўрока. 2) Паўнацэннасць педагагічнай задумкі. 3) Улік важнай ролі матывацыі вучэння 4) Арганізацыя актыўнай пазнаваўчай дзейнасці вучняў на ўроку.5) Гібкасць методыкі ўрока. 6) Высокая выніковасць урока.

5.Асноўныя этапы падрыхтоўкі да ўрока гісторыі.

Планіраванне вывучэння гісторыі ў школе. Падрыхтоўка настаўніка да выкладання гісторыі пачынаецца задоўга да пачатку навучальнага года са складання календарна-тэматычнага планавання. Складанне гэтага планавання ўяўляе сабой падрыхтоўку мадэлі вывучэння, або распрацоўкі тактыкі арганізацыі працэсу навучання таго ці іншага курса гісторыі. Календарна-тэматычны план складаецца ў выглядзе табліцы, якая ўтрымлівае наступныя графы, або калонкі: 1) № па парадку; 2) Назва раздзела, тэмы і тэмы ўрока; 3)дата правядзення; 4) асноўныя паняцці і ідэі; 4) спосабы дзейнасці,або ўменні і навыкі; 5) сродкі навучання(нагляднасць); 6) літаратура для вучняў; 7) літаратура для настаўніка; 7) дамашняе заданне. Часам указваецца тып урока і да кожнага раздзела, тэмы і ўрока вызначаюцца мэты нвучання.

Ідучы на ўрок, настаўнік папярэдне складае план, або план-канспект урока. Складанне плана ўрока ўваходзіць у фунцыянальныя абавязкі настаўніка і з'яўляюцца справаздачай за другую палову рабочага дня. Прыстуваючы да складання плана ўрока настаўнік вызначае тэму ўрока і яго задачы. Мадэліраванне вынікаў навучання, або вызначэнне мэты ўрока. Агульныя мэты навучання гісторыі вызначаюцца ў Дзяржаўным стандарце і ў школьных праграмах па гісторыі. Мэты вывучэння кожнага курса, раздзела

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і тэмы вызначаюцца настаўнікам пры складанні тэматычнага планавання. Мэта кожнага ўрока – напярэдадні, пры непасрэднай падрыхтоўцы да ўрока. Яна, як і мэты вывучэння гісторыі ў цэлым, ўтрымлівае тры асноўныя аспекты: адукацыйны, выхаваўчы і развіваючы. Вызначаная мэта ўрока звычайна канкрэтызуецца вызначэннем прыватных задач, вырашэнне якіх ў сукупнасці забяспечвае рэалізацыю мэты.

Што неабходна зрабіць, каб аптымальна вызначыць мэту і задачы ўрока? Па-першае, настаўнік знаёміцца са зместам гістарычнага матэрыяла, які будзе вывучацца на ўроку; па-другое, ажыццяўляе яго структурна-функцыянальны аналіз. У ходзе структурнага аналізу ён вылучае фактычны і тэарэтычны кампаненты матэрыяла параграфа, галоўныя і важныя ў адукацыйна-выхаваўчых адносінах гістарычныя факты, вызначае іх функцыянальныя магчыасці для вырашэння адукацыйных, выхаваўчых і развіваючых задач. Па-трэцяе, ацэньвае пазнавальныя магчымасці вучняў канкрэтнага класа, узровень іх навучаемасці і выхаванасці.

Пасля вызначэння задач урока, настаўнік прыступае да канструіравання тэхналогіі правядзення ўрока. Ён вызначае сродкі навучання, якія будуць выкарыстаны на ўроку. На дадзеным ўроку гэта: гістарычная карта “Старажытны Егіпет”, вучэбная карціна “У даліне Ніла”, падручнік па гісторыі для 5 класа, фрагменты дыяфільма “Старажытны Егіпет”, ілюстрацыі падручніка і фрагменты егіпецкіх міфаў, прыведзеныя ў падручніку. Прадумвае паслядоўнасць вывучэння матэрыялу і выкарыстання розных сродкаў навучання, метадычных прыёмаў і форм работы з гэтымі сродкамі. Далей ён прыступае да канструіравання тэхналогіі правядзення ўрока і і яе афармлення праз напісання плана, або плана-канспекта ўрока.

Пасля напісання плана ўрока карысна яшчэ раз уважліва пачытаць створаную мадэль урока, патрэніравацца ў выкарыстанні на ўроку карты, крэйдавых малюнкаў, схем, дыяграм, падрыхтаваць усё неабходнае да ўрока.

Рэфлексія спосабаў правядзення ўрока. Паспяховая і эфектыўная работа настаўніка на ўроку магчымая толькі тады, калі ён ажыццяўляе пастаянную рэфлексію сваёй дзейнасці, робіць самааналіз уласнай дзейнасці на кожным уроку і дзейнасці калег, што дазваляе вучыцца перш за ўсе на чужых памылках.

Схема аналіза ўрока гісторыі

1) Навукова-гістарычны профіль урока: 1.Дакладнасць і правільнасць паведамляемых на ўроку фактаў; 2. Правільнасць разбора і абагульнення гістарычных фактаў і зробленых ацэнак; 3. Паслядоўнасць і паўната ізлажэння; 4. Агульная ацэнка ўрока з пункту гледжання адпаведнасці яго зместу сучаснаму ўзроўню развіцця гістарычнай навукі;
II) Метадычная характарыстыка ўрока: 1. Метадычная структура ўрока; 2. Мэтанакіраванасць ўрока; 3. Метадычная характарыстыка структурных элементаў урока (праверкі ведаў, вывучэння новага матэрыялу, замацавання і рэфлексіі, задпання на дом); 4.Паўтарэнне і абагульненне на ўроку; 5. Методыка работы над гістарычнымі вобразамі і паняццямі; 6. Работа з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

картай; 7. Работа з храналогіей; 8. Работа з ілюстрацыямі; 9.Работа з гістарычнымі дакументамі; 10.Самастойная пазнавальная дзейнасць вучняў на ўроку; 11.Выхаваўчая работа на ўроку.
III) Педагагічныя паводзіны настаўніка: 1.Веданне настаўнікам вучняў; 2.Кантакт з класам, валоданне класам, уменне арганізаваць прадуктыўную работу з вучнямі і дысцыпліну; 3.Уменне валодаць сабой; 4.Валоданне жэстам, голасам,мімікай; 5.Знешні выгляд настаўніка і рух яго па класу;
IV) Характарыстыка вучняў на ўроку: 1.Узровень навучаемасці вучняў, іх гістарычныя веды; 2.Інтарэс вучняў да работы і атыўнасць на ўроку; 3.Тыпічныя праявы на ўроку моцных, слабых і сярэдніх вучняў; 4. Паводзіны і дысцыпліна вучняў на ўроку.

Безумоўна, лічыць гэту схему аналіза ўрока ўсеаб'емлючай не трэба, але яна ахоплівае асноўныя аспекты ўрока і стварае магчымасць для яго грунтоўнага аналізу.

**Лекцыя 28. Сістэма праверкі і ацэнкі вынікаў навучання гісторыі**

1. Функцыі праверкі ведаў у навучанні гісторыі і метадычныя ўмовы павышэння яе эфектыўнасці. 2. Змест і асноўныя віды праверкі ведаў, методыка яе арганізацыі. 3. Тэсціраванне, як спосаб арганізацыі праверкі ведаў. 4. Ацэнка ведаў і крытэрыі яе выстаўлення.

1. Праверка адукацыйна-выхаваўчых вынікаў навучання абавязковая ўмова і адзін з важнейшых фактараў павышэння эфектыўнасці навучання. Праверка не толькі стымулюе вучэбную работу, але і з'яўляецца важным сродкам кіравання ёй. Частка вучняў не толькі вучацца так, як іх апытвае настаўнік, але і ў значнай ступені думаюць, разважаюць, фармулюць свае думкі, пытанні і заданні так, як робіць гэта настаўнік. Пытанні і заданні настаўніка. накіроўваюць пазнавальную дзейнасць школьнікаў.

Такім чынам, праверка адукацыйна-выхаваўчых вынікаў выконвае ў працэсе навучання гісторыі шэраг важных функцый: кантролю і самакантролю за адукацыйна-выхаваўчымі вынікамі навучання; уліку ведаў і стымуляцыі навучання; выхавання ў школьнікаў адказных адносін да вучобы; арганізацыі і кіравання вучэбнай дзейнасцю; удасканалення ведаў, развіцця мышлення, памяці, вуснай і пісьмовай мовы, іншых пазнавальных здольнасцей вучняў.паўтарэння, абагульнення і сістэматызацыі ведаў і фарміравання ўменняў.

Паспяховае ажыццяўленне гэтых функцый магчымае, пры выкананні шэрагу, выяўленых у тэорыі і практыцы навучання гісторыі метадычных умоў: сістэматычнасць праверкі ведаў на працягу ўсяго навучання гісторыі; комплекснасць праверкі ўсіх адукацыйна-выхаваўчых вынікаў навучання: сістэмы факталагічных і тэарэтычных ведаў, развіцця гістарычнага мышлення, ступені валодання спосабамі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, інтэлектуальнымі і практычнымі уменнямі і навыкамі; прымяненне разнастайных развіваючых і навучаючых прыёмаў і форм праверкі ведаў; спалучэнне бягучай і адтэрмінаванай праверкі ведаў, уменняў і навыкаў, яе індывідуалізацыя ў адпаведнасці з узроўнем навучаемасці школьнікаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

аб'ектыўнасць праверкі ведаў, давядзенне да вучняў матываванай ацэнкі яе вынікаў з указаннем поспехаў і недахопаў у іх рабоце.

2. Змест праверкі ведаў. У аснове атэстацыі вучняў ляжыць праверка засваення ведаў і спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вызначаных Дзяржаўным стандартам і праграмамі па гісторыі. Гістарычныя веды ўключаюць ў сябе фактaлагічны (у тым ліку храналагічны і картаграфічны), тэарэтычны матэрыял (паняцці, тэарэтычныя высновы і абагульненні, прычынна-выніковыя сувязі і заканамернасці гістарычнага працэса), а таксама спосабы вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, якія ляжаць у аснове спецыяльных гістарычных уменняў і навыкаў.

Галоўнымі патрабаваннямі да гістарычных ведаў школьнікаў з'яўляюцца – усвядомленасць, трываласць і аператыўнасць, якія цесна ўзаемазвязаныя паміж сабой. Усвядомленасць ведаў гэта здольнасць выдзяляць у вучэбным матэрыяле галоўнае, разглядаць вывучаемыя факты і паняцці ў дыялектычнай сувязі з іншымі фактамі і паняццямі. Аператыўнасць ведаў праяўляецца ў здольнасці вучня прымяняць іх да асэнсавання новых фактаў, сувязей і паняццяў (перпанос ведаў ў новыя ўмовы, супастаўленне, абагульненне). Чым свядомей і сістэматызаваней гістарычныя веды, тым вышэй ступень іх аператыўнасці і наадварот. Аператыўнымі могуць быць толькі трывалыя веды. У сваю чаргу, трываласць ведаў дасягаецца не столькі завучваннем і механічным узнаўленнем, колькі глыбінёй іх асэнсавння, разнабаковасцю і ўсвядомленасцю сувязей паміж фактамі і паняццямі, здольнасцю вучняў выкарыстоўваць веды пры рашэнні пазнавальных задач і прымянення іх у новых вучэбных сітуацыях.

Асноўным недахопам пры правядзенні апытання з'яўляецца тое, што многія настаўнікі правяраючы веды галоўным чынам патрабуюць ад вучняў даслоўнага паўтарэння фармуліровак, апісанняў фактаў і даведачных звестак, выкладзеных у падручніку і не ўмеюць сканцэнтраваць увагу на галоўным. Адбіраючы матэрыял для праверкі настаўнік павінен кіравацца двума асноўнымі крытэрыямі: 1) значымасцю зместу і 2) складанасцю яго засваення.

Рыхтуючыся да праверкі засваення вучнямі зместу тэмы, настаўнік прадумвае пытанні, іх форму і прыёмы, якія забяспечваюць праверку свядомасці засваення, узроўню самастойнасці аналізу і абагульнення канкрэтнага вучэбнага матэрыялу, іх здольнасці да прымянення ведаў у знаёмай сітуацыі і творчаму іх прымяненню ў незнаёмай.

Асноўнымі формамі ці відамі праверкі вынікаў навучання гісторыі з'яўляюцца: вусная, якая можа быць індывідуальнай (вусныя разгорнутыя адказы) і франтальнай (кароткія вусныя адказы з места ў ходзе арганізаванай настаўнікам кантрольнай гутаркі па асноўных пытаннях вывучанай тэмы); пісьмовая, якая таксама можа быць індывідульнай (выкананне пісьмовага задання на дошцы ці за партай) і франтальнай (выкананне франтальных пісьмовых заданняў усім класам); графічная – выкананне індывідуальных і франтальных графічных заданняў (складанне схем, лагічных ланцужкоў, заданняў на контурнай карце).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Асноўным відам праверкі ведаў па гісторыі з'яўляецца вуснае апытанне, бо гісторыя гэта вусны прадмет. Акрамя вуснай, пісьмовай і графічнай існуюць іншыя шляхі праверкі і ўліку ведаў. Гэта праверка дамашніх заданняў у рабочых сшытках і выстаўленне адзнак за якасць іх вядзення, справаздач аб вучэбнай экскурсіі, за гістарычны дыктант, за падрыхтаваны рэфераты і праекты і г.д.

3. У апошнія гады ў практыку шырока ўкараніўся яшчэ адзін спосаб арганізацыі масавай праверкі ведаў – *тэсціраванне*. Яно дазваляе не толькі хутка праверыць якасць і ўзровень засваення гістарычных ведаў і авалодання спосабамі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, але і выконвае важную дыягнастычную функцыю.

Тэсціраванне, як спосаб праверкі адукацыйных вынікаў навучання атрымаў шырокае распаўсюджанне ў нашай школе ў 90-я гады XX – пачатку XXI стагоддзя. Яго ўкараненне звязана з новым разуменнем функцый праверкі ведаў. Пры распрацоўцы тэставага ацэначнага інструментарыя неабходна ўлічваць двaістую прыроду гістарычнай навукі і гісторыі як вучэбнага прадмета. Яна адначасова змяшчае аб'ектыўную інфармацыю аб канкрэтных, адзінкавых, ужо адбыўшыхся падзеях і суб'ектыўнае ўспрыманне і талкаванне гістарычных фактаў, заснаванае на розных сістэмах індывідуальных і грамадскіх каштоўнасцей. Пагэтаму вучэбны матэрыял і вынікі яго засваення можна ўмоўна падзяліць на фарманізаваныя (аб'ектыўныя) і нефармалізаваныя (суб'ектыўныя) веды.

Для першых адносяцца ўстаяўшыяся ў навуцы, дакументальна падцверджаныя звесткі аб месце, часе, удзельніках гістарычных падзей і з'яў, іх працягласці, колькасці удзельнікаў, размерах матэрыяльных прадметаў, прыкметы гістарычных паняццяў, тэрміны, агульнапрызнаныя высновы і выказванні.Суб'ектывізіраваны (нефармалізаваны) кампанент гістарычных ведаў уключае ў сябе розныя інтэрпрэтацыі гістарычных фактаў і ацэначныя выказванні сведак і сучаснікаў аб падзеях мінулага, асабістыя думкі аб іх прычынах, гістарычнай значнасці і выніковасці, аб матывах і інтарэсах дзейнасці асобных людзей і сацыяльных груп, а таксама індывідуальныя адносіны да падзей далёкага мінулага. Такім чынам, пры выкарыстанні тэставай праверкі, на кожным этапе навучання настаўнік выразна ўяўляе, які кампанент ведаў, якія ўменні ён правярае і з якой мэтай ён гэта робіць.

Тэст – кароткае, стандартызаванае па форме прад'яўлення і тэхналогіі праверкі і ацэнкі, заданне або сістэма заданняў, накіраваных на выяўленне і ацэнку дасягненняў вучняў зададзенага дзяржаўным адукацыйным стандартам узроўню прадметнай падрыхтоўкі.

У сучаснай школе тэставая праверка ведаў атрымала шырокае распаўсюджанне. Выдаецца вялікая колькасць разнастайных тэставых заданняў. Аднак большасць аўтараў функцыю тэстаў бачаць у эканамічнай арганізацыі праверкі ведаў школьнікаў. Заданні складаюцца хаатычна, без лагічнай сувязі адзін з адным, без дыферэнцыяцыі структурных кампанентаў гістарычнага матэрыяла. Вельмі рэдка тэсты выкарыстоўваюцца для дыягностыкі і удасканалення ўменняў школьнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сярод шматлікіх відаў тэстаў псіхалогі вылучаюць “тэсты спецыяльных здольнасцей і дасягненняў”, якія максімальна садзейнічаюць вызначэнню ўзроўню ведаў і элементарных пазнавальных уменняў. Да іх адносяцца: заданні з некалькімі варыянтамі адказу; заданні з альтэрнатыўнымі адказамі; заданні на ўсталяванне адпаведнасці; заданні з абмежаваннямі на адказы.

З дапамогай такіх тэстаў можна правяраць веды, сістэматызаваць і абагульняць матэрыял тэматычных блокаў. Але асабліва важнай іх роля для актуалізацыі раней вывучанага матэрыялу і падрыхтоўкі вучняў да ўспрыймання новай тэмы.

Разам з тым, трэба мець на ўвазе, што ў кампетэнцыю тэстаў не ўваходзіць праверка значнай часткі гістарычных ведаў і ступені валодання вучнямі большасцю спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці і ўменняў. Яны, у прыватнасці, не здольныя высніць, ці ўмеюць вучні самастойна ажыццяўляць пошук неабходнай інфармацыі з адной, або некалькіх крыніц, расказваць вусна ці пісьмова аб гістарычных падзеях і г.д. Выкарыстанне тэсціравання будзе эфектыўным, калі яно спалучаецца з выкарыстаннем заданняў з “адкрытымі адказамі”.

Паняцце “заданні з адкрытымі адказамі” адносна нядаўна выкарыстоўваецца ў педагагічнай літаратуры, хаця практычна ўжываюцца ўжо даўно. Такім чынам тэсціраванне можна разглядаць як адзін з эфектыўных спосабаў арганізацыі праверкі фармалізаваных гістарычных ведаў. Нават адкрытыя тэсты са свабодным адказам не даюць магчымасці праверыць нефармалізаваныя веды. Таму ў ходзе праверкі адукацыйных вынікаў навучання тэсціраванне павінна спалучацца з заданіямі скіраванымі на разуменне сутнасці гістарычных паняццяў. .

4. Ацэнка вынікаў навучання гісторыі матэрыялізуецца ў выстаўленні вучням адзнакі ў балах. Ацэньванне і выстаўленне адзнакі з’яўляецца важнейшым сродкам уліку ведаў і стымуліравання вучэбнай дзейнасці школьнікаў.

У адпаведнасці з правіламі атэстацыі ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі ўводзіцца бягучая, прамежкавая і выніковая атэстацыя вучняў, якая можа ажыццяўляцца ў вуснай, пісьмоовай і практычнай форме. Атэстацыя па кожнаму прадмету праводзіцца ў адпаведнасці з нормамі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў. Вынікі вучэбнай дзейнасці ацэньваюцца ў балах па 10-бальнай шкале адзнак: 1(адзін), 2(два), 3(тры), 4(чатыры), 5(пяць), 6(шэсць), 7(сем), 8(восем), 9(дзевяць), 10(дзесяць). Адзнака “0” выстаўляецца пры адсутнасці вынікаў вучэбнай дзейнасці на момант атэстацыі. Колькасным паказчыкам ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці веданяў з’яўляецца адзнака.

Адзнака – гэта вынік працэса ацэньвання, яго ўмоўна-фармальнае выражэнне ў балах.

Для ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вылучаецца пяць узроўняў засваення вучэбнага матэрыялу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

I узровень (нізкі) – дзеянні на распазнаванне і адрозненне паняццяў (аб'ектаў вывучэння).

II узровень (здавальняючы) – дзеянні на ўзнаўленне вучэбнага матэрыялу (аб'ектаў вывучэння) на ўзроўні памяці.

III узровень (сярэдні) – дзеянні па ўзнаўленню вучэбнага матэрыялу (аб'ектаў вывучэння) на ўзроўні разумення, апісанне і аналіз дзеянняў з аб'ектамі вывучэння.

IV узровень (дастатковы) – дзеянні па прымяненню ведаў у знаёмай сітуацыі па ўзору; тлумачэнне сутнасці аб'ектаў вывучэння, выкананне дзеянняў з выразна вызначанымі правіламі, прымяненне ведаў на аснове абагульненага алгарытма для рашэння новай вучэбнай задачы.

V узровень (высокі) – дзеянні па прымяненню ведаў у незнаёмых сітуацыях.

Выніковы кантроль за год вызначаецца правіламі атэстацыі і перавода вучняў. Гадавая ацэнка выстаўляецца як сярэдняя арыфметычная адзнака за чвэрці з улікам дынамікі вучэбных дасягненняў на канец навучальнага года. Калі дынаміка станоўчая, тоацэнка можа быць вышэй за сярэднюю арыфметычную, калі адмоўная – то ніжэй. Выніковая адзнака на выпускных экзаменах выстаўляецца на аснове гадавой і экзаменацыйнай адзнакі ў адпаведнасці з "Правіламі арганізацыі выпускных экзаменаў", якія ўстаноўліваюцца адпаведным распараджэннем Міністэрства адуацыі Рэспублікі Беларусь.

Такім чынам, праверка вынікаў навучання абавязковы і важны кампанент арганізацыі навучання гісторыі, а яе эфектыўнасць вызначаецаа метадычна правільнай яе арганізацыяй і аб'ектыўнасцю ўліку адукацыйна выхаваўчых вынікаў навучання.

**Лекцыя 29. Сістэма паўтарэння ў навучанні гісторыі**

1. Прызначэнне паўтарэнняў навучанні гісторыі. 2. Асноўныя віды паўтарэння і методыка яго арганізацыі. 3. Дамашнія заданні па гісторыі

1. Паўтарэнне ў навучанні гісторыі мае выключна важнае значэнне. Нездарма ў народзе існуе прымаўка "Паўтарэнне – маці вучэння." Памяць чалавека мае ўласцівасць забываць, яна вызваляцца ад непатрэбнай і невыкарыстоўваемай у практычнай дзейнасці інфармацыі. Пагэтаму асноўнай задачай паўтарэння з'яўляецца – папярэдзіць забыванне, захаваць у памяці асноўнае, без ведання чаго нельга сфарміраваць паўнацэнныя гістарычныя веды. Для таго каб паўтарэнне сапраўды стала "маці вучэння" неабходна каб кожны гістарычны фаакт, паняцце, дата, існавалі ў памяці вучня не самі па сабе, а ў сістэме, узаемадапаўнялі адзін аднаго і ў сукупнасці стваралі цэласную карціну гістарычнага працэса, ці гістарычнага перыяда. Таму, акрамя задачы папярэджання забывання, паўтарэнне выконвае ролю сродку сістэматызацыі і абагульнення гістарычных ведаў. Сістэматызацыя і абагульненне вучэбнага матырыялу ажыццяўляецца праз арганізацыю актыўнай пазнавальнай дзейнасці вучняў і спрыяе развіццю

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пазнавальных магчымасцей і здольнасцей школьнікаў. Гэта дазваляе паспяхова рэалізаваць развіваючую і навучаючую функцыю паўтарэння.

У працэсе сістэматызацыі і абагульнення ведаў настаўнік мае магчымасць выявіць якасць засваення гістарычнай інфармацыі і ступень авалодання спосабамі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці з ёй. Таму паўтарэнне адначасова выконвае дыягнастычную і кантрольную функцыі навучання, дазваляе настаўніку выявіць прабелы ў ведах вучняў і вызначыць шляхі іх ліквідацыі.

Такім чынам, у працэсе навучання гісторыі паўтарэнне выконвае функцыі: 1) папярэджанне забывання; 2) абагульнення і сістэматызацыі ведаў; 3) развіваючую і навучаючую (паглыблення ведаў і фарміравання спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці); 4) кантролю і дыягностыкі адукацыйныых вынікаў навучання. Улічваючы важную ролю паўтарэння ў навучанні гісторыі, трэба імкнуцца да сістэматычнай работы па яго арганізацыі на кожным этапе урока.

2. У тэорыі і практыцы навучання гісторыі праблема арганізацыі паўтарэння знайшла шырокае адлюстраванне. Гэта стварае магчымасць вызначыць методыку арганізацыі асноўных відаў паўтарэння ў навучанні гісторыі.

1) Пярвічнае паўтарэнне, або замацаванне. матэрыял з раней засвоеным, праверыць ступень засваення новага матэрыялу.

карцінай, гістарычнм дакументам, тэкстам вучэбнага дапаможніка, прапанаваць рашэнне праблемна-пазнавальных задач, патрабуючых прадуктыўнай пазнавальнай дзейнасці школьнікаў.

Пярвічнае паўтарэнне абавязковы структурны элемент арганізацыі ўрока гісторыі ў V – VIII класах. У IX – XI класах ён можа адсутнічаць як самастойны этап урока, але ў любым выпадку пры падвядзенні вынікаў урока павінна ажыццяўляцца сістэматызацыя і абагульненне вывучанага на ўроку, што ў пэўнай ступені замяняе пярвічнае паўтарэнне на ўроку.

2) Уступнае паўтарэнне праводзіцца у пачатку навучальнага года, або перад пачаткам вывучэння новай тэмы ці раздзела. Яно мае мэтай актуалізаваць у памяці вучняў засвоеныя раней веды, неабходныя для лепшага разумення новага вучэбнага матэрыялу.

3) Бягучае паўтарэнне. Асноўным відам паўтарэння з’яўляецца бягучае паўтарэнне раней пройдзенага ў тэматычнай сувязі са зместам кожнага новага ўрока. На яго арыентуюць настаўніка аўтары падручнікаў па гісторыі, якія прадугледзелі ў іх рубрыку “Успомніце”. Яна папярэднічае зместу кожнага параграфа. Але было б няправільна абмяжоўваць бягучае паўтарэнне толькі тымі пытаннямі, якія змешчаны перад параграфамі ў падручніках. Важна каб увесь урок, усе звенні працэсу навучання, якія ажыццяўляюцца ў працэсе ўрока, служылі паўтарэнню раней аывучанага матэрыялу і раней сфарміраваных у вучняў спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

Такім чынам, бягучае паўтарэнне павінна ажыццяўляцца на ўсіх этапах навучання: у час праверкі дамашняга задання, пры падрыхтоўцы да вывучэння і ў працэсе вывучэння новага матэрыялу на ўроку, у ходзе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

замацавання і пры выкананні дамашняга задання. Усё гэта сведчыць, што бягучае паўтарэнне сапраўды з’яўляецца асноўным відам паўтарэнне ў навучанні гісторыі. Шкада, што многія настаўнікі аб гэтым забываюць.

4) Абагульняючае паўтарэнне. Абагульняючае паўтарэнне ахоплівае матэрыял тэмы, або раздзела курса гісторыі, а ў некаторых выпадках, сістэматэзуе матэрыял з розных тэм і раздзелаў па пэўных праблемах і баках жыцця грамадства. Гэта можа быць: сістэматызацыя і абагульненне ведаў па вывучанай тэме, раздзелу ці вывучанаму курсу гісторыі; стварэнне цэласнай карціны аб падзеях і працэсах, якія вывучаліся на шэрагу розных урокаў; завяршэнне фарміравання важнейшых паняццяў; ўсведамленне заканамернасцей грамадскага развіцця; выяўленне новых прычынна-выніковых сувязей ў свеце раней вывучаных фактаў; дасягненне больш высокай ступені сістэматызацыі ведаў аб вывучаных з’явах і працэсах грамадскага жыцця; фарміравання абагульненых уменняў і спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці. Форма правядзення абагульняючага ўрока можа быць рознай: абагульняючая гутарка, аглядная лекцыя, семінар, практычныя ці лабараторныя заняткі, канферэнцыя, дыскусія, дыдактычная гульня, урок камп’тэрная прэзентацыя і г.д., аднак прызначэнне такога ўрока павінна заставацца нязменным абагульненне, сістэматызацыя і тэарэтычнае асэнсаванне вывучанай тэмы ці раздзела.

Найбольш важнымі ўмовамі павышэння эфетыўнасці ўрока паўтарэння і абагульнення, на нашу думку, з’яўляюцца: 1) правільны выбар настаўнікам аб’ёму, логікі, зместу, формы і метадычных прыёмаў паўтарэння і абагульнення; 2) усведамленне вучнямі важнасці і карыснасці такога ўрока; 3) пасільны для вучняў аб’ём паўтараемага матэрыялу; 4) папярэдняя дамашняя падрыхтоўка вучняў да ўрока; 5) арганізацыя актыўнай пазнавальнай дзейнасці вучняў на ўроку.

5) Перадэкзаменацыйнае паўтарэнне. Яно праводзіцца ў IX класе, дзе вучні здаюць абавязковы экзамен па гісторыі Беларусі за курс базавай школы. Яго арганізацыя ўскладняецца тым, што праграма не прадугледжвае спецыяльнага часу на яго правядзенне і настаўнік сам вызначае метадычныя шляхі яго арганізацыі.

Такім чынам, паўтарэнне гэта адна з най важнейшых перадумоў фарміравання ў вучняў трывалых, абагульненых і сістэматызаваных ведаў, на аснове якіх фарміруецца тэарэтычнае асэнсаванне гісторыі чалавецтва і светапоглядныя ідэі, дазваляючыя выпускніку школы свядома арыентавацца не толькі ў гістарычным мінулым, але і сучасным грамадскім жыцці.

3. Дамашнія заданні па гісторыі. Дамашня падрыхтоўка вучняў да ўрокаў – неабходнае звяно вучэбнага працэсу. Яе асноўная мэта: трывалае замацаванне пройдзенага на ўроку матэрыялу, больш глыбокае яго асэнсаванне, далейшае развіццё ў вучняў набытых на ўроках ўменняў і навыкаў самастойнай работы. У арганізацыі дамашняй работы школьнікаў сустракаюцца істотныя недахопы. Некаторыя настаўнікі асноўны цяжар засваення новага матэрыялу перакладваюць на дамашнюю работу школьнікаў. Большую частку часу на ўроку яны трацяць на праверку

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выканання дамашняга задання, што памылкова і шкодна. Іншы раз вучням даюцца залішне складаныя, перагружаючыя іх заданні. Часам назіраецца аднабаковасць дамашніх заданняў: звядзенне іх да простага завучвання або пераказу параграфа падручніка, што зніжае цікавасць школьнікаў не толькі да дамашняй работы па гісторыі, але і наогул да гісторыі як школьнага прадмета.  Як правіла, дамашнія заданні даюцца пасля вывучэння і замацавання новага вучэбнага матэрыялу, аднак можна даваць дамашняе заданне і перад вывучэннем новага матэрыялу. Гэта не толькі забяспечвае запіс задання ў дзённікі і стымулюе ўвагу вучняў на ўроку, але і стварае магчымасць настаўніку даць неабходныя метадычныя парады па яго выкананню, чаго ён, як правіла, пазбаўлены, даючы заданне на дом у самым канцы ўрока.

Асноўныя віды дамашніх заданняў па гісторыі. Дамашнія заданні па гісторыі адрозніваюцца вялікай разнастайнасцю. Гэта могуць быць заданні на: пераказ вучнямі зместу параграфа падручніка; пераказ параграфа па загадзя складзенаму плану (такія заданні пераважаюць ў V –VI класах); падрыхтоўку адказаў на пытанні па зместу ўрока або цэлай тэмы; аналіз і асэнсаванне ілюстрацый: складанне па іх змесце вуснага расказа, апісання;супастаўленне і параўнанне гістарычных з’яў;складанне лагічных схем, лагічных ланцужкоў, графікаў і дыяграм; аналіз картаграфічнага матэрыялу, работу з атласамі і контурнымі картамі; складанне храналагічных і тэкставых табліц, простага і разгорнутга плана, тэзісаў, канспекта параграфа, гістарычнага дакумента, навукова-папулярнай літаратуры; самастойнае вывучэнне матэрыялу па падручніку без папярэдняга тлумачэння настаўнікам, што спрыяе фарміраванню і прымяненню ўменняў, навыкаў і спосабаў дзейнасці з гістарычным матэрыялам выкананне заданняў творчага характару: творчага сачынення, вуснага ці пісьмовага паведамлення, даклада, рэферата і г.д.; пастаноўка пытанняў і фармуліравання заданняў па вывучаемай тэме; падрыхтоўка тэставых заданняў і камп’ютэрных прэзентацый і г.д.

Паспяховасць выканання дамашняга задання  школьнікамі поўнасцю залежыць ад валодання імі спосабамі дзейнасці з гістарычным матэрыялам, таму, даючы вучням дамашняе заданне, настаўнік павінен быць упэўнены, што спосабы яго выканання добра вядомыя вучням. Асабліва гэта важна ў V класе, калі вучні толькі прыступаюць да вывучэння сістэматычнага курса гісторыі

**Лекцыя 30. Выкарыстанне сучасных тэхналогій ў навучанні гісторыі**

1. Праблема тэхналогіі навучання. 2. Структура тэхналогіі навучання 3. Выкарыстанне ў навучанні гісторыі інавацыйных тэхналогій: а) модульнага навучання; б) поўнага засваення ведаў (праграміраванага навучання); в)тэхналогіі праблемнага і развіваючага навучання; г) гульнявыя тэхналогіі д) праектная тэхналогія.

1. Традыцыйна, ў педагогіцы лічыцца, што дастаткова знайсці метадычны прыём або групу прыёмаў, новую форму навучання і будзе

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

дасягнута жадаемая мэта – навучыць усіх школьнікаў. Так узнікалі дзесяткі новых методык, яны ўзбагачаліся практыкай, удасканальваліся і ствараліся новыя, больш эфектыўныя. Аднак дабіцца стабільна высокіх вынікаў навучання кожным вучням, ці хаця б абсалютнай большасцю з іх не ўдаецца і па сённяшні дзень. Імкненне педагогаў павышаць якасць адукацыі прывяло да тэхналагізацыі працэса навучання, у тым ліку і гісторыі.

Тэхналогіяй звычайна называюць працэс перапрцоўкі зыходнага матэрыялу з мэтай атрымання прадукта з загадзя заданымі ўласцівасцямі. У энцыклапедыі даецца наступнае азначэнне тэхналогіі “Тэхналгія гэта сукупнасць метадаў апрацоўкі вырабу, змянення стану, уласцівасцей, формы сыравіны, матэрыяла або паўфабрыката, ажыццяўляемае ў працэсе вытворчасц”. Аднак такое азначэнне справядлівае толькі для вытворчай сферы і непрыгоднае для сацыяльнага жыцця.

Упершыню паняцце тэхналогія навучання агучана ў педагагічных даследаваннях у ЗША і Заходняй Еўропе ў 30-я гады для апісання спосабаў выкарыстання ТСН ў навучальным працэсе. І толькі у сярэдзіне 80-х гадоў у дакументах ЮНЕСКО было дадзена азначэнне, якое ў найбольшай ступені адлюстроўвае сутнасць педагагічнай тэхналогіі: Яно гучыць так: “Педагагічная тэхналогія – гэта сістэмны метад стварэння, прымянення і вызначэння ўсяго працэса выкладання і засваення ведаў з улікам тэхнічных і чалавечых рэсурсаў ў іх узаемадзеянні, які ставіць сваёй мэтай аптымізацыю форм адукацыі” Аднак і ў адносінах да разумення асноўных ключавых паняццяў дадзенага азначэння існуюць некаторыя пытанні і сумненні.

Ключавым звяном любой тэхналогіі, у тым ліку і педагагічнай, з’яўляецца дэталёвае вызначэнне і фармуляванне канечнага выніку навучання і і выхаванне. Уласна кажучы, працэс навучання толькі тады атрымае назву “тэхналогія”, калі ён загадзя быў спрагназаваны, былі дакладна вызначаны яго вынікі, а таксама сродкі для яго атрымання: умовы і алгарытм вучэбных дзеянняў для яго ажыццяўлення і ён быў “запушчаны”, або прыведзены ў дзеянне. У параўнанні з навучаннем пабудаваным на аснове методыкі, тэхналогія навучання мае сур’ёзныя перавагі: Па-першае, яе асновай служыць выразнае вызначэнне канечнай мэты, якая разглядаецца як цэнтральны кампанент, дазваляючы больш дакладна вызначыць ступень яе дасягнення; Па-другое, тэхналогія, у якой мэты (канечная і прамежкавая) вызначана дыягнастычна (абсалютна дакладна), дазваляе распрацаваць аб’ектыўныя метады кантроля за іх дасягненнем; Па-трэцяе, тэхналогія зводзіць да мінімума сітуацыі, калі настаўнік пастаўлены перад выбарам і вымушаны пераходзіць да педагагічных экспромтаў у пошуках спрыяльнага варыянта; Па-чацвёртае, у адрозненне ад метадычных распрацовак, арыентаваных на настаўніка і віды яго дзейнасці, тэхналогія – праект вучэбнага працэса, які вызначае структуру і змест вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў. Жорсткае праекціраванне вучэбнай дзейнасці вучняў ў тэхналогіі вядзе да больш стабільных поспехаў практычна ўсіх навучэнцаў. Аб гэтым сведчыць вопыт праграміраванага навучання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Структура тэхналогіі навучання ўключае ў сябе наступныя асноўныя кампаненты: папярэднюю дыягностыку узроўню валодання ведамі, уменнямі і навыкамі вучнямі класа, часцей за ўсё метадам тэсціравання, асабліва ў пачатку вывучэння курса; арганізацыя дзейнасці вучняў па засваенню і замацаванню вучэбнага матэрыяла, які ўключае разнастайныя методыкі авалодання ведамі; кантроль якасці засваення матэрыялу: кантроль і арганізацыя дзейнасці вучняў па засваенню ведаў і назапашванню вопыта ў тэхналогіі навучання раўназначныя кампаненты; выбар прыёмаў і метадаў магчымай дадатковай работы з групай, або з асобнымі вучнямі. Апісанне такіх метадаў на сённяшні дзень няма; дыягностыку прычын адставання вучняў, што таксама дрэнна распрацавана для шэрагу вучэбных дысцыплін, у тым ліку і для гісторыі: выбар методыкі, якая здымае прабелы ў ведах і вопыце школьнікаў.

Такім чынам тэхналогія навучаняя, акрамя методыкі арганізацыі дзейнасці вучняў асобую ўвагу надае пытанням кантролю якасці засваення і дыягностыцы прычын адставання вучняў. У тэхналогіях навучання максімальна рэалізуецца прынцып завершанасці навучання. Ступень завершанасці працэса навучання рэгуліруецца самім настаўнікам. Іменна ён ацэньвае, ці завершаны працэс навучання і пераводзіць звычайны працэс зносін і узаемадзеяння з вучнямі на “тэхналагічныя рэйкі”.

Для таго каб працэс навучання набыў характар тэхналогіі неабходна выкананне шэрагу абавязковых патрабаванняў. Асноўнымі сярод іх з’яўляюцца наступныя: 1) пастаноўка дыягнастычнай мэты, з указаннем патрабуемага ўзроўню засваення; 2) правядзення аб’ектыўнага кантролю эфектыўнасці працэсу навучання і вызначэння ўзроўню дасягнення пастаўленай мэты па дадзенаму ўзроўню засваення (узнаўляючы, пераўтвараючы, эўрыстычны, творчы); 3) дасягненне канечнага ўзроўню засваення вучэбнага матэрыялу па дадзенаму ўзроўню засваення з дакладнасцю не менш як 80%.

3. Выкарыстанне ў навучанні гісторыі інавацыйных тэхналогій.

Да ліку найбольш выкарыстоўваемых у сучаснай практыцы навучання гісторыі інавацыйных тэхналогій можна аднесці наступныя: праблемна-модульнага навучання, тэхналогия поўнага засваення ведаў, развіваючага і праблемнага навучання і інш. Разгледзім іх больш дэталёва. Чым жа інавацыйныя тэхналогіі адрозніваюцца ад традыцыйных? Перш за ўсё тым, што ў іх вучань становіцца раўнапраўным суб’ектам працэса навучання, а настаўнік стварае магчымасці для забеспячэння спрыяльных ўмоў для творчай самастойнай пазнавальнай дзейнасці.

Тэхналогія модульнага навучання заснавана на прадстаўленні вучэбнай праграмы пэўнага курса гісторыі ў выглядзе цэласна завершаных і цесна звязаныхпаміж сабой праблемных модулей: эканоміка, унутраная і знешння палітыка, сацыяльныя адносіны ў грамадстве, быт, духоўная культура і г.д. Кожны модуль уяўляе сабой сукупнасць вучэбных элементаў, аб’яднаных у лагічную структуру вучэбнай тэмы тэхналагічнай картай. Модуль стварае магчымасць вучню самастойна пад кіраўніцтвам і пры мінімальнай дапамозе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

настаўніка засвоіць тэму. Кожны модуль уключае ў сябе: 1) дакладна вызначаны мэтавы план, які ўтрымлівае выніковую і прамежкавыя мэты асваення модуля; 2) банк неабходнай інфармацыі; 3) метадычныя парады па дасягненню вызначаных мэт, якія ўключаюць алгарытм вучэбных дзеянняў неабходных для авалодання модулем; 4) блок кантролю, які ўключае заданні па кантролю за дасягненнем як прамежкавай так і выніковай мэты навучання.

Тэхналогія поўнага засваення ведаў. Да такой тэхналогіі навучання адносіцца праграміраванае навучанне на аснове выкарыстання камп'ютэрнай тэхнікі. Толькі яно забяспечвае поўнае засваенне ведаў, на тым ці іншым узроўні, які адпавядае. Аднак адразу адзначым, што пакуль што не існуе ніводнай навучаючай праграмы па засваенню гісторыі, што абумоўлена спецыфікай яе зместу, які не паддаецца праграміраванню. Разам з тым існуе некалькі навучаючых праграм па засваенню асобных праблем і тэм курса гісторыі. Разнавіднасцю тэхналогіі поўнага засваення ведаў з'яўляецца тэхналогія выкарыстання апорных канспектаў па гісторыі, якая была распрацавана вядомым савецкім настаўнікам і вучоным Д.Ф.Шаталавым яшчэ ў пачатку 70-х гадоў мінулага стагоддзя.

Алгарытм гэтай тэхналогіі наступны: 1) прад'яўленне вучням апорнага канспекта і рагорнутае, вобразнае ізлажэнне настаўнікам тэарэтычнага і фактычнага зместу матэрыялаз апорай на канспект; 2)самастойнае ўзнаўленне вучнямі вучэбнага матэрыялу (пра сябе) з апорай на лісты з апорным канспектам, якія яны атрымліваюць перад ізлажэннем настаўніка; 3)для замацавання 1-2 вучні ўзнаўляюць вучэбны матэрыял ў сціслай форме каля дошкі; 4)дома вучні чытаюць адпаведны параграф і ўзнаўляюць засваенае з апорай на канспект; 5) на наступным уроку ў час праверкі ведаў яшчэ не менш як тры разы ўзнаўляюць гэты матэрыял шляхам спалучэння (1-2 вучні узнаўляюць матэрыял па апорнаму канспекту ля дошкі, затым ідзе ўзаемаправерка(ціхае апытанне) ведаў у парах па лістах індывідуальнага кантроля і выстаўляюць адзін аднаму адзнакі. Як бачым сямікратнае як мінімум узнаўленне ведаў дазваляе дасягнуць поўнага запамінаннея ведаў. Псіхолагі устанавілі, што сямікратнае паўтарэнне вядзе як правла не толькі да трывалага запамінання, але і да грунтоўнага асэнсавання вывучанага.

Тэхналогія праблемнага навучання. Яе заснавальніцай у выкладанні гісторыі з'яўляецца Т.І. Ганчарова. Вывучэнне гісторыі – гэта працэс выяўлення, асэнсавання і вырашэння комплекса праблем, звязаных з усімі бакамі жыцця грамадства. Вучні папярэдне знаёмяцца шляхам апераджальнага чытання з тэкстам параграфа, матэрыял якога будзе разглядацца на ўроку. Ідучы на ўрок, настаўнік вызначае і прадумвае праблемныя пытанні, якія могуць быць абмеркаваны на ўроку, дадатковыя сродкі і шляхі стварэння праблемных сітуацый і магчымыя спосабы іх вырашэння. Такім чынам, урок ператвараецца ў творчую_работу па асэнсаванню і прымяненню гістарычных ведаў, выпрацоўкі спосабаў дзейнасці з гістарычным матэрыялам. Такая тэхналогія дазваляе эфектыўна

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

развіваць мышлене і іншыя пазнавальныя здольнасці вучняў, дабівацца свядомага засвaення як тэарэтычнага так і фактaлаічнага матэрыяла

Сучасная дыдактыка дзеліць тэхналогіі развіцця разумовай дзейнасці ў адпаведнасці з дамінуючым на ўроку відам дзейнасці на: праблемна-пошукавыя (праблемнае навучанне); тэхналогіі даследчай дзейнасці(метад праектаў, дальтон-план, лабараторна-брыгадны метад, навучанне на аснове комплексаў); тэхналогіі мадэліруючага навучання або гульнявыя тэхналогіі (гульні-сітуацыі, сюжэтныя гульні, гульні-драматызацыі, гульні-імітацыі рэчаіснасці, гульні-спаборніцтвы); каммунікатыўна-дыялогавыя (камунікатыўныя гульні, дыялогі, дыскусіі з высокім узроўнем праблемнасці, праблемная дыскусія з прапановай праектаў, дыскусія з гульнявым мадэліраваннем, дыскусіі ў формах круглага стала, "паседжання экспертнай групы", "сімпозіума", "канферэнцыі", "дэбатаў").

## Лекцыя 31. Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у навучанні гісторыі.

У апошнія гады істотна павысіўся узровень камп'ютэрызацыі беларускага грамадства, што абумоўлена шырокім выкарыстаннем камп'ютэрнай тэхнікі ва ўсіх сферах жыцця чалавека і пастаянна ўзрастаючай колькасцю персанальных камп'ютэраў, якія становяцца прадметам дамашняга ўжытку.

Выкарыстанне неабмежаваных магчымасцей камп'ютэрнай тэхнікі і яе мультымедыйных магчымасцей прывяло да распрацоўкі і шырокага выкарыстання ў вучэбным працэсе інфармацыйных тэхналогій навучання, якія займаюць у сучаснай школе ўсё больш значнае месца. Выразна вызначыліся шляхі выкарыстання мультымедыйных і, у першую чаргу, камп'ютэрных сродкаў навучання. У сучаснай школе склаліся наступныя шляхі выкарыстання інфармацыйных тэхналогій:

- выкарыстанне электронных сродкаў навучаня ў працэсе вывучэня новага матэрыялу праз прадстаўленне яго зместу з дапамогай мультымедыйных сродкаў (так званыя камп.ютэрныя прэзентацыі новага на ўроку);
- выкарыстанне ЭСН на этапе сістэматызацыі і абагульнення зместу вучэбнага матэрыялу;
- аўтаматызацыя з дапамогай ЭСН кантрольна-ацэначнага працэсу (у тым ліку самакантроля і самаацэньвання);
- ажыццяўленне праектнай дзейнасці з выкарыстаннем камп.ютэрных сродкаў і даступных вучням інфармацыйных рэсурсаў;
- выкарыстанне інфармацыйных рэсурсаў глабальнай сеткі Інтэрнэт і размешчаных у ёй ЭСН пры падрыхтоўцы вучнямі тэматычных паведамленняў, дакладаў, рэфератаў і г.д.;
- выкарыстанне выдадзеных на лічбавых носьбітах электронных рэсурсаў інфармацыйна-даведачнага характару(энцыклапедый, хрэстаматый, даведнікаў, вучэбных дапаможнікаў), як пры падрыхтоўцы да заняткаў самага настаўніка, так і пры арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў на ўроку і дома;

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

- выкарыстанне ЭСН у пазакласнай рабоце па прадмету, на факультатыўных занятках, курсах па выбару, занятках па інтарэсах;
- выкарыстанне тэсціруючых праграм у працэсе падрыхтоўкі вучняў да экзаменаў і цэнтралізаванага тэсціравання.

Самай распаўсюджанай формай выкарыстання інфармацыйных педагагічных тэхналогій у працэсе выкладання гісторыі з'яўляецца падрыхтоўка прэзентацый, з дапамогай якіх прадстаўляецца змест вывучаемага на ўроку матэрыяла. Такая папулярнасць іх выкарыстання тлумачыцца адноснай прастатой стварэння прадукта-прэзентацыі на персанальным камп'ютэры і яго адпаведнасцю асноўным патрабаванням да іх выкарыстання на ўроку, а іменна:

- забеспячэнне нагляднасці і даступнасці навучання для навучэнцаў з розным узроўнем падрыхтоўкі г. зн. праграма павінна быць зразумелай вучням з першага знаёмства, а ўпраўленне ёй павінна быць простым;
- настаўнік мае магчымасць кампанаваць матэрыял на свайму жаданню і пры падрыхтоўцы да ўрока займацца творчасцю, а не запамінаннем таго, у якім парадку будзе выводзіцца інфармацыя;
- праграмма павінна дазваляць выкарыстоўваць інфармацыю ў любой форме прадстаўлення (нарратыўны тэкст, табліца, дыяграма, слайд, відэа і аўдыа рад);
- даваць магчымасць адаптацыі праграмы да індывідуальных магчымасцей школьніка, яго здольнасць ўспрымаць прапанаваны вучэбны матэрыял.

У якасці сродку рэалізацыі тэхналагічнага падыходу пры вывучэнні новага матэрыялу трэба разглядаць выкарыстанне інтэрактыўнай класнай дошкі. З дапамогай медыяпраектара на яе з дапамогай камп'ютэра выводзяць любую інфармацыю, а затым уручную дапаўняюць выяву заметкамі, каментарыямі, заўвагамі, абводзяць важныя фрагменты, акцэнціруючы ўвагу вучняў на найбольш істотным у паведамляемай інфармацыі. Усе створанае на інтэрактыўнай дошцы можа быць захавана ў камп'ютэры і выкарыстана ў будучым пры падрыхтоўцы новых прэзентацыйных праектаў.

Эфектыўнае выкарыстанне тэхнічных і дыдактычных магчымасцей электронных прэзентацый рэалізуецца у працэсе прымягнення метада праектаў.

Праект уяўляе сабой прэзентацыю, выкананую ў вучэбных мэтах. Гэта можа быць гульня-віктарына, тэарэтычная распрацоўка з выкарыстаннем камп'ютэрных праграма, рэферат на актуальную тэму. Метад праектаў дапамагае рэалізаваць узроўневую дыферанцыяцыю навучання праз вырашэння серыі індывідуальна падабраных для канкрэтнага вучня заданняў.

Пры падрыхтоўцы камп'ютэрных прэзентацый па сусветнай гісторыі многія настаўнікі выкарыстоўваюць распаўсюджаны на інфармацыйным рынку прадукт – CD – дыскі: "Гісторыя свету", "Гісторыя. 5 клас","Гісторыя Расіі.XX век", "Гісторыя Расіі і яе суседзяў", "Урокі сусветнай гісторы Кірыла і Мяфодзія" і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Што тычыцца гісторыі Беларусі, то выбар абмежаваны. Тут можна толькі назваць электронны падручнік“Гісторыю Беларусі старажытных часоў”для 5 кпаса і вучэбную праграму “Бакалаўр”, распрацаваную ў БДУ. Пагэтаму пры распрацоўцы прэзентацый па гісторыі настаўнікі вымушаны звяртацца пераважна да Інтэрнэтрэсурсаў.

**Лекцыя 32-33. Пазакласная работа па гісторыі. Настаўнік гісторыі (4г.)**.

1. Агляд метадычнай літаратуры па тэме. 2. Задачы пазакласнай работы. Прынцыпы яе арганізацыі. 3. Змест пазакласнай работы па гісторыі. 4. Асноўныя формы пазакласнай работы па гісторыі ў школе. 5. Настаўнік гісторыі.

1. У метадычнай літаратуры вопыт правядзення пазакласнай работы знайшоў самае шырокае адлюстраванне. Гэтай праблеме прысвечаны сотні артыкулаў, дапаможнікі і манаграфіі.

Класіфікацыя метадаў і характарыстыка арганізацыйных форм пазакласнай работы ўпершыню была дадзена у 40-х гадах ХХ ст. У.М. Бернадскім. У аснову іх класіфікацыі ім былі пакладзены крыніцы пазнання. Зыходзячы з гэтага ён вылучыў 4 напрамкі пазакласнай работы: 1) пазакласнае чытанне; 2) гутаркі і лекцыі; 3) кінафільмы, экскурсійная нагляднасць; 4) рэфераты, дыспуты, гульні. Асноўнай формай арганізацыі пазакласнай работы ён лічыў гістарычны гурток.

Значны ўклад у распрацоўку тэорыі пазакласнай работы ўнёс А.А. Вагін. Ён даў класіфікацыю відаў пазакласнай работы па крыніцах ведаў (жывое слова настаўніка, работа з друкаваным словам і работа з нагляднасцю) і прапанаваў 15 арганізацыйных форм пазакласнай работы. Пры гэтым ён падрабязна разглядзеў такія формы, як пазакласнае чытанне, гістарычнае краязнаўства, экскурсійная работа, гутаркі.

Пытанні тэорыі пазакласнай работы знайшлі адлюстраванне ў “Методыцы навучання гісторыі ў сярэдняй школе”. У гэтай кнізе ўпершыню уводзіцца ў навуковы абарот тэрмін “пазаўрочная работа”, якім аўтары прапануюць замяніць “пазакласную работу”. У гэтым раздзеле грунтоўна разбіраюцца змест і форма пазакласнай работы. На нашу думку, тэрміны “пазакласная і пазаўрочная работа” з’яўляюцца ідэнтычнымі і маюць аднолькавыя правы на існаванне. У далейшым мы будзем выкарыстоўваць тэрмін пазакласная работа. Шырокае асвятенне ў метадычнай літаратуры атрымалі розныя напрамкі і формы работы па гісторыі. Так пытанні кіравання пазакласным чытаннем атрымалі грунтоўнае асвятленне ў дапаможніку І.З. Азерскага, у дапаможніку настаўнікаў А.Ф. Родзіна і Ю.В. Сакалоўскага абагульнены вопыт экскурсійнай работы па гісторыі, разгледжаны віды і тыпы экскурсій, метады і прыёмы іх правядзення, паказана арганізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў у ходзе экскурсій.

Істотную дапамогу настаўніку ў правядзенні краязнаўчай работы ў школе, выкарыстанні разнастайных метадаў і прыёмаў вывучэння роднага краю на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўроках і ў пазакласнай рабоце можа аказаць дапаможнік, выдадзены пад рэдакцыей М.С. Барысава.

2. Задачамі пазакласнай работы па гісторыі застаюцца тыя ж, што і перад навучаннем гісторыі ў школе: авалоданне вучнямі асновамі сістэматызаваных ведаў аб сусветна-гістарычным працэсе; далучэнне іх да дасягненняў айчыннай і сусветнай культурай; выхаванне грамадзянскасці, патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці. Аднак у пазакласнай рабоце гэтыя задачы вырашаюцца на іншым гістарычным змесце, іншымі сродкамі і метадамі і ў іншых арганізацыйных формах, што дазваляе вырашаць шэраг дадатковых і спецыфічных задач:паглыбіць і пашырыць веды, атрыманыя вучнямі на ўроках;абудзіць цікавасць і сфарміраваць устойлівы пазнаваўчы інтарэс да вывучэння гісторыі;развіваць творчыя здольнасці вучняў, авалодваць уменнямі ажыццяўляць элементарныя гістарычныя даследаванні;садзейнічаць развіццю маральных якасцей асобы школьніка адказнасці за даручаную справу, арганізаванасць, дысцыплінаванасць, калектывізм і гатоўнасць прыйсці на дапамогу аднакласнікам і г.д.

Нягледзячы на пэўныя адрозненні пазакласная і урочная работа цесна звязаны паміж сабой. Так, напрыклад, летняя гісторыка-краязнаўчыя экспедыцыя ці паход з'яўляюцца справай добраахвотнай, вучні ўдзельнічаюць у іх па ўласнаму жаданню, але справаздача аб ім павінна стаць здабыткам галоснасці, вынікі павінны стаць вядомымі ўсей школе. Для гэтага можа быць праведзены агульна-школьны збор, лінейка, канферэнцыя або вечар. Гэта пазакласнае мерапрыемства плануецца загадзя і з'яўляецца абавязковым для ўсіх.

Пазакласная работа па гісторыі будуецца на іншых чым вучэбная прынцыпах арганізацыі. Асноўнымі з іх з'яўляюцца:дабраахвотнасць, якая стварае магчымасць арганізаваць дзейнасць вучняў па інтарэсах, садзейнічае развіццю індывідуальных схільнасцей, ініцыятывы і пазнавальнай самастойнасці;педагагічнае кіраўніцтва з боку настаўніка, якое ажыццяўляецца праз аказанне дапамогі школьнікам у вызначэнні задач, асноўных напрамкаў, зместу і форм пазакласнай работы;самакіраванне ў межах абраных вучнямі форм (гурткі, таварыствы, клубы, савет музея і г.д.) арганізацыі пазакласнай работы;галоснасць, якая рэалізуецца праз інфармаванне школьнай грамадскасці аб стане і выніках пазакласнай работы (аб'явы, інфармацыйныя білютэні, насценная газета, інтэрнэт – форумы і г.д.);грамадска-карысная накіраванасць пазакласнай работы. Якая вызначаецца яе значнасцю ў ажыццяўленні выхавання ў школьнікаў грамадзянскай адказнасці за вынікі сваёй дзейнасці, прапагандзе гістарычных ведаў і захаванні гісторыка-культурнай спадчыны.

3. Змест пазакласнай работы па гісторыі вызначаецца агульнымі задачамі, якія стаяць перад сучаснай школай і перш за ўсё выхаваўчымі. Ён рэалізуецца ў двух асноўных напрамках: а)пашырэнне і паглыбленне гістарычных ведаў, атрыманых на ўроку; б) вывучэнне краязнаўчага матэрыялу.

Змест пазакласнай работы можа быць звязаны з вырашэннем задач грамадска-патрыятычнага, маральнага і эстэтычнага выхавання моладзі. Другі напрамак – краязнаўчая работа: вывучэнне гісторыі горада, вёскі, края, школы ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пэўныя гістарычныя перыяды; вывучэнне жыцця і дзейнасці людзей звязаных з гісторыяй роднага краю; археалагічнае і этнаграфічнае вывучэнне краю – яго эканомікі, ваеннага і культурнага мінулага ў пэўны гістарычны перыяд.

Такім чынам, змест пазакласнай работы можа быць самым разнастайным. Разам з тым ён павінен быць звязаны з праграмным матэрыялам, вывучаемым у школе і садзейнічаць вырашэнню адукацыйных і выхаваўчых задач, якія ставяцца перад ёй дзяржавай і грамадствам.

4. Пазакласная работа па гісторыі характарызуецца вялікай разнастайнасцю форм, што патрабуе іх класіфікацыі. Усе формы яе правядзення можна класіфіцыраваць: па колькасці вучняў, занятых у ёй яны дзеляцца на масавыя, або франтальныя (вечар, канферэнцыя, мінтынг), групавыя або гуртковыя (работа гуртка, секцый, савета музея) і індывідуальныя (падрыхтоўка даклада, рэферпата, конкурснай работы, падрыхтоўка да алімпіяды і г.д.); *па* працягласці: на сістэматычныя, якія праводзяцца на працягу года (гурткі, пазакласнае чытанне, стварэнне і работа музея) і эпізадычныя (сустрэчы з цікавымі людзьмі, паход, экскурсія, выпуск гістарычнага бюлетэня і г.д.).

Пры выбары той ці іншай формы работы неабходна ўлічваць узрост вучняў. Так вечар забаўляльнай гісторыі, або тэатралізаваны ранішнік мэтазгодна арганізоўваць у V – VIII класах, а пасяджанні “круглага стала”, або канферэнцыю з вучнямі старэйшых класаў.

Разгледзім найбольш распаўсюджаныя ў школьнай практыцы формы пазакласнай работы.

Пазакласнае чытанне – гэта чытанне вучнямі мастацкай і папулярнай літаратуры па гістарычнай тэматыцы, якое выходзіць за рамкі абавязковых ведаў, вызначаных праграмай і выкладзеных у падручніку. Яно стварае магчымасць для фарміравання ў вучняў яркіх і запамінальных вобразаў гістарычных падзей і асоб, выразных уяўленняў аб пэўнай гістарычнай эпосе, яе каларыце, якія запамінаюцца надоўга. Чытанне мастацкай і навукова-папулярнай літаратуры істотна пашырае кругагляд вучняў, развівае інтарэс да гісторыі, уплывае на пачуцці школьнікаў, фарміруе ў іх маральныя веды і ацэнкі, развівае навыкі самаадукацыі. Каб рэалізаваць такія па-сапраўднаму неабмежаваныя магчымасці пазакласнага чытання неабходна мэтанакіраванае і сістэматычнае кіраўніцтва ім з боку дарослых і, перш за ўсё, настаўніка.

У старэйшых класах можна выкарыстоўваць напісанне рэцэнзій па прачытаных кнігах, аднак гэта складаны від работы, які патрабуе ад вучняў уменняў адбіраць фактычны матэрыял, ажыццяўляць яго аналіз і абагульненне, самастойна рабіць высновы.

Гістарычны гурток – гэта асноўная і найбльш распаўсюджаная ў сучаснай школе форма пазакласнай работы. Яна прадугледжвае сістэматычную і мэтанакіраваную работу, разлічаную на адносна доўгі перыяд часу. Гістарычны гурток ствараецца з вучняў прыкладана аднаго ўзросту, на дабраахвотнай аснове. Колькасна найбольш аптымальным з’яўляецца гурток ад 10 да 20 вучняў. Перад стварэннем гуртка ў працэсе арганізацыі эпізадычных форм работы (экскурсій, конкурсаў, гістарычных вечароў) выяўляюцца найбольш зацікаўленыя ў вывучэнні гісторыі вучні, якім настаўнік прапануе стварыць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гурток. Вельмі важным момантам у рабоце гуртка з’яўляецца самадзейнасць вучняў. Пры мінімальным педагагічным кіраўніцтве з боку настаўніка вучні вызначаюць тэму і змест работы гуртка, выпрацоўваюць план работы, абіраюць старасту і актыў гуртка.

Работа шэрагу гістарычных гурткоў можа перарасці ў стварэнне навуковых таварыстваў і клубаў, якія самастойна ці па заданню навуковых устаноў займаюцца навуковымі археалагічнымі, этнаграфічнымі і краязнаўчымі даследаваннямі.

Гістарычныя вечары – адна з распаўсюджаных форм арганізацыі пазакласанай работы. Яны абавязкова ўтрымліваюць у сабе элементы гульні, тэатралізаваных пастановак, драматызацыі. Гістарычныя вечары адносяцца да масавых форм пазакласнай работы.

Алімпіяды – гэта форма пазакласнай работы накіравана на выяўленне найбольш здольных і таленавітых у галіне гісторыі школьнікаў. Яны арганізуюцца ў пазаўрочны час і, як правіла, звязаны з ажыццяўляемай органамі адукацыі работай па выяўленню таленавітай моладзі.

Да алімпіяды, як формы пазакласнай работы прымыкаюць школьныя, раённыя, гарадскія і рэспубліканскія навукова-практычныя канферэнцыі і конкурсы вучнёўскіх навуковых работ, якія атрымалі ў апошнія гады шырокае распаўсюджанне ў нашай краіне. Падрыхтоўка да ўдзелу ў такіх канферэнцыях звязана з індывідуальнай пазакласнай работай па гісторыі. Іменна настаўнік, аказвае метадычную дапамогу школьніку ў пошуку і адборы навуковай літаратуры, дакументаў і матэрыялаў, іх вывучэнні і абагульненні, напісанні і афармленні навуковых дакладаў і выступленняў.

Экскурсіі, паходы і экспедыцыі па вывучэнню гісторыі і культуры роднага краю з’яўляюцца цікавымі і пазнавальнымі для вучняў формамі пазакласнай работы. Іх выкарыстанне звязана з вялікай падрыхтоўчай работай.

Стварэнне і работа школьных музеяў. Стварэнне школьных музеяў праходзіць некалькі этапаў: 1) падрыхтоўчы, на якім ствараецца Савет музея, абмяркоўваецца тэматыка, план, паслядоўнасць збора і размяшчэння экспанатаў; 2) збор рэчавага і дакументальнага матэрыялаў, камплектаванне фондаў, улік і захоўванне экспанатаў і дакументаў; 3) арганізацыя работы ў самім музеі: падрыхтоўка групы экскурсаводаў, правядзенне экскурсій, выкарыстанне экспазіцыі музея на ўроках і ў пазакласнай рабоце, сустрэчы з цікавымі людзьмі, папаўненне фондаў.

Ва ўсіх разгледжаных намі формах пазакласнай работы вырашальная роля належыць настаўніку. Яго энэргія, намаганні, энтузіязм могуць зрабіць так, што пазакласная работа можа стаць магутным фактарам паглыблення ведаў па гісторыі, абуджэнне пазнавальнай цікавасці, развіцця і выхавання школьнікаў гісторыяй.

Настаўнік гісторыі. Структура дзейнасці настаўніка гісторыі ўключае ў сябе: дзейнасць па выкладанню гісторыі школьнікам, выхаваўчую работу на ўроках і ў пазакласнай рабоце па гісторыі, метадычную работу па ўдасканаленню свайго педагагічнага майстэрства, работу па самаадукацыі і павышэнню сваей кваліфікацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Настаўнік гісторыі – адна з цэнтральных фігур у настаўніцкім калектыве, што вынікае са спецыфікі зместу гісторыі як школьнага прадмета, выкладанне якога мае вызначальнае значэнне ў фарміраванні светапогляду школьнікаў і выхаванні ў іх маральных якасцей і каштоўнасных арыентацый асобы.

# 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1. ПЛАНЫ СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

### Тэма 1. Асноўныя этапы развіцця методыкі выкладання гісторыі ў СССР

1. Развіццё гістарычнай адукацыі ў 20-я гады XXст. 2. Аднаўленне выкладання гісторыі ў савецкай школе і развіццё методыкі выкладання гісторыі ў 30-я- 50-я гады. 3. Развіцце методыкі выкладання гісторыі ў 60-я – пач.80-х гг. XXст. 4. Крызіс гістарычнай адукацыі ў СССР і пошукі шляхоў яго пераадолення.

Літаратура

1. Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе. – Мінск: БДПУ, 2009. – Гл. 2.
2. Методика обучения истории в средней школе. Пособие для учителей /Под ред. Ф.П. Коровкина. В 2-х Ч.-М. 1978. Ч.I., – М.: Просвешение, 1977. – Гл. 2, с. 15-39.
3. Студеникин М.В. Методика преподавания истории. Учебник для вузов. – М.: Владос, 2000. – Гл. 3
4. Ежова С.А. Методика преподавания истории в средней школе. Учебник для вузов. –М.: Просвешение, 1986. – Гл.3.

### Тэма 2. Нарматыўна-метадычнае забеспячэнне выкладання прадмета ”Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі”.

1. Аналіз канцэпцыі школьнай гістарычнай адукацыі.
2. Аналіз зместу адукацыйнага стандарту.
3. Прынцыпы пабудовы і аналіз школьных праграм па гісторыі.
4. Аналіз складу вучэбна-метадычных комплексаў па прадмеце “Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі”.

Практычнае заданне: кожнаму студэнту скласці характарыстыку канцэпцыі і школьнай праграмы па гісторыі.

Літаратура

1. Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе. – Мінск: БДПУ, 2009. – Гл 5.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2.Концепция предмета «Всемирная история. История Беларуси» //Гісторыя : праблемы выкладання. – 2009. – №7.
3. Образовательный стандарт учебного предмета «Всемирная история. История Беларуси» //Гісторыя : праблемы выкладання. – 2009. – №7.
3. Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі V-XIкласы: вучэбныя праграмы для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай мовай навучання. – Мінск: Нац.ін-т адукацыі,2009.
4. Ганущенко Н., Краснова М. Учебно-методический комплекс как фактор повышения качества исторического образования // Гісторыя: праблемы выкладання. 2010. – №2. – С. 8-12

**Тэма 3. Характарыстыка вучэбна-метадычнага комплекса вывучэння гісторыі старажытнапга свету і сярэдніх вякоў**

1. Структура курсаў сусветнай гісторыі. 2. Характарыстыка вучэбна-метадычных комплексаў па новай і найноўшай гісторыі. 3. Адпаведнасць зместу вучэбных дапаможнікаў школьным праграмам і патрабаванням адукацыйнага стандарту. 4. Характарыстыка метадычнага апарата вучэбных дапаможнікаў па новай і найноўшай гісторыі.

Практычнае заданне: кожнаму студэнту падрыхтаваць аналіз праграмы па сусветнай гісторыі новага і аднаго з вучэбных дапаможнікаў па сусветнай гісторыі.

Літаратура

1. Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе. – Мінск: БДПУ, 2009. – Гл. 5.
2. Морозов А.Ю. Учебники по истории: традиции и новации//Преподавание истории в школе. – 2007. – №1. С. 7 – 13.
3. Концепция предмета «Всемирная история. История Беларуси» //Гісторыя : праблемы выкладання. – 2009. – №7.
4. Образовательный стандарт учебного предмета «Всемирная история. История Беларуси» //Гісторыя : праблемы выкладання. 2009, №7.
5. Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі V-XIкласы: вучэбныя праграмы для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай мовай навучання. – Мінск: Нац.ін-т адукацыі,2009.
6. Гісторыя старажытнага свету: вуч.дапам. для 5кл.: в 2ч./пад рэд.праф. У.С. Кошалева. – Мінск: ВЦ БДУ, 2010.
7. Гісторыя сярэдніх вякоў: вуч.дапам. для 6 кл.: пад рэд.праф. В.А.Фядосіка. – Мінск: ВЦ БДУ, 2010.
8. Гісторыя сярэдніх вякоў: вуч.дапам. для 7 кл.: пад рэд.праф. В.А.Фядосіка. – Мінск: ВЦ БДУ, 2010.
9. Мініцкі М.В., Ханкевіч В.І. Выкладанне гісторыі старажытнага свету: вуч.-метад.для настаўнікаў. – Мінск: Рэд.час.”Адукацыя і выхаванне”. 2000.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Тэма 4. Характарыстыка вучэбна-метадычнага комплекса вывучэння сусветнай гісторыі новага і навейшага часу.**

1. Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе. – Мінск: БДПУ, 2009. – Гл. 5.
2. Морозов А.Ю. Учебники по истории: традиции и новации//Преподавание истории в школе. – 2007. – №1. С. 7 – 13.
3. Концепция предмета «Всемирная история. История Беларуси» //Гісторыя : праблемы выкладання. – 2009. – №7.
4. Образовательный стандарт учебного предмета «Всемирная история. История Беларуси» //Гісторыя : праблемы выкладання. 2009, №7.
5. Сусветная гісторыя новага часу XVI – XVIII стст.: вуч. дап. для 8 класа /пад рэд. Праф. У.С. Кошалева. – Мн.: ВЦ БДУ, 2010.
6. Сусветная гісторыя новага часу XIX – пач. XX ст.: вуч. дап. для 9 класа /пад рэд. Праф. У.С. Кошалева. – Мн.: 2011.
7. Сусветная гісторыя навейшага часу 1918-1945гг.: вуч.дап.для 10 кл./пад рэд.праф. Г.А. Космача. – Мн.: 2012.
8. Сусветная гісторыя навейшага часу 1945-2012гг.: вуч.дап.для 11 кл./пад рэд.праф. Г.А. Космача. – Мн.: 2012.

**Тэма 5. Характарыстыка вучэбна-метадычнага комплекса вывучэння гісторыі Беларусі ў 6-11 класах.**

1. Структура курса гісторыі Беларусі. 2. Характарыстыка вучэбна-метадычнага комплексу па гісторыі Беларусі. 3. Адпаведнасць падручнікаў зместу школьным праграм і патрабаванням адукацыйнага стандарту. 4. Характарыстыка метадычнага апарата падручнікаў.

Практычнае заданне: падрыхтаваць аналіз праграмы па гісторыі Беларусі і аднаго з вучэбных дапаможнікаў.

Літаратура

1. Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе. – Мінск: БДПУ, 2009. – Гл. 5.
2. Концепция предмета «Всемирная история. История Беларуси» //Гісторыя: праблемы выкладання. – 2009. – №7. – С. 3-7.
3. Образовательный стандарт учебного предмета «Всемирная история. История Беларуси» //Гісторыя : праблемы выкладання. – 2009. – №7.
4. Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі V-XI класы: вучэбныя праграмы для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай мовай навучання. – Мн.: Нац. ін-т адукацыі, 2009.
5. Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст.: вуч.дапам. для 6 класа/пад рэд. Г.В. Штыхава, Ю.М.Бохана. – Мн:Народная асвета, 2009.
6. Гісторыя Беларусі: ддругая паловаXIII - сярэдзіны XVI ст.: вуч.дапам. для 7 класа / пад рэд. Ю.М. Бохана. – Мн.: Народная асвета, 2009.
7. Гісторыя Беларусі: другая паловаXIII - сярэдзіны XVI ст.: вуч.дапам. для 7 класа / пад рэд. Ю.М. Бохана. – Мн.: Народная асвета, 2009.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

8. Гісторыя Беларусі: сяр. XVI – канец XVIII часу: вучэб. дапам. для 8-га кл. агульнаадукац. школ з бел. мовай навучання/ а.Белазаровіч: Пад рэд. І.П. Крэня. – Мн: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2011.
9. Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. – 1917 г.: вучэб. дапам. для 9-га кл. агульнаадукац. школ / У.А. Сосна С.В.Марозава, С.В.Паноў; Пад рэдак. М.С. Сташкевіча. – Мн.: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2010
10. Гісторыя Беларусі: канец 1917– 1945гг.: вучэб. дапам. для 10-га кл. агульнаадукац. школ / Пад рэдак. А.Кавалені – Мн.: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2012.
11. Гісторыя Беларусі: 1946–2011гг.: вучэб. дапам.для 11-га кл. агульнаадукац. школ. – Мн.: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2012.

**Тэма 5. Шляхі і сродкі фарміравання гістарычных уяўленняў**

1. Прыёмы выкарыстання нагляднасці для фарміравання гістарычных уяўленняў.2. Прыёмы славеснага малявання. 3. Выкарыстанне крэйдавага малюнка. 4. Выкарыстанне мастацкай літаратуры і твораў жывапісу.

Практычнае заданне: На аснове самастойнага вывучэння рэкамендаванай літаратуры кожны студэнт павінен падрыхтаваць фрагмент ўрока па фарміраванню ў вучняў ўяўлення (па выбару): 1) аб прыладах працы і спосабах яе арганізацыі; 2) аб занятках і быце людзей; 3) аб фактах ваеннай гісторыі; 4) аб фактах палітычнай гісторыі; 5) аб гістарычных дзеячах.

Літаратура

1. Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе. – Мінск: БДПУ, 2009. – Гл. 7.
2. Ежова С.А. и др. Методика преподавания истории в средней школе. –М., 1986.
3. Корзюк А.А. Вывучэнне гісторыі Беларусі канца XVIII – пач. XXст. у агульнаадукацыйнай школе: вуч.-метад. дапаможнік. – Мінск: БДПУ, 2010.
4. Короткова М.В., Студеникин М.Т. Практикум по методике преподавания истории в школе. – М.: ВЛАДОС. – 2000.
5. Студеникин М.В. Методика преподавания истории в средней школе. – М.: ВЛАДОС, 2000.
6.Вагин А.А. Методика обучения истории в средней школе. – М.: 1968.
7. Годер Г.И. Преподавание истории в 5 классе. – М.: 1984.
8. Дзеючая праграма па гісторыі.
9. Дзеючыя вучэбныя дапаможнікі па сусветнай і айчыннай гісторыі для 5-7 класаў.

**Тэма 6. Методыка фарміравання ўяўленняў аб гістарычным часе і гістарычнай прасторы.**

1. Фарміраванне ўяўленняў аб летазлічэнні і храналогіі. 2. Методыка фарміравання, замацавання і праверкі ведаў вучняў па храналогіі. 3.Віды гістарычных карт і іх характарыстыка. 4. Методыка работы з гістарычнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

картай. 5. Шляхі фарміравання, замацавання і праверкі картаграфічных уменняў.

Практычнае заданне*:* Кожнаму студэнту падрыхтаваць фрагмент ўрока з выкарыстаннем прыёмаў фарміравання ўяўленняў аб гістарычным часе і гістарычнай прасторы.

Літаратура

1. Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе. – Мінск: БДПУ, 2009. – Гл. 7.
2.Жук Т. Фарміраванне храналагічных ведаў і ўменняў на ўроках гісторыі Беларусі ў V – VI//Гісторыя: праблемы выкладання. – 2002. - №4. – С 94-102.
3. Ежова С.А. и др. Методика преподавания истории в средней школе. –М., 1986.
4. Лизунова Е. Обучение способам деятельности с картогафическим материалом при изучении истории в пятом классе // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2007. – №8. – С. 59 – с 63.
5. Лизунова Е.В. /Под ред. Богдановича И.И. Организация учебно-познавательной деятельности учащихся при изучении истории в 5 классе. – Минск, БГПУ, 2007.
6. Корзюк А.А. Вывучэнне гісторыі Беларусі канца XVIII – пач. XXст. у агульнаадукацыйнай школе: вуч.-метад. дапаможнік. – Мінск: БДПУ, 2010.
7. Короткова М.В., Студеникин М.Т. Практикум по методике преподавания истории в школе. М.: ВЛАДОС.2000.
8. Студеникин М.Т. Методика преподавания истории в средней школе. – М.: ВЛАДОС, 2000.
9. Вагин А.А. Методика обучения истории в средней школе. – М.: 1972.
10. Годер Г.И. Преподавание истории в 5 классе. – М.: 1984.
11. Дзеючая праграма па гісторыі.
12. Дзеючыя вучэбныя дапаможнікі па сусветнай і айчыннай гісторыі для 5-7 класаў.
13. Контурные карты і атласы для 5-6 класаў.

**Тэма 8. Шляхі фарміравання гістарычных паняццяў.**

1. Класіфікацыя паняццяў. 2. Метадычныя шляхі фарміравання: 1) рыватна-гістарычных паняццяў 2) агульных гістарычных паняццяў 3)усеагульных (сацыялагічных паняццяў).

Практычнае заданне: кожнаму студэнту пасля вывучэння рэкамендаванай літаратуры неабходна падрыхтаваць фрагмент урока па фарміраванню гістарычнага паняцця.

Літаратура

1. Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе. – Мінск: БДПУ, 2009. – Гл. 7.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Вагин А.А. Методика обучения истории в средней школе. – М.: Просвещение, 1972.
3. Ежова С.А. и др. Методика преподавания истории в средней школе. –М., 1986.
3. Короткова М.В., Студеникин М.Т. Практикум по методике преподавания истории в школе. – М.: ВЛАДОС. – 2000.
4. Студеникин М.В. Методика преподавания истории в средней школе. – М.: ВЛАДОС, 2000.
5. Ракуць В. Рабоце над гістарычнымі паняццямі – прырытэтны накірунак у выкладанні прадмета // Гісторыя: праблемы выкладання. – 1998. - №3. С. 42 – 59.
6. Салдатава О. Развитие мышления учащихся на уроках истории // Гисторыя: праблемы выкладання. – 1999. – №2. – С.43 – 54
7. Тумiловiч Г. Аб некаторых метадычных аспектах фарміравання гістарычных паняццяў // Гісторыя: праблемы выкладання. – 1997. - №2. – С. 31 – 36.
8. Дзеючая праграма па гісторыі.
9. Дзеючыя вучэбныя дапаможнікі па сусветнай і айчыннай гісторыі для 6 – 11 класаў.

**Тэма 9. Метадычныя прыёмы фарміравання гістарычных заканамернасцей**

1. Вызначэнне месца фарміравання заканамернасцей у школьных курсах гісторыі. 2. Методыка раскрыцця заканамернасцей гістарычнага развіцця.3. Методыка ажыццяўлення міжпрадметных сувязей.

Практычнае заданне: кожнаму студэнту пасля вывучэння рэкамендаванай літаратуры неабходна падрыхтаваць фрагмент урока па фарміраванню гістарычнай заканамернасці.

Літаратура

1. Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе. – Мінск: БДПУ, 2009. – Гл. 7.
2. Вагин А.А. Методика обучения истории в средней школе. – М.: Просвещение, 1972.
3. Ежова С.А. и др. Методика преподавания истории в средней школе. –М., 1986.
3. Короткова М.В., Студеникин М.Т. Практикум по методике преподавания истории в школе. – М.: ВЛАДОС. – 2000.
4. Студеникин М.В. Методика преподавания истории в средней школе. – М.: ВЛАДОС, 2000.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. Ракуць В. Рабоце над гістарычнымі паняццямі – прырытэтны накірунак у выкладанні прадмета // Гісторыя: праблемы выкладання. – 1998. - №3. С. 42 – 59.
6. Салдатава О. Развитие мышления учащихся на уроках истории // Гисторыя: праблемы выкладання. – 1999. – №2. – С.43 – 54.
7. Туміловіч Г. Аб некаторых метадычных аспектах фарміравання гістарычных паняццяў // Гісторыя: праблемы выкладання. – 1997. - №2. – С. 31 – 36.
8. Дзеючая праграма па гісторыі.
9. Дзеючыя вучэбныя дапаможнікі па сусветнай і айчыннай гісторыі для 6 – 11 класаў.

**Тэма 10. Метадычныя шляхі рэалізацыі дзейнаснага кампанента гістарычнай адукацыі**

1.Характарыстыка дзейнаснага кампанента гістарычнай адукацыі2. Класіфікацыя ўменняў і спосабаў дзейнасці. 3. Роля лагічных схем ў фарміраванні ўменняў і спосабаў дзейнасці.

Практычнае заданне: кожнаму студэнту пасля вывучэння рэкамендаванай літаратуры неабходна падрыхтаваць фрагмент з выкарыстаннем аднаго са шляхоў фарміраванню ў вучняў спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

Літаратура

1. Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе. – Мінск: БДПУ, 2009. – Гл. 7.
2. Ежова С.А. и др. Методика преподавания истории в средней школе. –М., 1986.
3. Короткова М.В., Студеникин М.Т. Практикум по методике преподавания истории в школе. – М.: ВЛАДОС. – 2000.
4. Гинчук В.В. /Под ред. Богдановича И.И. Организация учебно-познавательной деятельности учащихся при изучении всемирной истории в 10 классе. – Минск, БГПУ, 2004.
5. Запорожец Н.И. Развитие умений и навыков учащихся в процессе преподавания истории (IV-VIII кл.)./М., 1978.
6. Лизунова Е.В. /Под ред. Богдановича И.И. Организация учебно-познавательной деятельности учащихся при изучении истории в 5 классе. – Минск, БГПУ, 2007.
7. Сякацкая К. Фарміраванне ўменняў канспектаваць і тэзіраваць // БГЧ. – 1998. – № 1.
8. Дзеючая праграма па гісторыі.
9. Дзеючыя вучэбныя дапаможнікі па сусветнай і айчыннай гісторыі для 5-7 класаў.

**Тэма 11. Методыка фарміравання спосабаў вучэбна-пазнаваўчай дзейнасці**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Тэарэтычныя асновы методыкі фарміравання спосабаў ВПД у навучанні гісторыі. 2.Методыка паэтапнага фарміравання спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці. 3. Мадэліраванне дзейнасці школьнікаў па авалоданні спосабамі ВПД.

Практычнае заданне: кожнаму студэнту пасля вывучэння рэкамендаванай літаратуры неабходна падрыхтаваць фрагмент урока па фарміраванню ў вучняў аднаго са спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

Літаратура

1. Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе. – Мінск: БДПУ, 2009. – Гл. 7.
2. Ежова С.А. и др. Методика преподавания истории в средней школе. –М., 1986.
3. Короткова М.В., Студеникин М.Т. Практикум по методике преподавания истории в школе. – М.: ВЛАДОС. – 2000.
4. Гинчук В.В. /Под ред. Богдановича И.И. Организация учебно-познавательной деятельности учащихся при изучении всемирной истории в 10 классе. – Минск, БГПУ, 2004.
5. Запорожец Н.И. Развитие умений и навыков учащихся в процессе преподавания истории (IV-VIII кл.) /М., 1978.
6. Лизунова Е.В. /Под ред. Богдановича И.И. Организация учебно-познавательной деятельности учащихся при изучении истории в 5 классе. – Минск, БГПУ, 2007.
7. Сякацкая К. Фарміраванне уменняў канспектаваць і тэзіраваць // БГЧ. – 1998. – № 1.
8. Дзеючая праграма па гісторыі.
9. Дзеючыя вучэбныя дапаможнікі па сусветнай і айчыннай гісторыі для 5-7 класаў.

**Тэма 12. Метадычныя прыемы выкарыстання нагляднасці ў навучанні гісторыі**

1. Выкарыстанне прадметнай нагляднасці (экскурсіі).
2. Методыка выкарыстання выяўленчай нагляднасці па гісторыі.
3. Методыка выкарыстання ўмоўна-графічнай нагляднасці.
4. Выкарыстанне электронных сродкаў навучання гісторыі.

Практычнае заданне. На аснове аналіза рэкамендуемай да заняткаў літаратуры і дзеючых школьных дапаможнікаў падрыхтаваць фрагмент урока з выкарыстаннем некалькіх прыёмаў работы нагляднасцю.

Літаратура

1. Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе. – Мінск: БДПУ, 2009. – Гл. 8.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2.  Гора П.В. Методические приёмы и средства наглядного обучения истории в средней школе. – М.: Просвещение, 1971.
4. Ежова С.А. и др. Методика преподавания истории в средней школе. – М.: 1986.
5. Никифоров Д.Н., Скляренко С.Ф. Наглядность в преподавании истории и обществоведения. –М., 1978.
6. Короткова М.В., Студеникин М.Т. Практикум по методике преподавания истории в школе. – М.: ВЛАДОС. – 2000.
7. Лазіцкі В. Выкарыстанне электронных сродкаў навучання ў працэсе вывучэння гісторыі Беларусі на трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі //Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. – №3. – С.44- 52.
8. Солдатова О. Дидактические аспекты применения некоторых инновационных методов обучения школьников истории. /Гісторыя: праблемнае выкладанне. 1998, № 2.
8.  Дзеючая праграма па гісторыі.
9. Дзеючыя вучэбныя дапаможнікі па сусветнай і айчыннай гісторыі для 5-7 класаў.

**Тэма 13. Прыёмы вуснага навучання гісторыі**

1. Месца і роля вуснага слова ў навучанні гісторыі. 2. Характарыстыка прыёмаў вуснага навучання гісторыі. 3. Дыялагічныя формы вуснага слова ў навучанні гісторыі.

Практычнае заданне: кожнаму студэнту пасля вывучэння рэкамендаванай літаратуры неабходна падрыхтаваць фрагмент урока па фарміраванню ў вучняў аднаго прыемаў вуснага вывучання гісторыі.

Літаратура

1. Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе. –  Мінск: БДПУ, 2009. – Гл. 8.
2. Вагин А.А. Методика преподавания истории в средней школе. – М.: Просвещение,1968. –  С.54-75.
3. Гора П.В. Методические приёмы и средства наглядного обучения истории в средней школе. – М.: Просвещение, 1971. – С. 13-22.
4. Ежова С.А. и др. Методика преподавания истории в средней школе. – М.: 1986.
5. Корзюк А.А. Вывучэнне  гісторыі Беларусі канца XVIII – пач. XXст. у агульнаадукацыйнай школе: вуч.-метад. дапаможнік.  – Мінск: БДПУ, 2010.
6. Короткова М.В., Студеникин М.Т. Практикум по методике преподавания истории в школе. – М.: ВЛАДОС. – 2000.
7. Степанищев А.Т. Методика преподавания и изучения истории. В 2ч. Ч.І. – М.:ВЛАДОС,2002.
8.  Дзеючая праграма па гісторыі.
9. Дзеючыя вучэбныя дапаможнікі па сусветнай і айчыннай гісторыі для 5-7 класаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Тэма 14. Метадычныя прыемы работы з друкаванымі крыніцамі па гісторыі**

1. Прыемы арганізацыі работы вучняў з тэкстам падручніка. 2. Метадычныя прыёмы выкарыстання гістарычнага дакумента ў навучанні гісторыі. 3. Выкарыстанне ў навучанні гісторыі навукова-папулярнай літаратуры. 4. Выкарыстанне ў навучанні гісторыі мастацкай літаратуры.

Практычнае заданне. На аснове аналіза рэкамендуемай да заняткаў літаратуры і дзеючых школьных дапаможнікаў падрыхтаваць фрагмент урока з выкарыстаннем некалькіх прыёмаў работы з друкаваным гістарычным тэкстам, накіраваным на:

Літаратура


1. Баргдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе. – Мінск: БДПУ, 2009. – Гл. 8.
2. Вагин А.А. Методика преподавания истории в средней школе. – М.: Просвещение,1968. – С. 75 - 132.
3. Грицевский И.М. Работа учителя с учебником при подготовке к уроку истории: из опыта работы. – М.: Просвещение, 1987.
4. Гора П.В. Пути повышения эффективности обучения истории в средней школе. – М.: Просвещение,1988.
5. Ежова С.А. и др. Методика преподавания истории в средней школе. – М.: 1986.
6. Корзюк А.А. Вывучэнне гісторыі Беларусі канца XVIII – пач. XXст. у агульнаадукацыйнай школе: вуч.-метад. дапаможнік. – Мінск: БДПУ, 2010.
7. Короткова М.В., Студеникин М.Т. Практикум по методике преподавания истории в школе. – М.: ВЛАДОС. – 2000.
8. Лизунова Е.В./Под ред. Богдановича И.И. Организация учебно-познавательной деятельности учащихся при изучении истории в 5 классе. – Минск, БГПУ, 2007.
9. Степанищев А.Т. Методика преподавания и изучения истории. В 2ч. Ч.I. – М.:ВЛАДОС,2002.
10. Дзеючая праграма па гісторыі.
11. Дзеючыя вучэбныя дапаможнікі па сусветнай і айчыннай гісторыі для 5-7 класаў.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Тэма 15. Мадэліраванне мэты і задач ўрока гісторыі.**

1. Структурна-функцыянальны аналіз і яго роля ў канструявання мэты і задач ўрока гісторыі. 2. Метадычныя ўмовы аптымальнага вызначэння адукацыйна-выхаваўчых і развіваючых вынікаў навучання. 3. Методыка мадэлірavання мэты і задач урока.

Практычнае заданне: На аснове аналіза рэкамендуемай да заняткаў літаратуры і дзеючых школьных дапаможнікаў сфармулявавць мэту і задачы ўрока гісторыі.

Літаратура

1. Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе. – Мінск: БДПУ, 2009. – Гл. 9.
2. Вяземский Е.Е., Стрелова О. Ю. Теория и методика преподавания истории. Учебник для студентов ВУЗов. – М.:ВЛАДОС, 2003.
2. Гора П.В. Пути повышения эффективности обучения истории в средней школе. – М.: Просвещение,1988.
3. Ежова С.А. и др. Методика преподавания истории в средней школе. – М.: 1986.
4. Каплан С.Б. Я делаю урок: методика преподавания истории. Методическое псобие. – Минск, 1991.
5. Ракуць В. Тыпы і структура ўрокаў гісторыі.//Белпрускі гістарычны часопіс. – 2001. – №6. – С.82 – 85.
6. Студеникин М.В. Методика преподавания истории в средней школе. – М.: ВЛАДОС, 2000.
7. Дзеючая праграма па гісторыі.
8. Дзеючыя вучэбныя дапаможнікі па сусветнай і айчыннай гісторыі для 5-7 класаў.

**Тэма 16. Канструяванне структуры і падрыхтоўка палана-канспекта ўрока гісторыі**

1. Вызначэнне структуры ўрока. 2. Планаванне варыянтаў арганізацыі вывучэння новага матэрыялу на ўроках гісторыі. 3.Выбар спосабаў арганізыцыі пазнавальнай дзейнасці на розных этапах урока.

Практычнае заданне: На аснове аналіза рэкамендуемай да заняткаў літаратуры і дзеючых школьных дапаможнікаў падрыхтаваць план-канспект ўрока гісторыі.

Літаратура

1. Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе. – Мінск: БДПУ, 2009. – Гл. 9.
2. Вяземский Е.Е., Стрелова О. Ю. Теория и методика преподавания истории. Учебник для студентов ВУЗов. – М.:ВЛАДОС, 2003.
2. Гора П.В. Пути повышения эффективности обучения истории в средней школе. – М.: Просвещение,1988.
3. Ежова С.А. и др. Методика преподавания истории в средней школе. – М.: 1986.
4. Каплан С.Б. Я делаю урок: методика преподавания истории. Методическое псобие. – Минск, 1991.
5. Ракуць В. Тыпы і структура ўрокаў гісторыі.//Белпрускі гістарычны часопіс. – 2001. – №6. – С.82 – 85.
6. Студеникин М.В. Методика преподавания истории в средней школе. – М.: ВЛАДОС, 2000.
7. Дзеючая праграма па гісторыі.
8. Дзеючыя вучэбныя дапаможнікі па сусветнай і айчыннай гісторыі для 5-7 класаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Тэма 17. Прыёмы праверкі і ацэнкі ведаў па гісторыі**

1. Прызначэнне праверкі ведаў. 2. Канструяванне арганізацыі праверкі адукацыйна-выхаваўчых вынікаў навучання на ўроку гісторыі. 3. Атэстацыя па гісторыі, яе віды і методыка правядзення.

Практычнае заданне. На аснове вывучэння рэкамендаванай літаратуры, дзеючых праграм і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі спланіраваць методыку арганізацыі праверкі ведаў на канкрэтным уроку гісторыі.

Літаратура

1. Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе. – Мінск: БДПУ, 2009. – Гл.11.
2. Вяземский Е.Е., Стрелова О. Ю. Теория и методика преподавания истории. Учебник для студентов ВУЗов. – М.:ВЛАДОС, 2003.
2. Гора П.В. Пути повышения эффективности обучения истории в средней школе. – М.: Просвещение,1988.
3. Ежова С.А. и др. Методика преподавания истории в средней школе. – М.: 1986.
4. Лейбенгруб П.С. О повторении на уроках истории СССР в 7-10 классах. – М.:Просвещение, 1987.
5. Волкава Т. Правепка ведаў і навучанне
// Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – №3. – С. 85-87.
6. Студеникин М.В. Методика преподавания истории в средней школе. – М.: ВЛАДОС, 2000.

**Тэма 18. Методыка арганізацыі паўтарэння ў навучанні гісторыі**.

1. Віды паўтарэння і асаблівасці арганізацыі кожнага з іх. 2. Метадычныя ўмовы аптымальнай арганізацыі паўтарэння на ўроках гісторыі. 3. Канструяванне методыкі арганізацыі паўтарэння на ўроку гісторыі.

Практычнае заданне. На аснове вывучэння рэкамендаванай літаратуры, дзеючых праграм і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі спланіраваць методыку арганізацыі паўтарэння на канкрэтным уроку гісторыі.

Літаратура

1. Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе. – Мінск: БДПУ, 2009. – Гл.11.
2. Вяземский Е.Е., Стрелова О. Ю. Теория и методика преподавания истории. Учебник для студентов ВУЗов. – М.:ВЛАДОС, 2003.
2. Гора П.В. Пути повышения эффективности обучения истории в средней школе. – М.: Просвещение,1988.
3. Ежова С.А. и др. Методика преподавания истории в средней школе. – М.: 1986.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Лейбенгруб П.С. О повторении на уроках истории СССР в 7-10 классах. – М.:Просвещение, 1987.
5. Волкава Т. Правепка ведаў і навучанне // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – №3. – С. 85-87.
6. Студеникин М.В. Методика преподавания истории в средней школе. – М.: ВЛАДОС, 2000.

**Тэма 19. Выкарыстанне сучасных тэхналогій у навучанні гісторыі.**

1. Сутнасць інавацыйных тэхналогій навучання гісторыі2. Характарыстыка найбольш распаўсюджаных ў навучанні гісторыі сучасных тэхналогій. 3. Інавацыйныя тэхналогіі, як сродак павышэння эфектыўнасці навучання гісторыі.

Практычнае заданне: на аснове вывучэння рэкамендаванай літаратуры і перыядычнага друку па методыцы выкладання гісторыі кожнаму студэнту ахарактарызаваць адну з найбольш выкарыстоўваемых у навучанні гісторыі інавацыйных тэхналогій.

Літаратура

1. Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе. – Мінск: БДПУ, 2009. – Гл.10.
2. Вяземский Е.Е., Стрелова О. Ю. Теория и методика преподавания истории. Учебник для студентов ВУЗов. – М.:ВЛАДОС, 2003.
3. Волкава Т. Праверка ведаў і навучанне // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – №3. – С. 85-87.
4. Егорова О.Л.Модульное обучение истории//Преподавание истории в школе. – 2007. – № 7.
5. Корзюк А.А. Вывучэнне гісторыі Беларусі канца XVIII – пач. XXст. у агульнаадукацыйнай школе: вуч.-метад. дапаможнік. – Мінск: БДПУ, 2010.
6. Короткова М.В., Студеникин М.Т. Методика обучения истории в схамах, таблицах, описаниях. – М.: ВЛАДОС,1999.
7. Казакевіч М.А. Выкарыстанне мультымедыя-прэзентацый на ўроках гісторыі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. – №3.
8. Лазіцкі В. Выкарыстанне электронных сродкаў навучання ў працэсе вывучэння гісторыі Беларусі на трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі //Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. – №3.
9. Матохина Е. Технология развивающего обучения в преподаваниии истории // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2006. – №8.
10. Студеникин М.В.Современные технологии преподавания истории в школе. – М.: ВЛАДОС, 2007.

**Тэма 20. Асноўныя напрамкі прымянення інфармацыйных тэхналогій у вучэбным працэсе.**

1. Сутнасць інфармацыйных тэхналогій навучання гісторыі 2. Характарыстыка найбольш распаўсюджаных ў навучанні гісторыі спосабаз выкарыстання ЭСН. 3. Магчымасці выкарыстання ў навучанні гісторыі

РЭПОЗІТОРЫЙ БДПУ

інфармацыйных тэхналогій. 4. Інфармацыйныя тэхналогія, як сродак павышэння эфектыўнасці навучання гісторыі.

Практычнае заданне: на аснове вывучэння рэкамендаванай літаратуры і перыядычнага друку па методыцы выкладання гісторыі кожнаму студэнту ахарактарызаваць адну з найбольш выкарыстоўваемых у навучанні гісторыі інавацыйных ці інфармацыйных тэхналогій.

Літаратура


1. Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе. – Мінск: БДПУ, 2009. – Гл.10.
2. Вяземский Е.Е., Стрелова О. Ю. Теория и методика преподавания истории. Учебник для студентов ВУЗов. – М.:ВЛАДОС, 2003.
3. Волкава Т. Праверка ведаў і навучанне // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – №3. – С. 85-87.
4. Егорова О.Л.Модульное обучение истории//Преподавание истории в школе. – 2007. – № 7.
5. Корзюк А.А. Вывучэнне гісторыі Беларусі канца XVIII – пач. XXст. у агульнаадукацыйнай школе: вуч.-метад. дапаможнік. – Мінск: БДПУ, 2010.
6. Короткова М.В., Студеникин М.Т. Методика обучения истории в схамах, таблицах, описаниях. – М.: ВЛАДОС,1999.
7. Казакевіч М.А. Выкарыстанне мультымедыя-прэзентацый на ўроках гісторыі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. – №3.
8. Лазіцкі В. Выкарыстанне электронных сродкаў навучання ў працэсе вывучэння гісторыі Беларусі на трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі //Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. – №3.
9. Матохина Е. Технология развивающего обучения в преподаваниии истории // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2006. – №8.
10. Студеникин М.В.Современные технологии преподавания истории в школе. – М.: ВЛАДОС, 2007.


## 3.3.ТЭМАТЫКА КУРСАВЫХ РАБОТ

1. Развіццё методыкі выкладання гісторыі як навукі.

2. Станаўленне і развіцце нацыянальнай сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі.

3-6. Вывучэнне культуры ў курсе: гісторыі цывілізацый старажытнага свету; гісторыі сярэдніх вякоў; гісторыі новага часу; гісторыі навейшага часу;

7-9. Вывучэнне культуры беларускага народа ў курсе айчыннай гісторыі ў 6-7 класах; ў 8-9 класах; 10-11 класах.

10. Методыка вывучэння храналогіі ў выкладанні гісторыі.

11. Методыка работы з картаграфічным матэрыялам.

12. Выкарыстанне гістарычных дакументаў пры вывучэнні гісторыі цывілізацый старажытнага свету.

13. Выкарыстанне гістарычных дакументаў пры вывучэнні гісторыі цывілізацый у сярэднія вякі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

14. Выкарыстанне гістарычных дакументаў пры вывучэнні гісторыі цывілізацый новага часу.

15. Выкарыстанне гістарычных дакументаў пры вывучэнні сусветнай гісторыі навейшага часу.

16. Выкарыстанне гістарычных дакументаў пры вывучэнні гісторыі Беларусі ў 6-7 класах.

17. Выкарыстанне гістарычных дакументаў пры вывучэнні гісторыі Беларусі ў 8-9 класах.

18. Выкарыстанне навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры на ўроках гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў.

19. Выкарыстанне навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры на ўроках сусветнай гісторыі новага і навейшага часу.

20. Выкарыстанне навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры вывучэнні гісторыі Беларусі.

21. Выкарыстанне ілюстрацый падручніка, насценных вучэбных карцін і твораў жывапісу на ўроках гісторыі.

22. Крэйдавыя чарцяжы і малюнкі на ўроках гісторыі.

23. Кабінет гісторыі ў школе.

24. Школьныя лекцыі ў навучанні гісторыі.

25. Семінарскія заняткі па гісторыі.

26. Методыка арганізацыі і правядзення лабараторна-практычных заняткаў па гісторыі.

27. Урок-залік па гісторыі.

28. Методыка арганізацыі і правядзення ўрокаў-дыспутаў і канферэнцый па гісторыі.

29. Вучэбныя экскурсіі і ўрокі ў музеі.

30. Паўтарэнне ў выкладанні гісторыі.

31. Пазакласная работа да гісторыі.

32. Гісторыка-краязнаўчая работа ў школе.

33. Школьныя гістарычныя вечары.

34. Школьныя гісторыка-краязнаўчыя і іншыя музеі.

35-41. Выкарыстанне камп'ютарных прэзентацый ў навучанні гісторыі: старажытнага свету; сярэдніх вякоў; новай гісторыі; найноўшай гісторыі; гісторыі Беларусі ў 6-7 класах; гісторыі Беларусі ў 8-9 класах; гісторыі Беларусі ў10-11класах.

42-48. Гульнявыя тэхналогіі у навучанні гісторыі: старажытнага свету; сярэдніх вякоў; новай гісторыі; найноўшай гісторыі; гісторыі Беларусі ў 6-7 класах; гісторыі Беларусі ў 8-9 класах; гісторыі Беларусі ў10-11класах.

49-55. Арганізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў ў працэсе навучання гісторыі: старажытнага свету; сярэдніх вякоў; новай гісторыі; найноўшай гісторыі; гісторыі Беларусі ў 6-7 класах; гісторыі Беларусі ў 8-9 класах; гісторыі Беларусі ў10-11класах.

56-62. Арганізацыя пазнавальнайц дзейнасці вучняў у працэсе праверкі ведаў на ўроках: гісторыі старажытнага свету; сярэдніх вякоў; новай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гісторыі; найноўшай гісторыі; гісторыі Беларусі ў 6-7 класах; гісторыі Беларусі ў 8-9 класах; гісторыі Беларусі ў10-11класах.

## 3.4.ТЭМАТЫКА ДЫПЛОМНЫХ РАБОТ

1. Станаўленне і развіццё сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.
2. Роля школьнага выкладання гісторыі ў фарміраванні нацыянальнай свядомасці вучняў.
3. Выхаваўчыя магчымасці школьных курсаў гістрорыі і шляхі іх рэалізацыі на ўроках.
4. Маральнае выхаванне школьнікаў у навучанні гісторыі.
5. Эстэтычнае выхаванне ў навучэнні гісторыі.
6. Развіццё мыслення вучняў у працэсе вывучэння гісторыі.
7. Арганіазцыя пазнавальнай дзейнасці пры вывучэнні гісторыі.
8. Выкарыстанне гістарычных дакументаў пры вывучэнні гісторыі.
9. Выкарыстанне археалагічных матэрыялаў пры вывучэнні гісторыі.
10. Выкарыстанне навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры пры вывучэнні гісторыі.
11. Апорны канспект і яго роля ў засваенні гістарычных ведаў вучняў.
12.Тэхнічныя сродкі навучання ў выкладанні гісторыі.
13. Патрабаванні да сучаснага ўрока гісторыі і шляхі павышэння яго эфектыўнасці.
14. Электронныя сродкі ў навучанні гісторыі.
15. Інавацыйныя тэхналогіі навучання гісторыі.
16. Фарміраванне пазнавальнай актыўнасці на ўроках гісторыі.
17. Праверка і ўлік ведаў вучняў на ўроку гісторыі.
18. Гістарычныя гульні ў выкладанні гісторыі і ў пазакласнай рабоце.
19. Выкарыстанне інавацыйных падыходаў у навучанні гісторыі.
20. Інфармацыйныя тэхналогіі ў навучанні гісторыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

# 4.1. Пытанні да экзамена па методыцы выкладання гісторыі (3 курс, 2 семестр)

1. Прадмет і задачы методыкі выкладання гісторыі.
2. Сувязь методыкі выкладання гісторыі з іншымі навукамі. Метады даследавання працэсу навучання гісторыі.
3. Станаўленне і развіццё гістарычнай адукацыі ва ўсходнеславянскіх землях да канца XVIII ст.
4. Гістарычная адукацыя і методыка выкладання гісторыі ў XIX ст.
5. Развіццё гістарычнай адукацыі і методыкі выкладання гісторыі ў пачатку XX ст.
6. Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў СССР ў 20 –я гады XX ст.
7. Аднаўленне у школе гісторыі як самастойнага прадмета і яго выкладання ў 30-х --сярэдзіне 60-х гадоў XX стагоддзя.
8. Развіцце гістарычнай адукацыі і методыкі выкладання гісторыі у СССР у другой палове 80-х –пачатку 90-х гадоў XX ст.
9. Вытокі станаўлення гістарычнай адукацыі ў Беларусі (канец XIX -пач.XX ст.)
10. Вывучэнне ў школе гісторыі Беларусі ў 20-60 гады XX ст.
11. Вывучэнне гісторыі Беларусі ў школе ў 60-80-я гады XX ст.
12. Стварэнне нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі. Развіццё методыкі выкладання гісторыі ў РБ.
13. Задачы навучання гісторыі ў школе.
14. Структура школьнай гістарычнай адукацыі у РБ.
15. Праграмы па гісторыі. Навуковыя асновы і прынцыпы пабудовы. Характарыстыка дзеючых праграм.
16. Характарыстыка зместу, задачы і асаблівасці выкладання гісторыі старажытнага свету.
17. Характарыстыка зместу, задачы і асаблівасці выкладання гісторыі сярэдніх вякоў.
18. Характарыстыка зместу, задачы і асаблівасці выкладання сусветнай гісторыі новага часу.
19. Характарыстыка зместу, задачы і асаблівасці выкладання сусветнай гісторыі навейшага часу.
20. Характарыстыка зместу, задачы і асаблівасці выкладання гісторыі Беларусі.
21. Характарыстыка дзяржаўнага стандарту гістарычнай адукацыі.
22. Характарыстыка канцэпцыі прадмета “Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі.”
23. Структура гістарычных ведаў школьнікаў і характарыстыка яе асноўных элементаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

24. Месца і роля гістарычных  уяўленняў у фарміраванні гістарычных ведаў. Методыка іх фарміравання.
25. Методыка фарміравання уяўленняў аб гістарычным часе. Методыка работы з храналогіяй
26. Лакалізацыя гістарычных фактаў у прасторы. Методыка работы з картай.
27. Роля паняццяў у фарміраванні гістарычных ведаў і іх класіфікацыя.
28. Асноўныя шляхі фарміравання гістарычных паняццяў.
29. Метадычныя умовы павышэння эфектыўнасці фарміравання гістарычных паняццяў.
30. Раскрыццё гістарычных заканамернасцяў пры вывучэнні гісторыі.
31. Агульная характарыстыка асноўных сродкаў навучання гісторыі.
32. Паняцце аб метадах навучання. Класіфікацыя метадаў навучання гісторыі.
33. Месца і функцыі вуснага слова ў навучанні гісторыі.
34. Характарыстыка асноўных прыёмаў вуснага ізлажэння.
35. Месца і роля  друкаваных крыніц у навучанні гісторыі. Методыка работы з падручнікам.
36. Методыка работы з гістарычным дакументам у навучанні гісторыі.
37. Методыка выкарыстання  навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры ў навучанні гісторыі.
38. Міжпрадметныя і ўнутрыкурсавыя сувязі ў навучанні гісторыі.
39. Роля нагляднасці ў навучанні гісторыі. Віды наглядных дапаможнікаў.
40. Выкарыстанне прадметнай і выяўленчай нагляднасці у выкладанні гісторыі. Методыка работы з ёй.
41. Умоўна-графічная нагляднасць у выкладанні гісторыі. Методыка работы з ёй.
42. Методыка выкарыстання ТСН у навучанні гісторыі. Кабінет гісторыі ў школе.
43. Паняцце развіваючага навучання, яго асноўныя рысы. Класіфікацыя ўменняў.
44. Уменні і навыкі ў навучанні гісторыі, методыка фарміравання уменняў.
45. Выхаваўчыя магчымасці школьных курсаў гісторыі і шляхі іх рэалізацыі ў навучанні.
46. Метадычныя ўмовы павышэння эфектыўнасці выхавання вучняў ў навучанні гісторыі.
47. Паняцце і структура педагагічных тэхналогій.
48. Выкарыстанне інавацыйных тэхналогій у навучанні гісторыі.
49. Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у навучанні гісторыі.
50. Урок гісторыі. Тыпы урокаў.
51. Спецыфічныя і нетрадыцыйныя формы арганізацыі вучэбнага працэсу па гісторыі.
52. Структура ўрока. Сучасныя патрабаванні да урока гісторыі.
53. Асноўныя этапы падрыхтоўкі настаўніка да выкладання гісторыі. Планаванне вучэбнага працэсу па гісторыі.
54. Мадэліраванне вынікаў навучання і тэхналогія канструіравання урока гісторыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

55. Прызначэнне праверкі ведаў вучняў і методыка яе арганізацыі у навучанні гісторыі.
56. Прызначенне паўтарэння у выкладанні гісторыі. Методыка яго арганізацыі.
57. Функцыі ацэнкі ведаў школьнікаў. Крытэрыі выстаўлення ацэнкі.
58. Пазакласная работа по гісторыі. Яе задачы, змест і прынцыпы арганізацыі.
59. Характарыстыка асноўных форм пазакласнай работы (2-3 формы па выбару).
60. Настаўнік гісторыі. Структура яго дзейнасці.

## 4.2.ТЭСТЫ ПА МЕТОДЫЦЫ ВЫКЛАДАННЯ ГІСТОРЫІ

### (у адпаведнасці з вуч.дапаможнікам)

### Тэма 1. Прадмет і задачы методыкі выкладання гісторыі.

1. Методыка выкладання гісторыі гэта навука:
   1. гістарычная
   2. метадычная
   3. педагагічная
   4. сацыялагічная

2. Прадметам даследавання методыкі выкладання гісторыі з'яўляецца:
1. працэс выхавання школьнікаў
2. працэс выкладання гісторыі
3. працэс навучання гісторыі
4. гістарычны працэс

3. Асноўнымі метадамі навуковага даследавання ў методыцы выкладання гісторыі з'яўляюцца:
1. аналіз практыкі выкладання гісторыі
2. абагульненне вопыту выкладання гісторыі
3. анкеціраванне і фарміруючы эксперымент
4. назіранне і эксперымент

*4.* Самыя непасрэдныя сувязі методыка выкладання гісторыі мае:
1. з гісторыей і геаграфіей
2. з гісторыяй і метадалогіяй гісторыі
3. з педагогікай і псіхалогіяй
4. з дыдактыкай і гісторыяй

5. Вызначце правільную паслядоўнасць:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. мэты навучання

2. вынікі навучання

3. выкладчыцкая дзейнасць настаўніка

4 змест навучання

5. вучэбная дзейнасць вучняў

6. Вызначце правільную паслядоўнасць:

1. мэты навучання гісторыі ў школе

2. мэты ўрока

3. мэты вывучэння раздзела

4. мэты вывучэння тэмы

7. Змест гістарычнай адукацыі вызначаецца:

1. вучэбным планам школы
2. адукацыйным стандартам па гісторыі
3. дзяржаўнымі праграмамі па гісторыі.
4. дзяржаўным адукацыйным стандартам і школьнымі праграмамі па гісторыі

8. Працэс навучання гэта:

1. дзейнасць настаўніка
2. дзейнасць вучняў
3. адначасовая дзейнасць настаўніка і вучня
4. працэс работы з падручнікам

9. Выкладчыцкая дзейнасць настаўніка гісторыі ўключае ў сябе:

1. перадачу школьнікам ведаў па гісторыі
2. арганізацыю вучэбнай дзейнасці вучняў
3. арганізацыю работы з падручнікам
4. арганізацыю працэса навучання гісторыі ў школе

10. Методыка выкладання гісторыі даследуе:

1. вынікі навучання гісторыі
2. змест школьнай гістарычнай адукацыі
3. вучэбную дзейнасць школьнікаў
4. выкладчыцкую дзейнасць настаўніка
5. заканамернасці працэсу навучання гісторыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Тэма 2. Развіцце школьнай гістарычнай адукацыі і методыкі выкладання гісторыі ў дасавецкі час.**

1. Узнаўленне гісторыі ўсходніх славян пачалося з:
   1. Іпацьеўскага летапісу.
   2. Смаленскага летапісу.
   3. "Слова аб палку Ігаравым".
   4. Аповесці мінулых гадоў.

2. Рукапісныя кнігі XV-XVI ст.ст.павучальнага характару, якія змяшчалі звесткі па грамадзянскай гісторыі, называліся:

1. Сінопсісы.
2. Азбукоўнікі.
3. Летапісы.
4. Хронікі.
5. Сагі.

3. Першым вучэбным дапаможнікам па гісторыі ўсходніх славян ў XVII ст. стаў:

1. "Апостал"
2. "Малая падарожная кніжыца"
3. Сінопсіс
4. Хроніка Быхаўца

4. Вывучэнне грамадзянскай гісторыі ў школах Расіі пачалося ў:

1. канцы 17 ст.
2. пачатку 18 ст.
3. сярэдзіне 18 ст.
4. канцы 18 ст.

5. Айчынная гісторыя як самастойны школьны прадмет уводзіцца ўказам:

1. Пятра I
2. Елізаветы
3. Паўла I
4. Кацярыны II

6. Расійская гісторыя, як самастойны школьны прадмет, пачала вывучацца ў:

1. пачатак 18 ст.
2. сярэдзіне 18 ст.
3. канцы 18 ст.
4. пачатку 19 ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вядучым напрамкам у развіцці гісторыка-метадычнай думкі ў канцы XVIII-пачатку XIX ст. стаў:

1. ліберальна-буржуазны
2. рэвалюцыйна-дэмакратычны
3. манархічны
4. рэлігійна-манархічны або прагматычны

Суаднясіце элементы двух мностваў:

| | |
|---|---|
| 1) Круляніцкі | а)"Очерки по методике истории", Спб., 1908 |
| 2) Пакацiла | б)"Заметки о преподавании истории в школе", Спб., 1900 |
| 3)Іваноў К.А. | в)"Практическое руководство по преподаванию истории в школе", Спб., 1887 |
| 4)Карэеў М.І. | г)"Практическое руководство начинающему учителю истории", Спб., 1912 |

У пачатку XX стагоддзя методыка выкладання гісторыі:

1. толькі зарадзілася;
2. з'яўляецца самастойнай навукай;
3. афармляецца, як галіна педагагічнай навукі;
4. яшчэ не існуе.

10. Суаднясіце імя вучонага і напрамак у развіцці гісторыка-метадычнай думкі:

| | |
|---|---|
| 1) Пакроўскі М.М. | а) рэвалюцыйна-дэмакратычны |
| 2) Карэеў М.І. | б) рэлігійна -манархічны |
| 3) Каранеўскі М.І. | в) ліберальна-буржуазны |
| 4) Бялінскі В.Р. | г) радыкальны (марксісцкі) |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Тэма 3. Развіцце школьнай гістарычнай адукацыі і методыкі выкладання гісторыі ў савецкі час.

1. У 20-я гады ХХ стагоддзя гісторыя ў школе:
1. не выкладалася наогул
2. з'яўлялася самастойным школьным прадметам
3. не з'яўлялася самастойным школьным прадметам
4. вывучалася ў межах комплексных праграм і ў курсе грамадазнаўства

2. Аўтарам першых савецкіх школьных праграм па гісторыі быў:
1. У.І. Ленін
2. І.В. Сталін
3. М.І. Карэеў
4. М.Н. Пакроўскі

3. Асноўнымі метадамі арганізацыі вывучэння гісторыі ў 20-я гады былі:
1. тлумачальна-ілюстратыўны
2. драматызацыі
3. брыгадна-лабараторны
4. рэпрадуктыўны

4. Гісторыя як самастойны школьны прадмет была адноўлена ў савецкай школе ў:
1. 20-я гады
2. 1931 год
3. 1934 год
4. 1941 год

5. У адпаведнасці з Пастановай ЦК УКП (б) і СНК СССР ад 15 мая 1934 года ў аснову структуры школьнага навучання гісторыі быў пакладзены прынцып:
1. канцэнтрычны
2. лінейны
3. праблемны
4. сінхранічны

6. У адпаведнасці з Пастановай ЦК УКП (б) і СНК СССР ад 15 мая 1934 года асноўнай мэтай гістарычнай адукацыі з'яўляецца фарміраванне:
1. гуманістычнага светапогляду
2. марксісцка-ленінскага светапогляду
3. патрыятызму і інтэрнацыялізму
4. адданасці справе Камуністычнай партыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

7. Стварэнне першых савецкіх падручнікаў па гісторыі завяршылася ў:
1. пачатку 30-х гадоў XX стагоддзя
2. канцы 30-х гадоў XX стагоддзя
3. пачатку 40-х гадоў XX стагоддзя
4. пачатку 50-х гадоў XX стагоддзя

8. Да пачатку 60-х гадоў XX стагоддзя час навучэння гісторыі ў школе павялічыўся да:
1. 18 гадзін у тыдзень
2. 20 гадзін у тыдзень
3. 25 гадзін у тыдзень
4. 27 гадзін у тыдзень

9. Устанавіце правільную паслядоўнасць вывучэння гісторыі ў школе ў 30-я гады:
1. гісторыя сярэдніх вякоў
2. гісторыя старажытнага свету
3. новая гісторыя
4. гісторыя СССР са старажытных часоў да пачатку 40-х гадоў
5. элементарны курс гісторыі СССР

10. Дзяленне школьных курсаў гісторыі на элементарныя і сістэматычныя было ўведзена пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР:
1. 1931г.
2. 1934г.
3. 1959г.
4. 1965г.

11. Вывучэнне найноўшай гісторыі ў школах СССР пачалося ў:
1. 1956 г.
2. 1958 г.
3. 1959 г.
4. 1965 г.

12. Развіваючае навучанне ў выкладанні гісторыі пачало ўкарыняцца з:
1. сяр. 50-х гадоў XX стагоддзя
2. пач. 60-х гадоў XX стагоддзя
3. сяр. 60- х гадоў XX стагоддзя
4. сяр. 70-х гадоў XX стагоддзя

13. Суаднясіце прозвішча педагога- гісторыка і яго працы:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | |
|---|---|
| 1) А.І. Стражаў | а) «Очерки методики преподавания истории.» М., 1955 |
| 2) П.В. Гара | б) “Методические приемы и средства наглядного обучения истории.” М., 1971 |
| 3) А.А. Вагін | в) “Методика преподавания истории в средней школе.” М.,1968 |
| 4) В.Р.Карцоў | г) “Методика преподавания истории” М. 1964 |

14. У школьных праграмах па гісторыі пералік уменняў і навыкаў быў уключаны:

1. у 50-х гадах ХХ стагоддзя

2. у 60-х гадах ХХ стагоддзя

3. у сяр. 70-х гадоў ХХ стагоддзя

4. у пач. 80-х гадоў ХХ стагоддзя

15. Асноўныя паняцці, ідэі і міжпрадметныя сувязі былі ўключаны ў змест школьных праграм па гісторыі:

1. у пачатку 70-х гадоў ХХ стагоддзя
2. у пачатку 80-х гадоў ХХ стагоддзя
3. у сярэдзіне 80-х гадоў ХХ стагоддзя
4. у 60-я гады ХХ стагоддзя

**Тэма 4. Станаўленне і развіццё гістарычнай адукацыі ў Беларусі.**

1. Час зараджэння нацыянальнай гістарычнай адукацыі ў Беларусі можна аднесці да:

   1. сяр.19ст.
   2. другой паловы 19ст.
   3. пачатку 20ст.
   4. сяр.20ст.

2. Аўтарамі першых вучэбных дапаможнікаў па Гісторыі Беларусі былі:
   1. М..Доўнар-Запольскі і В. Іваноўскі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Л. Абэцэдарскі і П. Петрыкаў
3. А. Лютый і В.Фамін
4. В. Ластоўскі і У. Ігнатоўскі.

3. Вывучэнне Гісторыі БССР у школах Беларусі пачалося ў:
1. 20-я гады
2. пачатку 40-х гадоў
3. канцы 50-х гадоў
4. пачатку 90-хгадоў.

4. Аўтарамі першага падручніка па гісторыі БССР сталі:
1. П.Петрыкаў, Э. Загарульскі, М. Біч
2. Л. Абэцэдарскі, М. Баранава і Н.Г. Паўлава
3. М. Гнеўка, Н. Каменская, Э.Загарульскі
4. Э. Загарульскі, М. Біч, В.Фамін.

5. Канцэпцыя гістарычнай адукацыі ў Беларусі пачала ажыццяўляцца з:
1. канца 80-х гадоў
2. 1991г.
3.1993г.
4.1992г.

6. Навукова-метадвчны часопіс ”Гісторыя:праблемы выкладання” пачаў выходзіць з:
1. 1992г.
2. 1993г.
3. 1997г
4. 2002г.

7. “Беларускі гістарычны часопіс” пачаў выдавацца з:
1. 1991г.
2. 1993г.
3. 1994г.
4. 1997г.

8. Дзеючыя Канцэпцыя і Дзяржаўны стандарт гістарычнай адукацыі былі зацверджаны ў:
1.2007г.
2. 2008г.
3. 2009г.
4. 2011г.

9. У аснове дзеючай структуры гістарычная адукацыі ў РБ ляжыць прынцып:
1. праблемна-тэматычны
2. сінхранічны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. канцэнтрычны
4. лінейны.

10. Гістарычная адукацыя ў РБ ажыццяўляецца пры вывучэнні прадмета:
1. Гісторыя
2. Айчынная гісторыя
3. Сусветная гісторыя.
4. Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі.

**Тэма 5. Задачы, структура і змест гістарычнай адукацыі.**

1. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:

| | |
|---|---|
| 1) Дзяржаўны стандарт гістарычнай адукацыі | а) вызначае змест гістарычнай адукацыі |
| 2) Канцэпцыя гістарычнай адукацыі | б) вызначае мэты, задачы, асноўныя прынцыпы адбору зместу і структуры вывучэння прадмета |
| 3) Вучэбная праграма па гісторыі | в) дакумент, які вызначае патрабаванні да зместу гістарычнай адукацыі, ведаў і уменняў школьнікаў |

2.Усталюйце правільную паслядоўнасць:
1) мэты і задачы вывучэння пэўнага курса гісторыі
2) агульныя мэты навучання гісторыі ў дзяржаве
3) мэты і задачы канкрэтнага урока гісторыі
4) мэты і задачы вывучэння раздзела і тэмы

3. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:

| | |
|---|---|
| 1) 5 клас | а) Гісторыя старажытнага свету |
| 2) 6-7 класы | б) Сусветная гісторыя Новага часу. Гісторыя Беларусі сяр. 16-канец 1917г. |
| 3) 8-9 класы | в) Гісторыя сярэдніх вякоў. Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сяр 16 ст. |
| 4)10-11класы | г) Сусветная гісторыя Найноўшага часу |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Асаблівасцю навучання гісторыі ў 5-6 класах ў:
   1) перавазе эмпірычнага (наглядна-вобразнага) вывучэння фактаў
   2) абстрактнага вывучэння фактаў
   3) тэарэтычнага вывучэння гістарычных фактаў.

5.У 9-11класах пераважае:
   1) фармальна-лагічнае вывучэнне гісторыі
   2) эмпірычнае вывучэнне гістарычнай рэчаіснасці
   3) наглядна-вобразнае навучанне
   4) тэарэтычнае навучанне.

**Тэма 6. Выхаванне вучняў у працэсе навучання гісторыі.**

1. Гісторыя адносіцца да ліку прадметаў, якія:
   1) спрыяюць рэалізацыі выхавўчых задач навучання
   2) не істотна уплываюць на рэалізацыю выхаваўчых задач
   3) змяшчаюць найбольшы шырокія магчымасці для выхавання асобы школьніка.

2. Вызначце лішняе ў метадах выхавання:
   1) пераканання
   2) пакарання
   3) стымулявання
   4 )самавыхавання
   5) практыкавання.

3. Правільна суаднясіце:

| | |
|---|---|
| 1) А.М. Горкі | а)” …вопыт гісторыі – дапамагае выпрацаваць маральную ацэнку акружаючай нас рэчаіснасці і пэўным чынам вызначыць свае паводзіны… Вопыт гісторыі – дакладны арыенцір, якім часам карыстаюцца людзі нават не усвядамляючы гэтага.” |
| 2) А.В.Гулыга | б) “Вучаць, выхоўваюць чалавека факты – заўседы факты, ідэі спадарожнічаюць, а не папярэднічаюць фактам.” |
| 3) А.В. Луначарскі | в) Гісторыя – настаўніца жыцця |
| 4) Цыцырон | г) “Чалавечае слова магутнае, але слова жывое, слова, якое гучыць. Яно значна |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мацнейшае, чым слова друкаванае…яно
сагрэтае пачуццямі, яно заўседы больш
пераканаўчае.”

4. У малодшых і ў 5-6 класах для рэалізацыі выхаваўчых задач неабходна выкарыстоўваць пераважна прыемы ўздзеення:
1) на пачуцці і эмацыянальную сферу
2) на мысленне і волю
3) свядомасць і перакананні.

5. Найважнейшай умовай вырашэння выхаваўчых задач у навучанні гісторыі з'яўляецца:
1) нагляднасць і вобразнасць выкладання
2) стварэнне станоўчай матывацыі ў навучанні гісторыі
3) стварэнне праблемных сітуацый на ўроку

**Тэма 7. Працэс фарміравання гістарычных ведаў.**

**1. Суаднясіце элементы двух мностваў.**

| | |
|---|---|
| 1) Падзеі | а)ланцужкі фактаў, якія ўзаемазвязаны паміж сабой у часе, а таксама прычынамі і вынікамі |
| 2) З'явы | б) адзінкавыя факты, якія не паўтараюцца |
| 3) Працэсы | в)падобныя факты, якія шматкратна паўтараюцца ў падобных абставінах |

2. У аснове навучання гісторыі ляжыць:
1. тэарэтычнае асэнсаванне найважнейшых сацыяльных з'яў і працэсаў
2. пазнанне, засваенне і ўсведамленне сутнасці гістарычнага фактаў
3. стварэнне выразных уяўленняў аб гістарычных фактах
4. фарміраванне у вучняў пазнавальнага інтарэсу да навучання гісторыі

3. Пазнанне гісторыі пачынаецца:
1. з фарміравання гістарычных заканамернасцей
2. з засваення спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці
3. з фарміравання гістарычных паняццяў
4. са стварэння ў вучняў гістарычных уяўленняў.

4. Найбольш эканомным спосабам стварэння ў вучняў гістарычных уяўленняў з'яўляецца:
1. вуснае слова настаўніка
2. гутарка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. апісанне
4. выкарыстанне розных відаў нагляднасці.

5. Пры адсутнасці нагляднасці найбольш эфектыўным спосабам фарміравання гістарычных уяўленняў з’яўляюцца прыёмы:
1. славеснага малявання
2. тлумачэння сутнасці гістарычных фактаў
3. разважання
4. характарыстыкі гістарычных падзей.

6. Гістарычныя карты выконваюць ролю:
1. найважнейшага сродку лакалізацыі гістарычных падзей у прасторы
2. стварэння вобразаў гістарычных асоб
3. сродку лакалізацыі гістарычных падзей у часе
4. патрыятычнага выхавання асобы.

7. Суаднясіце элементы двух множстваў:

| | |
|---|---|
| 1) 1492 г – дата адкрыццё Амерыкі | а) дата падзеі, якая выконвае дапаможную ролю |
| 2) 1904 – 1905 гг . – руска-японская вайна | б) дата, якая складае аснову зместу вывучаемага курса гісторыі |
| 3) 4 гадзіны ночы 26 кастрычніка 1917г.– абвяшчэнне Дэкрата аб міры на II Усерасійскім з’езде Саветаў | в) дата, якая мела лесавызначальнае значэнне ў гісторыі чалавецтва |

8. Суаднясіце элементы двух множстваў:

| | |
|---|---|
| 1) Расійская імперыя ў канцы 18 – перш.палове 19 ст. | а) тэматычная карта |
| 2) Палітычная карта свету пасля першай сусветнай вайны. | б) агульнагістарычная карта |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | |
|---|---|
| 3) Вялікая Айчынная вайна 1941-1945гг. | в) аглядная карта |
| 4) Курская бітва | г) карта-схема |

9. Гістарычныя паняцці гэта адлюстраванне ў свядомасці:
    1. вобразаў гістарычных фактаў
    2. гістарычнага часу
    3. гістарычнай геаграфіі
    4. сутнасці гістарычных падзей

10. Суаднясіце элементы двух мностваў:

| | |
|---|---|
| 1) Шадуф, фаланга, мушкет | а) агульнагістарычныя паняцці |
| 2) Прамысловая рэвалюцыя, Адраджэнне, Рэфармацыя | б) адзінкавыя, або прыватныя гістарычныя паняцці |
| 3) вытворчасць працы, дзяржава, вайна | в)Усеагульныя (сацыялагічныя) паняцці |

11. Вызначце лагічныя шляхі фарміравання гістарычных паняццяў:
    1. аналіз і сінтэз
    2. індукцыя і дэдукцыя
    3. абагульненне і разважанне
    4. аналіз і параўнанне.

12. У аснове фарміравання гістарычных заканамернасцей ляжыць:
    1. паўтарэнне і абагульненне
    2. усведамленне аб’ектыўных, істотных, унутраных, паўторных сувязей
    3. пастаяннае аперыраванне гістарычнымі паняццямі
    4. аптымальныя суадносіны на ўроку эмацыянальнага і рацыянальнага.

13. Галоўнае прызначэнне міжпрадметных сувязей у:
    1. інтэграцыі навуковых ведаў і ўменняў школьнікаў
    2. замацаванні ведаў і уменняў школьнікаў
    3. засваенні сутнасці гістарычных фактаў
    4. фарміраванні спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

14. Міжпрадметныя сувязі могуць быць:
1. супадаючымі, рэтраспектыўнымі і перспектыўнымі
2. часавымі, лакальнымі і перспектыўнымі
3. супадаючымі, лакальнымі і рэтраспектыўнымі
4. рэтраспектыўнымі і паралельнымі

15. Дзейнасны кампанент гістарычнай адукацыі прадстаўлены ў дзеючых праграмах па гісторыі:
1. уменнямі і навыкамі
2. пералікам інтэлектуальных уменняў
3. пералікам прыёмаў вучэбнай работы
4. пералікам спосабаў дзейнасці з гістарычным матэрыялам

**Тэма 8. Метады навучання гісторыі.**

1. Усе сродкі навучання дзеляцца на:
1. аўдыа-візуальныя і гукавыя
2. слоўныя, практычныя і аўдыавізуальныя
3. наглядна-вобразныя і слоўныя
4. наглядныя, слоўныя і практычныя.

2. Цэнтральнае месца ў навучанні гісторыі займаюць сродкі навучання:
1. што з'яўляюцца першакрыніцамі гістарычных ведаў
2. што ўзнаўляюць гістарычныя веды ў навукова апрацаваным выглядзе
3. што рэканструююць гістарычную рэчаіснасць ў мастацкай форме.

3. Найбольш распаўсюджанай у дыдактыцы і методыцы з'яўляецца класіфікацыя метадаў навучання, прапанаваная:
1. Я.А. Каменскім
2. І. Я. Лернерам і М.Н. Скаткіным
3. Н.Г. Дайры і П.С. Лейбенгрубам
4. С.А. Ежовай і М.С. Студзянікіным.

4. У аснове прапанаванага П.В. Гарой спалучэння дыдактычнага і метадычнага падыходаў да класіфікацыі метадаў ляжыць:
1. структурны аналіз гістарычнага матэрыялу
2. функцыянальны аналіз гістарычнага матэрыялу
3. структурна – функцыянальны аналіз гістарычнага матэрыялу
4. колькасны і якасны аналіз фактаў.

5. Вуснае слова ў навучанні гісторыі выконвае функцыі:
1. інфармацыйную, развіццевую і выхаваўчую
2. развіццёвую і выхаваўчую
3. арганізацыйную, апавядальна-апісальную і выхаваўчую
4. вобразную, развіццевую, выхаваўчую і арганізацыйную

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6. Аптымальны тэмп вуснага апавядання ў 5-6 класах складае (слоў у хвіліну):

1. не больш за 60
2. 70-80
3. 80-85

7. Да прыемаў апісання адносяцца:

1. аналітычнае і карціннае апісанні, характарыстыка
2. апавяданне і лекцыя
3. тлумачэнне і характарыстыка
4. разважанне і гутарка.

8. Найбольш грунтоўна прыёмы вуснага выкладання гісторыі даследаваў:

1. П.В. Гара
2. А.А. Вагін
3. А.І. Стражаў
4. В.Р. Карцоў.

9. Прыёмы вуснага выкладання, якія носяць сінтэтычны характар гэта:

1. расказ, кароткае паведамленне, лекцыя
2. лекцыя і расказ настаўніка
3. разважанне і характарыстыка
4. тлумачэнне і разважанне.

10. Да недахопаў вуснага слова адносяцца:

1. вобразнасць вуснага выкладання
2. незваротнасць, прымусовы тэмп і недастатковая расчлененасць
3. эмацыянальнасць выкладавння
4. культура мовы.

11. Найважнейшай сярод друкаваных крыніц ведаў па гісторыі для вучняў з'яўляецца:

1. гістарычны дакумент
2. перыядычны друк
3. падручнік
4. навукова-папулярная літаратура.

12. Падручнік па гісторыі гэта:

1. навуковая манаграфія
2. навукова-папулярная кніга па гісторыі
3. твор мастацкай літаратуры
4. кніга для чытання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

13. Перавага схематычнага крэйдавага малюнка перад іншымі відамі нагляднасці ў:

1. багацці колераў
2. дынамічнасці
3. выразнасці
4. вобразнасці.

14. Выяўленчая нагляднасць найбольш спрыяе фарміраванню:

1. гістарычных паняццяў
2. гістарычных заканамернасцей
3. гістарычных уяўленняў
4. гістарычных тэрмінаў.

15. Асноўнае прызначэнне кабінета гісторыі ў стварэнні:

1. спрыяльных умоў для выхавання школьнікаў
2. аптымальных умоў для арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу па гісторыі
3. умоў для работы гістарычнага гуртка
4. станоўчай матывацыі вучняў да навучання гісторыі.

**Тэма 9. Формы арганізацыі навучання гісторыі.**

1. Урок гэта:

1. асноўная форма арганізацыі навучання ў школе
2. адзіная форма арганізацыі навучання гісторыі
3. адна з вялікага мноства іншых форм навучання.

2. Класна-урочная сістэма арганізацыі навучання распрацавана:

1. К. Дз. Ушынскім
2. І.Я. Лернерам і М.Н. Скаткіным
3. Я.А. Каменскім
4. Л.С. Выгодскім.

3. Шырокае распаўсюджанне ў свеце класна-урочнай сістэмы тлумачыцца яе:

1. універсальнасцю
2. адноснай таннасцю і магчымасцю весці масавае навучанне дзяцей
3. таннасцю і прастатой
4. гібкасцю і рухомасцю.

4. Урок ўяўляе сабой:

1. складовую частку вучэбнага працэса
2. самастойную і завершаную частку вучэбнага працэсу
3. невялікую, арганічна завершаную частку вучэбнага працэсу, якая вырашае канкрэтную адукацыйна-выхаваўчую задачу
4. форму арганізацыі пазакласнай работы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. Найбольш распаўсюджаным і ўніверсальным тыпам ўрока з’яўляецца:
    1. урок вывучэння новага матэрыялу
    2. урок паўтарэння і абагульнення
    3. камбініраваны ўрок
    4. урок праверкі і ўліку ведаў.

6. Найбольш прадуктыўнай з’яўляецца тыпалогія ўрокаў:
    1. па спосабу правядзення
    2. па вядучаму метаду
    3. па асноўнай, дамінуючай на ўроку дыдактычнай мэце
    4. па дамінуючаму віду дзейнасці.

7. “Ліпецкі метад” арганізацыі ўрока быў заснаваны на:
    1. аптымальным спалучэнні ўсіх структурных элементаў урока
    2. дамінаванні на ўроку праверкі ведаў
    3. выстаўленні паўрочнага бала і адмове ад праверкі ведаў як самастойным этапе ўрока
    4. адмове ад праверкі і першаснага паўтарэння на ўроку.

8. Найбольш прадуктыўным часам для засваення ведаў на ўроку з’яўляюцца:
    1. 26 – 34 хв.
    2. 4 – 26 хв.
    3. 15 – 36 хв.
    4. 26 – 42 хв.

9. Усталюйце правільную паслядоўнасць этапаў падрыхтоўкі настаўніка да ўрока гісторыі:
    1. канструяванне мадэлі ўрока, або складанне яго плана-канспекта
    2. структурна-функцыянальны аналіз зместу
    3. складанне календарна-тэматычнага плана
    4. мадэліраванне адукацыйна-выхаваўчых і развіваючых задач урока.

10. Мэта і задачы ўрока гэта:
    1. мяркуемыя вынікі навучання, выхавання і развіцця асобы
    2. пералік фактаў і паняццяў, якія неабходна засвоіць на ўроку
    3. уменні, якія могуць быць сфарміраваныя на матэрыяле ўрока
    4. ідэі і факты, якія неабходна засвоіць на ўроку.

**Тэма 10. Выкарыстанне сучасных тэхналогій навучання гісторыі.**

1. Упершыню тэрмін “тэхналогія” у адносінах да ннавучання быў выкарыстаны ў:
    1. Англіі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Расіі
3. ЗША
4. Францыі

2. Паняцце “тэхналогія навучання” пачало выкарыстоўвацца ў педагагічных даследаваннях XX ст. у:
1. 20-я гады
2. 30-я гады
3. 50-я гады
4. 70-я гады.

3. Пераможнае “шэсце” педагагічных тэхналогій у 90-я гады XX ст. абумоўлена іх:
1. даступнасцю і прастатой выкарыстання
2. гарантыяй высокіх вынікаў навучання
3. паляпшэннем матэрыяльнага забеспячэння школы
4. новымі падыходамі ў арганізацыі вучэбнага працэсу.

4. Шырокае выкарыстанне электронных сродкаў навучання гісторыі абумоўлена:
1. кам’ютэрызацыяй беларускага грамадства
2. наяўнасцю шматлікіх ЭСН гісторыі
3. шырокім выбарам інфармацыйных тэхналогій
4. добрым веданне камп’ютэрнай тэхнікі большасцю настаўнікаў.

5. Праграміраванае навучанне адносіцца да ліку найменш выкарыстоўваемых ў навучанні гісторыі тэхналогій з-за:
1. адсутнасці праграміраваных падручнікаў па гісторыі
2. немагчымасці запраграміраваць нефармалізаваныя гістарычныя веды
3. адсутнасці жадання іх выкарыстоўвацб у настаўнікаў
4. складанасці выкарыстання гэтай тэхналогіі.

**Тэма 11. Паўтарэнне і праверка ведаў па гісторыі**

1. Асноўная задача паўтарэння:
1. сістэматызаваць веды
2. абагульніць вывучанае
3. асэнсаваць і прымяніць веды
4. папярэдзіць забыванне.

2. Першаснае паўтарэнне ці замацаванне праводзіцца:
1. перад вывучэннем вялікай тэмы ці раздзела
2. напярэдадні экзамена
3. адразу пасля вывучэння або ў працэсе вывучэння новага на ўроку
4. пасля вывучэння тэмы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Уступнае паўтарэнне праводзіцца:
   1. перад вывучэннем вялікай тэмы ці раздзела
   2. напярэдадні экзамена
   3. адразу пасля вывучэння або ў працэсе вывучэння новага на ўроку
   4. пасля вывучэння тэмы.

4. Падагульняючае паўтарэнне праводзіцца:
   1. перад вывучэннем вялікай тэмы ці раздзела
   2. напярэдадні экзамена
   3. пасля вывучэння тэмы ці раздзела курса
   4. адразу пасля вывучэння або ў працэсе вывучэння новага на ўроку.

5. Бягучае паўтарэнне ажыццяўляецца:
   1. перад вывучэннем вялікай тэмы ці раздзела
   2. напярэдадні экзамена
   3. на любым этапе ўрока, па сувязі з раней вывучаным
   4. пасля вывучэння тэмы.

6. Суаднясіце працягласць выканання дамашняга задання па гісторыі з ўзростам вучняў:

| | |
|---|---|
| 1) 5-6 класы | а) 20 хвілін |
| 2) 7-8 класы | б) 30 хвілін |
| 3) 9-11 класы | в) 25 хвілін |

7. Асноўныя патрабаванні да гістарычных ведаў школьнікаў:
   1. асэнсаванасць, трываласць і аператыўнасць
   2. паўната і трываласць
   3. глыбіня і аператыўнасць
   4. аператыўнасць і трываласць.

8. У навучанні гісторыі выкарыстоўваюцца наступныя віды праверкі ведаў:
   1. вусная і пісьмовая
   2. пісьмовая і графічная
   3. вусная, пісьмовая і графічная
   4. вусная і графічная

9. Вядучым відам праверкі вынікаў навучання гісторыі з'яўляецца:
   1. вусная
   2. пісьмовая
   3. графічная.

10. Укараненне ў праверку ведаў тэсціравання звязана прыярытэтам ў ёй:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. кантрольных функцый
2. навучальнай і уліковай функцый
3. развіваючых функцый
4. дыягностыцы і аналізу вучэбных дасягненняў вучняў.

11. Тэст – гэта:
1. кароткае пытанне
2. кароткае, стандартызаванае па форме прад’яўлення і тэхналогіі праверкі і ацэнкі, заданне
3. стандартызаванае па тэхналогіі праверкі ацэнкі заданне
4. кароткае стандартызаванае заданне

12. Ва ўстановах адукацыі нашай краіны выкарыстоўваецц:
1.бягучая і выніковая атэстацыя
2 бягучая і прамежкавая атэстацыя
3. бягучая, прамежкавая і выніковая атэстацыя
4. прамежкавая і выніковая атэстацыя.

13. Для ацэнкі вынікаў навучання ў нашай краіне вызначана:
1. чатыры ўзроўні засваення ведаў
2.два узроўні засваення ведаў
3 пяць узрооўняў засваення ведаў
4. тры ўзроўні засваення ведаў.

14. Дзеючыя крытэрыі ацэнкі ведаў па гісторыі былі зацверджаны ў:
1. 2002г.
2. 2009г.
3. 2008г.
4. 2003г.

15. Гадавая ацэнка выстаўляецца як:
1. сума адзнак за год
2. сярэдняя арыфметычная адзнак за чвэрць
2. сярэдняя арыфметычная ўсіх адзнак за год
4. сярэднеарыфметычная адзнак за чвэрць з улікам дынамікі дасягненняў вучня на канец года.

**Тэма 12. Пазакласная праца па гісторыі. Настаўнік гісторыі.**

1. Пазакласная праца па гісторыі вырашае:
1. спецыфічныя задачы ў навучанні гісторыі
2. тыя ж задачы, што і ў на ўроках гісторыі, але на іншым змесце і ў іншых формах
3. якія задачы, карэнным чынам адрозніваюцца ад задач навучання гісторыі.

2. Прынцыпамі арганізацыі пазакласнай работы з’яўляюцца:
1. дабраахвотнасць, педагагічнае кіраўніцтва з боку настаўніка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. самакіраванне і галоснасць

3. дабраахвотнасць, педагагічнае кіраўніцтва з боку настаўніка, самакіраванне, галоснасць і грамадска-карысная накіраванасць

4. галоснасць і грамадска-карысная накіраванасць.

3. Самай распаўсюджанай формай пазакласнай працы з’яўляецца:

1. пазакласнае чытанне
2. гістарычны гурток
3. школьны гістарычны вечар
4. школьны музей.

4. Алімпіяда па гісторыі – гэта:

1. найбольш распаўсюджаная форма арганізацыі пазакласнай працы
2. форма працы накіраваня на выяўленне найбольш здольных і таленавітых у галіне гісторыі вучняў
3. форма спаборніцтва паіж школамі
4. форма масавай работы са школьнікамі.

5. Вядучая роля ў пазакласнай рабоце па гісторыі належыць:

1. настаўніку гісторыі
2. грамадскім арганізвцыям
3. адміністрацыі школы
4. педагогу-арганізатару.

6. Па колькасці занятых у іх вучняў усе формы пазакласнай работы можна падзяліць на:

1. масавыя і індывідуальныя
2. індывідуальныя і групавыя
3. масавыя і групавыя
4. масавыя, групавыя і індывідуальныя.

7. У структуры прафесійнай дзейнасці настаўніка гісторыі цэнтральнае месца займае:

1. выхаваўчая праца са школьнікамі
2. самаадукацыя
3. грамадская праца
4. выкладанне гісторыі і грамадазнаўства

8. Вызначце правільную паслядоўнасць у пераліку кваліфікацыйных катэгорый настаўніка:

1. без катэгорыі
2. першая катэгорыя
3. вышэйшая катэгорыя
4. другая катэгорыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

9. Настаўнік праходзіць курсавую перападрыхтоўку адзін раз ў:

1.тры гады
2. пяць гадоў
3. шэсць гадоў
4. чатыры гады.

10. Настаўнік гісторыі – ключавая фігура ў педагагічным калектыве ў сілу:

1. свайго аўтарытэта
2. выкладання асноўнай гуманітарнай дысцыпліны ў школе
3. свайго выключнага статуса
4. сваей эрудыцыі.

**Адказы да тэстаў па тэмах**

| № тэмы адказ | Тэма 1 | Тэма 2 | Тэма 3 | Тэма 4 | Тэма 5 | Тэма 6 | Тэма 7 | Тэма 8 | Тэма 9 | Тэма 10 | Тэма 11 | Тэма 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 3 | 4 | 4 | 3 | 1в2 б3а | 3 | 1б,2 в,3а | 4 | 1 | 3 | 4 | 2 |
| 2 | 3 | 2 | 4 | 4 | 2,1, 4,3 | 2 | 2 | 2 | 3 | 2 | 3 | 3 |
| 3 | 4 | 3 | 3 | 3 | 1а2 в3б 4г | 1б2 а3г 4в | 4 | 1 | 1 | 2 | 1 | 3 |
| 4 | 4 | 2 | 2 | 2 | 1 | 1 | 4 | 3 | 3 | 1 | 3 | 2 |
| 5 | 1,4, 3,5, 2 | 4 | 2 | 4 | 4 | 2 | 1 | 4 | 3 | 2 | 3 | 1 |
| 6 | 1,3, 4,5, | 3 | 2 | 3 | | | 1 | 1 | 3 | | 1а 2 в3б | 4 |
| 7 | 4 | 3 | 3 | 2 | | | 1в,2 б,3а | 1 | 3 | | 1 | 4 |
| 8 | 3 | 1в,2 г,3а 4б | 3 | 3 | | | 1б.2 в,3а 4г | 2 | 2 | | 3 | 1,4, 2,3 |
| 9 | 4 | 3 | 5,2, 1, 3, 4 | 4 | | | 4 | 2 | 3,2, 4,1 | | 1 | 2 |
| 10 | 5 | 1г,2 в,3б 4а | 3 | 4 | | | 1б,2 а,3в | 2 | 1 | | 4 | 2 |
| 11 | | | 2 | | | | 2 | 3 | | | 2 | |
| 12 | | | 3 | | | | 1 | 2 | | | 3 | |
| 13 | | | 1г,2 б,3в 4а | | | | 1 | 2 | | | 3 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 14 | | | 4 | | | | 1 | 3 | | | 2 | |
| 15 | | | 3 | | | | 4 | 2 | | | 4 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 5.1. ТЫПАВАЯ ПРАГРАМА ПА ДЫСЦЫПЛІНЕМІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Вучэбна-метадычнае аб’яднанне па педагагічнай адукацыі**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**

Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
__________________ В.А. Богуш
“ ”______________ 2015г.
Рэгістрацыйны № ТД-А.- /тып.

**МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ ГІСТОРЫІ**

**Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне**

**для спецыяльнасці**

1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны

**УЗГОДНЕНА**
Старшыня вучэбна-метадычнага
аб’яднання па педагагічнай адукацыі

________________ А.І. Жук
________________

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік Упраўлення вышэйшай
адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
___________________ С.І. Раманюк
_____________________

Прарэктар па навукова-метадычнай рабоце Дзяржаўнай установы адукацыі “Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы”
___________________ І.У. Цітовіч
____ ________________

Эксперт-нормакантралёр
_____________________
____ _______________

Мінск 2015

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**СКЛАДАЛЬНІК**

І.І. Багдановіч, дацэнт кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Кафедра гісторыі паўднёвых і заходніх славян Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта;

Паноў С.В., дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі Дзяржаўнай установы адукацыі “Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**

Кафедрай дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”
(пратакол № 9 ад 31 сакавіка 2015 г.);

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”
(пратакол № 5 ад 26 мая 2015г.);

Навукова-метадычным саветам па гуманітарнай адукацыі вучэбна-метадычнага аб'яднання па педагагічнай адукацыі
(пратакол № ад чэрвеня 2015 г.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Адказны за рэдакцыю: У.М. Кадзіра

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне “Методыка выкладання гісторыі” распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасці 1-02 01 01 “Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны”.

Вучэбная дысцыпліна “Методыка выкладання гісторыі” займае вядучае месца ў прафесійнай падрыхтоўцы выкладчыка гісторыі. Ён закліканы даць будучым выкладчыкам гісторыі веданне тэарэтычных асноў сучаснай методыкі выкладання, выпрацаваць першапачатковыя ўменні і навыкі, неабходныя для арганізацыі эфектыўнага навучання, падрыхтаваць іх да рэалізацыі ў школьным выкладанні выхаваўчых і развіваючых магчымасцей гісторыі.

Засваенне зместу вучэбнай дысцыпліны забяспечвае падрыхтоўку кваліфікаванага выкладчыка гісторыі, які глыбока валодае зместам школьнай гістарычнай адукацыі, умее вызначаць найбольш эфектыўныя метады, сродкі, формы і тэхналогіі навучання, якія садзейнічаюць эфектыўнаму засваенню школьнікамі гістарычных ведаў, свабоднае валоданне і аперыраванне імі ў практычнай дзейнасці, развіццю ў вучняў творчага мыслення.

Методыка выкладання гісторыі непасрэдным чынам звязана з авалоданнем зместам такіх вучэбных дысцыплін, як “Філасофія”, “Педагогіка”, “Псіхалогія” і інш. Таму паспяховая прафесійная падрыхтоўка выкладчыка гісторыі немагчыма без ажыццяўлення міждысцыплінарнага падыходу ў працэсе навучання на гістарычным факультэце педагагічнага ўніверсітэта.

Тыпавая вучэбная праграма складаецца з шасці раздзелаў. Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны пачынаецца з характарыстыкі методыкі навучання гісторыі як навукі, асноўных этапаў яе станаўлення і развіцця. Затым прадугледжваецца знаёмства студэнтаў з задачамі і зместам школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Цэнтральнае месца ў дысцыпліне займае вывучэнне асаблівасцей працэсу фарміравання гістарычных ведаў школьнікаў, метадаў узаемазвязанай вучэбнай дзейнасці настаўніка і вучняў, форм арганізацыі працэсу навучання гісторыі. Заканчваецца вывучэнне дысцыпліны раздзелам, прысвечаным методыцы пазакласнай работы па гісторыі, і характарыстыкай структуры дзейнасці настаўніка гісторыі.

У праграме тэарэтычная і практычная часткі дысцыпліны пададзены разам. Гэта дазваляе выкладчыку самастойна вызначыць, які матэрыял складае аснову тэарэтычнага навучання методыцы выкладання гісторыі, а які можа стаць базай арганізацыі лекцый і семінараў са студэнтамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Мэта і задачы вывучэння дысцыпліны

**Мэта** вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Методыка выкладання гісторыі” – забяспечыць валоданне будучымі выкладчыкамі тэарэтычнымі асновамі сучаснай методыкі выкладання гісторыі і выпрацоўку ў іх уменняў і навыкаў адбіраць і выкарыстоўваць у практычнай дзейнасці прыёмы, сродкі і тэхналогіі, якія забяспечваюць эфектыўнае навучання гісторыі ў агульнаадукацыйнай школе.

Дадзеная мэта вырашаецца праз рэалізацыю наступных **задач**:

1. Засваенне студэнтамі асаблівасцей методыкі выкладання гісторыі як навукі і асноўных этапаў яе станаўлення і развіцця як ў нашай краіне, так і за яе межамі.

2. Знаёмства з нарматыўна-прававым і навукова-метадычным забеспячэннем вучэбнага прадмета “Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі”, мэтамі і задачамі яго вывучэння ў школе, навукова-метадычнымі прынцыпамі адбору зместу гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, структурай вывучэння гісторыі ў V–XI класах агульнаадукацыйнай школы і яе зместам.

3. Авалоданне ведамі аб заканамернасцях працэсу навучання гісторыі, асаблівасцях структуры гістарычных ведаў і ўзаемазвязанай дзейнасці настаўніка і вучняў, якая забяспечвае трывалае засваенне вучнямі гістарычнымі ўяўленнямі, паняццямі, заканамернасцямі грамадскага развіцця і авалоданне дзейнасным кампанентам гістарычнай адукацыі.

4. Знаёмства з методыкай аналізу развіваючага і выхаваўчага патэнцыялу школьных курсаў гісторыі, вызначэнне аптымальных метадычных шляхоў яго рэалізацыі ў працэсе навучання прадмету і аналіза фактаў сучаснага грамадска-палітычнага жыцця.

5. Авалоданне першапачатковымі ўменнямі мадэліравання працэсу навучання гісторыі і канструявання найбольш эфектыўных арганізацыйных форм і тэхналогій навучання, якія забяспечаюць прадуктыўную дзейнасць школьнікаў па авалоданні гістарычнымі ведамі і іх выкарыстанні ў якасці інструмента пазнання фактаў грамадскага жыцця мінулага і сучаснасці.

6. Знаёмства з асаблівасцямі методыкі арганізацыі факультатыўных заняткаў, заняткаў па інтарэсах і пазакласнай работы па гісторыі, іх задачамі, прынцыпамі і асноўнымі формамі арганізацыі.

7. Знаёмства са структурай дзейнасці настаўніка гісторыі, яго творчай лабараторыяй па даследаванню, пошуку і канструяванню найбольш аптымальных шляхоў арганізацыі навучання гісторыі ў школе.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

- тэарэтыка-метадалагічныя асновы методыкі выкладання гісторыі, мэты і задачы навучання гісторыі ў школе;
- адукацыйныя, выхаваўчыя і развіваючыя магчымасці сучаснага зместу школьнай гістарычнай адукацыі і шляхі іх рэалізацыі;
- асноўныя прыёмы, сродкі, формы і тэхналогіі навучання гісторыі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- асаблівасці арганізацыі факультатыўных заняткаў і пазакласнай работы па гісторыі;

**умець:**

- вызначаць аптымальныя мэты і задачы вывучэння асноўных кампанентаў зместу школьнай гістарычнай адукацыі;
- выкарыстоўваць адэкватныя мэтам, зместу і пазнавальным магчымасцям школьнікаў прыёмы і сродкі навучання, разнастайныя формы і тэхналогіі арганізацыі працэса навучання;

**валодаць:**

- асноўнымі прыёмамі, сродкамі, формамі і тэхналогіямі навучання гісторыі;
- метадамі аналізу перадавога педагагічнага вопыту для ўдасканалення адукацыйнага працэса і асабістага педагагічнага майстэрства.

### Патрабаванні да кампетэнтнасці спецыяліста

***Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый спецыяліста***

Спецыяліст павінен:

– Умець прымяняць базавыя навукова-практычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.
– Валодаць метадамі навукова-педагагічнага даследавання.
– Валодаць даследчыцкімі навыкамі.
– Умець працаваць самастойна.
– Быць здольным нараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).
– Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.
– Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных прыстасаванняў, кіраваннем інфармацыяй і працай з камп'ютарам.
– Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.
– Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

***Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый спецыяліста***

Спецыяліст павінен:

– Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.
– Валодць здольнасцю да міжасабовых камунікацый.
– Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.
– Умець працаваць у камандзе.
– Быць здольным ажыццяўляць самаадукацыю і ўдасканальваць прафесійную дзейнасць.

***Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый спецыяліста***

Спецыяліст павінен:

– Кіраваць вучэбна-пазнавальнай і вучэбна-даследчыцкай дзейнасцю навучэнцаў.
– Выкарыстоўваць аптымальныя метады, формы і сродкі навучання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– Арганізоўваць і праводзіць вучэбныя заняткі разнастайных відаў і форм.
– Арганізоўваць самастойную працу навучэнцаў.
– Развіваць вучэбныя магчымасці і здольнасці навучэнцаў на аснове сістэмнай педагагічнай дыягностыкі.
– Развіваць навыкі самастойнай працы навучэнцаў з вучэбнай, даведачнай, навуковай літаратурай і інш. крыніцамі інфармацыі.
– Арганізоўваць і праводзіць карэкцыйна-педагагічную дзейнасць з навучэнцамі.
– Папярэджваць і пераадольваць непаспяховасць навучэнцаў.
– Фармуляваць адукацыйныя і выхаваўчыя ідэі.
– Ацэньваць вучэбныя дасягненні навучэнцаў, а таксама ўзроўні іх выхаванасці і развіцця.
– Ажыццяўляць прафесійную самадукацыю і самавыхаванне з мэтай удасканалення прафесійнай дзейнасці.
– Арганізоўваць цэласны адукацыйны працэс з улікам сучасных адукацыйных тэхналогій і педагагічных інавацый.
– Аналізаваць і ацэньваць педагагічныя з'явы і падзеі мінулага ў святле сучасных навуковых ведаў.

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны адведзена 191 гадзіна, з іх 106 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 66 гадзін - лекцыі, 40 гадзін - семінары.

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Назвы раздзелаў і тэм | Аўдыторныя гадзіны | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | у тым ліку | |
| | | | Лек-цыі | Семі-нары |
| **1** | **Раздзел 1. Методыка навучання гісторыі як педагагічная навука** | **10** | **10** | |
| 1.1 | Прадмет і задачы методыкі выкладання гісторыі | 2 | 2 | |
| 1.2 | Станаўленне і развіццё школьнай гістарычнай адукацыі і методыкі выкладання гісторыі ў дасавецкі час | 2 | 2 | |
| 1.3 | Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі і методыкі выкладання гісторыі ў СССР | 2 | 2 | |
| 1.4 | Станаўленне нацыянальнай сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі ў Беларусі | 2 | 2 | |
| 1.5 | Сучасны стан і тэндэнцыі развіцця гістарычнай адукацыі ў свеце | 2 | 2 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **2** | **Раздзел 2. Задачы і змест навучання гісторыі ў школе** | **12** | **4** | **8** |
| 2.1 | Мэты, задачы і структура школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь | 4 | 2 | 2 |
| 2.2 | Агульная характарыстыка зместу і асаблівасцей выкладання асобных курсаў гісторыі ў школе | 8 | 2 | 6 |
| **3** | **Раздзел 3. Працэс фарміравання гістарычных ведаў** | **22** | **14** | **8** |
| 3.1 | Структура гістарычных ведаў школьнікаў, характарыстыка яе асноўных кампанентаў | 2 | 2 | |
| 3.2 | Методыка фарміравання гістарычных уяўленняў | 6 | 4 | 2 |
| 3.3 | Метадычныя прыемы і сродкі фарміравання гістарычных паняццяў | 4 | 2 | 2 |
| 3.4 | Методыка раскрыцця гістарычных заканамернасцей і рэалізацыі міжпрадметных сувязей у навучанні гісторыі | 6 | 4 | 2 |
| 3.5 | Выхаванне школьнікаў у працэсе навучання гісторыі | 4 | 2 | 2 |
| **4** | **Рэалізацыя дзейнаснага падыходу ў працэсе навучання гісторыі** | **14** | **10** | **4** |
| 4.1 | Дзейнасны падыход ў навучанні гісторыі. Паняцце і структура вучэбнай дзейнасці | 2 | 2 | |
| 4.2 | Фарміраванне пазнаваўчага інтарэсу – аснова рэалізацыі дзейнаснага кампанента гістарычнай адукацыі | 2 | 2 | |
| 4.3 | Характарыстыка зместу дзейнаснага кампаненту гістарычнай адукацыі | 2 | 2 | |
| 4.4 | Фарміраванне спосабаў вучэбна-пазнаваўчай дзейнасці | 4 | 2 | 2 |
| 4.5 | Асаблівасці методыкі рэалізацыі дзейнаснага кампанента ў традыцыйнай і тэхналагічнай мадэлях навучання | 4 | 2 | 2 |
| **5** | **Раздзел 5. Прыёмы і сродкі ўзаемадзеяння настаўніка і вучняў ў працэсе навучання гісторыі** | **18** | **12** | **6** |
| 5.1 | Агульная характарыстыка сродкаў навучання гісторыі | 2 | 2 | |
| 5.2 | Праблема метадаў навучання гісторыі | 2 | 2 | |
| 5.3 | Методыка нагляднага навучання гісторыі | 6 | 4 | 2 |
| 5.4 | Метадычныя прыёмы вуснага навучання гісторыі | 4 | 2 | 2 |
| 5.5 | Методыка работы з друкаванымі крыніцамі ў навучанні гісторыі | 4 | 2 | 2 |
| **6** | **Раздзел 6. Формы арганізацыі навучання гісторыі** | **26** | **12** | **14** |
| 6.1 | Урок гісторыі і падрыхтоўка да яго правядзення | 8 | 4 | 4 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 6.2 | Сістэма праверкі і ацэнкі вынікаў навучання гісторыі | 6 | 2 | 4 |
| 6.3 | Паўтарэнне ў навучанні гісторыі | 4 | 2 | 2 |
| 6.4 | Выкарыстанне сучасных тэхналогій навучання гісторыі | 4 | 2 | 2 |
| 6.5 | Методыка выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у навучанні гісторыі | 4 | 2 | 2 |
| **7.** | **Раздзел 6. Пазакласная работа па гісторыі. Настаўнік гісторыі** | **4** | **4** | |
| 7.1 | Пазакласная работа па гісторыі | 3 | 3 | |
| 7.2 | Настаўнік гісторыі | 1 | 1 | |
| | **Усяго па дысцыпліне** | **106** | **66** | **40** |

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Раздзел І. МЕТОДЫКА НАВУЧАННЯ ГІСТОРЫІ ЯК ПЕДАГАГІЧНАЯ НАВУКА

#### *Тэма 1.1. Прадмет і задачы методыкі выкладання гісторыі*

Методыка выкладання гісторыі як навука і як педагагічная дысцыпліна. Прадмет методыкі выкладання гісторыі. Асноўныя кампаненты працэсу навучання гісторыі: мэты і змест школьных курсаў гісторыі, выкладчыцкая дзейнасць настаўніка і пазнавальная дзейнасць вучняў, вынікі навучання. Узаемасувязь паміж імі. Месца методыкі выкладання ў сістэме педагагічных навук. Яе сувязь з іншымі навукамі.

Методыка і тэхналогія навучання. Агульнае і асаблівае. Сувязь методыкі навучання гісторыі з іншымі навукамі. Метады даследавання працэсу навучання гісторыі.

Задачы, змест і структура вучэбнай дысцыпліны “Методыка выкладання гісторыі ”. Асноўная літаратура.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- характарызаваць методыку выкладання гісторыі як самастойную галіну педагагічнай навукі;
- ведаць асноўныя кампаненты працэсу навучання гісторыі;
- устанаўліваць агульнае і асаблівае ў методыцы і тэхналогіі навучання гісторыі;
- вызначаць месца методыкі выкладання гісторыі ў сістэме навук;
- раскрываць сутнасць метадаў навуковага даследавання працэсу навучання гісторыі.

#### *Тэма 1.2. Станаўленне і развіццё школьнай гістарычнай адукацыі і методыкі выкладання гісторыі ў дасавецкі час*

Узнікненне і станаўленне школьнай гістарычнай адукацыі на ўсходнеславянскіх землях. Фактары, якія вызначаюць станаўленне методыкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

як навукі. Асноўныя напрамкі развіцця гісторыка-метадычнай думкі ў дарэвалюцыйнай Расіі ў XIX ст. Афармленне методыкі выкладання гісторыі ў пачатку XX стагоддзя як самастойнай галіны педагагічнай навукі.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- вызначаць фактары, якія абумовілі ўзнікненне і развіццё школьнай гістарычнай адукацыі і методыкі выкладання гісторыі;
- характарызаваць асноўныя напрамкі ў развіцці гісторыка-метадычнай думкі ў дарэвалюцыйнай Расіі;
- абгрунтаваць заканамернасць афармлення методыкі выкладання гісторыі ў пачатку XX ст. у самастойную навуку.

### *Тэма 1.3. Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі і методыкі выкладання гісторыі ў СССР*

Замена гісторыі як вучэбнай дысцыпліны палітграматай і грамадазнаўствам у 20-я гады XX стагоддзя. Аднаўленне самастойнага курса гісторыі ў савецкай школе ў 30-я гады. Ідэалагізацыя і палітызацыя школьнага курса грамадзянскай гісторыі. Пастанаўленні ЦК КПСС і савецкага ўрада па пытаннях школьнага выкладання гісторыі 1934, 1959 і 1965 гадоў. Выкарыстанне сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі як магутнага інструмента ідэалагічнай і прапагандысцкай дзейнасці камуністычнай партыі.

Развіццё метадычных даследаванняў у СССР у 20—30-я гады. Стварэнне сістэмы стабільных падручнікаў па гісторыі ў канцы 40-х гадоў і іх далейшае ўдасканаленне ў 50-я — сярэдзіне 60-х гадоў. Навуковая распрацоўка праблем зместу методыкі выкладання, выхоўваючага і развіваючага навучання гісторыі ў канцы 60-х— пач. 90-х гадоў XX стагоддзя.

Прычыны крызісу ў выкладанні гісторыі другой паловы 80-х – пачатку 90-х гадоў. Пошукі шляхоў яго пераадолення.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- вызначаць прычыны, якія абумовілі ліквідацыю сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі ў 20-я гады XX ст.;
- характарызаваць асноўныя этапы ў развіцці гістарычнай адукацыі і методыкі выкладання гісторыі ў савецкі час;
- абгрунтаваць ідэалагізацыю і палітызацыю школьных курсаў гісторыі ў савецкі час;
- вызначаць прычыны крызісу савецкай сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі.

### *Тэма 1. 4. Станаўленне нацыянальнай сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі ў Беларусі*

Вытокі станаўлення гістарычнай адукацыі ў Беларусі. Вывучэнне гісторыі Беларусі ў школе ў 20-я-30-я гады XX ст. Стан вывучэння гісторыі БССР і развіццё методыкі яе выкладаня ў 60-я-80-я гады. Станаўленне

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі ў Беларусі. Канцэпцыя школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Стварэнне школьных праграм, вучэбных дапаможнікаў і падручнікаў для школ. Праблемы развіцця нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі. Поспехі і недахопы на шляху іх вырашэння.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці*:**

- вызначаць вытокі станаўлення гістарычнай адукацыі ў Беларусі;
- вызначаць і характарызаваць асноўныя этапы станаўлення і развіцця нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі;
- аналізаваць сучасны стан нацыянальнай сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі ў Беларусі.

## *Тэма 1.5. Сучасны стан і тэндэнцыі развіцця гістарычнай адукацыі ў свеце*

Стан сучаснай гістарычнай адукацыі за мяжой. Мэты і задачы вывучэння гісторыі ў школе. Асаблівасці паслядоўнасці вывучэння гісторыі і метадалагічных прынцыпаў адбору зместу гістарычнай адукацыі ў розных краінах свету. Сучасны стан развіцця дыдактыкі гісторыі ў розных еўрапейскіх краінах і ЗША. Інавацыйныя тэхналогіі выкладання гісторыі ў школе і іх выкарыстанне ў розных краінах свету.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- вызначаць асаблівасці мэт і задач, якія ставяцца перад навучаннем гісторыі ў розных краінах свету;
- вызначаць фактары, якія ўплываюць на сучасны стан гістарычнай адукацыі ў розных краінах свету;
- ахарактарызаваць сутнасць інавацыйных тэхналогій навучання гісторыі ў ЗША і еўрапейскіх краінах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Раздзел II. ЗАДАЧЫ І ЗМЕСТ НАВУЧАННЯ ГІСТОРЫІ Ў ШКОЛЕ

### *Тэма 2.1. Мэты, задачы і структура гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь*

Комплексны характар мэт навучання гісторыі: фарміраванне ў вучняў трывалых і глыбокіх ведаў аб развіцці грамадства і творчага мыслення; развіццё пазнавальнай самастойнасці пры вывучэнні гісторыі; выхаванне высокамаральнага чалавека-грамадзяніна, патрыёта сваёй Бацькаўшчыны. Уплыў мэт навучання на змест і структуру гістарычнай адукацыі, на складанне школьных праграм і арганізацыю навучання. Мэты навучання і задачы вывучэння асобных раздзелаў і тэм. Таксанамія мэт навучання гісторыі. Узаемасувязь мэтанакіраванасці і выніковасці ў навучанні гісторыі.

Гісторыя як прадмет школьнага навучання. Яе месца ў вучэбным плане базавай, сярэдняй агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы. Сучасная структура школьнай гістарычнай адукацыі.

Канцэпцыя вучэбнага прадмета “Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі”, Дзяржаўны стандарт гістарычнай адукацыі і праграмы па гісторыі. Навуковыя асновы, метадалагічныя і агульнадыдактычныя прынцыпы пабудовы гістарычнай адукацыі. Метадычныя прынцыпы структуры школьнай гістарычнай адукацыі: лінейнасць, узаемасувязь айчыннай і сусветнай гісторыі, улік міжпрадметных і міжкурсавых сувязей. Асноўныя кампаненты і структура дзеючых школьных праграм па гісторыі.

Планаванне навучання гісторыі ў школе. Тэхналогія складання тэматычнага і каляндарна-тэматычнага плана. Вучэбны – метадычны комплекс па гісторыі, яго склад і змест.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- вызначаць комплексны характар і таксанамію мэт і задач навучання гісторыі;
- абгрунтаваць аб’ектыўнасць уплыву мэт і задач навучання на выніке вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў;
- характаразываць асноўныя дзяржаўныя дакументы па пытаннях навучання гісторыі ў школе;
- валодаць першапачатковымі уменнямі складання каляндарна-тэматычнага планавання.

### *Тэма 2.2.. Агульная характарыстыка зместу і асаблівасцей выкладання асобных курсаў гісторыі ў школе*

Пабудова і задачы вывучэння “Гісторыі старажытнага свету”. Склад вучэбна-метадычнага комплексу па гісторыі старажытнага свету і яго характарыстыка. Змест і структура курса, яго храналагічныя рамкі, перыядызацыя. Асноўныя паняцці і вядучыя ідэі. Раскрыццё ў курсе найбольш істотных прыкмет старажытных цывілізацый. Фарміраванне спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці. Месца абагульняючых урокаў у фарміраванні агульных паняццяў. Асаблівасці методыкі выкладання гісторыі старажытнага свету.

Пабудова і задачы вывучэння “Гісторыі сярэдніх вякоў”. Склад вучэбна-метадычнага комплексу па гісторыі сярэдніх вякоў і яго характарыстыка. Структура, храналагічныя рамкі і перыядызацыя курса. Асноўныя паняцці і вядучыя ідэі курса гісторыі сярэдніх вякоў, асаблівасці методыкі іх фарміравання ў 6-7 класах агульнаадукацыйнай школы. Асноўныя спосабы вучэбна-пазнавальнай дзейнасці і магчымасці іх фарміравання ў курсе гісторыі сярэдніх вякоў.

Пабудова і задачы вывучэння “Сусветнай гісторыі новага часу”. Склад вучэбна-метадычнага комплексу па гісторыі новага часу і яго характарыстыка. Храналагічныя рамкі, перыядызацыя і структура курса.

РЭПОЗІТОРЫЙ БГПУ

Вядучыя паняцці і ідэі. Раскрыццё ў змесце курса заканамернасцей сусветнай гісторыі ў новы час. Магчымасці курса для фарміравання асноўных спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

Пабудова і задачы вывучэння “Сусветная гісторыі навейшага часу”. Склад вучэбна-метадычнага комплексу па гісторыі навейшага часу і яго характарыстыка. Храналагічныя рамкі і перыядызацыя курса. Структура і адукацыйна-выхаваўчыя задачы вывучэння гісторыі навейшага часу. Асноўныя праблемы і ідэі курса, іх абагульняючы і тэарэтычны характар. Асаблівасці выкарыстання актыўных і інтэрактыўных форм і метадаў арганізацыі працэсу навучання навейшай гісторыі. Міжпрадметныя і ўнутрыпрадметныя сувязі пры вывучэнні гісторыі навейшага часу.

Пабудова і задачы вывучэння “Гісторыі Беларусі” ў 6-11 класах сярэдняй агульнаадукацыйнай школы. Храналагічныя рамкі і перыядызацыя курса. Структура яго пабудовы па гадах навучання. Асноўныя ідэі і заканамернасці курса гісторыі Беларусі. Разгляд айчыннай гісторыі ў кантэксце еўрапейскай і сусветнай гісторыі.

Сістэма гістарычных фактаў, глыбіня іх раскрыцця ў залежнасці ад ступені навучання і ўзросту школьнікаў. Асноўныя паняцці і вядучыя ідэі. Ступень ускладнення работы па фарміраванню паняццяў у залежнасці ад узросту школьнікаў. Раскрыццё ў курсе патрыятычных традыцый беларускага народа. Выхаванне пачуцця гонару за свой народ, яго гістарычную і культурную спадчыну. Суадносіны тэарэтычнага і фактычнага матэрыялу ў курсе айчыннай гісторыі, іх абумоўленасць ступенню навучання і ўзростам школьнікаў. Міжпрадметныя і ўнутрыпрадметныя сувязі ў навучанні гісторыі Беларусі.

Развіццё ўменняў вучняў выяўляць асноўныя заканамернасці айчыннай гісторыі, параўноўваць падзеі і факты з гісторыі Беларусі з фактамі сусветнай гісторыі, разглядаць і аналізаваць іх у кантэксце еўрапейскай і сусветнай гісторыі.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- даваць агульную характарыстыку пабудовы і зместу асноўных курсаў гісторыі, вывучаемых у сярэдняй агульнаадукацыйнай школе;
- ажыццяўляць аналіз існуючых у сучаснай школе вучэбна-метадычных комплексаў па асноўных курсах гісторыі;
- рабіць навукова-метадычны аналіз школьных падручнікаў па гісторыі;
- умець вызначаць вядучыя паняцці і ідэі, вывучаемыя ў курсах гісторыі і асаблівасці іх раскрыцця ў залежнасці ад узроставых і псіхалагічных асаблівасцей вучняў рознага ўзросту;
- вызначаць асаблівасці методыкі навучання гісторыі на тэарэтычнай ступені ў старэйшых класах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## РАЗДЗЕЛ ІІІ. ПРАЦЭС ФАРМІРАВАННЯ ГІСТАРЫЧНЫХ ВЕДАЎ

### *Тэма 3.1. Структура гістарычных ведаў школьнікаў, характарыстыка яе асноўных кампанентаў*

Роля гістарычных ведаў у фарміраванні светапогляду вучняў і ажыццяўленні адукацыйна-выхаваўчых і развіваючых задач навучання гісторыі. Структура і функцыі гістарычных ведаў. Роля фактаў у навучанні гісторыі. Віды гістарычных фактаў. Узаемасувязь падзей і з'яў у гісторыі. Суадносіны канкрэтных фактаў і абагульненняў у працэсе навучання гісторыі. Асноўныя кампаненты вучэбнага гістарычнага матэрыялу: канкрэтныя гістарычныя ўяўленні, гістарычныя паняцці, заканамернасці гістарычнага развіцця. Дзейнасны кампанент зместу гістарычнай адукацыі, яго роля ў рэалізацыі развіццевых магчымасцей школьных курсаў гісторыі.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- даваць агульную характарыстыку структуры гістарычных ведаў школьнікаў;
- вызначаць асноўныя функцыі гістарычных ведаў, іх ролю ў рэалізацыі адукацыйна-выхаваўчых і развіццевых магчымасцей школьнага курса гісторыі.

### *Тэма 3.2. Методыка фарміравання гістарычных уяўленняў*

Віды гістарычных уяўленняў. Іх месца ў працэсе фарміравання гістарычных ведаў. Раскрыццё метадычных шляхоў фарміравання гістарычных уяўленняў у метадычнай літаратуры. Шляхі і сродкі фарміравання ўяўленняў аб фактах мінулага. Роля нагляднасці ў фарміраванні ўяўленняў аб гістарычным мінулым. Вобразы памяці і фантазіі ў фарміраванні гістарычных ўяўленняў. Методыка фарміравання ўяўленняў аб гістарычным часе і прасторы. Храналогія на ўроку гісторыі. Методыка работы з гістарычнай картай.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- вызначаць аптымальныя метадычныя шляхі фарміравання гістарычных уяўленняў;
- валодаць асноўнымі прыёмамі і сродкамі фарміравання ў вучняў вобразаў гістарычнай рэчаіснасці;
- валодаць асноўнымі метадычнымі прыёмамі работы на ўроку з храналогіяй і гістарычнай картай.

### *Тэма 3.3. Метадычныя прыёмы і сродкі фарміравання гістарычных паняццяў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гістарычныя паняцці – найважнейшы кампанент у структуры гістарычных ведаў. Распрацоўка пытанняў методыкі фарміравання гістарычных паняццяў у метадычнай літаратуры. Класіфікацыя гістарычных паняццяў: па ступені абагульнення гістарычных з'яў, і па асаблівасцях зместу. Псіхалагічныя асаблівасці засваення школьнікамі гістарычных паняццяў. Лагічныя шляхі фарміравання паняццяў. Метадычныя ўмовы павышэння эфектыўнасці фарміравання гістарычных паняццяў. Роля ўяўленняў, тэрмінаў і азначэнняў у рабоце па фарміраванні паняццяў. Развіццё і абагачэнне паняццяў у працэсе навучання. Выпрацоўка ўменняў аперыраваць гістарычнымі паняццямі.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- даваць класіфікацыю гістарычных паняццяў на аснове некалькіх навуковых крытэрыяў;
- улічваць метадычныя ўмовы павышэння эфектыўнасці фарміравання гістарычных паняццяў пры распрацоўцы методыкі іх засваення школьнікамі;
- канструяваць метадычныя шляхі (алгарытмы) фарміравання асноўных паняццяў на ўроках гісторыі.

### *Тэма 3.4 . Методыка раскрыцця гістарычных заканамернасцей і рэалізацыі міжпрадметных сувязей ў навучанні гісторыі*

Аб'ектыўныя гістарычныя сувязі і заканамернасці грамадскага развіцця – найважнейшы кампанент школьнай гістарычнай адукацыі. Віды гістарычных сувязей: лакальныя, часавыя, прычынна-выніковыя. Паняцце аб заканамернасцях у гістарычным развіцці. Метадычная навука аб месцы, часе, ступені і глыбіні раскрыцця заканамернасцей у школьных курсах гісторыі. Методыка падвядзення вучняў да засваення гістарычных заканамернасцей з улікам узросту школьнікаў.

Роля міжпрадметных і ўнутрыкурсавых сувязей ў навучанні гісторыі ў засваенні светапоглядных ідэй. Змест міжпрадметных сувязей з іншымі дысцыплінамі: па вывучаемых фактах, паняццях, ідэях, агульнавучэбных спосабах вучэбна-пазнавальнай дзейнасці. Асноўныя напрамкі ажыццяўлення міжпрадметных сувязей: рэтраспектыўныя, супадаючыя, перспектыўныя.

Метадычныя прыёмы і сродкі ажыццяўлення міжпрадметных і ўнутрыкурсавых сувязей. Залежнасць выкарыстання прыёмаў і сродкаў ажыццяўлення міжпрадметных сувязей ад падрыхтаванасці класа, задач іх усталявання і зместу.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- валодаць методыкай падвядзення вучняў да засваення гістарычнымі заканамернасцямі з улікам узросту школьнікаў;
- вызначаць ролю міжпрадметных сувязей ў засваенні светапоглядных ідэй;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- адбіраць аптымальныя шляхі, прыёмы і сродкі ажыццяўлення міжпрадметных і ўнутрыкурсавых сувязей.

### *Тэма 3.5. Выхаванне школьнікаў у працэсе навучання гісторыі*

Магчымасці школьных курсаў гісторыі для маральнага, патрыятычнага, інтэрнацыянальнага, экалагічнага і эстэтычнага выхавання школьнікаў. Спецыфіка праяўлення метадаў выхавання ў навучанні гісторыі. Метадычныя шляхі рэалізацыі выхаваўчых задач курсаў гісторыі ў працэсе навучання. Адбор вучэбнага матэрыялу і сродкаў навучання з улікам іх выхаваўчых магчымасцей. Сувязь выкладання гісторыі з жыццём, сучаснасцю як умова рэалізацыі выхаваўчых задач. Выхаванне інтарэсу да вывучэння гісторыі. Адзінства эмацыянальнага і лагічнага ў раскрыцці падзей і з'яў як шлях фарміравання ў вучняў маральных перакананняў. Фарміраванне гуманістычнага светапогляду школьнікаў.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- вызначаць і выкарыстоўваць у навучанні гісторыі яе патэнцыяльныя магчымасці для выхавання школьнікаў;
- ажыццяўляць адбор гістарычнага матэрыялу, прыёмаў і сродкаў яго вывучэння, якія ў найбольшай ступені спрыяюць рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу школьных курсаў гісторыі;
- умець ажыццяўляць адзінства эмацыянальнага і лагічнага ў раскрыцці сутнасці гістарычных падзей і з'яў як найважнейшую перадумову выхавання ў вучняў маральных перакананняў.

## РАЗДЗЕЛ 4. РЭАЛІЗАЦЫЯ ДЗЕЙНАСНАГА ПАДЫХОДУ Ў ПРАЦЭСЕ НАВУЧАННЯ ГІСТОРЫІ

### ТЭМА 4.1. ДЗЕЙНАСНЫ ПАДЫХОД У

### *навучанні гісторыі. Паняцце і структура вучэбнай дзейнасці*

Дзейнасны падыход у навучанні гісторыі. Паняцце і структура вучэбнай дзейнасці школьнікаў. Ідэі асобасна-дзейнаснага падыходу ў працах Л.С. Выгоцкага, С.Л. Рубінштэйна, А.М.Лявонцьева. Асноўныя палажэнні тэорыі вучэбнай дзейнасці Д.Б. Эльконіна і У.В. Давыдава. Укараненне дасягненнў сучаснай педагагічнай псіхалогіі і дыдактыкі ў працэс даследавання працэсу навучання гісторыі і ў школьную практыку.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- ведаць і выкарыстоўваць у навучанні гісторыі структуру вучэбнай дзейнасці ў навучанні і выхаванні школьнікаў;
- ажыццяўляць адбор гістарычнага матэрыялу, прыёмаў і сродкаў яго вывучэння, якія ў найбольшай ступені спрыяюць рэалізацыі асобасна-дзейнаснага падыходу ў навучанні гісторыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### *Тэма 4.2. Фарміраванне пазнаваўчага інтарэсу – аснова рэалізацыі дзейнаснага кампанента гістарычнай адукацыі*

Сутнасць пазнаваўчага інтарэсу і яго характэрныя рысы. Характарыстыка інтарэса ў філасофіі, псіхалогіі і педагогіцы. Класіфікацыя інтарэсаў. Пазнаваўчы інтарэс як аснова матывацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў, яго адметныя рысы. Дынаміка развіцця пазнаваўчага інтарэсу да вывучэння гісторыі. Устойлівы пазнаваўчы інтарэс. Змест гістарычнай адукацыі як крыніца фарміравання ўстойлівага пазнаваўчага інтарэсу. Паказчыкі наяўнасці пазнаваўчага інтарэсу і яго сфарміраванасці ў вучняў. Магчымасці прадмета “Сусветная гісторыя .Гісторыя Беларусі” ў 5-11класах для фарміравання ўстойлівага пазнаваўчага інтарэсу ў школьнікаў.

Актыўная вучэбна-пазнавальная дзейнасць і ўзаемадзеянне суб’ектаў адукацыйнага працэсу як крыніцы фарміравання ўстойлівага пазнаваўчага інтарэсу. Метадычныя прыемы і ўмовы фарміравання ўстойлівага пазнаваўчага інтарэсу вучняў 5-11 класаў да вывучэння гісторыі.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- вызначаць сутнасць пазнаваўчага інтарэсу, яго характэрныя рысы і выкарыстоўваць у навучанні гісторыі яе патэнцыяльныя магчымасці для выхавання школьнікаў;
- ажыццяўляць адбор гістарычнага матэрыялу, прыёмаў і сродкаў яго вывучэння, якія ў найбольшай ступені спрыяюць фарміраванню ўстойлівага пазнаваўчага інтарэсу да вывучэння гісторыі;
- выкарыстоўваць разнастайныя метадычныя прыемы і сродкі для фарміравання ў навучэнцаў устойлівага пазнаваўчага інтарэсу.

### *Тэма 4.3. Характарыстыка зместу дзейнаснага кампанента гістарычнай адукацыі*

Дзейнасны кампанент гістарычнай адукацыі: уменні, навыкі, спосабы вучэбна-пазнавальнай дзейнасці. Змест дзейнаснага кампаненту гістарычнай адукацыі ў 5-11 класах. Патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі вучняў ў адпаведнасці з Адукацыйным стандартам прадмета “Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі”

Характарыстыка спецыяльных спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, неабходных для вывучэння гісторыі: лакалізаваць гістарычныя падзеі ў прасторы і часе, суадносіць працэсы з перыядам; працаваць з рознымі крыніцамі гістарычных ведаў; тлумачыць гістарычныя факты на аснове ўсебаковага вывучэння крыніц і прымянення тэарэтычных ведаў; выяўляць сутнасць гістарычных з’яў і даваць ім ацэнку; асвятляць гістарычны матэрыял па скразных пытаннях курса; канспектаваць, тэзаваць і рэферыраваць гістарычныя крыніцы і г.д.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- ажыццяўляць адбор прыёмаў і сродкаў фарміравання спосабаў вучэбна-пазнаваўчай дзейнасці, неабходных для вывучэння гісторыі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- валодаць уменнямі вылучаць дзейнасны кампанент у змесце гістарычнай адукацыі і мэтанакіравана весці дзейнасць па яго рэалізацыі ў працэсе навучання гісторыі.

### *Тэма 4.4. Фарміраванне спосабаў вучэбна-пазнаваўчай дзейнасці*

Дыягностыка ўзроўню сфарміраванасці спосабаў дзейнасці, інтэлектуальных і практычных уменняў і навыкаў, неабходных для пазнання гісторыі. Методыка фарміравання спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці ў працэсе навучання гісторыі ў школе. Метадычныя ўмовы павышэння эфектыўнасці іх фарміравання. Узаемасувязь авалодання спецыяльнымі гістарычнымі ўменнямі і развіццём пазнавальнай самастойнасці і актыўнасці вучняў. Асноўныя этапы работы па фарміраванні ўменняў і спосабаў вучэбнай дзейнасці. Метадычныя ўмовы рэалізацыі дзейнаснага кампанента гістарычнай адукацыі.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- ажыццяўляць дыягностыку ўзроўню сфарміраванасці інтэлектуальных і практычных уменняў і спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці і на аснове гэтага мадэліраваць вучэбную дзейнасць па іх фарміраванні і ўдасканаленні;
- улічваць метадычныя ўмовы павышэння эфектыўнасці фарміравання спецыяльных уменняў і спосабаў дзейнасці, неабходных для вывучэння гісторыі;
- канструяваць метадычныя шляхі (алгарытмы) фарміравання спосабаў вучэбнай дзейнасці ў працэсе навучання гісторыі;
- раскрываць структуру фарміравання асноўных спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці па гадах навучання ў сярэдняй школе.

### *Тэма 4.5. Асаблівасці методыкі рэалізацыі дзейнаснага кампанента ў традыцыйнай і тэхналагічнай мадэлях навучання*

Асноўныя мадэлі арганізацыі навучання гісторыі ў сучаснай школе і крытэрыі іх вылучэння. Асноўны дыдактычныя прынцыпы традыцыйнай, тэхналагічнай і асобасна арыентаванай мадэляў навучання. Асаблівасці рэалізацыі дзейнаснага кампанента зместу гістарычнай адукацыі ў традыцыйнай і тэхналагічнай мадэлях. Рэалізацыя дзейнаснага падыходу да навучання гісторыі ў мадэлі асобасна арыентаванага навучання. Кампетэнтнасны падыход да пабудоввы зместу адукацыі. Выкладчыцкая дзейнасць настаўніка і вучэбная дзейнасць вучняў ў розных мадэлях навучання.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- ведаць і ўлічваць у навучанні гісторыі асноўныя мадэлі арганізацыі вучэбнага працэса;
- улічваць асаблівасці рэалізацыі дзейнаснага кампанента гістарычнай адукацыі як у традыцыйнай, так і тэхналагічнай мадэлі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Раздзел 5. ПРЫЁМЫ І СРОДКІ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ НАСТАЎНІКА І ВУЧНЯЎ У ПРАЦЭСЕ НАВУЧАННЯ ГІСТОРЫІ

### *Тэма 5.1. Агульная характарыстыка сродкаў навучання гісторыі*

Сродкі навучання гісторыі як крыніцы гістарычных ведаў. Іх месца і роля ў навучанні гісторыі. Першакрыніцы гістарычных ведаў. Сапраўдныя рэчы мінулага, помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры, гістарычныя пісьмовыя крыніцы, магчымасці іх выкарыстання ў выкладанні гісторыі. Сродкі, якія ўзнаўляюць гістарычную рэчаіснасць у навукова-апрацаваным выглядзе: вуснае слова настаўніка, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі. Наглядныя сродкі, якія рэканструююць вобразы гістарычных фактаў: ілюстрацыі, вучэбныя карціны, дыяпазітывы, дыяфільмы, кіна- і тэлефільмы, камп'ютэрныя праграмы і г. д. Сродкі навучання, якія ўзнаўляюць гістарычную рэчаіснасць у мастацка-вобразнай форме: мастацкая літаратура эпохі і гістарычная белетрыстыка, творы выяўленчага мастацтва, мастацкія кіна- і тэлефільмы, музычныя творы. Магчымасці і метадычная абгрунтаванасць выкарыстання кожнай з вызначаных груп сродкаў навучання. Крытэрыі выбару сродкаў навучання гісторыі адэкватных мэтам і задачам навучання і ўзроставым і псіхалагічным асаблівасцям школьнікаў.

Комплексны характар выкарыстання сродкаў навучання гісторыі. Кабінет гісторыі ў школе. Задачы і змест работы кабінета гісторыі. Яго роля ў аптымальнай арганізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў. Абсталяванне кабінета. Планаванне яго работы.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- вызначаць і характарызаваць асноўныя групы сродкаў навучання гісторыі;
- ацэньваць і метадычна абгрунтоўваць магчымасці выкарыстання розных груп сродкаў навучання гісторыі ў залежнасці ад мэт навучання, ўзроставых і псіхалагічных асаблівасцей школьнікаў;
- планаваць работу кабінета гісторыі.

### *Тэма 5.2. Праблема метадаў навучання гісторыі*

Розныя пункты гледжання на азначэнне метадаў навучання і іх класіфікацыю ў дыдактыка-метадычнай літаратуры. Дыдактычны і метадычны падыходы да праблемы метадаў навучання, магчымасці іх спалучэння. Суадносіны паняццяў "метад" і "прыём" навучання. Узаемасувязь двух бакоў метадаў навучання: выкладання настаўніка і вучэбнай дзейнасці вучняў. Узаемаабумоўленасць у вучэбна-выхаваўчым працэсе метадычных прыёмаў выкладчыцкай дзейнасці настаўніка і вучэбнай дзейнасці вучняў. Пазнавальная, выхаваўчая і развіваючая роля метадаў і прыёмаў у працэсе навучання гісторыі. Інавацыйныя падыходы да вызначэння метадаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

навучання гісторыі. Паняцце інтэрактыўных метадаў навучання гісторыі, метадычныя ўмовы іх выкарыстання.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- аналізаваць існуючыя пункты гледжання на класіфікацыю метадаў навучання гісторыі;
- выкарыстоўваць традыцыйныя і інавацыйныя падыходы да вызначэння характару ўзаемадзеяння настаўніка і вучняў у працэсе навучання гісторыі.

### *Тэма 5.3. Методыка нагляднага навучання гісторыі*

Роля і месца нагляднасці ў вырашэнні адукацыйна-выхаваўчых задач гісторыі. Класіфікацыя наглядных сродкаў навучання. Прадметная нагляднасць, методыка яе выкарыстання на ўроках. Экскурсіі па гістарычных мясцінах і ў музеі. Методыка іх арганізацыі.

Выяўленчая нагляднасць. Прыёмы работы з творамі жывапісу, партрэтамі, фатаграфіямі, карыкатурамі. Роля педагагічнага малюнка і яго значэнне ў навучанні гісторыі.

Умоўна-графічная нагляднасць, яе месца ў выкладанні гісторыі. Прыёмы выкарыстання ўмоўнай нагляднасці.

Тэхнічныя сродкі навучання ў выкладанні гісторыі. Методыка выкарыстання аўдыёвізуальных сродкаў і камп'ютэрных праграм у выкладанні гісторыі.

Асаблівасці выкарыстання прыёмаў нагляднага навучання ў старэйшых і сярэдніх класах; развіццё самастойнасці пры выкарыстанні нагляднага метаду навучання гісторыі.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- вызначаць асаблівасці методыкі выкарыстання розных відаў нагляднасці;
- валодаць тэхналогіяй правядзення экскурсіі, дэманстрацыі выяўленчай і умоўна-графічнай нагляднасці;
- валодаць асаблівасцямі методыкі выкарыстання нагляднасці ў сярэдніх і старэйшых класах агульнаадукацыйнай школы.

### *Тэма 5.4. Метадычныя прыёмы вуснага навучання гісторыі*

Функцыі вуснага слова ў навучанні гісторыі. Прыёмы вуснага выкладання: расказ, сціслае паведамленне, канспектыўнае, вобразнае, сюжэтнае апавяданне, карціннае і аналітычнае апісанне, характарыстыка, тлумачэнне, разважанне. Іх узаемнае спалучэнне. Школьная лекцыя. Тлумачальна-ілюстрацыйны і праблемны характар вуснага выкладання. Выкарыстанне настаўнікам розных крыніц ведаў пры пераказе матэрыялу. Арганізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў у працэсе вуснага пераказу. Узнаўленчы, пераўтваральны і творча-пошукавы характар пазнавальнай дзейнасці вучняў у працэсе вуснага навучання гісторыі. Віды творча-пошукавых заданняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дыялагічныя формы вуснага слова ў навучанні гісторыі. Роля гутаркі ў навучанні гісторыі, патрабаванні да яе арганізацыі. Віды гутаркі. Дыскусія як форма арганізацыі навучання гісторыі, методыка яе арганізацыі.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- вызначаць і выкарыстоўваць на практыцы асноўныя прыёмы вуснага навучання гісторыі;
- выкарыстоўваць розныя крыніцы ведаў у спалучэнні з вусным аповедам на ўроках гісторыі;
- валодаць прыёмамі арганізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў у працэсе вуснага пераказу;
- валодаць тэхналогіяй выкарыстання дыялагічных форм вуснага слова ў навучанні гісторыі.

### *Тэма 5.5. Методыка работы з друкаванымі крыніцамі ў навучанні гісторыі*

Месца і роля друкаваных крыніц ў навучанні гісторыі. Падручнік гісторыі як крыніца і сродак арганізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў. Суадносіны слова настаўніка і зместу падручніка. Асноўныя структурныя кампаненты падручніка гісторыі. Прыёмы работы з тэкстам падручніка з улікам задач урока і ўзросту школьнікаў. Фарміраванне ўменняў самастойнай работы з тэкстам падручніка.

Роля гістарычных дакументаў у навучанні гісторыі. Віды гістарычных дакументаў. Асаблівасці методыкі іх выкарыстання ў залежнасці ад узросту вучняў. Асноўныя прыёмы выкарыстання гістарычных дакументаў у навучанні гісторыі: цытаванне; каменціраванае чытанне; аналіз гістарычных дакументаў вучнямі; рашэнне праблемна-пазнавальных задач на аснове аналізу дакументаў і г. д. Педагагічнае кіраванне самастойнай работай вучняў у працэсе вывучэння дакументаў. Навучанне школьнікаў асноўным відам запісаў пры вывучэнні першакрыніц: складанне простага і разгорнутага плана, тэзісаў, апорнага канспекта, рэферата.

Віды даведачнай літаратуры па гісторыі і магчымасці яе выкарыстання ў навучальным працэсе. Навучанне вучняў спосабам выкарыстання даведачнага апарата падручнікаў, навуковых кніг, часопісаў, працаваць са слоўнікамі, энцыклапедыямі, бібліяграфічнымі крыніцамі.

Выкарыстанне навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры ў вырашэнні адукацыйна-выхаваўчых і развіваючых задач пры навучанні гісторыі. Методыка работы з мастацкай літаратурай, перыядычнымі выданнямі.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- валодаць методыкай выкарыстання падручніка пры арганізацыі самастойнай работы школьнікаў на ўроках і пры выкананні дамашніх заданняў;
- выкарыстоўваць на практыцы разнастайныя прыёмы работы з гістарычным дакументам;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- валодаць навыкамі арганізацыі работы вучняў з навукова-папулярнай і даведачнай літаратурай;
- выкарыстоўваць прыёмы работы з мастацкай літаратурай у навучанні гісторыі.

## Раздзел 6. ФОРМЫ АРГАНІЗАЦЫІ НАВУЧАННЯ ГІСТОРЫІ

### *Тэма 6.1. Урок гісторыі і падрыхтоўка да яго правядзення*

Урок як асноўная форма арганізацыі працэсу навучання гісторыі. Патрабаванні да сучаснага ўрока: паўнацэннасць гістарычнага зместу ўрока і педагагічнай задумы, улік матывацыі вучэння, гібкасць структуры і методыкі ўрока, самастойная пазнавальная дзейнасць вучняў на ўроку, выніковасць урока.

Тыпы ўрокаў гісторыі. Фактары, якія абумоўліваюць мэтазгоднасць выбару тыпу ўрока. Тыпалогія ўрокаў па іх асноўнай дыдактычнай мэце: урок вывучэння новага матэрыялу; урок праверкі і ўліку ведаў; урок паўтарэння і абагульнення вывучанага; камбінаваны (састаўны) урок. Асаблівасці арганізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў у залежнасці ад дыдактычных задач і абранага тыпу ўрока. Тыпалогія ўрокаў па спосабе іх правядзення ці вядучым метадзе навучання: лекцыя, семінар, практычныя, лабараторныя заняткі, кінаўрок, тэлеўрок, урок-экскурсія і г. д. Структурна-функцыянальны аналіз зместу ўрока як перадумова паспяховага канструявання задач і мадэлі ўрока. Мадэліраванне вынікаў навучання як перадумова аптымальнага вызначэння мэты і задач урока. Канструяванне методыкі правядзення ўрока, састаўленне плана-канспекта. Яго структура і асаблівасці складання. Формы плана-канспекта, яго выкарыстанне на ўроку.

Структурныя элементы ўрока: падрыхтоўка да ўспрымання новага матэрыялу, паведамленне новага гістарычнага зместу, арганізацыя асэнсавання і замацавання, авалодання ўменнямі і навыкамі, прымяненне засвоеных ведаў і ўменняў. Фактары, якія ўплываюць на выбар структуры ўрока. Крытэрыі ацэнкі ўрока.

Спецыфічныя і нетрадыцыйныя формы арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу: вучэбныя экскурсіі, канферэнцыі, ролевыя гульні, дыспуты, дыскусіі, кансультацыі, залікі і г. д. Магчымасці выкарыстання лекцыйна-семінарскай сістэмы, вывучэння гісторыі па праблемна-тэматычным прынцыпе, “скразнымі” тэмамі, модулямі і г. д.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- ведаць і ўлічваць у практычнай дзейнасці сучасныя патрабаванні да ўрока гісторыі;
- ажыццяўляць структурна-функцыянальны аналіз гістарычнага матэрыяла як аснову паспяховага вызначэння мэты і задач урока і стварэння метадычнай мадэлі ўрока;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- аптымальна вызначаць тып і структуру ўрока;
- канструяваць метадычную мадэль і тэхналогію правядзення ўрока, афармляць яе ў выглядзе плана-канспекта ўрока;
- планаваць і рэалізоўваць на практыцы нетрадыцыйныя формы правядзення ўрокаў гісторыі.

### *Тэма 6.2. Сістэма праверкі і ацэнкі вынікаў навучання гісторыі*

Прызначэнне і функцыі сістэматычнай праверкі і ацэнкі ведаў, ўменняў і навыкаў вучняў. Метадычныя ўмовы павышэння эфектыўнасці праверкі ведаў. Праверка засваення вучнямі асноўных фактаў, паняццяў і заканамернасцей гістарычнага працэсу. Паглыбленне, сістэматызацыя і абагульненне гістарычных ведаў, развіццё пазнавальных уменняў у ходзе апытання.

Прыёмы бягучай праверкі і ацэнкі ведаў і ўменняў у малодшых і старэйшых класах. Метады вуснага і пісьмовага кантролю на падагульняючых занятках і занятках семінарска-лабараторнага тыпу, машыннага і безмашыннага праграміраванага кантролю, тэсціравання. Метады самакантролю. Індывідуальныя, групавыя і калектыўныя формы кантролю.

Функцыі і роля ацэнкі ведаў і уменняў вучняў, яе формы і крытэрыі. Методыка выстаўлення адзнакі на ўроку, за чвэрць, паўгоддзе, год.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- вызначаць асноўныя функцыі і прызначэнне праверкі вынікаў навучання гісторыі;
- валодаць тэхналогіяй планавання і методыкай ажыццяўлення праверкі адукацыйна-выхаваўчых і развіваючых вынікаў навучання;
- валодаць крытэрыямі выстаўлення ацэнак і методыкай арганізацыі ўліку ведаў у навучанні гісторыі.

### *Тэма 6.3 Паўтарэнне ў навучанні гісторыі*

Сістэма паўтарэння ў навучанні гісторыі як важнейшая перадумова паглыблення, абагульнення і сістэматызацыі ведаў вучняў. Асноўныя віды паўтарэння. Першапачатковае паўтарэнне вывучанага на ўроку. Спосабы яго арганізацыі. Бягучае паўтарэнне і яго роля ў фарміраванні гістарычных ведаў. Падагульняючае паўтарэнне па выніках вывучэння тэмы, раздзела, гістарычнага курса. Перадэкзаменацыйнае паўтарэнне, методыка яго арганізацыі.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- валодаць методыкай арганізацыі розных відаў паўтарэння ў навучанні гісторыі;
- планаваць і ажыццяўляць на практыцы ўрокі паўтарэння і абагульнення пры навучанні гісторыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### *Тэма 6.4. Выкарыстанне сучасных тэхналогій навучання гісторыі*

Інавацыйныя падыходы да выкладання гісторыі. Іх сутнасць і магчымасці выкарыстання ў сучаснай школе. Паняцце "тэхналогія навучання". Адрозненні тэхналогіі і методыкі навучання. Структура тэхналогіі навучання. Методыка выкарыстання ў навучанні гісторыі сучасных тэхналогій: развіццёвага і праблемнага навучання, поўнага засваення ведаў, модульнага навучання, гульнявых тэхналогій, тэхналогіі праектнай дзейнасці.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- ведаць структуру тэхналогіі і асаблівасці арганізацыі навучання на аснове тэхналогій;
- валодаць методыкай выкарыстання інавацыйных і асобасна арыентаваных тэналогій ў навучанні гісторыі;

### **Тэма 6.5 Методыка выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у навучанні гісторыі**

Месца і роля інфармацыйных тэхналогій у навучанні гісторыі. Магчымасці выкарыстання камп'ютэрнай тэхнікі ў вучэбным працэсе па гісторыі. Метадычныя шляхі выкарыстання мультымедыйных і камп'ютэрных сродкаў навучання пры вывучэнні гісторыі. Асноўныя напрамкі прымянення інфармацыйных тэхналогій у вучэбным працэсе: камп'ютэрныя прэзентацыі новага матэрыялу на ўроку, сродак мультымедыйнага забеспячэння нагляднасці на ўроку, аўтаматызацыя кантрольна-ацэначнай дзейнасці, выкарыстанне выдадзеных на лічбавых носьбітах электронных рэсурсаў і г.д.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- ведаць сутнасць і магчымасці выкарыстання пры вывучэнні гісторыі ў школе інфармацыйных тэхналогій;
- валодаць методыкай выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у навучанні гісторыі ў школе.

## **Раздзел 7. ПАЗАКЛАСНАЯ РАБОТА ПА ГІСТОРЫІ. НАСТАЎНІК ГІСТОРЫІ**

### *Тэма 7.1. Пазакласная работа па гісторыі*

Адукацыйна-выхаваўчае значэнне пазакласнай работы па гісторыі. Яе роля ў фарміраванні ў вучняў устойлівага інтарэсу да гісторыі, развіцці іх пазнавальных здольнасцей, выхаванні асобы. Змест, асноўныя напрамкі і арганізацыйныя формы пазакласнай работы па гісторыі. Класіфікацыя форм работы па ступені масавасці і тэрмінах дзеяння. Пазакласнае чытанне, гістарычныя гурткі, таварыствы, клубы, канферэнцыі, вечары, алімпіяды, экскурсіі, школьныя музеі. Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у пазакласнай рабоце.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- вызначаць адукацыйна-выхаваўчае значэнне пазакласнай работы па гісторыі;
- выкарыстоўваць разнастайныя формы арганізацыі пазакласнай работы па гісторыі ў школе.

### *Тэма 7.2. Настаўнік гісторыі*

Роля настаўніка гісторыі ў выхаванні падрастаючага пакалення. Асаблівасці педагагічнай дзейнасці настаўніка гісторыі, яе змест і структура.

Абавязкі настаўніка гісторыі. Патрабаванні да гістарычных, псіхолага-педагагічных ведаў і ўменняў настаўніка гісторыі, яго асабістых якасцей. Сутнасць педагагічнай творчасці. Умовы творчага росту настаўніка гісторыі. Метады педагагічнага даследавання ў дзейнасці настаўніка гісторыі. Этапы прафесійнага ўдасканалення.

Метадычная работа ў школе, яе формы. Удзел настаўніка ў метадычнай рабоце школы, ў рабоце раённых метадычных аб'яднанняў настаўнікаў. Бесперапынная самаадукацыя як аснова павышэння кваліфікацыі настаўніка гісторыі. Асноўныя напрамкі самаадукацыі, яе планаванне.

***Патрабаванні да кампетэнтнасці:***

- вызначаць асаблівасці педагагічнай дзейнасці настаўніка гісторыі, яе змест і структуру;
- валодаць метадамі педагагічнага даследавання і выкарыстоўваць іх для самаадукацыі і павышэння прафесійнага майстэрства.

## ІНФАРМАЦЫЙНА – МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

### *Асноўная*


1. Концепция учебного предмета “Всемирная история. История Беларуси”: утв. приказом Министерства образования 29.05.2009 г. № 675 // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2009 – № 7.
2. Образовательный стандарт учебного предмета “Всемирная история. История Беларуси”: утв. постановлением Министерства образования 29.05.2009г. № 32 // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2009 – № 7.
3. Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі // Вучэбныя праграмы для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовай навучання. – Мінск: Нац. інстытут адукацыі, 2014. – 128 с.
4. Багдановіч, І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе: вучэб. дапам. / І. І. Багдановіч. – Мінск : БДПУ, 2009. – 286 с.
5. Корзюк, А. А. Вывучэнне гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. у агульнаадукацыйнай школе : вучэб.-метад. Дапаможнік / А. А. Корзюк; пад рэд. докт. гіст. навук, праф. М. М. Забаўскага. – Мінск : БДПУ, 2010. – 152 с.
6. Шоган, В.В. Методика преподавания истории в школе: Новая технология личностно-ориентированного исторического образования;


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

учебное пособие / В.В. Шоган. – Ростов-на-Дону, 2007. – 426 с.
***Дадатковая***
7. Вяземский, Е.Е. Как сегодня преподавать историю в школе : пособие для учителя / Е.Е. Вяземский, О.Ю. Стрелова. – М.: Просвещение, 2000. – 112 с.
8. Гістарычнае краязнаўства Беларусі: вучэбна-метадычны дапаможнік / І.І. Баргдановіч, М.Ф.Бандзелікаў [і інш.]; пад рэд. А.А. Корзюка. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2014. – 220 с.
9. Гора, П.В. Повышение эффективности обучения истории в средней школе / П.В.Гора. – М.: Просвещение, 1988. – 208 с.
10. Запрудский, Н. И. Моделирование и проектирование авторских дидактических систем / Н.И. Запрудский. – Минск: "Сэр-Вит", 2008. – 336 с.
11. Запрудский, Н.И. Современные школьные технологии - 2 / Н.И. Запрудский. – Минск: "Сэр-Вит", 2010. – 256 с.
12. Вяземский, Е. Е., Стрелова, О.Ю. Теория и методика преподавания истории в школе: учебн. для студ. высш. учеб. заведений / Е.Е. Вяземский, О.Ю. Стрелова. – М.: Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 2003. – 384 с.
13. Короткова, М.В., Методика обучения истории в схемах, таблицах, описаниях: практ. пособие для учителей / М.В. Короткова, М.Т. Студеникин. – М.: Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 1999. – 191 с.
14. Гинчук, В.В. Организация учебно-познавательной деятельности учащихся при изучении всемирной истории в 10 класе: метод.пособ. / В.В. Гинчук; под научн. ред. И.И. Богдановича. – Мінск.: БГПУ, 2004. – 56 с.
15. Ежова, С.А. Методика преподавания истории в средней школе / С.А.Ежова и др.: учебн. для студ. историч. фак-тов пед. вузов. – М.: Просвещение, 1986. – 349 с.
16. Карзюк, А.А. Фарміраванне пазнавальнага інтарэсу вучняў пры вывучэнні гісторыі Беларусі XVIII – пач. XXст. у школе / А.А. Карзюк; пад навук. рэд. І.І. Багдановіча. – Мінск.: БДПУ, 2005. – 62с.
17. Лернер, И. Я. Развитие мышления учащихся в процессе обучения истории / И.Я. Лернер. – М.: Просвещение, 1982. – 267с.
18. Лизунова, Е.В. Организация учебно-познавательной деятельности учащихся при изучении истории в 5 классе / Е.В. Лизунова; под ред. И.И. Богдановича. – Мн.: БГПУ, 2007. – 66 с.
19. Мініцкі, М.І., Выкладанне гісторыі старажытнага свету: вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў / М.І. Мініцкі, В.І. Ханкевіч. – Мінск: Рэд.часопіса"Адукацыя і выхаванне", 2000. – 204 с.
20. Ракуць, В. Лекцыйна-семінарская сістэма навучання гісторыі / В.Ракуць // Народная асвета. – 1992. – № 5 - 12.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

21. Паноў, С.В. Вывучэнне ў школе гісторыі першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі / С.В. Паноў. – Мінск.: УПБестпрынт, 2001. – 152 с.
22. Степанищев, А.Т. Методический справочник учителя истории / А.Т. Степанищев. – М.: Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 2000. – 320 с.
23. Студеникин, М.Т. Методика преподавания истории в школе: учебн. для студ. вузов / М.Т.Студеникин. – М.: Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 2003 – 240 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 5.2. ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ
## (З ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЙ КАРТАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ)

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ МАКСІМА ТАНКА”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
ўстановы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны
ўніверсітэт імя Максіма Танка»

________________ У.У. Шлыкаў
“__” _______________ 2015 г.
Рэгістрацыйны № УД-27-05________/р.

**МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ ГІСТОРЫІ**
**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці**

1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны

Факультэт гістарычны

Кафедра ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі

Курс 3

Семестр 5,5

Лекцыі 66 гадзін — Залік 5 семестр

Семінарскія заняткі 40 гадзін — Экзамен 6 семестр

Курсавая работа 7 семестр

Аўдыторных гадзін па вучэбнай дысцыпліне 106

Усяго гадзін па вучэбнай дысцыпліне 144

Форма атрымання вышэйшай адукацыі дзённая, завочная

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Склаў І.І. Багдановіч, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

2015 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове тыпавой вучэбнай праграмы для ўстаноў вышэйшай адукацыі па методыцы выкладання гісторыі (дата зацвярджэння _______________, рэгістрацыйны №_______________).

Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння кафедрай ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі

"8" мая 2015 г., пратакол № _1_

Загадчык кафедры

__________________ А. А. Корзюк

Адобрана і рэкамендавана да зацвярджэння Саветам гістарычнага факультэта ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

"_26 _" мая 2015 г., пратакол № 10

Старшыня

__________________ А.В. Касовіч

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядаюць

Метадыст ВМУ БДПУ

_________________ Г.І. Шкнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Мэта і задачы вывучэння дысцыпліны

**Мэта вывучэння вучэбнай дысцыпліны** “Методыка выкладання гісторыі” – забяспечыць аваладанне будучымі выкладчыкамі тэарэтычнымі асновамі сучаснай методыкі выкладання гісторыі і выпрацоўку ў іх уменняў і навыкаў адбіраць і выкарыстоўваць у практычнай дзейнасці прыёмы, сродкі і тэхналогіі, якія забяспечваюць эфектыўнае навучання гісторыі ў агульнаадукацыйнай школе

**Дадзеная мэта вырашаецца праз рэалізацыю наступных задач:**

1. Засваенне студэнтамі асаблівасцей методыкі выкладання гісторыі як навукі і асноўных этапаў яе станаўлення і развіцця як ў нашай краіне, так і за яе межамі.

2. Знаёмства з нарматыўна-прававым і навукова-метадычным забеспячэннем вучэбнага прадмета “Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі”, мэтамі і задачамі яго вывучэння ў школе, навукова-метадычнымі прынцыпамі адбору зместу гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, структурай вывучэння гісторыі ў V–XI класах агульнаадукацыйнай школы і яе зместам.

3. Аваладанне ведамі аб заканамернасцях працэсу навучання гісторыі, асаблівасцях структуры гістарычных ведаў і ўзаемазвязанай дзейнасці настаўніка і вучняў, якая забяспечвае трывалае засваенне вучнямі гістарычнымі ўяўленнямі, паняццямі, заканамернасцямі грамадскага развіцця і аваладанне дзейнасным кампанентам гістарычнай адукацыі.

4. Знаёмства з методыкай аналізу развіваючага і выхаваўчага патэнцыялу школьных курсаў гісторыі, вызначэнне аптымальных метадычных шляхоў яго рэалізацыі ў працэсе навучання прадмету і аналіза фактаў сучаснага грамадска-палітычнага жыцця.

5. Аваладанне першапачатковымі ўменнямі мадэліравання працэсу навучання гісторыі і канструявання найбольш эфектыўных арганізацыйных форм і тэхналогій навучання, якія забяспечаюць прадуктыўную дзейнасць школьнікаў па аваладанні гістарычнымі ведамі і іх выкарыстанні ў якасці інструмента пазнання фактаў грамадскага жыцця мінулага і сучаснасці.

6. Знаёмства з асаблівасцямі методыкі арганізацыі факультатыўных заняткаў, заняткаў па інтарэсах і пазакласнай работы па гісторыі, іх задачамі, прынцыпамі і асноўнымі формамі арганізацыі, са структурай дзейнасці настаўніка гісторыі, яго творчай лабараторыяй па даследаванні, пошуку і канструяванні найбольш аптымальных шляхоў арганізацыі навучання гісторыі ў школе.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

- тэарэтыка-метадалагічныя асновы методыкі выкладання гісторыі, мэты і задачы навучання гісторыі ў школе;
- адукацыйныя, выхаваўчыя і развіваючыя магчымасці сучаснага зместу школьнай гістарычнай адукацыі і шляхі іх рэалізацыі;
- асноўныя прыёмы, сродкі, формы і тэхналогіі навучання гісторыі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- асаблівасці арганізацыі факультатыўных заняткаў і пазакласнай работы па гісторыі;

**умець:**
- вызначаць аптымальныя мэты і задачы вывучэння асноўных кампанентаў зместу школьнай гістарычнай адукацыі;
- выкарыстоўваць адэкватныя мэтам, зместу і пазнавальным магчымасцям школьнікаў прыёмы і сродкі навучання, разнастайныя формы і тэхналогіі арганізацыі працэса навучання;

**валодаць:**
- асноўнымі прыёмамі, сродкамі, формамі і тэхналогіямі навучання гісторыі;
- метадамі аналізу перадавога педагагічнага вопыту для удасканалення адукацыйнага працэса і асабістага педагагічнага майстэрства.

Асноўнымі метадамі (тэхналогіямі) навучання, якія адэкватна адказваюць праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне, часткова-пошукавы і мэтам вывучэння дадзенай вучэбнай дысцыпліны, з'яўляюцца: даследчыцкі метады); тэхналогія навучання як вучэбнага даследаванне; камунікатыўныя тэхналогіі, якія заснаваны на актыўных формах і метадах навучання.

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны адведзена 191 гадзіна, з іх 10 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 66 гадзін - лекцыі, 40 гадзін - семінары.

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Назвы раздзелаў і тэм | Аўдыторныя гадзіны | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | у тым ліку | |
| | | | Лек-цыі | Практычныя заняткі |
| **1** | **Раздзел 1. Методыка навучання гісторыі як педагагічная навука** | **12** | **10** | **2** |
| 1.1 | Прадмет і задачы методыкі выкладання гісторыі | | | |
| 1.2 | Станаўленне і развіццё школьнай гістарычнай адукацыі і методыкі выкладання гісторыі ў дасавецкі час | 22 | 2 | |
| 1.3 | Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі і методыкі выкладання гісторыі ў СССР | 2 | 2 | 2 |
| 1.4 | Станаўленне нацыянальнай сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі ў Беларусі | 2 | 2 | |
| 1.5 | Сучасны стан і тэндэнцыі развіцця гістарычнай адукацыі ў свеце | 2 | 2 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **2** | **Раздзел 2. Задачы і змест навучання гісторыі ў школе** | **12** | **4** | **8** |
| 2.1 | Мэты, задачы і структура школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь | 4 | 2 | 2 |
| 2.2 | Агульная характарыстыка зместу і асаблівасцей выкладання асобных курсаў гісторыі ў школе | 8 | 2 | 6 |
| **3** | Раздзел 3. Працэс фарміравання гістарычных ведаў | **22** | **14** | **8** |
| 3.1 | Структура гістарычных ведаў школьнікаў, характарыстыка яе асноўных кампанентаў | 2 | 2 | |
| 3.2 | Методыка фарміравання гістарычных уяўленняў | 6 | 4 | 2 |
| 3.3 | Метадычныя прыемы і сродкі фарміравання гістарычных паняццяў | 4 | 2 | 2 |
| 3.4 | Методыка раскрыцця гістарычных заканамернасцей і рэалізацыі міжпрадметных сувязей у навучанні гісторыі | 6 | 4 | 2 |
| 3.5 | Выхаванне школьнікаў у працэсе навучання гісторыі | 4 | 2 | 2 |
| **4** | **Рэалізацыя дзейнаснага падыходу ў працэсе навучання гісторыі** | **14** | **10** | **4** |
| 4.1 | Дзейнасны падыход ў навучанні гісторыі. Паняцце і структура вучэбнай дзейнасці | 2 | 2 | |
| 4.2 | Фарміраванне пазнаваўчага інтарэсу – аснова рэалізацыі дзейнаснага кампанента гістарычнай адукацыі | 2 | 2 | |
| 4.3 | Характарыстыка зместу дзейнаснага кампаненту гістарычнай адукацыі | 2 | 2 | |
| 4.4 | Фарміраванне спосабаў вучэбна-пазнаваўчай дзейнасці | 4 | 2 | 2 |
| 4.5 | Асаблівасці методыкі рэалізацыі дзейнаснага кампанента ў традыцыйнай і тэхналагічнай мадэлях навучання | 4 | 2 | 2 |
| **5** | **Раздзел 5. Прыёмы і сродкі ўзаемадзеяння настаўніка і вучняў ў працэсе навучання гісторыі** | **18** | **12** | **6** |
| 5.1 | Агульная характарыстыка сродкаў навучання гісторыі | 2 | 2 | |
| 5.2 | Праблема метадаў навучання гісторыі | 2 | 2 | |
| 5.3 | Методыка нагляднага навучання гісторыі | 6 | 4 | 2 |
| 5.4 | Метадычныя прыёмы вуснага навучання гісторыі | 4 | 2 | 2 |
| 5.5 | Методыка работы з друкаванымі крыніцамі ў навучанні гісторыі | 4 | 2 | 2 |
| **6** | **Раздзел 6. Формы арганізацыі навучання гісторыі** | **24** | **12** | **12** |
| 6.1 | Урок гісторыі і падрыхтоўка да яго правядзення | 8 | 4 | 4 |
| 6.2 | Сістэма праверкі і ацэнкі вынікаў навучання гісторыі | 6 | 2 | 2 |
| 6.3 | Паўтарэнне ў навучанні гісторыі | 4 | 2 | 2 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 6.4 | Выкарыстанне сучасных тэхналогій навучання гісторыі | 4 | 2 | 2 |
| 6.5 | Методыка выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у навучанні гісторыі | 4 | 2 | 2 |
| **7.** | **Раздзел 7. Пазакласная работа па гісторыі. Настаўнік гісторыі** | **4** | **4** | |
| 7.1 | Пазакласная работа па гісторыі | 3 | 3 | |
| 7.2 | Настаўнік гісторыі | 1 | 1 | |
| | **Усяго па дысцыпліне** | **106** | **66** | **40** |

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Раздзел І. МЕТОДЫКА НАВУЧАННЯ ГІСТОРЫІ ЯК ПЕДАГАГІЧНАЯ НАВУКА

**Тэма 1.1. Прадмет і задачы методыкі выкладання гісторыі**

Методыка выкладання гісторыі як навука і як педагагічная дысцыпліна. Прадмет методыкі выкладання гісторыі. Асноўныя кампаненты працэсу навучання гісторыі. Узаемасувязь паміж імі. Месца методыкі выкладання ў сістэме педагагічных навук. Яе сувязь з іншымі навукамі.

Методыка і тэхналогія навучання. Агульнае і асаблівае. Сувязь методыкі навучання гісторыі з іншымі навукамі. Метады даследавання працэсу навучання гісторыі. Асноўная літаратура.

**Тэма 1.2. Станаўленне і развіццё школьнай гістарычнай адукацыі і методыкі выкладання гісторыі ў дасавецкі час**

Узнікненне і станаўленне школьнай гістарычнай адукацыі на ўсходнеславянскіх землях. Фактары, якія вызначаюць станаўленне методыкі як навукі. Асноўныя напрамкі развіцця гісторыка-метадычнай думкі ў дарэвалюцыйнай Расіі ў XIX ст. Афармленне методыкі выкладання гісторыі ў пачатку ХХ стагоддзя як самастойнай галіны педагагічнай навукі.

**Тэма 1.3. Развіццё школьнай гістарычнай адукацыіі методыкі выкладання гісторыі ў СССР**

Замена гісторыі як вучэбнай дысцыпліны палітграматай і грамадазнаўствам у 20-я гады ХХ стагоддзя. Аднаўленне самастойнага курса гісторыі ў савецкай школе ў 30-я гады. Пастанаўленні ЦК КПСС і савецкага ўрада па пытаннях школьнага выкладання гісторыі 1934, 1959 і 1965 гадоў.

Развіццё метадычных даследаванняў у СССР у 20—30-я гады. Стварэнне сістэмы стабільных падручнікаў па гісторыі ў канцы 40-х гадоў і іх далейшае ўдасканаленне ў 50-я — сярэдзіне 60-х гадоў. Навуковая распрацоўка праблем зместу методыкі выкладання, выхоўваючага і развіваючага навучання гісторыі ў канцы 60-х— пач. 90-х гадоў ХХ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

стагоддзя. Прычыны крызісу ў выкладанні гісторыі другой паловы 80-х – пачатку 90-х гадоў. Пошукі шляхоў яго пераадолення.

**Тэма 1.4. Станаўленне нацыянальнай сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі ў Беларусі**

Вытокі станаўлення гістарычнай адукацыі ў Беларусі. Вывучэнне гісторыі Беларусі ў школе ў 20-я-30-я гады ХХ ст. Стан вывучэння гісторыі БССР і развіццё методыкі яе выкладаня ў 60-я-80-я гады. Станаўленне нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі ў Беларусі. Канцэпцыя школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Стварэнне школьных праграм, вучэбных дапаможнікаў і падручнікаў для школ. Поспехі і недахопы на шляху іх вырашэння.

**Тэма 1.5 Стан сучаснай гістарычнай адукацыі за мяжой.**

Мэты і задачы вывучэння гісторыі ў школе. Асаблівасці паслядоўнасці вывучэння гісторыі і метадалагічных прынцыпаў адбору зместу гістарычнай адукацыі ў розных краінах свету. Сучасны стан развіцця дыдактыкі гісторыі ў розных еўрапейскіх краінах і ЗША. Інавацыйныя тэхналогіі выкладання гісторыі ў школе і іх выкарыстанне ў розных краінах свету.

**Раздзел II. ЗАДАЧЫ І ЗМЕСТ НАВУЧАННЯ ГІСТОРЫІ Ў ШКОЛЕ**

**Тэма 2.1. Мэты, задачы і структура гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь**

Комплексны характар мэт навучання гісторыі: фарміраванне ў вучняў трывалых і глыбокіх ведаў аб развіцці грамадства і творчага мыслення; развіццё пазнавальнай самастойнасці пры вывучэнні гісторыі; выхаванне высокамаральнага чалавека-грамадзяніна, патрыёта сваёй Бацькаўшчыны.

Уплыў мэт навучання на змест і структуру гістарычнай адукацыі, на складанне школьных праграм і арганізацыю навучання. Мэты навучання і задачы вывучэння асобных раздзелаў і тэм. Таксанамія мэт навучання гісторыі. Узаемасувязь мэтанакіраванасці і выніковасці ў навучанні гісторыі.

Гісторыя як прадмет школьнага навучання. Яе месца ў вучэбным плане базавай і сярэдняй агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы. Сучасная структура школьнай гістарычнай адукацыі.Канцэпцыя вучэбнага прадмета “Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі”, Дзяржаўны стандарт гістарычнай адукацыі і праграмы па гісторыі. Навуковыя асновы, метадалагічныя і агульнадыдактычныя прынцыпы пабудовы гістарычнай адукацыі. Метадычныя прынцыпы структуры школьнай гістарычнай адукацыі. Асноўныя кампаненты і структура дзеючых школьных праграм па гісторыі.

Планаванне навучання гісторыі ў школе. Тэхналогія складання тэматычнага і каляндарна-тэматычнага плана. Вучэбны – метадычны комплекс па гісторыі, яго склад і змест.

**Тэма 2.2. Агульная характарыстыка зместу і асаблівасцей выкладання асобных курсаў гісторыі ў школе**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пабудова і задачы вывучэння “Гісторыі старажытнага свету”. Склад вучэбна-метадычнага комплексу па гісторыі старажытнага свету і яго характарыстыка. Фарміраванне спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці. Месца абагульняючых урокаў у фарміраванні агульных паняццяў. Асаблівасці методыкі выкладання гісторыі старажытнага свету. Пабудова і задачы вывучэння “Гісторыі сярэдніх вякоў”. Склад вучэбна-метадычнага комплексу па гісторыі сярэдніх вякоў і яго характарыстыка. Структура, храналагічныя рамкі і перыядызацыя курса. Асноўныя паняцці і вядучыя ідэі курса гісторыі сярэдніх вякоў, асаблівасці методыкі іх фарміравання ў 6-7 класах агульнаадукацыйнай школы. Асноўныя спосабы вучэбна-пазнавальнай дзейнасці і магчымасці іх фарміравання ў курсе гісторыі сярэдніх вякоў.

Пабудова і задачы вывучэння “Сусветнай гісторыі новага часу”. Склад вучэбна-метадычнага комплексу па гісторыі новага часу і яго характарыстыка. Храналагічныя рамкі, перыядызацыя і структура курса. Вядучыя паняцці і ідэі. Раскрыццё ў змесце курса заканамернасцей сусветнай гісторыі ў новы час. Магчымасці курса для фарміравання асноўных спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці. Пабудова і задачы вывучэння “Сусветная гісторыі навейшага часу”. Склад вучэбна-метадычнага комплексу па гісторыі навейшага часу і яго характарыстыка. Храналагічныя рамкі і перыядызацыя курса. Структура і адукацыйна-выхаваўчыя задачы вывучэння гісторыі навейшага часу. Асноўныя праблемы і ідэі курса, іх абагульняючы і тэарэтычны характар. Асаблівасці выкарыстання актыўных і інтэрактыўных форм і метадаў арганізацыі працэсу навучання навейшай гісторыі. Міжпрадметныя і ўнутрыпрадметныя сувязі пры вывучэнні гісторыі навейшага часу.

Пабудова і задачы вывучэння “Гісторыі Беларусі” ў 6-11 класах сярэдняй агульнаадукацыйнай школы. Храналагічныя рамкі і перыядызацыя курса. Структура яго пабудовы па гадах навучання. Асноўныя ідэі і заканамернасці курса гісторыі Беларусі. Разгляд айчыннай гісторыі ў кантэксце еўрапейскай і сусветнай гісторыі. Сістэма гістарычных фактаў, глыбіня іх раскрыцця ў залежнасці ад ступені навучання і ўзросту школьнікаў. Асноўныя паняцці і вядучыя ідэі. Суадносіны тэарэтычнага і фактычнага матэрыялу ў курсе айчыннай гісторыі, іх абумоўленасць ступенню навучання і ўзростам школьнікаў. Міжпрадметныя і ўнутрыпрадметныя сувязі ў навучанні гісторыі Беларусі.

Развіццё ўменняў вучняў выяўляць асноўныя заканамернасці айчыннай гісторыі, параўноўваць падзеі і факты з гісторыі Беларусі з фактамі сусветнай гісторыі, разглядаць і аналізаваць іх у кантэксце еўрапейскай і сусветнай гісторыі.

## РАЗДЗЕЛ ІІІ. ПРАЦЭС ФАРМІРАВАННЯ ГІСТАРЫЧНЫХ ВЕДАЎ

### Тэма 3.1. Структура гістарычных ведаў школьнікаў, характарыстыка яе асноўных кампанентаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Роля гістарычных ведаў у фарміраванні светапогляду вучняў і ажыццяўленні адукацыйна-выхаваўчых і развіваючых задач навучання гісторыі. Структура і функцыі гістарычных ведаў. Роля фактаў у навучанні гісторыі. Віды гістарычных фактаў. Узаемасувязь падзей і з'яў у гісторыі. Суадносіны канкрэтных фактаў і абагульненняў у працэсе навучання гісторыі. Асноўныя кампаненты вучэбнага гістарычнага матэрыялу. Дзейнасны кампанент зместу гістарычнай адукацыі, яго роля ў рэалізацыі развіццевых магчымасцей школьных курсаў гісторыі.

**Тэма 3.2. Методыка фарміравання гістарычных уяўленняў**

Віды гістарычных уяўленняў. Іх месца ў працэсе фарміравання гістарычных ведаў. Раскрыццё метадычных шляхоў фарміравання гістарычных уяўленняў у метадычнай літаратуры. Шляхі і сродкі фарміравання ўяўленняў аб фактах мінулага. Роля нагляднасці ў фарміраванні ўяўленняў аб гістарычным мінулым. Вобразы памяці і фантазіі ў фарміраванні гістарычных ўяўленняў. Методыка фарміравання ўяўленняў аб гістарычным часе і прасторы. Храналогія на ўроку гісторыі. Методыка работы з гістарычнай картай.

**Тэма 3.3. Метадычныя прыёмы і сродкі фарміравання гістарычных паняццяў**

Гістарычныя паняцці – найважнейшы кампанент у структуры гістарычных ведаў. Распрацоўка пытанняў методыкі фарміравання гістарычных паняццяў у метадычнай літаратуры. Класіфікацыя гістарычных паняццяў: па ступені абагульнення гістарычных з'яў, і па асаблівасцях зместу. Псіхалагічныя асаблівасці засваення школьнікамі гістарычных паняццяў. Лагічныя шляхі фарміравання паняццяў. Метадычныя ўмовы павышэння эфектыўнасці фарміравання гістарычных паняццяў. Роля ўяўленняў, тэрмінаў і азначэнняў у рабоце па фарміраванні паняццяў. Развіццё і абагачэнне паняццяў у працэсе навучання. Выпрацоўка ўменняў аперыраваць гістарычнымі паняццямі.

**Тэма 3.4. Методыка раскрыцця гістарычных заканамернасцей і рэалізацыі міжпрадметных сувязей ў навучанні гісторыі**

Аб'ектыўныя гістарычныя сувязі і заканамернасці грамадскага развіцця – найважнейшы кампанент школьнай гістарычнай адукацыі. Віды гістарычных сувязей: лакальныя, часавыя, прычынна-выніковыя. Паняцце аб заканамернасцях у гістарычным развіцці. Метадычная навука аб месцы, часе, ступені і глыбіні раскрыцця заканамернасцей у школьных курсах гісторыі. Методыка падвядзення вучняў да засваення гістарычных заканамернасцей з улікам узросту школьнікаў.

Роля міжпрадметных і ўнутрыкурсавых сувязей ў навучанні гісторыі ў засваенні светапоглядных ідэй. Змест міжпрадметных сувязей з іншымі дысцыплінамі: па вывучаемых фактах, паняццях, ідэях, агульнавучэбных спосабах вучэбна-пазнавальнай дзейнасці. Асноўныя напрамкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ажыццяўлення міжпрадметных сувязей: рэтраспектыўныя, супадаючыя, перспектыўныя. Метадычныя прыёмы і сродкі ажыццяўлення міжпрадметных і ўнутрыкурсавых сувязей. Залежнасць выкарыстання прыёмаў і сродкаў ажыццяўлення міжпрадметных сувязей ад падрыхтаванасці класа, задач іх усталявання і зместу.

### Тэма 3.5. Выхаванне школьнікаў у працэсе навучання гісторыі

Магчымасці школьных курсаў гісторыі для маральнага, патрыятычнага, інтэрнацыянальнага, экалагічнага і эстэтычнага выхавання школьнікаў. Спецыфіка праяўлення метадаў выхавання ў навучанні гісторыі. Метадычныя шляхі рэалізацыі выхаваўчых задач курсаў гісторыі ў працэсе навучання. Адбор вучэбнага матэрыялу і сродкаў навучання з улікам іх выхаваўчых магчымасцей. Сувязь выкладання гісторыі з жыццём, сучаснасцю як умова рэалізацыі выхаваўчых задач. Выхаванне інтарэсу да вывучэння гісторыі. Фарміраванне гуманістычнага светапогляду школьнікаў.

## РАЗДЗЕЛ 4. РЭАЛІЗАЦЫЯ ДЗЕЙНАСНАГА ПАДЫХОДУ Ў ПРАЦЭСЕ НАВУЧАННЯ ГІСТОРЫІ

### Тэма 4.1. Дзейнасны падыход у навучанні гісторыі. Паняцце і структура вучэбнай дзейнасці

Дзейнасны падыход у навучанні гісторыі. Паняцце і структура вучэбнай дзейнасці школьнікаў. Ідэі асобасна-дзейнаснага падыходу ў працах Л.С. Выгоцкага, С.Л. Рубінштэйна, А.М.Лявонцьева. Асноўныя палажэнні тэорыі вучэбнай дзейнасці Д.Б. Эльконіна і У.В. Давыдава. Укараненне дасягненнў сучаснай педагагічнай псіхалогіі і дыдактыкі ў працэс даследавання працэсу навучання гісторыі і ў школьную практыку.

### Тэма 4.2. Фарміраванне пазнаваўчага інтарэсу – аснова рэалізацыі дзейнаснага кампанента гістарычнай адукацыі

Сутнасць пазнаваўчага інтарэсу і яго характэрныя рысы. Характарыстыка інтарэса ў філасофіі, псіхалогіі і педагогіцы. Класіфікацыя інтарэсаў. Пазнаваўчы інтарэс як аснова матывацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў, яго адметныя рысы. Дынаміка развіцця пазнаваўчага інтарэсу да вывучэння гісторыі. Устойлівы пазнаваўчы інтарэс. Змест гістарычнай адукацыі як крыніца фарміравання ўстойлівага пазнаваўчага інтарэсу. Паказчыкі наяўнасці пазнаваўчага інтарэсу і яго сфарміраванасці ў вучняў. Магчымасці прадмета “Сусветная гісторыя .Гісторыя Беларусі” ў 5-11класах для фарміравання ўстойлівага пазнаваўчага інтарэсу ў школьнікаў.

Актыўная вучэбна-пазнавальная дзейнасць і ўзаемадзеянне суб’ектаў адукацыйнага працэсу як крыніцы фарміравання ўстойлівага пазнаваўчага інтарэсу. Метадычныя прыемы і ўмовы фарміравання ўстойлівага пазнаваўчага інтарэсу вучняў 5-11 класаў да вывучэння гісторыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Тэма 4.3. Характарыстыка зместу дзейнаснага кампанента гістарычнай адукацыі**

Дзейнасны кампанент гістарычнай адукацыі: уменні, навыкі, спосабы вучэбна-пазнавальнай дзейнасці. Змест дзейнаснага кампаненту гістарычнай адукацыі ў 5-11 класах. Патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі вучняў ў адпаведнасці з Адукацыйным стандартам прадмета “Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі”

Характарыстыка спецыяльных спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, неабходных для вывучэння гісторыі: лакалізаваць гістарычныя падзеі ў прасторы і часе, суадносіць працэсы з перыядам; працаваць з рознымі крыніцамі гістарычных ведаў; тлумачыць гістарычныя факты на аснове ўсебаковага вывучэння крыніц і прымянення тэарэтычных ведаў; выяўляць сутнасць гістарычных з’яў і даваць ім ацэнку; асвятляць гістарычны матэрыял па скразных пытаннях курса; канспектаваць, тэзаваць і рэферыраваць гістарычныя крыніцы і г.д.

**Тэма 4.4. Фарміраванне спосабаў вучэбна-пазнаваўчай дзейнасці**

Дыягностыка ўзроўню сфарміраванасці спосабаў дзейнасці, інтэлектуальных і практычных уменняў і навыкаў, неабходных для пазнання гісторыі. Методыка фарміравання спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці ў працэсе навучання гісторыі ў школе. Метадычныя ўмовы павышэння эфектыўнасці іх фарміравання. Узаемасувязь авалодання спецыяльнымі гістарычнымі ўменнямі і развіццём пазнавальнай самастойнасці і актыўнасці вучняў. Асноўныя этапы работы па фарміраванні ўменняў і спосабаў вучэбнай дзейнасці. Метадычныя ўмовы рэалізацыі дзейнаснага кампанента гістарычнай адукацыі.

**Тэма 4.5. Асаблівасці методыкі рэалізацыі дзейнаснага кампанента ў традыцыйнай і тэхналагічнай мадэлях навучання**

Асноўныя мадэлі арганізацыі навучання гісторыі ў сучаснай школе і крытэрыі іх вывучэння. Асноўны дыдактычныя прынцыпы традыцыйнай, тэхналагічнай і асобасна арыентаванай мадэляў навучання. Асаблівасці рэалізацыі дзейнаснага кампанента зместу гістарычнай адукацыі ў традыцыйнай і тэхналагічнай мадэлях. Рэалізацыя дзейнаснага падыходу да навучання гісторыі ў мадэлі асобасна арыентаванага навучання. Кампетэнтнасны падыход да пабудоввы зместу адукацыі. Выкладчыцкая дзейнасць настаўніка і вучэбная дзейнасць вучняў ў розных мадэлях навучання.

## РАЗДЗЕЛ 5. ПРЫЁМЫ І СРОДКІ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ НАСТАЎНІКА І ВУЧНЯЎ У ПРАЦЭСЕ НАВУЧАННЯ ГІСТОРЫІ

**Тэма 5.1. Агульная характарыстыка сродкаў навучання гісторыі**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сродкі навучання гісторыі як крыніцы гістарычных ведаў. Іх месца і роля ў навучанні гісторыі. Першакрыніцы гістарычных ведаў. Сродкі, якія ўзнаўляюць гістарычную рэчаіснасць у навукова-апрацаваным выглядзе. Сродкі навучання, якія ўзнаўляюць гістарычную рэчаіснасць у мастацка-вобразнай форме. Крытэрыі выбару сродкаў навучання гісторыі адэкватных мэтам і задачам навучання і ўзроставым і псіхалагічным асаблівасцям школьнікаў. Комплексны характар выкарыстання сродкаў навучання гісторыі. Кабінет гісторыі ў школе. Задачы і змест работы кабінета гісторыі. Яго роля ў аптымальнай арганізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў. Абсталяванне кабінета. Планаванне яго работы.

**Тэма 5.2. Праблема метадаў навучання гісторыі**

Розныя пункты гледжання на азначэнне метадаў навучання і іх класіфікацыю ў дыдактыка-метадычнай літаратуры. Дыдактычны і метадычны падыходы да праблемы метадаў навучання, магчымасці іх спалучэння. Суадносіны паняццяў “метад” і “прыём” навучання. Узаемасувязь двух бакоў метадаў навучання: выкладання настаўніка і вучэбнай дзейнасці вучняў. Узаемаабумоўленасць у вучэбна-выхаваўчым працэсе метадычных прыёмаў выкладчыцкай дзейнасці настаўніка і вучэбнай дзейнасці вучняў. Пазнавальная, выхаваўчая і развіваючая роля метадаў і прыёмаў у працэсе навучання гісторыі. Інавацыйныя падыходы да вызначэння метадаў навучання гісторыі. Паняцце інтэрактыўных метадаў навучання гісторыі, метадычныя ўмовы іх выкарыстання.

**Тэма 5.3. Методыка нагляднага навучання гісторыі**

Роля і месца нагляднасці ў вырашэнні адукацыйна-выхаваўчых задач гісторыі. Класіфікацыя наглядных сродкаў навучання. Прадметная нагляднасць, методыка яе выкарыстання на ўроках. Экскурсіі па гістарычных мясцінах і ў музеі. Методыка іх арганізацыі. Выяўленчая нагляднасць. Прыёмы работы з творамі жывапісу, партрэтамі, фатаграфіямі, карыкатурамі. Роля педагагічнага малюнка і яго значэнне ў навучанні гісторыі. Умоўна-графічная нагляднасць, яе месца ў выкладанні гісторыі. Прыёмы выкарыстання ўмоўнай нагляднасці.

Тэхнічныя сродкі навучання ў выкладанні гісторыі. Методыка выкарыстання аўдыёвізуальных сродкаў і камп’ютэрных праграм у выкладанні гісторыі.Асаблівасці выкарыстання прыёмаў нагляднага навучання ў старэйшых і сярэдніх класах; развіццё самастойнасці пры выкарыстанні нагляднага метаду навучання гісторыі.

**Тэма 5.4. Метадычныя прыёмы вуснага навучання гісторыі**

Функцыі вуснага слова ў навучанні гісторыі. Прыёмы вуснага выкладання. Іх узаемнае спалучэнне. Школьная лекцыя. Тлумачальна-ілюстрацыйны і праблемны характар вуснага выкладання. Выкарыстанне настаўнікам розных крыніц ведаў пры пераказе матэрыялу. Арганізацыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пазнавальнай дзейнасці вучняў у працэсе вуснага пераказу. Узнаўленчы, пераўтваральны і творча-пошукавы характар пазнаваўчай дзейнасці вучняў ў працэсе вуснага навучання гісторыі. Віды творча-пошукавых заданняў.

Дыялагічныя формы вуснага слова ў навучанні гісторыі. Роля гутаркі ў навучанні гісторыі, патрабаванні да яе арганізацыі. Віды гутаркі. Дыскусія як форма арганізацыі навучання гісторыі, методыка яе арганізацыі.

**Тэма 5.5. Методыка работы з друкаванымі крыніцамі ў навучанні гісторыі**

Месца і роля друкаваных крыніц ў навучанні гісторыі. Падручнік гісторыі як крыніца і сродак арганізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў. Суадносіны слова настаўніка і зместу падручніка. Асноўныя структурныя кампаненты падручніка гісторыі. Прыёмы работы з тэкстам падручніка з улікам задач урока і ўзросту школьнікаў. Фарміраванне уменняў самастойнай работы з тэкстам падручніка.

Роля гістарычных дакументаў у навучанні гісторыі. Віды гістарычных дакументаў. Асаблівасці методыкі іх выкарыстання у залежнасці ад узросту вучняў. Асноўныя прыёмы выкарыстання гістарычных дакументаў у навучанні гісторыі. Педагагічнае кіраванне самастойнай работай вучняў у працэсе вывучэння дакументаў. Навучанне школьнікаў асноўным відам запісаў пры вывучэнні першакрыніц. Віды даведачнай літаратуры па гісторыі і магчымасці яе выкарыстання ў навучальным працэсе.

Выкарыстанне навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры ў вырашэнні адукацыйна-выхаваўчых і развіваючых задач пры навучанні гісторыі. Методыка работы з мастацкай літаратурай, перыядычнымі выданямі.

**РАЗДЗЕЛ 6. ФОРМЫ АРГАНІЗАЦЫІ НАВУЧАННЯ ГІСТОРЫІ**

**Тэма 6.1. Урок гісторыі і падрыхтоўка да яго правядзення**

Урок як асноўная форма арганізацыі працэсу навучання гісторыі. Патрабаванні да сучаснага ўрока. Тыпы ўрокаў гісторыі. Фактары, якія абумоўліваюць мэтазгоднасць выбару тыпу ўрока. Тыпалогія ўрокаў па іх асноўнай дыдактычнай мэце. Асаблівасці арганізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў у залежнасці ад дыдактычных задач і абранага тыпу ўрока. Тыпалогія ўрокаў па спосабе іх правядзення ці вядучым метадзе навучання.

Структурна-функцыянальны аналіз зместу ўрока як перадумова паспяховага канструявання задач і мадэлі ўрока. Мадэліраванне вынікаў навучання як перадумова аптымальнага вызначэння мэты і задач урока. Канструяванне методыкі правядзення ўрока, састаўленне плана-канспекта. Яго структура і асаблівасці складання. Формы плана-канспекта, яго выкарыстанне на ўроку. Фактары, якія ўплываюць на выбар структуры ўрока. Крытэрыі ацэнкі ўрока.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Спецыфічныя і нетрадыцыйныя формы арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу: вучэбныя экскурсіі, канферэнцыі, ролевыя гульні, дыспуты, дыскусіі, кансультацыі, залікі і г. д.

**Тэма 6.2. Сістэма праверкі і ацэнкі вынікаў навучання гісторыі**

Прызначэнне і функцыі сістэматычнай праверкі і ацэнкі ведаў, ўменняў і навыкаў вучняў. Метадычныя ўмовы павышэння эфектыўнасці праверкі ведаў. Праверка засваення вучнямі асноўных фактаў, паняццяў і заканамернасцей гістарычнага працэсу. Паглыбленне, сістэматызацыя і абагульненне гістарычных ведаў, развіццё пазнавальных уменняў у ходзе апытання.

Прыёмы бягучай праверкі і ацэнкі ведаў і ўменняў у малодшых і старэйшых класах. Метады вуснага і пісьмовага кантролю на падагульняючых занятках і занятках семінарска-лабараторнага тыпу, машыннага і безмашыннага праграміраванага кантролю, тэсціравання. Метады самакантролю. Індывідуальныя, групавыя і калектыўныя формы кантролю.

Функцыі і роля ацэнкі ведаў і ўменняў вучняў, яе формы і крытэрыі. Методыка выстаўлення адзнакі на ўроку, за чвэрць, паўгоддзе, год.

**Тэма 6.3 Паўтарэнне ў навучанні гісторыі**

Сістэма паўтарэння ў навучанні гісторыі як важнейшая перадумова паглыблення, абагульнення і сістэматызацыі ведаў вучняў. Асноўныя віды паўтарэння. Першапачатковае паўтарэнне вывучанага на ўроку. Спосабы яго арганізацыі. Бягучае паўтарэнне і яго роля ў фарміраванні гістарычных ведаў. Падагульняючае паўтарэнне па выніках вывучэння тэмы, раздзела, гістарычнага курса. Перадэкзаменацыйнае паўтарэнне, методыка яго арганізацыі.

**Тэма 6.4. Выкарыстанне сучасных тэхналогій навучання гісторыі**

Інавацыйныя падыходы да выкладання гісторыі. Іх сутнасць і магчымасці выкарыстання ў сучаснай школе. Паняцце “тэхналогія навучання”. Адрозненні тэхналогіі і методыкі навучання. Структура тэхналогіі навучання. Методыка выкарыстання ў навучанні гісторыі сучасных тэхналогій: развіццёвага і праблемнага навучання, поўнага засваення ведаў, модульнага навучання, гульнявых тэхналогій, тэхналогіі праектнай дзейнасці.

**Тэма 6.5. Методыка выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у навучанні гісторыі**

Месца і роля інфармацыйных тэхналогій у навучанні гісторыі. Магчымасці выкарыстання камп’ютэрнай тэхнікі ў вучэбным працэсе па гісторыі. Метадычныя шляхі выкарыстання мультымедыйных і камп’ютэрных сродкаў навучання пры вывучэнні гісторыі. Асноўныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

напрамкі прымянення інфармацыйных тэхналогій у вучэбным працэсе: камп'ютэрныя прэзентацыі новага матэрыялу на ўроку, сродак мультымедыйнага забеспячэння нагляднасці на ўроку, аўтаматызацыя кантрольна-ацэначнай дзейнасці, выкарыстанне выдадзеных на лічбавых носьбітах электронных рэсурсаў і г.д.

### РАЗДЗЕЛ 7. ПАЗАКЛАСНАЯ РАБОТА ПА ГІСТОРЫІ. НАСТАЎНІК ГІСТОРЫІ

### Тэма 7.1. Пазакласная работа па гісторыі

Адукацыйна-выхаваўчае значэнне пазакласнай работы па гісторыі. Яе роля ў фарміраванні ў вучняў устойлівага інтарэсу да гісторыі, развіцці іх пазнавальных здольнасцей, выхаванні асобы. Змест, асноўныя напрамкі і арганізацыйныя формы пазакласнай работы па гісторыі. Класіфікацыя форм работы па ступені масавасці і тэрмінах дзеяння. Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у пазакласнай рабоце.

### Тэма 7.2. Настаўнік гісторыі

Роля настаўніка гісторыі ў выхаванні падрастаючага пакалення. Асаблівасці педагагічнай дзейнасці настаўніка гісторыі, яе змест і структура. Абавязкі настаўніка гісторыі. Сутнасць педагагічнай творчасці. Умовы творчага росту настаўніка гісторыі. Метады педагагічнага даследавання ў дзейнасці настаўніка гісторыі. Этапы прафесійнага ўдасканалення.

Метадычная работа ў школе, яе формы. Бесперапынная самаадукацыя як аснова павышэння кваліфікацыі настаўніка гісторыі. Асноўныя напрамкі самаадукацыі, яе планаванне.

## ІНФАРМАЦЫЙНА – МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## АСНОЎНАЯ ЛІТАРАТУРА


1. Концепция учебного предмета “Всемирная история. История Беларуси”: утв. приказом М-ва образования 29.05.2009 г. № 675 // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2009- № 7.
2. Образовательный стандарт учебного предмета “Всемирная история. История Беларуси”: утв. постановлением М-ва образования 29.05.2009г. № 32 // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2009- № 7.
3. Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі // Вучэбныя праграмы для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовай навучання. – Мінск: Нац. інстытут адукацыі, 2014. – 128 с.
4. Баграновіч, І. І. Методыка выкладання гісторыі ў школе: вучэб. дапам. / І. І. Багдановіч. – Мінск : БДПУ, 2009. – 286 с.
5. Корзюк, А. А. Вывучэнне гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. у агульнаадукацыйнай школе : вучэб.-метад. Дапаможнік / А. А. Корзюк; пад рэд. докт. гіст. навук, праф. М. М. Забаўскага. – Мінск : БДПУ, 2010. – 152 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6. Шоган В.В. Методика преподавания истории в школе: Новая технология личностно-ориентированного исторического образования; учебное пособие/В.В. Шоган. – Ростов-на-Дону, 2007. – 426с.

## ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА

7. Вяземский, Е. Е., Теория и методика преподавания истории в школе: учебн. для студ. высш. учеб. заведений / Е.Е. Вяземский, О.Ю. Стрелова. – М.: Гуман. изд. центр ВЛАДОС, 2003. – 384 с.
8. Гістарычнае краязнаўства Беларусі: вучэбна-метадычны дапаможнік/ І.І. Багдановіч,М.Ф.Бандзелікаў[і інш.];пад рэд.А.А. Корзюка. – Гродна, ЮрСаПрынт, 2014. – 220с.
9. Гора, П.В. Повышение эффективности обучения истории в средней школе / П.В.Гора. – М.:Просвещение,2010. – 208 с.
10. Запрудский, Н. И. Моделирование и проектирование авторских дидактических систем / Н.И. Запрудский. – Минск: "Сэр-Вит",2008. – 336с.
11. Запрудский, Н. И. Современные школьные технологии-2 / Н.И. Запрудский. – Минск: "Сэр-Вит", 2010. – 256 с.
12. Гинчук, В.В. Организация учебно-познавательной деятельности учащихся при изучении всемирной истории в 10 класе: метод.пособ./В.В. Гинчук; под научн.ред. И.И. Богдановича. – Мн.: БГПУ, 2004. – 56 с.
13. Карзюк, А.А. Фарміраванне пазнавальнага інтарэсу вучняў пры вывучэнні гісторыі Беларусі XVIII – пач. XXст. у школе / А.А. Карзюк; пад навук.рэд. І.І. Багдановіча. – Мн.:БДПУ, 2005. – 62 с
14. Короткова, М. В., Методика обучения истории в схемах, таблицах, описаниях: практ. пособие для учителей / М.В. Короткова, М.Т. Студеникин. М.: Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 1999. – 191 с.
15. Лизунова, Е.В. Организация учебно-познавательной деятельности учащихся при изучении истории в 5 классе / Е.В. Лизунова; под ред. И.И. Богдановича. Мн.: БГПУ, 2007. – 66 с.
16. Линденберг К. Обучение истории / К. Линденберг; перевод с нем. – М.: Парсифаль. Русское слово, 2007. – 192с.
17. Мініцкі, М.І., Выкладанне гісторыі старажытнага свету: вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаўМ.І. Мініцкій, В.І. Ханкевіч – Мінск: Рэд.часопіса"Адукацыя і выхаванне", 2000. – 204 с.
18. Студеникин, М.Т. Методика преподавания истории в школе: учебн. для студ. вузов / М.Т.Студеникин. – М.: Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 2003 – 240 с.
19. Паноў, С.В. Вывучэнне ў школе гісторыі першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі / С.В. Паноў. – Мн.: УПБестпрынт, 2001. – 152с.
20. Степанищев, А.Т. Методический справочник учителя истории / А.Т. Степанищев. – М.: Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 2000. – 320 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ

1. Асноўныя этапы развіцця методыкі  выкладання гісторыі ў СССР
2.Нарматыўна-метадычнае забеспячэнне выкладання прадмета ”Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі”.
3. Характарыстыка вучэбна-метадычнага комплекса вывучэння гісторыі старажытнапга свету і сярэдніх вякоў
4 Характарыстыка вучэбна-метадычнага комплекса вывучэння сусветнай гісторыі новага і навейшага часу.
5 Характарыстыка вучэбна-метадычнага комплекса вывучэння гісторыі Беларусі ў 6-11 класах
6. Шляхі і сродкі фарміравання гістарычных уяўленняў
7. Методыка фарміравання ўяўленняў аб гістарычным часе і прасторы.
8 Шляхі фарміравання гістарычных паняццяў
9. Метадычныя прыемы фарміравання гістарычных заканамернасцей
10. Метадычныя шляхі рэалізацыі дзейнаснага кампанента гістарычнай адукацыі
11. Методыка фарміравання спосабаў вучэбна-пазнаваўчай дзейнасці
12 Метадычныя прыемы выкарыстання нагляднасці у навучанні гісторыі
13. Прыемы вуснага навучання гісторыі
14. Метадычныя прыемы работы з друкаванымі крыніцамі па гісторыі.
15. Мадэліраванне мэты і задач ўрока гісторыі
16. Канструяванне структуры і падрыхтоўка палана-канспекта ўрока гісторыі
17. Прыёмы праверкі і ацэнкі ведаў па гісторыі
18. Методыка арганізацыі паўтарэння ў навучанні гісторыі.
19. Методыка выкарыстання ў навучанні гісторыі сучасных тэхналогій
20. Асноўныя напрамкі прымянення інфармацыйных тэхналогій у вучэбным працэсе

## ПЕРАЛІК ВЫКАРЫСТОЎВАЕМЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Ацэнка вучэбных дасягненняў студэнта на экзамене і пры абароне курсавой работы ажыцяўляецца па дзесяцібальнай шкале.

Ацэнка прамежкавых вучэбных дасягненняў студэнтаў ажыцяўляецца ў адпаведнасці з абранай кафедрай десяцібальнай шкалой адзнак.

Для ацэнкі дасягненняў студэнтаў выкарыстоўваецца наступны дыягнастычны інструментарый:

- выступленне студэнта на канферэнцыі па падрыхтаванаму рэфэрату;
- правядзенне бягучых кантрольных апытанняў па асобных тэмах;
- абарона на семінарах выкананых індывідуальных заданняў;
- абарона выкананых у рамках самастойнай работы індывідуальных заданняў;
- абарона курсавой работы;
- здача экзамена па вучэбнай дысцыпліне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ПАТРАБАВАННІ ДА КУРСАВОЙ РАБОТЫ

Структура курсавой работы павінна спрыяць раскрыццю выбранай тэмы і яе састаўных элементаў. Усе часткі курсавой работы павінны быць узаемазвязаны і выкладзены ў строгай лагічнай паслядоўнасці.

Структурнымі элементамі курсавой работы з'яўляюцца: тытульны ліст; змест; уводзіны; асноўная частка; заключэнне; спіс выкарыстанай літаратуры; дадаткі.

Змест ўключае ў сябе назвы глаў і раздзелаў з указаннем нумароў старонак, на якіх пачынаюцца матэрыялы адпаведных частак курсавой работы.

Ва ўводзінах абгрунтоўваецца выбар тэмы, актуальнасць і ступень яе распрацаванасці, фармулююцца мэта і задачы даследавання, вызначаецца яго аб'ект і прадмет, паказваюцца метады, з дапамогай якіх будуць вырашацца пастаўленыя задачы. Таксама ва ўводзінах даецца агульная характарыстыка работы і паказваецца яе аб'ём: колькасць глаў, дакладная колькасць табліц, схем, малюнкаў, дадаткаў і выкарыстаных крыніц.

Мэта курсавой работы – пэўны вынік (тэарэтычны, практычны), які павінен быць дасягнуты ў ходзе даследавання. Задачы курсавой работы – гэта праграма, накіраваная на дасягненне мэты.

У асноўнай частцы курсавой работы (главах і раздзелах) неабходна лагічна і аргументавана паказаць методыку і вынікі даследавання. Змест структурных частак работы павінен адпавядаць мэце і задачам даследавання.

Заключэнне – гэта лагічнае стройнае выкладанне асноўных вынікаў даследавання і зробленых на іх падставе высноў. У ім павінны быць падведзены вынікі даследавання па праблеме, яно можа ўтрымліваць 3–5 буйных абагульненняў, якія падводзяць вынікі выкананай працы.

Спіс выкарыстанай літаратуры – гэта пералік літаратурных крыніц і іншых матэрыялаў, на якія ў курсавой рабоце прыводзяцца спасылкі. Спіс выкарыстанай літаратуры афармляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі «Інструкцыі па афармленні дысертацыі, аўтарэферата і публікацый па тэме дысертацыі».

Дадаткі (пры неабходнасці) уключаюць графічныя, статыстычныя і іншыя матэрыялы па выніках даследавання, а таксама дадатковыя і дапаможныя матэрыялы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА
# (ДЗЕННАЯ ФОРМА АТРЫМАННЯ АДУКАЦЫІ)

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, | Літаратура | Форма кантроля ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) | Лабараторныя | Самастойная работа | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| **1.** | **Раздзел 1. Методыка навучання гісторыі як педагагічная навука** | **10** | **2** | | **10** | | | |
| 1.1 | **Прадмет і задачы методыкі выкладання гісторыі**<br>1. Задачы методыкі выкладання гісторыі.<br>2. Асноўныя кампаненты працэсу навучання гісторыі.<br>3. Сувязь методыкі выкладання гісторыі з іншымі навукамі.<br>4. Метады даследавання працэсу навучання гісторыі. | 2 | | | | Канцэпцыя вучэбнага прадмета “Сусветная гісторыя Гісторыя Беларусі”, схема “Асноўныя кампаненты працэса навуч.гіст.” | [1; 7; 17] | |
| 1.2. | **Станаўленне і развіццё школьнай гістарычнай адукацыі і методыкі выкладання гісторыі ў дасавецкі час.**<br>1.Узнікненне і станаўленне школьнай гістарычнай адукацыі на ўсходнеславянскіх землях. 2. Асноўныя напрамкі развіцця гісторыка-метадычнай думкі ў Расіі да к. XIX ст. 3. Афармленне методыкі выкладання гісторыі як самастойнай галіны навукі. | 2 | | | | | [4;6 7;17 ] | |
| 1.3 | **Развіцце школьнай гістарычнай адукацыі і методыкі выкладання гісторыі ў СССР**<br>1. Развіцце гістарычнай адукацыі ў 20-я гады XX стагоддзя. 2. Аднаўленне самастойнага курса гісторыі ў савецкай школе ў 30-я гады. 3. Развіццё метадычных даследаванняў у СССР ў к. 40-х гадоў – сяр. 60-х гадоў. 4. Навуковая распрацоўка праблем методыкі выкладання гісторыі ў канцы 60-х— | 2 | | | | | [1; 2; 3; 4; 17;19] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | пач. 90-х гадоў XX стагоддзя. | | | | | | | |
| 1.3.1 | **Асноўныя этапы развіцця методыкі выкладання гісторыі ў СССР**<br>1. Станаўленне савецкай сістэмы гістарычнай адукацыі 2. Развіцце гістарычнай адукацыі ў 30-я-50-я гады.3.Гістарычная адукацыя і методыка выкладання гісторыіў 60-я-80-я гады. 4. Пошукі шляхоў пераадолення крызісу гіст.адукацыі к.80-х – пач. 90-х гг. | | 2 | | | Табліца “асноўныя этапы развіцця гістарычнай адукацыі ў СССР” | | Вуснае апытанне, выкананне практычных заданняў |
| 1.4 | **Станаўленне нацыянальнай сістэмы школьнай гіст. адукацыі ў Беларусі**<br>1.Вытокі станаўлення гістарычнай адукацыі ў Беларусі. 2. Вывучэнне гісторыі Беларусі ў школе ў 20-я-30-я гады XX ст. 3. Стан вывучэння гісторыі БССР і развіццё методыкі яе выкладаня ў 60-я-80-я гады. 4. Станаўленне нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі ў Беларусі. | 2 | | | | Канцэпцыя вучэбнага прадмета “Сусветная гісторыя Гісторыя Беларусі”, | [1; 2; 3; 4;] | |
| 1.5 | **Стан сучаснай гістарычнай адукацыі за мяжой**.<br>1. Мэты і задачы вывучэння гісторыі ў школах розных краін. 2. Асаблівасці паслядоўнасці вывучэння гісторыі і метадалагічных прынцыпаў гістарычнай адукацыі ў розных краінах свету. 3. Сучасны стан развіцця дыдактыкі гісторыі ў еўрапейскіх краінах і ЗША. | 2 | | | | | [4; 19; 20] | Праверка канспектаў |
| **2** | **Раздзед 2. Задачы і змест навучання гісторыі ў школе.** | **4** | **8** | | **10** | | | |
| 2.1 | **Мэты, задачы і структура гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь**<br>1. Комплексны характпр мэт навучання гісторыі.<br>2. Таксанамія мэт навучання гісторыі.<br>3. Узаемасувязь мэтанакіраванасці і выніковасці ў навучанні гісторыі. | 2 | | | | Канцэпцыя і адук. стандарт вучэбнага прадмета “Сусветная гісторыя Гісторыя Беларусі”. | [1; 2; 3; 4; ] | |
| 2.1.1 | **Нарматыўна-метадычнае забеспячэнне выкладання прадмета ”Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі”.**<br>1. Характарычтыка канцэпцыі вучэбнага прадмета “Сусветная гісторыя . Гісторыя Беларусі”<br>2. Характарыстыка адукацыйнага | | 2 | | | Канцэпцыя і адук. стандарт вучэбнага прадмета “Сусветная гісторыя Гісторыя | [1; 2; 3; 4; ] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | стандарту.<br>3.Прынцыпы пабудовы і змест школьнай праграмы па гісторыі | | | | | Беларусі”, | | |
| 2.2 | **Агульная характарыстыка зместу і асаблівасцей выкладання асобных курсаў гісторыі ў школе.** 1. Пабудова і задачы вывучэння: 1.“Гісторыі старажытнага свету”; 2. “Гісторыі сярэдніх вякоў;” 3. “Сусветнай гісторыі новага часу”. 4. Сусветнай гісторыі навейшага часу. 5. Гісторыі Беларусі ў 6-9 кл. 6. Гісторыі Беларусі ў 9-11кл. 7. Факультатывы і курсы па выбару, як сродак профільнага навучання гісторыі. | 2 | | | | Схема “Структура вучэбна-метадычнага комплекса навучання гісторыі” | [3,4; 5; 6;12 ;13;!5; 18] | Вуснае апытанне, выкананне практычных заданняў |
| 2.2.1 | **Характарыстыка вучэбна-метадычнага комплекса вывучэння гісторыі старажытнапга свету і сярэдніх вякоў**<br>1. Аналіз праграмы курсаў. 2. Асноўныя паняцці і ідэі азначаных курсаў. 3. Характарыстыка зместу і метадычнага апрату падручнікаў. 4. Патрабаванні да ведаў і ўменняў школьнікаў ў 5-7 класах. 5. Характарыстыка вучэбных і метадычных дапаможнікаў па азначаных курсах | | 2 | | | Нарматыўныя дакументы па навучанню гісторыі ў школе. Вучэбныя дапаможнікі для 5-7 класаў. | [3,4; 5; 6;12 ;13;!5; 18] | Вуснае апытанне, выкананне практычных заданняў |
| 2.2.2 | **Характарыстыка вучэбна-метадычнага комплекса вывучэння сусветнай гісторыі новага і навейшага часу**<br>1. Аналіз праграмы курсаў. 2. Асноўныя паняцці і ідэі азначаных курсаў. 3. Характарыстыка зместу і метадычнага аапрату падручнікаў. 4. Патрабаванні да ведаў і ўменняў школьнікаў ў 5-7 класах. 5.Характарыстыка вучэбных і метадычных дапаможнікаў па азначаных курсах | | 2 | | | Нарматыўныя дакументы па навучанню гісторыі ў школе. Вучэбныя дапаможнікі па новай і навейшай гісторыі. | [3,4; 5; 6;12 ;13;!5; 18] | Вуснае апытанне, выкананне практычных заданняў |
| 2.2.3 | **Характарыстыка вучэбна-метадычнага комплекса вывучэння гісторыі Беларусі ў 6-11 класах**<br>1. Аналіз праграмы курсаў. 2. Асноўныя паняцці і ідэі азначаных курсаў. 3. Характарыстыка зместу і метадычнага аапрату падручнікаў. 4. Патрабаванні да ведаў і ўменняў школьнікаў ў 5-7 класах. 5.Характарыстыка вучэбных і метадычных дапаможнікаў па | | 2 | | | Нарматыўныя дакументы па навучанню гісторыі ў школе. Вучэбныя дапаможнікі па гісторыі Беларусі для | [3,4; 5; 6;12 13; 15; 18] | Вуснае апытанне, выкананне практыч |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | азначаных курсах | | | | | 6-11 класаў. | | ных заданняў |
| **3** | **Раздзел 3. Працэс фарміравання гістарычных ведаў.** | **14** | **8** | | **20** | | | |
| 3.1 | **Структура гістарычных ведаў школьнікаў, характарыстыка яе асноўных кампанентаў**<br>1. Роля гістарычных ведаў у фарміраванні светапогляду вучняў. 2. Структура і функцыі гістарычных ведаў. 3. Асноўныя кампаненты вучэбнага гістарычнага матэрыялу. 4. Роля дзейнаснага кампанента гистарычнага матэрыялу ў рэалізацыі развіццевых магчымасцей школьных курсаў гісторыі. | **2** | | | | Схема “Структура гістарычных ведаў школьникаў” | [4;5; 6;14 ] | |
| 3.2 | **Методыка фарміравання гістарычных уяўленняў**<br>1. Віды гістарычных уяўленняў. 2. Роля нагляднасці ў фарміраванні ўяўленняў аб гістарычным мінулым. 4. Вобразы памяці і фантазіі ў фарміраванні гістарычных ўяўленняў. 5 Фарміраванне ўяўленняў аб гістарычным часе і прасторы. | 4 | | | | | [4;9; 14;17 ] | |
| 3.2.1 | **Шляхі і сродкі фарміравання гістарычных уяўленняў**<br>1. Месца ўяўленняў у працэсе фарміравання гістарычных ведаў. 2. Метадычныя прыемы і сродкі фарміравання ўяўленняў аб фактах мінулага. 3. Мадэліраванне фрагментаў ўрока па фарміраванні гістарычных уяўленняў. | | 2 | | | Нарматыўныя дакументы па навучанню гісторыі ў школе. Вучэбныя дапаможнікі па гісторыі. | [4;9; 14;17 ] | Праверка канспектаў распрацаваных мадэлей навучання |
| 3.2.2 | **Методыка фарміравання ўяўленняў аб гістарычным часе і прасторы.**<br><br>1. Лакалізацыя гістарычных фактаў у прасторы. 2. Прыемы работы з картай. 3. Лакалізацыя гістарычных фактаў ў часе. 4. Прыемы работы з храналогіяй на ўроках гісторыі. 5. Мадэліраванне фрагмента ўрока. | | 2 | | | Нарматыўныя дакументы па навучанню гісторыі ў школе. Вучэбныя дапаможнікі па гісторыі. | [4;9; 14;17 ] | Праверка канспектаў распрацаван мадэлей |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | навучання |
| 3.3 | **Метадычныя прыёмы і сродкі фарміравання гістарычных паняццяў**<br>1. Гістарычныя паняцці – найважнейшы кампанент гістарычных ведаў. 2. Класіфікацыя гістарычных паняццяў. 3. Метадычныя ўмовы павышэння эфектыўнасці фарміравання гістарычных паняццяў.4. Выпрацоўка ўменняў аперыраваць гістарычнымі паняццямі. | **2** | | | | Схема “Метадычныя шляхі фарміравання гістарычных паняццяў” | [4;9; 14;17 ] | Вуснае апытанне, выкананне практычных заданняў |
| 3.3.1 | **Шляхі фарміравання гістарычных паняццяў**<br>1. Праблема фарміравання гстарычных паняццяў ў метадычнай літаратуры. 2. Лагічныя шляхі фармірвання гістарычных паняццяў. 3. Мадэліраванне фрагмента ўрока па фарміраванні гістарычнага паняцця. | | 2 | | | | [4;9; 14;17 ] | Праверка канспектаў |
| 3.4 | **Методыка раскрыцця гістарычных заканамернасцей і рэалізацыі міжпрадметных сувязей ў навучанні гісторыі**<br>1. Паняцце аб заканамернасцях гістарычнага развіцця. 2. Падвядзення вучняў да засваення гістарычных заканамернасцей. 3. Роля міжпрадметных сувязей ў засваенні светапоглядных ідэй. 3. Змест міжпрадметных сувязей. 5. Асноўныя напрамкі ажыццяўлення міжпрадметных сувязей. | 4 | | | | Схема “Асноўныя напрамкі ажыццяўлення міжпрадметных сувязей” | [4;9; 14;17 ] | |
| 3.4.1 | **Метадычныя прыемы фарміравання гістарычных заканамернасцей**<br>1. Метадычная навука аб месцы часе і глыбіні раскрыцця гістарычных заканамернасцей ў курсе гісторыі. 2. Методыка падвядзення вучняў да ўсведамлення гістарычных заканамернасцей.3. Мадэліраванне фрагмента ўрока па раскрыцці гістарычнай заканамернасці | | 2 | | | Схема “Метадычныя шляхі раскрыцця гіст. заканамерн.” | [4;9; 14;17 ] | Праверка канспектаў распрацаваных мадэлей навучанн |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | я |
| 3.5 | **Выхаванне школьнікаў у працэсе навучання гісторыі**<br>1. Выхаваўчыя магчымасці школьных курсаў гісторыі. 2. Адбор вучэбнага матэрыялу і сродкаў навучання з улікам іх выхаваўчых магчымасцей. 3. Сувязь выкладання гісторыі з жыццём, сучаснасцю як умова рэалізацыі выхаваўчых задач. 4. Выхаванне інтарэсу да вывучэння гісторыі. 5. Фарміраванне гуманістычнага светапогля-ду школьнікаў. | **2** | | | | Схема “Метадычныя ўмовы павышэння эфектыўнасці выхавання вучняў ў навучанні гісторыі” | [4;9; 14;17 ] | |
| **4** | **Раздзел 4. Рэлізацыя дзейнаснага падыходу ў працэсе навучання гісторыі** | **10** | **4** | | **14** | | | |
| **4.1** | **Дзейнасны падыход у навучанні гісторыі. Паняцце і структура вучэбнай дзейнасці**<br>**1.** Дзейнасны падыход у навучанні гісторыі. 2. Паняцце і структура вучэбнай дзейнасці школьнікаў. 3. Ідэі асобасна-дзейнаснага падыходу ў працах псіхолагаў і дыдактаў. 4. Укараненне дасягненнў псіхалогіі і дыдактыкі ў школьную практыку. | 2 | | | | Схема “Структура вучэбнай дзейнасці вучняў” | [4;10;11; 12;15 ] | |
| **4.2** | **Фарміраванне пазнаваўчага інтарэсу – аснова рэалізацыі дзейнаснага кампанента гістарычнай адукацыі**<br>1. Сутнасць пазнаваўчага інтарэсу і яго характэрныя рысы. 2. Дынаміка развіцця пазнаваўчага інтарэсу да вывучэння гісторыі. 3. Устойлівы пазнаваўчы інтарэс. 4. Магчымасці прадмета “Сусветная гісторыя .Гісторыя Беларусі” ў 5-11 класах для фарміравання ўстойлівага пазнаваўчага інтарэсу ў школьнікаў. | 2 | | | | | [4;6; 11; 12; 13 ] | |
| **4.3** | **Характарыстыка зместу дзейнаснага кампанента гістарычнай адукацыі**<br>1.Патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі вучняў ў адпаведнасці з Адукацыйным стандартам прадмета “Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі” 2. Характарыстыка спецыяльных спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, неабходных для вывучэння гісторыі. 3. Метадычныя ўмовы фарміравання спосабаў вучэбна-пазнаваўчай | 2 | | | | Адукацыйны стандарт прадмета “Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі” | [4; 10; 11; 12; 13; 15 ] | Вуснае апытанне, выкананне практычных зада |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | дзейнасці. | | | | | | | нняў |
| **4.3.1** | **Метадычныя шляхі рэалізацыі дзейнаснага кампанента гістарычнай адукацыі.** 1.Уменні і навыкі як перадумова фарміравання спосабаў вучэбна-пазнаваўчай дзейцнасці. 2.Пераемнасць у фарміраванні уменняў і навыкаў на розных ступенях навучання.3. Распрацоўка мадэлі фарміравання уменняў і навыкаў на ўроках гісторыі. | | 2 | | | Адукацыйны стандарт прадмета “Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі” | | Праверка канспектаў распрацаваных мадэлей навучання |
| **4.4** | **Фарміраванне спосабаў вучэбна- пазнаваўчай дзейнасці**. 1.Дыягностыка ўзроўню сфарміраванасці спосабаў дзейнасці. 2. Шляхі фарміравання спосабаў ВПД ў навучанні гісторыі. 3. Метадычныя ўмовы павышэння эфектыўнасці іх фарміравання. 4. Метадычныя ўмовы рэалізацыі дзейнаснага кампанента гістарычнай адукацыі. | 2 | | | | Вучэбныя праграмы, і дапаможнікі па асобных курсах гісторыі ў школе | [4; 10; 11; 12; 13 ] | |
| **4.4.1** | **Методыка фарміравання спосабаў вучэбна-пазнаваўчай дзейнасці**. 1.Дыягностыка сфарміраванасці ўменняў і навыкаў як перадумова паспяховай работы па іх удасканаленню. 2. Методыка фарміравання спосабаў вучэбнай дзейнасці на ўроках гісчторыі. 3. Распрацоўка мадэлі фарміравання уменняў і навыкаў на ўроку гісторыі. | | 2 | | | | [ 4; 10; 11; 12; 13; 15 ] | Выкананне практычных заданняў |
| **4.5** | **Асаблівасці методыкі рэалізацыі дзейнаснага кампанента ў традыцыйнай і тэхналагічнай мадэлях навучання.** 1.Асноўныя мадэлі арганізацыі навучання ў сучаснай школе. 2.Дыдактычныя прынцыпы традыцыйнай мадэлі навучання. 3. Тэхналагічная мадэль фарміравання спосабаў вучэбнай дзейнасці ў навучанні гісторыі.4.Кампетэнтнасны падыход да пабудовы зместу адукацыі. | 2 | | | | Табліца “Мадэлі арганізацыі навучання ў сучаснай школе” | [ 4; 10; 11; 12; 13; 15 ] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **5** | **Раздзел 5. Прыемы і сродкі ўзаемадзеення настаўніка і вучняў ў працэсе навучання гісторыі** | 12 | **6** | | **15** | | | |
| **5.1** | **Агульная характарыстыка сродкаў навучання гісторыі**<br>1 Сродкі навучання гісторыі як крыніцы гістарычных ведаў. 2. Сродкі, якія ўзнаўляюць гістарычную рэчаіснасць у навукова-апрацаваным выглядзе. 3. Сродкі навучання, якія ўзнаўляюць гістарычную рэчаіснасць у мастацка-вобразнай форме. 4. Кабінет гісторыі ў школе.оле. Планаванне яго работы. | 2 | | | | Схема "Крыніцы гістарыч. Ведаў школьнікаў" | [ 4; 6;14 ;17; 19; 20 ] | |
| **5.2** | **Праблема метадаў навучання гісторыі**<br>1. Азначэнне метадаў навучання і іх класіфікацыя. 2. Дыдактычны і метадычны падыходы да праблемы метадаў навучання, магчымасці іх спалучэння. 3. Пазнаваўчая, выхаваўчая і развіваючая роля метадаў у працэсе навучання гісторыі. | 2 | | | | Табліцы "Метады і прыемы навучання гісторыі ў школе" | [ 4; 9;14 ;17; 19; 20 ] | |
| **5.3** | **Методыка нагляднага навучання гісторыі**<br>1. Класіфікацыя наглядных сродкаў навучання. 2. Прадметная нагляднасць, 3. Выкарыстання выяўленчай нагляднасці. 4. Прыёмы выкарыстання ўмоўнай нагляднасці. 5. Тэхнічныя сродкі навучання ў выкладанні гісторыі. 6. Кабінет гісторыі ў школе | 2 | | | | Схема "Класіфікацыя наглядных сродкаў навучання" | [ 4; 6; 14; 17; 20; ] | Праверка канспектаў |
| **5.3 .1** | **Метадычныя прыемы выкарыстання нагляднасці ў навучанні гісторыі**<br>1. Прыемы выкарыстанне прадметнай нагляднасці. 2. Выкарыстанне выяўленчай нагляднасці. 3. Умоўна-графічная нагляднасць, прыемы яе выкарыстання. | | **2** | | | | [ 4; 6;14 ;17; 20; ] | Вуснае апытанне, выкананне практычных заданняў |
| **5.4** | **Метадычныя прыёмы вуснага навучання гісторыі**<br>1. Функцыі вуснага слова ў навучанні гісторыі. 3.Характар вуснага выкладу. 4. Арганізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў у працэсе вуснага выкладу. 5. Дыялагічныя формы вуснага слова ў навучанні гісторыі | 2 | | | | Табліца "Прыемы вуснага навучання гісторыі" | [ 4; 6;14 ;17; 19; ] | Выкананне практычных заданняў |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **5.4.1** | **Прыемы вуснага навучання гісторыі**<br>1. Характарыстыка прыёмаў вуснага выкладання гісторыі. 2. Патрабаванні да вуснага слова настаўніка. 3. Шляхі авалодання школьнікамі прыемамі вуснага выкладу гісторыі. 4. Распрацоўка мадэлі выкарыстання розных прыемаў вуснага выкладу на ўроку. | | 2 | | | | [ 4; 6;14 ;17; 19; ] | Вуснае апытанне, выкананне практычных заданняў |
| **5.5** | **Методыка работы з друкаванымі крыніцамі ў навучанні гісторыі.**<br>1. Месца і роля друкаваных крыніц ў навучанні гісторыі. 2. Роля гістарычных дакументаў у навучанні. 3. Магчымасці выкарыстання даведачнай літаратыры ў навучальным працэсе. 4. Выкарыстанне навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры. | 2 | | | | | [ 4; 6;9; 14;17; 20; ] | |
| **5.5.1** | **Метадычныя прыемы работы з друкаванымі крыніцамі па гісторыі.**<br>1. Падручнік гісторыі як крыніца і сродак арганізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў. 2 Асаблівасці методыкі выкарыстання гіст. дакументаў ў залежнасці ад узросту вучняў. 3. Навукова-папулярная і мастацкая літаратура ў навучанні гісторыі. | | 2 | | | | [ 4; 6;9; 14;17; 20; ] | Вуснае апытанне, выкананне практычных заданняў |
| **6** | **Раздзел 6. Формы арганізацыі навучання гісторыі** | 12 | **12** | | **12** | | | |
| **6.1** | **Тэма 6.1. Урок гісторыі і падрыхтоўка да яго правядзення**<br>**1.** Урок як асноўная форма арганізацыі працэсу навучання гісторыі. 2. Патрабаванні да сучаснага ўрока. **3.** Тыпы ўрокаў гісторыі. 4. Крытэрыі ацэнкі ўрока. 5. Спецыфічныя і нетрадыцыйныя формы арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу. | 4 | | | | Табліца "Тыпы урокаў гісторыі" | [ 4; 6;9; 14; 17; 20; ] | |
| **6.1.1** | **Мадэліраванне мэты і задач ўрока гісторыі**<br>1. Структурна-функцыянальны аналіз зместу ўрока як перадумова паспяховага канструявання задач і мадэлі ўрока. 2. Метадычныя умовы паспяховага | | 2 | | | Вучэбная праграма і вучэбныя дапаможнікі па асобных | [ 4; 6;9; 14; 17; 20; ] | Праверка канспектаў |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | вызначэння мэты і задач урока. 3. Мадэліраванне вынікаў навучання гісторыі на канкрэтным ўроку. | | | | | курсах гісторыі | | распрацаваных мадэлей навучання |
| 6.1.2 | **Канструяванне структуры і падрыхтоўка палана-канспекта ўрока гісторыі** 1. Методыка вызначэння структуры ўрока гісторыі, фактары якія ўплываюць на яе. 2. Канструяванне структуры ўрока ў адпаведнасці з вызначанымі мэтамі і задачамі ўрока.3. Распрацоўка плана канспекта ўрока гісторыі і ягот апрабацыя на занятках. | | 2 | | | Вучэбная праграма і вучэбныя дапаможнікі па асобных курсах гісторыі | [ 4; 6;9; 14; 17; 20; ] | |
| 6.2 | **Сістэма праверкі і ацэнкі вынікаў навучання гісторыі** 1. Прызначэнне і функцыі праверкі і ацэнкі ведаў. 2. Метадычныя ўмовы павышэння эфектыўнасці праверкі ведаў. 3. Функцыі і роля ацэнкі ведаў і ўменняў вучняў, яе формы і крытэрыі. 4. Методыка выстаўлення адзнакі на ўроку, за чвэрць, паўгоддзе, год. | 2 | | | | Табліца "Дзесяцібальная сістэма ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў" | [ 4; 6;9; 14; 17; 20; ] | |
| 6.2.1 | **Прыёмы праверкі і ацэнкі ведаў па гісторыі** 1. Прыёмы бягучай праверкі і ацэнкі ведаў і ўменняў у малодшых і старэйшых класах. 2. Метады вуснага і пісьмовага кантролю. 3. Індывідуальныя, групавыя і калектыўныя формы кантролю.4. Мадэліраванне фрагментаў урокаў з выкарыстаннем розных відаў кантролю. | | 2 | | | Табліца "Дзесяцібальная сістэма ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў" | [ 4; 6;9; 14; 17; 20; ] | Праверка канспектаў распрацаваных мадэлей навучання |
| 6.3 | **Паўтарэнне ў навучанні гісторыі** 1. Прызначэнне паўтарэння. 2. Сістэма паўтарэння ў навучанні. Як найважнейшая перадумова сістэматызацыі і абагульнення ведаў школьнікаў. 3. Віды паўтарэння. Спосабы яго арганізацыі. | 2 | | | | Табліца "Віды паўтарэння і яго прызначэнне" | [ 4; 6;9; 14; 17; 20; ] | |
| 6.3.1 | **Методыка арганізацыі паўтарэння ў навучанні гісторыі.** | | **2** | | | Табліца "Віды | 4; 6; 20; ] | Вуснае |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1. Методыка першапачатковага паўтарэння вывучанага на ўроку. 2. Бягучае паўтарэнне і яго роля ў фарміраванні гістарычных ведаў. 3. Падагульняючае паўтарэнне па выніках вывучэння тэмы, раздзела, гістарычнага курса. 4. Перадэкзаменацыйнае паўтарэнне, методыка яго арганізацыі. | | | | | паўтарэння і яго прызначэнне” | | апытанне, выкананне практычных заданняў |
| **6.4** | **Выкарыстанне сучасных тэхналогій навучання гісторыі**<br>1. Інавацыйныя падыходы да выкладання гісторыі. 2. Паняцце “тэхналогія навучання”. 3. Адрозненні тэхналогіі і методыкі навучання. 4. Структура тэхналогіі навучання. 5. Характарыстыка найбольш выкарысоўваемых тэхналогійц у навучанні гісторыі. | 2 | | | | Табліца “Структура педагагічнай тэхналогііі” | [ 4; 6;14 ;17; 20; ] | |
| **6.4 .1** | **Методыка выкарыстання ў навучанні гісторыі сучасных тэхналогій**<br>1. Тэхналогіі развіццёвага і праблемнага навучання. 2. Тэхналогія поўнага засваення ведаў. 3. Модульнае навучання гісторыі. 4. Гульнявыя тэхналогіі ў навучанні гісторыі. 5. Тэхналогіі праектнай дзейнасці, іх сутнасць і магчымасці выкарыстання ў сучаснай школе. | | 2 | | | | [ 4; 6;10 ;11; 17] | Вуснае апытанне, выкананне практычных заданняў |
| **6.5** | **Тэма 6.5. Методыка выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у навучанні гісторыі**<br>**1.** Месца і роля інфармацыйных тэхналогій у навучанні гісторыі. 2. Магчымасці выкарыстання камп’ютэрнай тэхнікі ў вучэбным працэсе па гісторыі. 3. Метадычныя шляхі выкарыстання мультымедыйных і камп’ютэрных сродкаў навучання ў навучанні гісторыі. | 2 | | | | Табліца “Выкарыстанне электонных сродкаў навучання гісторыі” | [ 4; 6;10 ;11; 17] | |
| **6.5 .1** | **Асноўныя напрамкі прымянення інфармацыйных тэхналогій у вучэбным працэсе**<br>1. Камп’ютэрныя прэзентацыі новага матэрыялу на ўроку як сродак мультымедыйнага забеспячэння нагляднасці на ўроку. 2. Аўтаматызацыя | | **2** | | | Табліца “Выкарыстанне электонных сродкаў навучання | [ 4 6;10 ;11; 17] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | кантрольна-ацэначнай дзейнасці ў навучанні гісторыі. 3. Выкарыстанне выдадзеных на лічбавых носьбітах электронных рэсурсаў у навучанні гісторыі.4. Падрыхтоўка фрагмента ўрока з выкарыстаннем інфармац.тэхналогій. | | | | | гісторыі” | | |
| **7.** | **РАЗДЗЕЛ 7. Пазакласная работа па гісторыі. Настаўнік гісторыі** | **4** | | | **4** | | | |
| **7.1** | **Пазакласная работа па гісторыі**<br>1. Роля пазакласнай работы ў фарміраванні ў вучняў устойлівага інтарэсу да гісторыі. 2. Змест, асноўныя напрамкі і арганізацыйныя формы пазакласнай работы па гісторыі. 3. Класіфікацыя форм работы па ступені масавасці і тэрмінах дзеяння. Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у пазакласнай рабоце. | 2 | | | | | [ 4 6; 10; 11; 17] | |
| 7.2 | **Настаўнік гісторыі**<br>1. Роля настаўніка гісторыі ў выхаванні падрастаючага пакалення. 2. Асаблівасці педагагічнай дзейнасці настаўніка гісторыі, яе змест і структура. 3. Умовы творчага росту настаўніка гісторыі. Метады педагагічнага даследавання ў дзейнасці настаўніка гісторыі. 4. Этапы прафесійнага ўдасканалення. 5. Асноўныя напрамкі самаадукацыі, яе планаванне. | 2 | | | | | [ 4 6; 10; 11; 17] | |
| | **Усяго** | **66** | **40** | | **85** | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ**
**(завочная форма атрымання адукацыі)**

| Нумар раздзела, тэмы, | Назва раздзела, тэмы, пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (нагляднья, метадычныя дапаможнікі і г.д.) | Літаратура | Форма кантроля ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) | Лабараторныя заняткі | Самастойная работа | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| **1.** | **Раздзел 1. Методыка навучання гісторыі як педагагічная навука** | **2** | | | | | | |
| 1.1 | **Прадмет і задачы методыкі выкладання гісторыі. Станаўленне нацыянальнай сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі ў Беларусі**<br>1. Задачы методыкі выкладання гісторыі.2. Асноўныя кампаненты працэсу навучання гісторыі. 3. Сувязь методыкі выкладання гісторыі з іншымі навукамі. 4. Метады даследавання працэсу навучання гісторыі.<br>5. Вытокі станаўлення гістарычнай адукацыі ў Беларусі. 6. Стан вывучэння гісторыі ў БССР і развіццё методыкі яе выкладаня ў 20-я-80-я гады. 7. Станаўленне нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі ў Беларусі. | 2 | | | | Канцэпцыя вучэбнага прадмета “Сусветная гісторыя Гісторыя Беларусі”, схема “Асноўныя кампаненты працэса навучання гісторыі” | [1; 4 ; 5; 17] | |
| **2** | **Раздзел 2. Задачы і змест навучання гісторыі ў школе.** | **2** | **2** | | | | | |
| **2.1** | **Мэты, задачы і структура гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь**<br>1. Комплексны характпр мэт навучання гіст<br>2. Таксанамія задач навучання гісторыі. 3. Характарыстыка структуры і зместу гістарычнай адукацыи ў РБ. 4. Асаблівасці вывучэння гісторыі ў залежнасці ад узроставых асаблівасцей вучняў. | 2 | | | | Канцэпцыя і адук. стандарт вучэбнага вучэбнага прадмета п “Сусветная гісторыя Гісторыя Беларусі”. Табліца “Структура гістарычнай адукацыі ў РБ” | [1; 2; 3; 4; 6 ] | |
| 2.1 | **Нарматыўна-метадычнае** | | 2 | | | Канцэпцыя і | [1; | Правер |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| .1 | **забеспячэнне выкладання прадмета ”Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі”.** 1. Характарычтыка канцэпцыі вучэбнага прадмета “Сусветная гісторыя . Гісторыя Беларусі”. 2. Характарыстыка адукацыйнага стандарту. 3. Прынцыпы пабудовы і змест школьнай праграмы па гісторыі. 4. Іншая нарматыўная база арганізацыі навучання гістоорыі ў школе. | | | | | адук. стандарт вучэбнага прадмета “Сусветная гісторыя Гісторыя Беларусі”, | 2; 3; 4; ] | ка канспе ктаў і выніка ў выкана нinformal ня практы чн. заданн яў |
| **3** | **Раздзел 3. Працэс фарміравання гістарычных ведаў.** | **4** | | | | | | |
| 3.1 | **Методыка фарміравання гістарычных уяўленняў і паняццяў** 1. Структура гістарычных ведаў школьнікаў, характарыстыка яе асноўных кампанентаў. 2. Роля нагляднасці ў фарміраванні ўяўленняў. 4. Метадычныя шляхі фарміравання гістарычных паняццяў. | 2 | | | | | [ 4;9; 14;1 7 ] | |
| 3.2 | **Методыка раскрыцця гістарычных заканамернасцей і рэалізацыі міжпрадметных сувязей ў навучанні гісторыі** 1. Паняцце аб заканамернасцях гістарычнага развіцця. 2. Падвядзення вучняў да засваення гістарычных заканамернасцей. 3. Роля міжпрадметных сувязей ў засваенні светапоглядных ідэй. 4. Асноўныя напрамкі ажыццяўлення міжпрадметных сувязей. | 2 | | | | Схема “Метадычныя шляхі раскрыцця гіст. заканамернас цей” Схема “Асноўныя напрамкі ажыццяўленн я міжпрадметн ых сувязей” | [ 4;9; 14;1 7 ] | |
| **4** | **Раздзел 4. Рэлізацыя дзейнаснага падыходу ў працэсе навучання гісторыі** | **2** | | | | | [4;5; 6; 12; 13;! 5;17 ] | |
| **4.1** | **Дзейнасны падыход у навучанні гісторыі.** **Фарміраванне спосабаў вуч-пазн. дзейнасці.** **1.** Дзейнасны падыход у навучанні гісторыі. 2. Паняцце і структура вучэбнай дзейнасці школьнікаў. 3. Укараненне дасягненнў | 2 | | | | Схема “Структура вучэбнай дзейнасці вучняў” | [ 4;10 ; 11; 12;1 5 ] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | псіхалогіі і дыдактыкі ў школьную практыку. 4. Асноўныя этапы фарміравання спосабаў вуч.-пазн. дзейнасці на ўроках гісторыі. | | | | | | | |
| **5** | **Раздзел 5. Прыемы і сродкі ўзаемадзеення настаўніка і вучняў ў працэсе навучання гісторыі** | 2 | 2 | | | | | |
| **5.2** | **Праблема метадаў навучання гісторыі** 1. Азначэнне метадаў навучання і іх класіфікацыя. 2. Дыдактычны і метадычны падыходы да праблемы метадаў навучання, магчымасці іх спалучэння. 3. Класіфікацыя метадаў навучання гісторыі 4. Характарычтыка славесных(вуснае і друкаванае слова) і наглядных метадаў навучання гісторыі. | 2 | | | | Табліцы "Метады і прыемы навучання гісторыі ў школе" | [ 4;9; 14;17; 19;20 ] | |
| **5.2.1** | **Метадычныя прыемы выкарыстання наглядных і друкаваных сродкаў навучанні гісторыі** 1. Прыемы выкарыстанне прадметнай нагляднасці. 2. Выкарыстанне выяўленчай нагляднасці. 3. Умоўна-графічная нагляднасць, прыемы яе выкарыстання. 4. Вуснае слова ў навучанні гісторыі. 5. Выкарыстанне друкаваных крыніц у навучанні гісторыі | | 2 | | | | [ 4;6; 14;17; 20; ] | Праверка канспектаў распрацаваных мадэлей навучання |
| **6** | **Раздзел 6. Формы арганізацыі навучання гісторыі** | **3** | **2** | | | | [4;5; 6; 12; 13;!5;17 ] | |
| **6.1** | **Тэма 6.1. Урок гісторыі і падрыхтоўка да яго правядзення** **1.** Урок як асноўная форма арганізацыі працэсу навучання гісторыі. 2. Патрабаванні да сучаснага ўрока. **3.** Тыпы ўрокаў гісторыі. 4. Крытэрыі ацэнкі ўрока. 5. Спецыфічныя і нетрадыцыйныя формы арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу. | 2 | | | | Табліца "Тыпы урокаў гісторыі" | [ 4;6; 9;14 ;17; 20; ] | |
| **6.1.1** | **Мадэліраванне мэты, задач ўрока, канструяванне плана-канспекта ўрока** | | 2 | | | Вучэбная праграма і вучэбныя | [ 4;6; 9;14 | Праверка канспе |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1. Структурна-функцыянальны аналіз зместу ўрока як передумова паспяховага канструявання задач і мадэлі ўрока. 2. Метадычныя умовы паспяховага вызначэння мэты і задач урока. 3. Мадэліраванне вынікаў навучання гісторыі на канкрэтным ўроку. 4. Канструяванне мадэлі ўрока (стварэнне плана-канспекта). | | | | | дапаможнікі па асобных курсах гісторыі | ;17; 20; ] | ктаў распрацаваных мадэлей навучання |
| **6.4** | **Выкарыстанне сучасных тэхналогій навучання гісторыі** 1. Інавацыйныя падыходы да выкладання гісторыі. 2. Паняцце “тэхналогія навучання”. 3. Адрозненні тэхналогіі і методыкі навучання. 4. Структура тэхналогіі навучання. 5. Характарыстыка найбольш выкарысоўваемых тэхналогійц у навучанні гісторыі. 6. Методыка выкарыстання інфармацыйных тэхналогій. | 1 | | | | Табліца “Структура педагічнай тэхналогііі” | [ 4;6; 14;17; 20; ] | |
| **7.** | **Раздзел 7. Пазакласная работа па гісторыі. Настаўнік гісторыі** | **1** | | | | | [4;5; 6; 8;17 ] | |
| **7.1** | **Пазакласная работа па гісторыі. Настаўнік гісторыі** 1. Роля пазакласнай работы ў фарміраванні ў вучняў устойлівага інтарэсу да гісторыі. 2. Змест, асноўныя напрамкі і арганізацыйныя формы пазакласнай работы па гісторыі. 3. Асаблівасці педагагічнай дзейнасці настаўніка гісторыі, яе змест і струк-тура. | 1 | | | | | [4;5; 6; 8;17 ] | |
| | **Усяго** | **16** | **6** | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Пратакол узгаднення вучэбнай праграмы

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы кафед-ры аб змяненнях у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, распрацаваўшай вучэбную праграму (з указаннем даты і нумар пратакола) |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Педагогіка | Кафедра педагогікі | Скараціць колькасць вучэбнага матэрыялу аб формах вучэбных заняткаў па гісторыі як пытанню разглядаемаму ў змесце курса педагогікі | |

# 6. ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## 6.1. ГЛАСАРЫЙ

**Абагульняючая характарыстыка** – прыём кароткага, сціслага, простага пераліку істотных прыкмет, прычынна-выніковых сувязей, гістарычнага значэння найважнейшых гістарычных фактаў, зместу паняццяў і законаў грамадскага развіцця. Выкарыстоўваецца ў навучанні індуктыўна і дэдуктыўна.

**Аб'ект гістарычнай навукі** – чалавечае грамадства усей разнастайнасці мінулага, у яго развіцці і змяненні. Гісторыя як навука даследуе сацыяльную рэальнасць, якая перасталаа ці перастае быць сучаснасцю. Пры гэтым гісторык, як правіла, пазбаўлены магчымасці назіраць аб'ект вывучэння. **Адукацыя** – мэтанакіраваны працэс выхавання і навучання ў інтарэсах чалавека, грамадства і дзяржавы, які суправаджаецца канстатацыяй дасягнення грамадзянінам вызначаных дзяржавай адукацыйных узроўняў. У методыцы пад адукацыяй разумеюць толькі працэс авалодання школьнікамі прадметнымі ведамі і ўменнямі (адсюль: адукацыйныя мэты,вынікі адукацыі і г.д.).

**Актуалізацыя** (з лац.**)** – дзеянне накіраванае на прыстасаванне чаго-небудзь да ўмоў дадзенай сітуацыі.

**Актуальнасць** (з лац.**)** – дзейснасць, адпаведнасць запытам сучаснасці.

**Алагізм** (з лац.**)** – ход разважанняў, які парушае правілы логікі; нешта нелагічнае, што супярэчыць логіцы. Алагічныя факты – факты, якія не паддаюцца законам логікі. Напрыклад: алагічнымі здаюцца дзеянні мангола-татар, якія сто верст не дайшлі да багатага Ноўгарада і павярнулі на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

поўдзень, так як і дзеянні Аю Неўскага, чыё княства не было захоплена мангогла-татарамі, але даніну ім князь плаціў рэгулярна.

**Альтэрнатыва**(з лац.**)** – неабходнасць выбару паміж двума ці некалькімі выключаючымі адна другую магчымасцямі. У вучэбным працэсе альтэрнатыўнасць выкарыстоўваецца з мэтай абмеркавання розных пунктаў гледжання для выбару найбольш праўдзівай, якая найбольш аб'ектыўна адлюстроўвае гістарычную рэчаіснасць.

**Аналіз** (з грэч. – раскладванне, разбор, расчляненне) – лагічны прыем, метад даследавання, пры выкарыстанні якога вывучаемы прадмет у думках ці практычна расчляняецца на складаючыя яго элементы (прыкметы, уласцівасці, адносіны), кожны з якіх даследуецца асобна як частка расчлененага цэлага, для таго как вылучаныя у ходзе аналізу элементы аб'яднаць с дапамогай другога лагічнага прыёму – сінтэзу – у цэлае, узбагачанае новымі элементамі.

**Аналітычная гутарка** – дыялагічная форма вуснага слова, у працэсе якой сумеснымі намаганнямі настаўніка і вучняў аналізуецца змест вучэбнага гістарычнага матэрыялу і фармуліруюцца новыя тэарэтычныя высновы.

**Аналітычнае апісанне** – прыём вуснага выкладання, які расчляняе ў думках цэласны гістарычны факт на складовыя часткі, дэталі з мэтай паказу яго структуры, прызначэння і ўзаемадзеяння кампанентаў. Вынікам яго выкарыстання з'яўляюцца эмпірычныя веды і тэарэтычныя абагульненні.

**Антыціпацыя** (з лац.**)** **–** прадугадванне, здагадка: 1) тэарэтычнае прадугадванне з'яў або дзейнняў на аснове гістарычнага вопыту; 2) прадузятая думка, заснаваная на абстрактных разважаннях, якія ігнаруюць вопыт , практыкук; 3)прадугадванне гучання слова без прачытвання некалькіх апошніх літар у ім.

**Апорныя даты** – храналагічныя звесткі аб найважнейшых гістарычных фактах, якія неабходныя для вывучэння пэўнага курса гісторыі.

**Аспект** (з лац.) – 1) погляд, пункт гледжання на аснове якога разглядаецца аналізіруецца даследуемы прадмет, з'ява, падзея, паняцце, масіў дакументаў іг.д.; 2) адзін бок дадзенага прадмета, з'явы, адна форма яго сувязі з іншымі прадметамі і з'явамі; 3) погляд на той ці іншы аб'ект з пункту гледжання пэўнай навукі (гістарычны, эканамічны, філасофскі аспект і г.д); 4) перспектыва, у якой выступае з'ява, бок прадмета, што надае ім асаблівую афарбоўку і гучанне.

**Буквалізм** – строгае выкананне знешняга фармальнага боку, вузкафармальнага сэнсу чаго-небудзь на шкоду сутнасці самой справы.

**Вобразны аповед** – прыём выкладання, які вобразна ўзнаўляе развіццё тыпічных гістарычных з'яў у межах пэўнага перыяду

**Вобразная характарыстыка** – прыем узнаўлення яскравых вобразаў рэадьных гістарычных дзеячаў, або тыповых прадстаўнікоў грамадскіз груп

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на аснове партрэтнага апісання іх знешняга выгляду, аналіза дзейнасці і светапогляду.

**Вобразнае заданне** – адзін з відаў заданняў “з адкрытым адказам”, накіраваных на рэканструкцыю знешніх рыс гістарычных фактаў эмпірычным спосабам.

**Вымяральнікі** – сродкі і спосабы выяўлення па загадзя зададзеных параметрах колькасных і якасных характарыстык дасягнення выпускнікамі патрабаванняў Дзяржаўнага адукацыйнага стандарту па выніках засваення імі зместу агульнаадукацыйных праграм трох канцэнтраў сярэдняй школы.

**Герменеўтыка** – традыцыя і спосабы талкавання многазначных тэкстаў ці тэкстаў, якія не паддаюцца ўдакладненню.

**Гістарычная заканамернасць** – сувязь гістарычных фактаў, спосаб злучэння гістарычнага і лагічнага, для адлюстравання ўстойлівых паўтараючыхся прычынна-выніковых і іншых сувязей, якія абумоўліваюць пэўныя *вынікі* развіцця гістарычнага працэсу ў адпаведны гістарычны перыяд. Пад гістарычнай заканамернасцю разумеюць таксама размяшчэнне фактаў па часе і іх асэнсаванне ў катэгорыях агульных для дадзенай культуры.

**Гістарычная крыніца** – разнастайныя сведчанні, якія змяшчаюць інфармацыю аб гістарычных з’явах і працэсах.

**Гістарычнае мышленне** – адзінства зместу метадалагічных ведаш, спосаб разумовых дзеянняў і накіраванасці асобы на іх прымяненне ў пазнанні і асэнсаванні канкрэтных гістарычных з’яў.

**Гістарычная прастора** – прастора , у якой адбываецца гістарычная падзея.

**Гульня** – сродак актывізацыі пазнавальнай дзейнасці школьнікаў у межах ўрочнай і пазакласнай работы па прадмету. Вучэбныя гістарычныя гульні можна падзяліць на гульні: з правіламі,сюжэтна-ролявыя (рэтраспектыўныя і дзелавыя) і рубежныя.

**Даследаванне** – індывідуальнае ці групавое – спосаб самастойнай работы вучняў над праблемнай задачай, якая ўключае усе этапы праблемнага навучання.

**Драматызацыя** – прыём вобразнага ці сюжэтнага апавядання ў форме дыялога двух або некалькіх асоб, прадстаўнікоў розных грамадскіх слаёў-носьбітаў розных і супроцьлеглых інтарэсаў. У аснове драматызацыі – канфліктная сітуацыя, якая грунтуецца насупярэчлівых адносінах удзельнікаў да галоўнай тэмы дыялога.

**Заданні з “адкрытым адказам”** – паззнававльныя заданні для дыягностыкі, развіцця і праверкі нефармалізаваных ведаў і складаных пазнавальных уменняў. Форма, змест і аб’ём адказаў на такія заданні адвольныя, не паддаюцца фармалізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Інтэгратыўны курс** – сумяшчэнне ў рамках адзінага вучэбнага курса падзей замежнай і айчыннай гісторыі, што дазваляе разглядаць мінулае цэласна, у арганічным адзінстве.
**Інтэрв'ю** - гульнявы прыём складання школьнікамі пытанняў ва ўяўнай гутарцы з гістарычным персанажам. Творча рэканструючы вобразы людзей прыёі інтэрв'ю узнаўляе і самі гістарычныя падзеі і з'явы.
**Інфарматыўны план** – просты ці разгорнуты – складаецца па ўсіх відах асноўнага тэкста падручніка гісторыі, адлюстоўвае яго галоўныя палажэнні ў выглядзе пунктаў і падпунктаў, якія канкрэтызуюць або падцвярджаюць вядучыя ідэі крыніцы.

**Карціна** – наглядны сродак навучання. У методыцы выкладання гісторыі адрозніваюць: *тыпалагічныя*, выява тыпічнай гістарычнай з'явы і *эпізадычныя* (падзейнасныя), прысвечваныя адзінкавым падзеям карціны.
**Карціннае апісанне** – прыём узнаўлення яркага цэласнага вобраза адносна статычнага гістарычнага факта.
**Карцінны план –** прыём узнаўлення знешніх дэталей або эпізодаў галоўнага гістарычнаг факта ў кароткіх, але вобразных фармуліроўках з мэтай захавання яго эмацыяналльна-афарбаванага вобраза.

**Канспект** – больш менш разгорнутае, паслядоўнае ізлажэнне зместу кнігі, артыкула, лекцыі і іншых крыніц, якое адлюстроўвае " вузлы тэмы", абгрунтаванне і канкрэтызацыю суджэнняў і высноў
**Крытычнае мышленне** – адзін са спосабаў інтэлектуальнай дзейнасці, які скіраваны на выяўленне ілжывых стэрэатыпаў, ацэнку аб'ектыўнасці інфармацыі, акцэнтацыю істотных каштоўнасных арыенціраў, інтарэсаў і прызначэння крыніцы.
**Курс вучэбны** – складовая частка вучэбнай дысцыпліны (прадмета), якая ўяўўляе сабой дыдактычную мадэль вывучэння тых ці іншых яе раздзелаўці праблем. У школьным прадмеце "Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі" існуюць курсы сусветнай( гісторыі старажытнага свету , сярэдніх вякоў і г.д.) і айчыннай гісторыі, базавы і паглыблены курсы гісторыі.

**Лабараторныя заняткі** – форма вучэбных заняткаў, на якіх арганізуецца самастойнае вывучэнне школьнікамі новага матэрыялу па падручніку ці дакументах.
**Лагічнае заданне** – адзін з відаў заданняў з "адкрытымі адказамі", якія арганізуюць пазнавальную дзейнасць вучняў на пераўтваральным узроўні і накіравыныя на фармуляванне паняццяў, прічынна-выніковых сувязей, заканамернасцяў, тэарэтычных высноў з прымяненнем прыемаў тэарэтычнага вывучэння гісторыі.
**Лагічная схема** – умоўна-графічны сродак, які выкарыстоўваецца ў спалучэнні з прыемам разважання для зрокавай перадачы прычынна-выніковых сувязей і іншых адносін паміж гістарычнымі фактамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Мадэрнізацыя** – прыём дапаўнення сучаснымі вобразамі і ўяўленнямі недастаючых дэталей пры рэканструкцыі фактаў гістарычнага мінулага, які школьнікі несвядома прымяняюць там, дзе іх веды недастатковыя.
**Метадалогія** – мае два асноўных значэнні: 1) сістэма пэўных спосабаў, прыёмаў і аперацый, якія прымяняюцца ў пэўнай сферы дзейнасці, напрыклад у навуцы. 2) вучэнне аб гэтай сістэме, тэорыя метадаў. Метадалогіяй гістарычнай навукі прынята называць вучэнне аб прынцыпах пабудовы, формах і спосабах навуковага пазнання ў гістарычнай навуцы.
**Методыка навучання гісторыі** – галіна педагагічнай навукі, якая даследуе заканамернасці навучання гісторыі, з мэтай павышэння эфектыўнасці яе вывучэння.
**Метады навучання** – спосабы ўзаемазвязанай дзейнасці настаўніка і вучняў ў працэсе навучання, якая накіравана на дасягненне мэт навучання.
**Мышленне** – форма творчага адлюстравання чалавекам рэчаіснасці, якая нараджае такі вынік, якога ў самой рэчаіснасці.ю або ў суб'екта на дадзены момант не існуе.
**Мэтавая установка ўрока** – гэта каротка сфармуляваны комплекс плануемых адукацыйных, выхаваўчых і развіваючых вынікаў навучання, якія настаўнік плануе дасягнуць на вучэбных занятках на аснове аргазаванай пазнавальнай дзейнасці школьнікаў з канкрэтным вучэбным гістарычным матэрыялам.

**Навучаемасць** – індывідуальны паказчык хуткасці і якасці засваення ведаў, уменняў і нвыкаў у працэсе навучання.
**Навучанне** – складаны працэс, які ўключае узаемазвязаныя і знаходзячыяся ў пастаянным руху кампаненты: мэты навучання, яго змест, выкладчыцкую дзейнасць настаўніка, вучэбную дзейнасць вучняў і вынікі навучання.
**Навык** – "згорнутае уменне" – дзеянне, якое выконваецца з высокай доляй аўтаматызма і не залежыць ад спецыфікі вывучаемых пытанняў і асблівасцей крыніц.
**Нефармалізаваныя веды** – усе магчымыя інтэрпрэтацыі гістарычных фактаў: ацэначныя суджэнні сведкаў, сучаснікаў і патомкаў аб падзеях далёкага мінулага, асабістыя выказванні аб іх прычынах і характары, гістарычнай значнасці і выніковасці, аб матывах і інтарэсах дзейнасці, індывідуальныя адносіны да вывучаемых фактаў.

**Памятка** – вучэбны дапаможнік, які дапамагае ў пэўнай паслядоўнасці вобразна ўзнавіць гістарычны факт ці раскрыць яго унутраную сутнасць. Памятка ўяўляе сабой пералік вучэбных зеянняў, які расчляняюць складаны вучэбны прыём на некалькі больш простых аперацый.
**Памяць** – псіхафізіялагічны працэс, які выконвае функцыі запамінання, захавання і ўзнаўлення інфармацыі.
**Парадыгма** (ад грэчаскага слова "прыклад", "узор") – прызнанае ўсімі навуковае дасягненне, якое на працягу пэўнага часу дае навуковай супольнасці мадэль пастаноўкі праблем і іх вырашэння. Педагагічная

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

інтэрпрэтацыя новай парадыгмы ўключае такія параметры, як асобасная арыентаванасць, плюралістычнасць, дзейнасны і развіваючы характар навучання.

**Персаніфікацыя** – гульнявы прыем вобразнага ці сюжэтнага апавядання ад першай асобы, звычайна ад імя сведкі або ўдзельніка гістарычнай падзеі.

**Пазнавальныя магчымасці** – дасягнуты на дадзены момант узровень фізіялагічных, псіхалагічных і маральнхх якасцей, якія забяспечваюць школьніку пэўнывынік у авалоданні вучэбным прадметам. Пазнававльныя магчымасці = адначасова і вынік і зона бліжэйшага развіцця вучня.

**Пазнаваўчы інтарэс вучняў да гісторыі** – актыўныя, няспынна удасканальваемыя, эмацыянальна-пазнавальныя адносіны школьнікаў да вывучэннягістарычных фактаў, да высвятлення іх прычын і наступстваў, а та ксама да авалодання уменнямі, неабходнымі для ўсебаковага вывучэння мінулага і сучаснасці на аснове разнастайных крыніц. Пазнавальны інтарэс аказвае істотны ўплыў на станаўленне асобы школьніка, ператвавраецца ва ўстойлівую рысу характару.

**Паняцце** – лагічна аформленая агульная думка аб прадмеце, ідэя чаго-небудзь, якая адлюстроўвае ўнутраную сутнасць гістарычнага факта, яго характэрныя прыкметы, якія указваюць на яго відаваю і родаваю прыналежнасць.

**Практычныя заняткі** – адна з форм вучэбных заняткаў, у час якой на аснове атрыманых раней ведаў і сфарміраваных уменняў школьнікі выконваюць пазнавальныя заданні, прадстаўляюць вынікі сваёй творчай дзейнасці, асвойваюць больш складаныя пазнавальныя прыёмы вывучэння гістарычнага мінулага.

**Прадмет гістарычнай навукі** – мінулае грамадства як працэс.або навука аб чалавеку, якая даследуе мінулае грамадства як працэс, які ствараецца людзьмі, вынік чалавечай дзейнасці, чалавечай суб’ектыўнасці.

**Прыём** – метадычная катэгорыя, складовая частка метада навучання, спосаба вучэбнай работы настаўніка і вучняў, які можа быць выражаны ў пераліку дзеянняў, якія ўваходзяць у склад прыема, адэкватнага спецыфіцы зместу вывучаемага матэрыяла.

**Праблема** – тэарэтычнае ці практычнае пытанне, якое пратрабуе вырашэння або даследавання. Праблемы могуць быць навуковымі і вучэбнымі.

**Праблемная задача** – адзінка зместу праблемнага навучання, якая складаецца з трох кампанентаў: умовы, праблемнага пытання і шыкаемага адказу, адзін з самых складаных тыпаў заданняў з “адкрытым адказам”.

**Праблемнае ізлажэнне** – маналагічнае ізлажэнне гістарычных фактаў без тлумачэння іх сутнасці. Сваім зместам і логікай такі аповед пабуджае школьнікаў да выкарыстаня ведаў і уменняў, якія ў іх ужо ёсць, для адказу на складаныя тэарэтычныя пытанні, якія могуць быць сфармуляваныя на аснове прадстаўленай фактaлагічнай інфармацыі.

**Праектная дзейнасць** – асаблівы від інтэлектуальнай дзейнасці, якізаснаваны на самастойным асэнсаванні эдабытай інфармацыі праз прызму

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

уласных адносін да яе, матэрыялізаваны вынік яго абмеркавання перад аудыторыяй.

**Праграма** – кароткі выклад асноўнага вучэбнага зместу, мэт навучання прадмета і спосабаў іх дасягнення; дзяржаўны дакумент, які вызначае мэты, задачы і змест гістарычнай адукацыі, абавязковы для выканання ў адпаведным тыпе школ.

**Разважанне** – прыём маналагічнага выкладання тэарэтычнага матэрыялу, які ўяўляе сабой ланцужок пытанняў і адказаў па сутнасці разглядаемай вучэбнай праблемы.

**Рэферат** – даклад на пэўную тэму, які ўключае агляд авдпаведных крыніц. Абарона рэферата – адна з магчымых форм выніковай атэстацыі выпускнікоў сярэдняй школы па гісторыі.

**Семінар** – адна з форм вучэбных заняткаў па гісторыі, на якой пераважае самастойная работа старшакласнікаўпры вывучэнні новага матэрыялу, яго сістэматызацыі і абагульненні.

**Сэнсавы план** – спосаб пераліку істотных прыкмет і палажэнняў, якія характарызуюць галоўныя факты, якія могуць быць выяўлены пры аналізе крыніцы пад пэўным вуглом бачання.

**Сродкі навучання** – метадычная катэгорыя састаўная частка метада, г.зн спосабаў вучэбнай работы настаўніка і вучняў, у спалучэнні з прыёмаміадэкватнымі спецыфіцы вучэбнага гістарычнага матэрыялу.

**Стылізацыя** – гульнявы прыём імітацыі сапраўдных тэкстаў, якія адносяцца да пэўных гісторыка-культурных умоў.

**Структурна-функцыянальны аналіз** – лагічная апрацоўка зместу ўрока або параграфа з мэтай выдзялення ў ім галоўных гістарычнх фактаў і тэарэтычсных высноў і паследуючага вызначэння іх адукацыйных, выхаваўчых і развіваючых магчымасцей. На аснове структурна-функцыянальнага аналіза рэкамендуецца мадэліраваць вынікі навучання ці мэтавую ўстаноўку ўрока гісторыі.

**Сюжэтны (расказ) аповед** – прыём вуснага ізлажэння, які мае сюжэт і ўзнаўляе жывы дынамічна развіваючыйся вобраз адзінкавай гістарычнай падзеі. У яго аснове канфлікт удзельнікаў, які паслядоўна праходзіць стадыі завязкі, кульмінацыі і развязкі.

**Тэзісы** – сцісла сфармуляваныя асноўныя палажэнн зместу друкаваных крыніц або вуснага ізлажэння.

**Тэзісны план** – спосаб адлюстравання істотных старон, прыкмет, прычын і вынікаў адзінкавых фактаў, якія не маюць аналагаў у гісторыі.

**Тэматычны блок** – сістэма вучэбных заняткаў, аб'яднаных агульнай тэмай і мэтавай устаноўкай, унутры якой адбываецца не механічнае дабаўленне аднаго занятку да другога, а лагічнае нарашчванне ведаў і уменняў вучняў. Вучэбны матэрыял у тэматычным блоку размяшчаецца па аднаму з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прынцыпаў: падзейнасна-храналагічнаму, стадыяльна-рэгіянальнаму, праблемна-тэматычнаму.

**Тэарэтычны шлях пазнання гісторыі** – асэнсаванне сутнасці фактычнага матэрыялу і авалоданне сістэмай навуковых паняццяў, высноў, прычынна-выніковых сувязей і заканамернасцей грамадскага развіцця.

**Тэст** – кароткае, стандартызаванае (па форме прад'яўлення, тэхналогіі праверкі і ацэнкі выканання) заданне (сістэма заданняў), прызначанае для выяўленне і дыхатамічную ацэнку дасягненняў вучняў зададзенага Дзяржаўным адукацыйным стандпртам узроўню падрыхтоўкі.

**Уменне** – падрыхтаванасць да свядомых і дакладных дзеянняў (разумовых і практычных), здольнасць вучняў паслядоўна прымяняць усю сукупнасць гэтых дзеянняў у новай вучэбнай сітуацыі.

**Урок** – адна з асноўных форм арганізацыі вучэбнай работы ў школе. У метадыцы выкладання гісторыі існуе тыпалогія урокаў па звеннях працэсу навучання: урок вывучэння новага матэрыялу, камбінаваны, кантрольны і паўторна-абагульняючы і па вядучаму метаду; урок-лекцыя, урок семінар і г.д.

**Факт** – аб'ектыўна існуючыя падзеі і з'явы гістарычнай рэчаіснасці, якія знаходзяцца ў пэўных прасторава-часавых рамках. Іх змест не залежыць ад талкавання.

**Фактары (кампаненты) працэса навучання гісторыі** – істотныя абставіны, якія вызначаюць працэс навучання канкрэтнаму прадмету. Да асноўных фактараў адносяцца: мэты, змест, вучэбная работа педагога і вучня і вынікі навучання.

**Фармалізаваныя веды па гісторыі** – устаяўшыяся ў навуцы, дакументальна падцверджаныя палажэнні аб месце, часе, удзельніках гістарычных падзей і з'яў, аб іх працягласці, колькасці, памерах і г.д., а таксама прыкметы гістарычных паняццяў і тэрмінаў, агульнапрызнаныя высновы і г.д., якія могуць быць праверaныя з дапамогай стандартызаваныхзаданняў (тэстаў).

**Школьная лекцыя** – адна з форм вучэбных заняткаў па гічторыі у старэйшых класах, з дапамогай якой настаўнік, пераважна моналагічнымі прыёмамі дае глыбокае, цэласнае, лагічна стройнае выкладанне асноўных фактаў ітэарэтычнага матэрыяла тэмы. У навучанні гісторыі лекцыі дзеляцца на аглядныя і тэматычныя.

**Эўрыстычная гутарка** – дыялогавая форма знолсін настаўніка і вучняў, у працэсе якой цэласная праблема расчляняецца на састаўныя часткі рашаецца паслядоўна., паэтапна, намаганнямі ўсяго класа пад кіраўніцтвам настаўніка. Пытанні эўрыстычнай гутаркі прадугледжваюць не толькі наяўнасць базавых ведаў і уменняў, але і творчасць, інтуіцыюздагадлівасць школьнікаў у пошуку адказау.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Эмпірычны ўзровень навучання гісторыі** – вывучэнне фактаў зса знешняга боку (Што?  Хто? Дзе? Калі? Як?)  і фарміраванне на гэтай аснове вобраза гістарычнай падзеі, з'явы, працэса.
**Эсэ** – адзін з тыпаў заданняў з "адкрытым адказам" празаічны эцюд, які змяшчае або папярэднія меркаванні аб якім –небудь прадмеце ў адвольнай непрымусовай форме.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 6.2 ЛІТАРАТУРА ПА КУРСУ

### АСНОЎНАЯ

1. Концепция учебного предмета “Всемирная история. История Беларуси”// Гісторыя: праблемы выкладання. – 2009- № 7.
2. Образовательный стандарт учебного предмета “Всемирная история. История Беларуси”: утв. постановлением М-ва образования 29.05.2009г. № 32 // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2009- № 7.
3. Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі // Вучэбныя праграмы для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовай навучання. – Мінск: Нац. інстытут адукацыі, 2014. – 128 с.
4. Багдановіч, І. І. Методыка выкладання гісторыі ў школе: вучэб. дапам. / І. І. Багдановіч. – Мінск : БДПУ, 2009. – 286 с.
5. Корзюк, А. А. Вывучэнне гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. у агульнаадукацыйнай школе : вучэб.-метад. Дапаможнік / А. А. Корзюк; пад рэд. докт. гіст. навук, праф. М. М. Забаўскага. – Мінск : БДПУ, 2010. – 152 с.
6. Шоган В.В. Методика преподавания истории в школе: Новая технология личностно-ориентированного исторического образования; учебное пособие/В.В. Шоган. – Ростов-на-Дону, 2007. – 426с.

### ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА

7. Вяземский, Е. Е., Теория и методика преподавания истории в школе: учебн. для студ. высш. учеб. заведений / Е.Е. Вяземский, О.Ю. Стрелова. – М.: Гуман. изд. центр ВЛАДОС, 2003. – 384 с.
8. Гістарычнае краязнаўства Беларусі: вучэбна-метадычны дапаможнік/ І.І. Багдановіч,М.Ф.Гандзелікаў[і інш.];пад рэд.А.А. Корзюка. – Гродна, ЮрСаПрынт, 2014. – 220с.
9. Гора, П.В. Повышение эффективности обучения истории в средней школе / П.В.Гора. – М.:Просвещение,2010. – 208 с.
10. Запрудский, Н. И. Моделирование и проектирование авторских дидактических систем / Н.И. Запрудский. – Минск:“Сэр-Вит”,2008. – 336с.
11. Запрудский, Н. И. Современные школьные технологии-2 / Н.И. Запрудский. – Минск: “Сэр-Вит”, 2010. – 256 с.
12. Гинчук, В.В. Организация учебно-познавательной деятельности учащихся при изучении всемирной истории в 10 класе: метод.пособ./В.В. Гинчук; под научн.ред. И.И. Богдановича. – Мн.: БГПУ, 2004. – 56 с.
13. Карзюк, А.А. Фарміраванне пазнавальнага інтарэсу вучняў пры вывучэнні гісторыі Беларусі XVIII – пач. XXст. у школе / А.А. Карзюк; пад навук.рэд. І.І. Багдановіча. – Мн.:БДПУ, 2005. – 62 с
14. Короткова, М. В., Методика обучения истории в схемах, таблицах, описаниях: практ. пособие для учителей / М.В. Короткова, М.Т. Студеникин. М.: Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 1999. – 191 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

15. Лизунова, Е.В. Организация учебно-познавательной деятельности учащихся при изучении истории в 5 классе / Е.В. Лизунова; под ред. И.И. Богдановича. -Мн.: БГПУ, 2007. – 66 с.
16. Линденберг, К. Обучение истории / К. Линденберг; перевод с нем. – М.: Парсифаль. Русское слово, 2007. – 192с.
17. Мініцкі, М.І., Выкладанне гісторыі старажытнага свету: вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаўМ.І. Мініцкій, В.І. Ханкевіч – Мінск: Рэд.часопіса”Адукацыя і выхаванне”, 2000. – 204 с.
18. Студеникин, М.Т. Методика преподавания истории в школе: учебн. для студ. вузов / М.Т.Студеникин. – М.: Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 2003 – 240 с.
19. Паноў, С.В. Вывучэнне ў школе гісторыі першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі / С.В. Паноў. – Мн.: УПБестпрынт, 2001. – 152с.
20. Степанищев, А.Т. Методический справочник учителя истории / А.Т. Степанищев. – М.: Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 2000. – 320 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ